
ЗМЕСТ Крыніца

Міхась СТРАЛЬЦОЎ



Імгненні ёсць пакутлівага шчасця -
Ірвуцца ўвысь і думка і душа.
Ды толькі тое ўсё ў радок не ўкласці,
Як ты яго, радок, не падвышай.

Бо адмыслова, самадастаткова
Само сабой гаворыць пачуццё.
Тады абразай можа здацца слова,
Тады адно - цудоўнасць і жыццё!

СМАЛЕННЕ ВЕПРУКА

Ідуць ужо халады бяруцца прымаразкі — ападаюць інеем сырыя туманы Чарсцвее зямля і цёмным ільсняна халодным зяленівам б е ў вочы парадзелая пры дарозе трава Ужо выпетрала зябліва пасівела ў гародчыках і пазванчэла бадыллё, і панішчымнела паветра Неба ўдзень ужо ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі Яшчэ выганяюць на пашу кароў — далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле.

І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна бы першаком, пахне ў наваколлі дымам.

Такою парою ў вёсках свяжуюць вепрукоў

Мне даўно хацелася напісаць адно апавяданне назваць яго так: «Смаленне вепрука» Цяпер я ведаю, што бадай, не напішу баюся, каб тое пра што хацеў напісаць, не прыцішылася няўзнак, а то і не згубілася там, у здзейсненай пісаніне, а яно ж мне самае важнае Дык навошта ж тады згадваю і навошта пішу? Мне проста падумалася што можа, усё ж абзавецца на астачу нейкай логікай тое, што тут раскажу Пагляд

Я жыў тады ў нечапанай частцы горада, калі надумаўся пісаць, у старым раёне забудаваным няўклюднымі цаглянымі, а найбольш драўлянымі дамкамі, што ўсцяж патаналі ў садах. Цяпер мала засталося ад таго раёна — адны лапінкі астраўкі зацінутыя кварталамі несамавітых бязверхіх дамоў Засталіся ля новых будынін побач з дз цячымі пляцоўкамі то крывая кашчавая яблыня то вішня што вырасла ў дрэва,— купчастая ў кроне і тоўстая ў камлі І засталася яшчэ вуліца, хоць і старая, але шыракаватая і роўная бо быў гэта некалі брукаваны тракт Назву яму памянялі, адхрышчва-

Пра Мяне

14.2.1937 *нарадзіўся ў вёсцы Сычын, што на Магілёўшчыне. Бацька – Лявон Клімавіч Стральцоў дырэктар мясцовай школы, маці Марыя Міхайлаўна хатняя гаспадыня.*

1954 — *скончыў Нова-Ельненскую сярэднюю школу і паступіў у БДУ на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта.*

1957 *у «Маладосці» надрукавана першае апавяданне «Блакітны вецер».*

1959 *скончыў вучобу ў БДУ і да 1987 года працаваў у рэдакцыях беларускіх газет і часопісаў.*

1962 *прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР, выдаў першы зборнік прозы «Блакітны вецер». У гэту кнігу, афармленую Барысам Заборавым, увайшло сем апавяданняў «Дома», «Мацеевы дровы», «Восеньскі ўспамін», «Блакітны вецер», «Двое ў лесе», «Суседзі», «Перад дарогай». У артыкуле «Ці існуе блакітны вецер?» Анатоль Вярцінскі адзначаў, што Міхась Стральцоў «...шукае свой стыль на шляху вобразна-асацыятыўнага мыслення».*

1965 *выйшла ў свет кніга літаратурна-крытычных артыкулаў «Жыццё ў слове», у якой выявіліся першыя подступы да стварэння аповесці «Загадка Багдановіча». «Алгебра і гармонія... у Багдановіча настолькі з'яднаны, настолькі зрабіліся ягонай паэтычнай сутнасцю, што здаецца натуральным дапусціць, нібы не алгебрай паверялася ў яго гармонія, а гармонія павярала алгебру. Здаецца, каб можна было перакласці на мову алгебры гармонію, дык вершы Багдановіча разгарнуліся б у лагічную паслядоўнасць матэматычнай формулы. Здаецца, з кожнага верша Багдановіча можна вывесці закон «залатога сячэння» паэзіі».*

1966 *выдаў другую кнігу прозы*

Выгнаны патрыцый

Пра Яго звыклі пісаць — паэт, празаік, эсэіст, крытык. Жанрава так яно і ёсць, але сутнасна быў Ён і застаўся перш за ўсё паэтам, хаця (парадокс?) найпаўней выказаўся ў прозе і эсэістыцы. Пра гэту дзіўную асаблівасць Яго таленту скажу крыху пазней. Што ж да Ягонай крытыкі, то мушу адзначыць — большасць артыкулаў, прысвечаных творчасці Брыля, Панчанкі, Барадуліна, Карамазава, Кудраўца і інш., абумоўлены аўтаравай прыязнасцю да названых пісьменнікаў і праз гэта шмат страцілі ў сэнсе мастацкай аб'ектыўнасці...

Пра сябе, паэта, Ён сказаў·

Мне звышнадзённай тэмы
не падняць,
Як не пазбыцца і лірычных трантаў.
Як барытону можна заспяваць
Напружана-задзірыстым дыскантам?
Каб так зрабіў, каб гэтакі наіў
Мяне завабіў на сцяжынку моды,
Дальбог павыміралі б салаўі
На ўчастку мне адведзенай
прыроды.

Мне б так сказаць: «Я здолеў
заручыць
Сябе з уласнай думкай,
і свой голас
Птушынай песняй здолеў надтачыць,
Сабраў расу, якою ўмыўся колас».

«Сена на асфальце», змест якой склалі наступныя творы — «Трыпціх», «На вакзале чакае аўтобус», «Там, дзе зацішак, спакой», «Сена на асфальце», «Добрае неба», «На чацвёртым годзе вайны», «Што будзе сніцца», «Роздум», «І зноў, зноў горад», «Свет Іванавіч, былы донжуан», «Дзень у шэсцьдзесят сутак». З гэтай кнігай у нашу літаратуру вярнулася (пасля ўзвышанскай прозы) прыгажосць стылёвага індывідуалізму: «Вось жыву я цяпер у адным добрым месцы на адзіноце з лесам, восеньскай цішынёй, з незразумелым пакуль мне самому набыткам свае душы. Днём лес свіціцца, засланы скурчаным сухім лісцем, халадок цвеpазіць скроні, і такое адчуванне ў мяне, што калі разгадаю я цяперашнюю патаемнасць лесу, адзінокага на галінцы лістка, калі спасцігну простым словам пругкую выразнасць чорнага крушынавага ствала, калі спалучу я ў адным адчуванні скупы водар халоднай зямлі, журбліваe святло неба і далёкі рокат трактара, і сарочы порсткі чэкат, скрозь восень гляну я сабе ў душу, нібы ў крыніцу, адвяду рукой апалыя ў ваду пажоўклыя лісты...»

1968 *выдаў аповесць «Загадка Багдановіча», якая выклікала захапленне ў Алеся Адамовіча: «Якая культура думкі, пачуцця... І якое разуменне, што ў паэта не біяграфія, а лёс. І тужлівае жаданне сабе іменна гэтага».*

1970 *асобным выданнем выходзіць у свет аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь».*

1973 *выходзіць першая кніга вершаў «Ядлоўцавы куст», у 9-м нумары «Маладосці» надрукавана апавяданне «Асеннім днём» (канчатковая назва «Смаленне вепрука»). Маскоўскі крытык Вячаслаў Івашчанка адзначаў: «Традыцыйная «вясковая» і наватарская «інтэлектуальная» плыні ў прозе Стральцова не дзве асобныя мелодыі аднаго аўтара, а дзве тэмы, якія перакрыжоўваюцца, перагукваюцца і ўзбагачаюць адна адну... У аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь», у апавяданні «Смаленне вепрука» адчуваецца відавочнае імкненне Стральцова да*

ючыся ад даўніны, але не памянялі і нават забыліся даць назву базару, што месціцца пры той вуліцы і завецца ён па-стараму — Конскі базар.

Увосень, кожнай раніцы ў нядзелю, чуваць было, як парыпваюць на маёй асфальтаванай вуліцы вясковыя вазы, як цокаюць капытамі коні і як вішчаць і рохкаюць у драбінах падсвінкі Пазней, калі ўстанеш, расходзішся ад сну, паснедаеш, а потым пойдзеш па цыгарэты ў блізкую краму — не прабіцца будзе да прылаўка праз чужых, негарадскіх людзей Таўканіна, гармідар, і нетутэйшыя дзядзькі гукаюць нечага ад касы да цётак, што стаяць у чарзе, і для большай пэўнасці на мігах нешта паказваюць ім А на пустцы ля крамы ўжо атабарыліся цыганы Жанчыны сядзяць з дзецьмі гарлапаняць, нібы ў полі, увелькі з сваёй модай кудлатыя дзецюкі Конь, выпражаны з калёсаў, цягне сена з драбін, клыча яго ды матляе галавой, нібы «так, браткі, так!» — хоча сказаць гаманкой кампаніі падпітых мужчын Нібыта конь той ведае, што цыганы ёсць цыганы,— ім усё можна

Вось так было, а можа, бывае і цяпер на тым гарадскім лапіку, дзе застаўся Конскі базар, вось так было тою парою калі ідуць халады, калі бяруцца ўранку прымаразкі — ападаюць інеем сырыя туманы

Тою парою, калі ў вёсках свяжуюць вепрукоў

І ў апавяданні павінна была згадвацца тая пара і павінна была чуцца вёска пах падмерзлых трэсак на дрывотні, тарахценне трактарка ля фермы, і на шумавым фоне гэтым — гулкім ёкатам галасы людзей спалоханы гэгат гусака на тарфянішчы, настылы звон калодзежнага вядра і нечакана — пругкі выпад ветру наўскасы а над усім, а ва ўсім павінна была быць каменная, зацятая маўклівасць зямлі, травы і схаладнелага шурпата-шызага неба Вось што трэба было ***загнаць у падтэкст*** А як загнаць, я не ведаў Трэба было, каб адчувалася як выходзіць на ганак чалавек, як ляскае за ім а пасля дробна брынчыць клямка, ён чуе гэта, але і наваколле пачынае ўжо валодаць ім і вось тут, на самай трэшчынцы ўвагі, услед за скавышлівым павевам ветру сарока з-за пуні махнецца яму ў вочы тугою сваёй чарнатой спалохаецца кульнецца ўгору, востра бліснуўшы гэткай жа тугою беллю, і саслізне, падламаўшы крылы у агарод, на плот сігане ад-

Самаатэстацыя вычарпальная, і сваёй, у першай і другой страфе, іроніяй яна не надта заахвочвае пісаць пра Яго паэзію. Бо што можна сказаць пра гэту паэзію, якую генетычную тайну адкрыць, калі *сам* аўтар раскрыў ці не галоўную сваю творчую крэда-таямніцу: «...Я здолеў заручыць сябе з уласнай думкай...»?!

Але, мусіць, ёсць неблагое выйсце ў тым, калі паспрабаваць аўтару пакінуць аўтарава, а сабе сваё — гэта значыць, няпэўныя здагадкі, заснаваныя на больш-менш уважлівым прачытанні вершаў. Хай будуць гэтыя, менавіта няпэўныя, здагадкі, бо нешта ж таксама няпэўнае карціць, не дае душы супакоіцца, з трывогай прымушае думаць пра паэта, што «...сабраў расу, якою ўмыўся колас», што імкнуўся «...пабачыць, як свой кіне цень лясная елка на паляну», акумулюючы ў гэтым сціплым жаданні «пабачыць» і сэнс творчасці і, магчыма, сэнс жыцця. Так, няпэўныя здагадкі (пэўныя пакінем жывым класікам) найбольш прыдатныя ў гаворцы пра мастака, чый зямны шлях завершаны і чыя прыжыццёвая драма ўраўнаважваецца высокім спакоем...

Калі б злы ці добры чараўнік ператварыў Яго ў музычны інструмент, то на гэтым інструменце можна было б іграць толькі мінорную музыку Я не хачу сказаць, што вясёлыя хвіліны (ці наогул радасць) заўсёды абыходзілі Яго. Вядома ж, не. Радасць (творчая, сямейная — нарэшце, інтымная) была. Адна з кніг Яго, дарэчы, так і называецца «На ўспамін аб радасці». Аднак жа відавочна і тое, што не радасць дамінавала ў Яго характары, не весялосці вы-

туль, і трывожна зачачэкае, закалышацца там «Бач, як бы чуе ўжо»,— раптоўна падумае ён і ўспомніць свой сённяшні клопат і знарок безуважную жончыну стараннасць, калі раніцой стаўляла ў печ вядзерныя чыгуны з вадой Ён падманна, нібы нейкі другі знайшоўшы сабе клопат, прыпыніцца на ганку і твар падставіць ветру і вочы яго трывожна будуць убіраць у сябе наваколле, і нябачна накрэсліць там яму гонкі вецер і сум палёў, і халодны вобмарак травы, і перадзімовае трыванне дрэваў

Так ён будзе стаяць, і ў яго будуць варушыцца бровы Ён пачуе, як зарохкае ў пуні вяпрук.

...есці яму сягоння дадуць чым пазней, каб так, угаладаўшыся, лягчэй абмінуў ён здагадку пра тое, што прызначана яму на гэты дзень. Але ж гэта, можа, і насцярожвае яго Ён яшчэ і не здагадваецца ні пра што, адно трывожыць яго, чаму ***гаспадыня***, выходзячы з сенцаў на двор, не хоча падаць на ягонае рохканне голас, чаму з дурным кэрханнем, з бязладным лопатам крылаў пазляталі з седала і раней часу кінуліся да ганка куры Пах пракіслага хлеба і паранкі чуваць яму, чутно, як нямірна сакочуць, не падзяліўшы нешта, куры на двары і цвёрда шкрэбае аб ганак дзюбаю певень, як разладжана, роспачным нейкім голасам, злуецца на курэй гаспадыня Але аціхае пасля ўсё, і зноўку трэба чакаць і нудзіцца Ды вось, нарэшце, тое, што не можа быць падобным на падман тупанне ў сенцах, знаёмы шоргат мешалкі і галасы, і другі, глушэйшы і спакайнейшы голас,— гэта ***гаспадар***. І адчыняюцца сенцы, і бухаюць дзверы, прадракаючы міг нечакана хісткай, поўнай незразумелага сэнсу цішыні У ёй і галасы інакш чуваць. таропка-сцішаны — гаспадынін і коратка-круглы, цёмны — гаспадароў Тады зноў як бы рушыцца, абрынаецца ўсё, паглынутае новай, яшчэ больш незразумелай цішынёй Гаспадара не чуваць (застаўся на ганку?), і ўсё бліжэй, бліжэй да пуні гаспадыніны крокі .

Ён пачынае хламкаць, сутаргава і рашуча, як бы напярэймы той няпэўнасці, што раптоўна пасялілася ўжо ў ім і гняце яго. І гэтак жа рашуча, як пачаў, у нейкі міг перастае ён есці і, злосна рохнуўшы, востра ўскідвае лыч і нюхае паветра, але хваравіта-няўцямна, тужліва глядзяць у пустату яго маленькія, кволыя вочкі, і ўжо чамусьці няможна даверыцца яму

сінтэзу, імкненне спалучыць у прасторы аднаго твора і мінулае і сучаснае. » Алесь Адамовіч разглядаў «Смаленне вепрука» ў кантэксце пошукаў і знаходак Кузьмы Чорнага: «Здаралася, што малады Чорны свядома «супернічаў» з класікамі... пісаў апавяданне «Буланы», вядома ж, маючы на ўвазе талстоўскі «Халстамер». Тым самым правяраў самога сябе, беларускую мову, беларускую прозу... Міхась Стральцоў «супернічае» ўжо з Чорным вучачыся такому смеламу суперніцтву ў таго ж Чорнага, але пачуццё сучаснай прозы, мабыць, ужо не тое: бо ёсць ужо ўсё, «што і ў людзей»...»

1974 *выходзіць у свет кніга выбранай прозы «На ўспамін аб радасці». Праз дзесяць гадоў, перачытваючы гэту кнігу, Аляксандар Станюта сказаў пра яе аўтара: «Як сапраўдны нацыянальны талент, ён нікога не паўтарыў, не даўшы тым самым нікому паўтарыць сябе».*

1976 *выходзіць зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў і эсэ «У полі зроку». Каштоўнасць зборніка ў прызнанні, якое відавочна супярэчыла тагачасным афіцыйным стандартам адносна «правоў» мастака: «Трэба верыць у* **сваё** *(выдзелена намі.—* **Рэд.** *) права быць мастаком, і тады чытачы будуць пазбаўлены таго не вельмі прыемнага і не вельмі маральнага відовішча, калі пісьменнік, паэт ці празаік усё адно баючыся, што чытачы-суайчыннікі не павераць у добрыя намеры ягонага пяра, праз радок клянецца ў сваёй вернасці гэтым суайчыннікам-чытачам, кідаючы тым часам адным вокам і на рэдактара».*

1979 *выходзіць у свет другі зборнік вершаў «Цень ад вясла».*

1981—1982 *прымусовае знаходжанне ў мазырскім «лячэбна-працоўным прафілакторыі». У лісце ад 7.01.82*[1] *паэт так характарызаваў сваё мазырскае існаванне: «Тут, на адзіноце сярод людзей, асабліва пачынаеш цаніць усялякі нязмушаны, шчы-*

[1] Ліст адрасаваны Л.Дранько-Майсюку.

падала быць запаветным пачуццём. Калі весялосць і з'яўлялася, то абавязкова ў журботнай афарбоўцы. Невыпадкова ж Ён прамовіў· «О весялосць мая у восеньскай журбе!» Невыпадкова і такое прызнанне «Я вінават, што скрухай змучан...» А вось гэтыя радкі гучаць, як выдых псіхалагічнай устойлівасці:

За днём зара ідзе, а ноч вядзе заранку
Свяціць табе спагадай, мне — журбой.

Яго мастакоўская свядомасць знаходзілася па-за межамі штучнай драматызацыі канкрэтнай з'явы ці прадмета, гэтаксама як і песімістычнай зададзенасці ў выяўленні самага імгненнага свайго пачуцця. Проста самім жыццём Яму быў наканаваны выбар на карысць смутку, і таму нават звычайная сасна, якая ў іншых паэтаў выклікае столькі аптымізму, уяўлялася Яму не чым іншым, а тарпейскай скалой — вобразам нейкай прадвызначанай асуджанасці, і асуджанасць гэтую (сваю ці, наогул, чалавечую) Ён успрымаў як бездакорную справядлівасць, не наракаючы ні на Бога, ні на будзённае жыццё.

Непазбыўная нота жалю ўвесь час працінала Ягоную надламаную постаць, і Ён звыкся з гэтай нотай. Ён не проста сумаваў, а жыў сумам. Не сумна, а менавіта сумам, як начныя кветкі жывуць расой. Ягоны сум быў тоесны маўклівасці, а ў больш пашыраным (надбытавым) значэнні — тоесны творчаму маўчанню Ён называў сваё маўчанне звонам навыварат Звон навыварат — адсутнасць музыкі.

Ёсць людзі, якія і ў маўчанні

ры знак спагады ці ўвагі — у малых радасцях вялікі сэнс... Я нават думаю: вось месца, дзе найпрасцей падацца ў экзістэнцыянісцкую веру, беручы экзістэнцыю як філасофію пражытага і неражытага імгнення ў яго самацэннасці, у неизбывной, кажучы па-руску, каштоўнасці. Нешта ў гэтым сэнсе, хоць экзістэнцыялізм, вядома, не толькі ў гэтым... Жыццё мае цячэ патрохі ў не мной прызначаным рэчышчы, для працы сваёй часу амаль няма што зробіш? ды і думка валюхаецца, як мокрае гарыць. Праўда, напачатку, як быў у каранціне, можа, болей імпульсіўна, са злосці, чым па натхненню, пісаў вершы (пісаліся), цяпер — не... Як будзе далей пабачым. Тое-сёе мроіцца ў галаве: з прозы — не з прозы, з крытыкі не з крытыкі эсэі[2] нейкія. Як жартуе Вера Сям.(ёнаўна) Палтаран...»

1983 *у серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» выйшаў зборнік «Яшчэ і заўтра».*

1986 *выходзяць з друку апошнія прыжыццёвыя кнігі «Пячатка майстра» (літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ) і «Мой свеце ясны» (вершы).*

1987, вясна — *цяжкое захворванне. Вычытаў падпісную карэктуру «Выбранага» (проза, паэзія, эсэ).*

5 траўня *выходзіць у свет пераклад рамана Ч.Айтматава «Буранны паўстанак» (І вякуе дзень даўжэй за век). Мяркуем, што праца над перакладам адыграла для М Стральцова тую ж негатыўную ролю, якую ў свой час падобная праца адыграла ў творчым лёсе Ю.Казакова, творы якога, дарэчы, М Стральцоў вельмі любіў. Перакладаючы трылогію казахскага пісьменніка А.Нурпеісава «Кроў і пот», Ю.Казакоў не ўзбагачаў свой лірычны талент, а незваротна яго выдаткоўваў, «губляў» у глыбіні чужога эпасу. Падобнае адбылося і з Міхасём Стральцовым на прыкладзе айтматаўскай прозы.*

23 жніўня *смерць. Пахаваны на Чыжоўскіх могілках у Менску.*

[2] У лісце падкрэслена.

ні асцярожлівай ласцы ў гаспадыніным голасе ні паспешлівай яе руцэ, што дрыготка казыча за вухам Рашуча і злосна ён зарохкае зноў, а потым нечакана жорстка калыхнецца ўбок аграмадна-гладкім сваім і грузным тулавам і напружыць карак, адступаючы назад і перастаўляючы пад сабой недарэчна круглыя кароткія ногі Каб умеў, падзівіцца мог бы ён як тое рохканне неспадзеўкі слаба і нудліва абзавецца ў ім не прарочачы ўжо нічога акрамя бяды бо не так убачыць ён, як учуе што гаспадарова постаць непазбежна і цёмна набліжаецца ўжо да варот і забірае засланяе сабою светлы прахон на двор Не будзе ўжо гаспадыні, і застанецца ён сам-насам з гаспадаром. І будзе ён кідацца па пуні, рохкаць і тужыць, і нерухома будзе стаяць гаспадар, мусіць, беспамылкова зазнаўшы, што цяпер непатрэбны і марны быў бы любы падман: трэба лепей набрацца цярплівасці і чакаць, можа, нават выйсці за вароты на двор — набрацца цярплівасці і чакаць. Ён і зробіць гэтак, і ўжо з-за варот пачуе, як ураз аціхне, перастане рохкаць вяпрук, як потым будзе бэрсаць ён лычом падсцілку то прыслухоўваючыся, то пачынаючы непакоіцца зноў як аберне ён цэбар з мешанкай, нарэшце, рашыўшыся, пойдзе да варот Гэта будзе самы трудны міг, калі трэба спакойна хіснуцца з-за вушака напярэймы яму і выставіць перад сабою дула ружжа і старацца не чуць, як у грудзях цёмна чохкае, шырыцца сэрца і цэліцца, блізка наставіўшы дула, ва ўяўную плямінку пад брывом пад кароткімі, белымі пруткімі вейкамі і бачыць тужлівую, амаль па-чалавечы асэнсаваную пакору ў тым, як, змірыўшыся з непазбежнасцю, усё чухае, чухае ён безабаронным каркам аб вушак... Вось і ўсё.

І далей ужо няцяжка будзе ўявіць працяг Уявіць ладнаватыя санкі ну тыя і фасон і памер якіх чалавек свядома ды з разлікам падладжваў пад сваю мажлівасць ды пад свой імпэт каб выпадкам можна было і добрую вязанку дроў па шаранку прывезці з лесу каб малое магло ўправіцца з імі на зледзянелай горцы каб і нядужага дзядка можна было прытарабаніць марозікам дамоў з суседавай лазні Вось і абернуць тыя самыя санкі ўскоцяць яго на іх, і павалакуць па рэдкіх лапіках ранняга снегу ці па камлыжнай восеньскай зямлі кудынебудзь за пуню у алешнікавы зацішак на лажку і непарадак нейкі ўраз угледз ць сарока ў тамтэйшым гаспадарчым жыцці — застракоча, зашастае па алешніку ды па платах.

Вось і ўсё Вось што акрамя ўсяго іншага павінна было адчувацца трызніцца ў тым апавяданні

А сама задума мыслілася так. ну скажам недзе ў нейкім горадзе у вялікім свеце сярод людзей, жыве *сын* — магчыма жанаты а можа і не. У дзяцінстве, у сваім вясковым дзяцінстве гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук — хударлявы бледны шыракароты парывісты адначасна ціхмяны зацяты і ў той жа час быстры на слёзы Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа і можна сказаць што яна была надзелена здольнасцю разумення хацення дабра і разумення людзей, але не таго хцівага, саманадзейнага разумення заручанага з адным днём, а другога журботнага і трохі безнадзейнага, без выгодаў для сябе яно благога чалавека прымушала шкадаваць гэтак жа, як і добрага — хаця б за тое, што ён благі Але гэта — пасля Пачаць трэба было б з ранняга юнацтва з той пары калі чалавек адчуваць сябе можа бадай што вясновай пупышкай вось толькі што ўзарвала тугую сваю абалонку яна — о, салодкі міг вызвалення небяспечная ласка сонца ў трызненн далёкіх дажджоў! І навальніца прыйдзе, і сутаргава разарве неба маланка — не раз не два,— выбліснe сонца, і ападзе цёплы дым над арэшынай, і не скажа маланка, для якой завязі згубны быў яе халодны зялёны прамень. Але вось — маладосць, і герой наш і жыць спяшаецца, і адчуваць жыццё прыспешвае сябе. «Бывай жа родная засень, і родная хата,— думае ён — і ты, маці не глядзі так трывожна ўслед» — і галаву яшчэ не горача пячэ ранішняе сонца і ў крыніцы што так сцішна жыве пад засенню родных ліп яшчэ так багата бруістай вады

Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім сваё. Ды і што тут было ашчаджаць ці шкадаваць! Яму здавалася што не можа быць на свеце чалавека які уведаўшы, не палюбіў бы яго· ну хаця б за гэтую ягоную прагу спагады і ласкі для сябе і для ўсіх! Толькі часам, у шумлівым разгары ягонай з людзьмі злагады і любові нечакана задумлівым рабіўся ягоны пагляд, і здавалася тады што цішыня высокая і сцярожкая вырастала за ім і адчуванне было такое, нібыта нехта ў яго стаяў за сп ной. І час надышоў і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай і нудліва-вінаваты позірк сяброў і нетрывалую ласку жаночага сэрца.

І вось сядзеў ён аднойчы ў добрага знаёмага ў ягонай кватэры за на скорую руку без жаночай помачы накрытым сталом Гаварылі маўчалі бралі чарку і маўчалі зноў Гаспадар лысаваты цыбаты біты жыццём і разумны чалавек, доўга нешта — ламаліся запалкі — не мог прыкурыць цыгарэту Нарэшце натрапілася добрая запалка ён прыкурыў і нечакана з нейкай незразумелай горыччу засмяяўся сам сабе а потым сказаў·

—Ведаеш быў я ў маці З ма Сумнавата Вечарам старая паставіць чыгунок з бульбай на комінак. сядзем з ёю глядзім на агонь, гаворым ці маўчым — во як зараз з табой І хораша неяк, то бяздумна, то трывожна мне. Закуру крамную папяросу а яна патухне зноў І зноў я запалкай чырк ды чырк. А маці тады ціха так кажа мне· «Дык няможна так псаваць запалкі сынок. Можа ад вугольчыка прыкуры, га?» І ведаеш аж скаланула мяне ўсяго.. Не тое каб сорамна стала перад ёй — не запалак жа маіх шкадавала яна мне,— а падалося мне бра-

здаюцца вясёлымі. Ён не ведаў такога псіхалагічнага стану. Ягонае маўчанне было без дамешкаў гарэзіі ці прыхаванай блазноты. Яно нічым не саграваласся, акрамя тытунёвага дыму.

У вершы «Аднойчы ноччу...» Ён убачыў сябе, маўклівага, праз свайго двайніка:

...калі ты раніцай курыш,
разгублены і задуменны,
мне балюча глядзець на цябе.
І днём між людзей ты ходзіш
нейкім далёкім рэхам
і цыгарэт выкурваеш болей,
чым прамаўляеш слоў.

Адчуваецца нейкая гранічная бязвыхаднасць у тым, што раніца пачыналася з курэння, разгубленасці і задуменнасці, што ўсё гэта пераходзіла ў дзень, калі Ён апынаўся сярод людзей, але не самім сабой, паэтам, а «нейкім далёкім рэхам», і таму ў надзеі знайсці *сябе* даводзілася цыгарэт выкурваць больш, чым прамаўляць слоў.

Так, Ён шмат курыў Попельніца і цыгарэта геральдычна аздаблялі Яго пісьмовы стол. Гэту характэрную дэталь не прамінуў мастак Аляксандр Шэвераў, калі афармляў кнігу «Мой свеце ясны». На форзацы гэтай цудоўна аздобленай кнігі — бела-сіняя попельніца, у якой запаленая цыгарэта. Побач з попельніцай аркуш паперы з завостраным алоўкам. Папера, дарэчы, чыстая, на ёй — ніводнага слова.

Алкаголь (гэты класічна-славянскі прывід радасці доўгія гады не абмінаў Яго) не ператвараўся ў вобразны лад вершаў. Толькі ў прозе, у аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь», ёсць сакавітая, па-жыццёваму дакладная сцэна выпіўкі. Курэнню ж у вершах адведзена даволі радкоў, і сама гэта згубная, з пункту гледжання медыцыны, звычка, з'яўляючыся, відаць, не адной толькі фізіялагічнай патрэбай, стала не проста ўласцівай Яго паэзіі (прозы таксама) асаблівасцю, а неад'емным, хочацца нават сказаць, сакраментальным матывам Яго творчага існавання. Памятаю, як у адным маім празаічным чарнавіку Ён прачытаў пра папяросы «Нёман». Вельмі здзівіўся: «І ты, старычок, памятаеш пра іх!» І доўга глядзеў на мяне з нейкай асаблівай настальгічнай уважлівасцю. Яму было прыемна, што я памятаў папяросы, якія былі папулярныя ў Яго шасцідзесятыя гады.

Да знаёмства з Ім я быў амаль абыякавы да тытуню, але назіраючы, як Ён з цыгарэтай засяроджана думае, смуткуе, моўчкі жыве сабою, маё стаўленне да курэння памянялася з абыякавага, скажам так, на філасофскае...

Ён быў упэўнены: шчаслівая хвіліна прыходзіць да чалавека ў яго апошні дзень, але пры той абавязковай умове, калі чалавек будзе бачыць сонца, слухаць птушку і звон вясновай вады. Сам жа гэтай шчаслівай хвіліны не дачакаўся. Не было ні сонца, ні птушкі, ні вады. Заместа вясновай прыроды — быў казённы анкалагічны ложак. Нешта накшталт прадбачання свайго фізічнага фіналу выдыхнулася ў адным з вершаў·

І што тут казаць? Бывае...
Палата, рэжым і пасцель.
І ўсё-такі хай нас мінае
Вось гэта журботная бель.

Журботная бель не мінула, але відавочна ўзбуйніла маральную якасць Яго паэзіі — паэзіі, пазбаўленай хлусні.

це. — ён лёгка, усмешліва зыркнуў на субяседніка і, нібы збаяўшыся сваёй той расчуленасці, зарагатаў — Што скажаш, га? А каб жа ты ведала, думаю, колькі мы, такія харошыя, тых запалак рублёвых па рэстаранах ды піўных у адзін вечар кідаем, га?

І пасмяяліся, і памаўчалі, і ўзялі па чарцы яшчэ.

Пасля ўсталі яны з-за стала, і гаспадар хацеў праводзіць госця, але той адмовіўся, сказаў пра гэта прабачліва і ціха, і гаспадар зразумеў, што, можа, так і трэба, што пасядзелі і памаўчалі яны добра, а ў чым паразумеліся, здагадаецца кожны сам

Тады госць наш развітаўся і памалу пайшоў на вуліцу Вечарэла Сонца нізка стаяла над горадам і лена, холадна біла ў вокны, у бляшаныя дахі дамоў залаціста-барвовым, безуважным святлом Трамвай звінеў недзе, і пах, астываючы нагрэты за дзень асфальт, і пахла, можа, чуйней за ўсё, прапыленай цэглай і фарбай Была пустою вуліца, ён ішоў, а даўгалыгі цень лажыўся на дарогу і соўгаўся паволі, нібы папіхаючы сябе, і раптам побач ці не за драўляным плотам, у гародчыку, коратка і жаласна ціўкнула птушанё. Гэта як бы знак нейкі быў, і ён спыніўся і пагледзеў туды Халадноватая чырвань аблівала бэз, павеў скразняковага ветру калыхнуў лісцё, і цені ад яго затрапяталіся на жоўтай сцяне, і зноў прыцішана-жаласна ціўкала птушанё. Тады ён прыгледзеўся і ўбачыў яго. Ён бачыў яго блізка, тое сумна натапыранае, шэрае птушанё, гэтак бясконца, незразумела адзінокае ў знаёмай яму і, мусіць, не першы раз аблюбаванай засені падвечаровага куста. На сцяне, на лісці на вялікіх прасцягах горада памірала сонца, і што адчуваў, каму і на што жаліўся ён, гэты жывы маленькі камячок, натомлены за дзень нейкім сваім, зразумелым яму, а мо зусім і незразумелым клопатам? Што гэта было страх, натужнае чаканне непасільнага празарэння ці чуйна, вусцішна і раптоўна адчутая адасобленасць ад усяго і разлад з усім? І ці не так трывожыць, гняце незразумелым нейкім сэнсам і самога чалавека тужлівая палоска расхінутай на захадзе вечаровай зары?

Так падумалася яму і ён сцепануўся ад іншай, непрадбачна вострай думкі што прыйшла разам з гэтай, але якая ўжо, мусіць, жыла ў ім з той пары, як сядзеў у гасцях і браў чарку, і слухаў сябе і ў самім сабе гаспадаровы словы Гэта думка ***пра маці*** была яна так увачавідкі падступілася да яго, што зусім невыпадковым, несумненна і адзіна значным падалося яму імгненне, у якое цень ад бэзавага лісця калыхнуўся на сцяне і неспадзеўна ціўкнула за плотам птушка У маркотным, дзіўна запаволеным одуме ішоў ён дамоў, і разам з ім думка пра маці ішла, ці, дакладней, памяць аб нейкай віне перад ёй успамін пра марна растрачаную сілу любові, якая, можа, не сагрэла нікога Бруілася крыніца пад засенню родных ліп, і, прыклаўшы руку да вачэй, углядалася ўдалеч маці

З таго дня неспакой і трывога пасяліліся ў ім

Аднаго разу яму сасніўся сон Напачатку то быў лагодны сон, то было панаванне прыцемку на мяжы святла, калі ўсё азначала і ясніла сабой не лінія адно абрыс, няўлоўна пэўны, нібы вобраз птушкі, якая толькі што пераляцела дарогу перад табой Высокім полем, бярозавым шляхам нібыта ехаў на веласіпедзе ён, захмарана-ціхай і цёплай чулася наперадзе далеч, і гулі ў бярозавым веццi хрушчы І так расхіналася насустрач невядомасці душа, і так было добра. Куды, куды, чаго ехаў ён? Але такім знаёмым, хоць і не знаёмым дагэтуль, быў краявід, так даверліва лашчыла вочы супакойнае неба, што немагчыма не думаць было, што ўсё гэта было ўжо некалі з ім, калі не ў сапраўдным дык у душэўна прыдуманым жыцці «Ага, дык гэта ж я еду дамоў,— нечакана весела, радасна здагадаўся ён,— вунь там скончыцца шлях і зачарнеецца вёска» І далей ехаў ён, але чамусьці не канчаўся шлях, і знаёмае пакутна знаёмае нешта, чым свяціўся, жыў і вабіў краявід, ніяк не магло акрэсліцца ні здагадкай, ні сэнсам. Азірнуцца захацелася яму, ён ужо і намерыўся але не мог І тады як бы парыў ветру нечакана напружыўся, ураз раскідаўся ў яго за спіной: зашалясцела, зашастала, невядома адкуль узяўшыся і асыпаючыся долу, сіберна-калянае лісце. Стала ціха Холад і спусташэнне чуў ён за сабой. Падалося на момант, што ён заплюшчыў вочы, адно чуючы, як іначылася, незразумела іначылася ўсё наўкол яго, а можа, і ў ім, і страх працінаў ягонае сэрца І ён тады ўбачыў О, ён убачыў усё так дакладна — у той кароткі міг, калі нехта, дачасна схаваны ў ім, адным балючым штуршком расхінуў яму вочы і грудзі! І тады ён убачыў сцены, якія адразу пазнаў прапахлыя павуціннем, негабляваныя сцены, і тапчан у куце, закіданы старой вопраткай, і старыя начоўкі на ім, і лаву ля дзвярэй, і вёдры на ёй, і на падлозе кашы з бульбай, і чыгуны, і цэбар з мешанкай, і вузкае, на адно бервяно прарэзанае акенца ў сцяне, і нейкі слоік на ім, і шклянку з гусіным тлушчам на ім (ён гэта ведаў), і адно замурзанае (ці не поклад?) курынае яйка.. О, навошта, навошта такое знаёмае ўсё гэта, і навошта стаіць перад лавай маці, і навошта чыгуны каля яе ног, навошта яна павярнула галаву да яго,— о, які цёмны, невідушчы, цяжкі, нібы плёскат вады ў вядры, у яе пагляд! Ён хацеў ступіць да яе, але яна, засланяючыся, павяла рукой, і тады, нібы па хаценню яе, расхінуліся сцены, і трывожна, квола зашамацела, бліснула яму пад святлом ліхтара салома. То была пуня Нейкая постаць стаяла на каленях, спіной да яго. і нешта хрыпела, трэпала па саломе за тою спіной, і сцішана блішчэла параскіданая ўсюды салома, і шкрэбаліся на седале куры І чыгуны стаялі ў сенцах, і цэбар з мешанкай, і кашы з бульбай! Так ён прачнуўся ўночы А ўдзень яму прынеслі тэлеграму

Ва ўсіх нас ёсць ці была некалі маці, і, на жаль, не заўсёды добрыя прыходзяць да нас тэлеграмы.

Вось і ўсё Ізноў ідуць халады, бяруцца прымаразкі — ападаюць долу інеем сырыя туманы Яшчэ выганяюць на пашу кароў — далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле. І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам.

Такою парою пішу я эпітафію апавяданню, якое магло б называцца «Смаленне вепрука» О, вядома, не шмат логікі ў ім, але ж не шмат логікі і ў стратах, што прыносяць нам лета ці вясна зіма ці восень. Ёсць, на жаль, рэчы, непадуладныя нам але ж ёсць і суцяшэнне ёсць і надзея У таго, хто бярэ ў рукі пяро, надзея ёсць таксама О, паэт да таго ж бывае яшчэ крыху забабонным. Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць. я засцярогся ад бяды — бо сказаў Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг

1973

Да старасці Ён не дажыў і, мяркую, памёр у сваю пару, у той час, калі паэзіяй сталі пагарджаць самі паэты. Зрэшты, мог пакінуць нас і раней, у тым жа 1984 годзе, калі памёр Караткевіч. Ці на тры гады пазней, як і памёр. Не гэта істотна. Істотна іншае — памёр Ён з крыўдай на сяброў Яго сябры-літаратары, людзі з талентам і душой, пачыналі з рамантычнага паразумення, з магіі слова, а скончылі (цяпер гэта відавочна) холадам лічбаў і банальным прагматызмам. Ён лічыў гэта здрадай самой прыродзе мастацтва. Не, Ён не зайздросціў прагматыкам, але адчуваючы, што з імі, абачлівымі філолагамі, у Яго застаецца ўсё менш і менш душэўнай еднасці, пачынаў думаць пра старасць — гэта значыць, развітваўся з маладосцю, асноўнымі дзейнымі асобамі якое з'яўляліся былыя сябры. Цяжка ўявіць Яго старым ды яшчэ з кавенькай, тым не менш Ён марыў пра сваю арэхавую кавеньку — увасабленне журботнай немаладосці.

Ён з ліку тых рэдкіх літаратараў, якія маюць духоўны ўзрост, а гэта, як вядома, нешта зусім іншае, чым проста гады, што складаюцца ў звыклае жыццё; гэта талент той кранальнай памяркоўнасці, якая дае магчымасць паверыць у неверагоднае — ну хоць бы ў тое, што сярод людскасці (слова Гарэцкага, якога Ён вельмі любіў) можа існаваць толькі адзін кепскі чалавек.

Ён жыў з гэтай верай, жыў не ідэямі — пачуццямі, дзеля адлюстравання якіх цярпліва чакаў свайго слова. Менавіта слова, а не слоў. Ягоная лексічная ашчаднасць, здаецца, перавышае ўсе магчымыя ўяўленні аб стылёвай лапідарнасці. «Я хачу напісаць радок, толькі адзін радок...» — прызнаўся Ён у кнізе «Ядлоўцавы куст». Заўважце, не верш, а толькі радок. І ў той жа кнізе можна знайсці яшчэ адно характэрнае прызнанне: «Прысніўся верш — не верш, а два радкі...» Ніхто з нашых паэтаў так не набліжаўся да патрабавання Малармэ шанаваць чысціню паперы. І як тут зноў не ўспомніць, здзіўляючыся інтуіцыі мастака Аляксандра Шэверава, афармленне кнігі «Мой свеце ясны», на форзацы якой сярод іншых дэталяў змешчаны і ліст паперы, не крануты (!) алоўкам.

Ён не загаворваў пачуцці, а далікатна выяўляў іх. Калі адчуваў што слова шкодзіць пачуццям, тады змаўкаў Ужо з першых сваіх твораў зразумеў вартасць маўчання, гаючую непатрэбнасць слоў. Пра гэта добра сказана ў апавяданні «Восеньскі ўспамін»: «Ёсць хвіліны прыемнай блізкасці паміж людзьмі, нейкай ціхай узрушанасці і лагоды... Гэта добрыя хвіліны і добрая блізкасць, якой не трэба слоў».

Іншы раз маўчанне перарывалася вершамі, выпадковымі для Яго. Назаву гэтыя няўдалыя вершы дзеля ўдакладнення сваёй чытацкай незадаволенасці — «26 красавіка, 1966», «Размова з часам», «Партызанская гармата», «Усім сказаць. была, была бамбёжка...», «Эпіграмы» Тут навідавоку сацыяльная канкрэтыка, плоская спроба іроніі, адным словам, нешта тое, што наогул неўласціва Яго пісьму, якое ў свае шчаслівыя парнаскія моманты жывілася не гэтай груваскай канкрэтыкай, не выдуманай ironіяй, а дакладнай эмпірыкай — усё той жа разгуб-

Юрась ЗАЛОСКА - Уладзімір БОЙКА

СОНЕЧНЫ СТРАЛЬЦОЎ

Ю.З. Вам, Уладзімір Андрэевіч, давялося працаваць разам з Міхасём Стральцовым у аддзеле літаратуры «ЛіМа», бачыць яго як чалавека, назіраць як творцу І вось зараз наш часопіс прадстаўляе Міхася Стральцова як Постаць — паэта, празаіка, эсэіста Скажыце, ці не зарана (запозна?) усчынаецца гэта гутарка?

У.Б. А ці існуюць крытэрыі для паняццяў «зарана» «запозна»? У літаратурным жыцці так часта «зарана» і «запозна» ў лёсе творцаў пераблытваюцца «Зарана» ці «запозна» прыйшло шырокае прызнанне да Уладзіміра Караткевіча? Мабыць, многае «запозна» для лёсу такога чалавека, такога пісьменніка «Зарана» тут ніколі не бывае, калі, канешне, творца і сам умее паглядзець на сябе збоку дастаткова патрабавальна.

Калі гаварыць пра Стральцова, дык увага да яго творчасці і асобы ніколі не можа быць перадчаснай Што датычыць запозненасці, дык вось паралельны прыклад, мне здаецца, досыць красамоўны паэт Алесь Разанаў Памятаю ягоны зборнік, які не мог выйсці ў свет, пакуль да яго прадмову не напісаў Пімен Панчанка, а пасляслоўе — Варлен Бечык (ролю грамадскага рэдактара ўзяў на сябе Уладзімір Караткевіч, і трое рэцэнзентаў паставілі на ім свае подпісы). Бачыце, якое атачэнне патрэбна было, каб адпаведныя «інстанцыі» дазволілі паэту прыйсці да чытача? Вось, па сутнасці, і пазнілася кніга Значыцца, і ўвага чытача тармазілася Але «інстанцыі» гэта мала турбавала А вершы ўражвалі нетрадыцыйнасцю, актыўнымі пошукамі формы Сёння гэты паэт не абыдзены ўвагаю, але ці адэкватна чытае яго крытыка? Канешне, нямала істотнага і важкага пра яго творчасць сказана Ды яна — праява больш шматслойная, больш аб'ёмная У такім сэнсе моцна запазняецца і гаворка пра Міхася Стральцова Хто быў на вечары ў гонар ягонага 50-годдзя ў Доме літаратараў, памятае, як прагнуў пісьменнік пытанняў пра творчасць. А пытанняў такіх было так мала

Ю.З. Але тым не менш гаворка пра Стральцова пачалася, і пачалася з пэўным пафасам і ў пэўным тоне Наколькі яны слушныя?

У.Б. Усё ж пачыналася яна трошкі раней, а цяпер прадаўжаецца Што датычыць пафасу і тону, дык здаўна ўтварылася нейкая «іерархія», «табель аб рангах» — літаратурнымі чыноўнікамі, пэўныя пабочныя прычыны часта ўплывалі на характар, змест і нават «памеры» гаворкі вакол таго ці іншага пісьменніка Па сёння гэта не зжыта ў літаратурным побыце. Адсюль, мабыць, далёка не заўсёды адэкватнае адлюстраванне рэальнай «удзельнай вагі» таго ці іншага творцы ў літаратурным працэсе.

Праява Стральцова была адразу відочная хоць і гаварыл пра яго «пад сурдзінку» Адразу не падлягала сумненню, што гэта — адметная індывідуальнасць. Па-першае, апавяданні Іх аўтар — вытанчаны стыліст (наўмысна падкрэсліваю гэта таму што культура беларускай прозы шмат у якіх праявах знівелявана). Вакол апавяданняў Стральцова адразу пачал ўзнікаць «завіхрэнні» ва ўспрыняцці нават блізкім да пісьменніка колам чытачоў Памятаю вострыя спрэчкі вакол апавядання «Свет Іванавіч былы донжуан» Аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» стала падзеяй вельмі прыкметнай Па-другое стральцоўскія артыкулы і эсэ. Працуючы ў «ЛіМе», нельга было не пісаць рэцэнзій пэўных матэрыялаў да літаратурных дат І з першых жа публ кацый гэтага жанру акрэслілася адметная эсэістычнасць стральцоўскага пяра вытанчанасць стылістыкі культура мыслення інтэлігентнасць Нельга было не дзівіцца, колькі гэтым зусім яшчэ маладым чалавекам было назапашана душэўнага досведу колькі было начытана адчута перадумана Бліскучая арыентаванасць у еўрапейскай літаратуры у рускай, не кажучы ўжо аб роднай Стральцоў адразу заняў у беларускай літаратуры сваё месца, сваю нішу і мабыць, можна дастаткова рашуча акрэсл ць АДКУЛЬ ён ідзе. Але яшчэ пару слоў пра яго эсэістыку

Ці не пра Кузьму Чорнага ўзяўся ён напісаць для газеты Памятаю, Міхась знік на колькі дзён з рэдакцыі І вось прыходз ць, дыктуе — тры-чатыры старонкі машынапісу Невялічкае эсэ. Але — такое шчыльнае! Адным духам чыталася Не магло не ўразіць трапныя назіранні сваё свежае, важкае слова актыўнасць перажывання

Ю.З. Напэўна таму спрыяла яго ўнутраная паэтычнасць паэтычнае ўспрыняцце рэчаіснасці?

У.Б. Можна валодаць развітым паэтычным успрыняццем рэчаіснасці (і рэчаіснасці літаратурнай таксама), але пры гэтым кепска арыентавацца ў рэальнай праблематыцы жыцця У Стральцова ж — менавіта начытанасць, арыентаванасць у свеце літаратуры а галоўнае — арыентаванасць у ***балючых кропках душы сучасніка*** найвял кшая спагаднасць да гэтай душы Колькі ён пакутаваў з-за душы чалавечай — сваёй, чужой — па вялікім рахунку па дробязях. Дробязяў у людзях для яго не было. Ён умеў паспагадаць, суперажыць, усцешыць, зразумець. Інтэлігентнасць арганічная Ніколі не стамлюся вымаўляць гэтае слова ў дачыненні да Стральцова

Ну і нарэшце паэзія Яго першыя вершы парушалі звыклае і напрацаванае беларускай паэзіяй тут не было ўсялякіх «гімнаў» але чуваць было «як гарыць цыгарэта кінутая некім на вуліцы», відочны былі «зялёныя кругі жыцця» Для мяне, як чытача стральцоўскія парушэнні звыклага ў паэзіі гэтак жа заўважныя нечаканасцю як і рэчы Разанава Пры ўсёй індывідуальнасці кожнага гэта праявы РОДНАСНЫЯ — па культурнай глебе якая іх жыв ць па ўнутраным напале і напяцці радка Многім аўтарамі друкуюцца кіламетры вершаў дзесяткі тысяч тэм, матываў уздымаецца, і хвалюючых, і цікавых, але з гэтых кіламетраў столькі напісана як бы адной рукой і перажыта як бы адным (нейкім сярэднеарыфметычным) узроўнем біцця сэрца . Фармальна — нібыта пісьменныя вершы, але каб прыйсці ў паэзію і сказаць. Я — ТОЙ ХТО ШЛЯХ, І ХТО ПА ІМ ІДЗЕ (А.Разанаў), альбо: «Кіну рыну — пакіну ра"), а таксама пра гаючы эфірны скавышок ("А будзе час, калі і без нагоды...").

Ягоная паэзія — творчасць стомленай душы, разгубленай не так перад жыццём, як перад сваімі пачуццямі. У зборніках «Ядлоўцавы куст» і «Цень ад вясла» ёсць яшчэ нейкі бунтоўны штуршок, надзея на ўсё тое ж каханне, аднак у апошняй кнізе «Мой свеце ясны», нягледзячы на яе праставата-бадзёрую назву, ад гэтай надзеі застаўся толькі цень.

Дарэчы, цень — любімае Яго слова, таксама, як і сініца — птушка, вобраз неабароненасці і душэўнага свята.

Ён не трымаў сініцу ў руцэ і не імкнуўся лавіць яе — проста любіў слухаць, любіў вітацца з ёю, стоячы ў ценю. Цень — прытулак для патрыцыяў, пазбаўленых матэрыяльнай улады. У адным з вершаў, якраз у тым, дзе сасна ўявілася Яму тарпейскай скалой, Ён жартоўна ахрысціў сябе выгнаным патрыцыем, не падазраючы ўсёй праўдзівай дакладнасці такой самаатэстацыі. І сапраўды ў нашым прыгожым пісьменстве Ён быў выгнаннікам[1] з літаратурнага сената — самакрытычным арыстакратам слова, якому было балюча глядзець на свае ранейшыя здабыткі, асабліва празаічныя. На зборніку прозы «Журавлиное небо» трэцяга верасня 1983 года Ён зрабіў мне такі надпіс: «Браце Леанід! Мне здаецца, што ўсе ўжо забыліся пра маю прозу і мне ж самому згадваць пра яе балюча ці надару цябе чым новым? Маліся за мяне Твой...»

Ён дарэмна хваляваўся, пра Яго прозу не забыліся ні даўнейшыя чытачы, ні пакаленне

ленасцю, псіхалагічнай няпэўнасцю, усё тым жа непадманным сумам. Яму заўсёды патрэбна была экзістэнцыйная адлегласць паміж выпадковым уражаннем і неабходным назіраннем, і калі яна з'яўлялася, то выяўленне яе іншы раз было самым шчасліва-немудрагелістым:

Стоячы перад люстэркам
ён доўга сябе пазнаваў...

Ён паэт неаўтабіяграфічны. Зрэшты, уся наша паэзія такая. Паспрабуйце, напрыклад, у вершах Купалы ці Вярцінскага знайсці дакладныя прыкметы іхняга жыцця. Не знойдзеце. Аўтабіяграфізм, калі і прысутнічае ў беларускай паэзіі, то абавязкова з нейкім асаблівым, цяжкім для чытання кодавым знакам. У гэтым сэнсе наша паэзія даволі зашыфраваная, ва ўсякім разе не такая адкрытая, як, напрыклад, руская.

У Яго вершаваных краявідах, і ў празаічных таксама, дамінуе ўмоўнасць — Ягоная вёска не мае канкрэтнай назвы, як і Ягоны горад. Гэта Вёска ўсіх нашых вёсак, і Горад усіх нашых беларускіх гарадоў.

Дакладна пазначаны хіба што літаратурна-міфалагічныя алюзіі і вобразы. Але калі вобразы літаратурныя ўвайшлі ў Яго паэзію тэматычна, як у вершах «Пачатак», «Купала», «Міцкевіч на Беларусі», «Вечаровае», «Экспромт» і інш , то вобразы міфалагічныя ўзбагацілі Яго пісьмо на больш высокім — сэнсавым узроўні. Тут я маю на ўвазе і радок пра сонечнага Феба ("Развагай сталае пары..."), і верш пра неасцярожнага Фаэтона ("Фаэтон"), і згадку пра Кастальскую смагу ("Прыехаў сяб-

Гэты дом на гары, Горкі дым успаміну Хай развеюць вятры .» (М Стральцоў). Здавалася б, гранічна традыцыйна, але — якое напяцце пачуцця і якая натуральнасць інтанацый!

Такім чынам тры іпастасі Стральцова проза эсэістыка паэзія Гэта праявы аднаго — высокага!— кшталту аднаго ўзроўню.

Ю.З. Ці не знаходзіце што апроч начытанасці у Стральцова само жыццё варункі жыцця былі балючай кропкай? Маю на ўвазе развітанне з вёскай тым векавечным ладам жыцця з якога паэт выйшаў і мусіў быў назаўсёды яго пакінуць.

У.Б. Ну, калі пісаў пра гэта значыцца — не пакінуў Тут я вымушаны крануць матывы якія прагучаць дысанансам з распаўсюджанымі і як бы ўжо ўсталяванымі поглядамі

Справа ў тым што ў каго пальцам ні пакажы з нашых сучасных паэтаў і празаікаў — ледзь не перад кожным так ці інакш стаяла гэта праблема I перад пасляваенным пакаленнем таксама. I нават раней Задоўга да вайны было засведчана цяпер ужо сапраўды класікам «Зноў шкода мне родных аселіц скрыпучых на полі калёс Туман серабраны абеліць атаву звінячую, плёс. Зара на куросаднях ціха збіраецца ўжо начаваць а мне яшчэ хочацца крыху на ржышчы старым пастаяць .» Хочацца «каб і без мяне мае зоры гарэлі над вёскай маёй .» Я гарадскі чалавек, а ўсё жыццё са мною гэтыя радкі Аднекуль адтуль, з дзяцінства калі давялося і вясковага жыцця паспытаць удосталь Пасля прыйшло пакаленне, якое засведчыла вуснамі Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей трэба дома бываць не госцем .» (Гэтае натуральнае пачуццё не замінае яму засвоіць сэрцам большыя абшары і ў прасторы, і ў часе). А шмат хто так і застаецца на мяжы паміж горадам і вёскай· і сваёй несумненнай сувязі з народнай культурай не рэалізуе (як натуральна рэалізаваў яе, напрыклад, Антон Бялевіч), і выкшталцонасці культуры гарадской не дасягае. Так і застаюцца недзе паміж горадам і вёскай. Не хапае, мабыць таго чым так багаты быў Міхась Стральцоў

Ю.З. Я аднак, меў на ўвазе менавіта тое, што Міхась Стральцоў можа, як ніхто ў пару 60—70-х гадоў здолеў адчуць драму вёскі

У.Б. Мне здаецца, не ўсё так проста Тое што ён адчуваў драму і можа, адным з першых, калі не першы па-мастакоўску выявіў яе — гэта факт Але «драма вёскі» — толькі часцінка тае драмы, што выяўлена ў творчасці Міхася Стральцова. Пра гэта мабыць, даследчыкі яго творчасці яшчэ скажуць Ім яшчэ трэба ПРАЙСЦІ ШЛЯХ Стральцова Яны — на пачатку шляху Наўрад часцінку драмы варта выдаваць за ледзь не пануючы матыў хоць знешне гэтая драма здольна падацца зручным стрыжнем на які можна «насадзіць» аналіз творчасці гэтага пісьменніка Вельмі зручна залічыць Стральцова да так званых «деревенщиков» але ён вострa адчуваючы і выяўляючы драму вёскі выходзіць усё ж на інакшыя абсягі чалавечай драмы Разумееце, як назваць тую драму што вынікае з ажыццяўлення мары Паўлюка Труса «О край палёў калі ж ты станеш краем фабрык дымных і машын? .»? Ну стала Беларусь «краем фабрык» Цікава было б суаднесці гарадскія матывы лірыкі Труса і Стральцова Не зразумейце так, быццам рупіць мне тут экалогія матухны-прыроды Яна канешне, рупіць. Але Стральцоў адчуў прадонне ЭКАЛОГІІ ДУШЫ У «сямі восьмых» айсберга ягонай паэзіі і прозы адчувальная праблема праблем абездухоўленне чалавека — ці не ёсць гэта працэс незваротны Міхась вострa адчуваў· для любога чалавека апроч здольнасцяў і таленту патрэбна *культура абыходжання* са сваімі здольнасцямі і талентам. Патрэбна *работа душы.* А яе выцясняе празмерна сур'ёзнае да сябе стаўленне, эгацэнтрызм, страта здольнасці адчуваць чужы боль як свой Паўтару· да адэкватнага прачытання Стральцова — яшчэ ШЛЯХ I ШЛЯХ.

Ю.З. Нагадаю: вы сказалі, што можна акрэсліць, АДКУЛЬ ён ідзе.

У.Б. Натуральна Найперш Міхась Стральцоў узнік як пачатак самога сябе. Для яго надта ж прыдатнае азначэнне Разанава Я — ТОЙ ХТО ШЛЯХ, I ХТО ПА ІМ ІДЗЕ Так-так. Стральцоў быў і шляхам, і тым, хто па ім ішоў Дык АДКУЛЬ ЖА усё-такі?

Некалі моцна выцяла па сэрцы кніга «Загадка Багдановіча» З'яўленне гэтай рэчы здзівіла Не ведаю, як знаўцы Багдановіча ўспрымаюць яе, хоць у кніжкі, здаецца, добрае імя,— магчыма, пэўныя даследчыкі і з пачуццём рэўнасці ставяцца да высноў Стральцова, які зусім нечакана выйшаў да чытача з адметнай, нестандартнай, тыпалагічна новай літаратуразнаўчай работай. Калі б мы былі меней заклапочаныя «табелем аб рангах» празмернай увагай да«іерархіі», дык за такую работу не грэх было б прысудзіць аўтару навуковае званне. Пры нашай жа культуры літаратурнага і навуковага побыту дарэмна было чакаць такой павагі да адкрыццяў калегі А ў «Загадцы Багдановіча» адкрыцці ёсць. I Міхася Стральцова, чалавека, з якім сустракаўся кожны дзень, я тады ўбачыў інакшымі вачыма Якая найтанчэйшая духоўная душэўная структура, з якіх балючых, найтанчэйшых ніцяў вытканa гэтая душа I кожная з ніцяў трымціць і баліць усімі болямі рэчаіснасці — сённяшняй учарашняй, заўтрашняй — і ўсімі болямі культуры Дзякуючы яму бачыш трагізм культуры засведчаны праз вострае маральнае адчуванне канфлікту бацькі і сына Багдановічаў — Чалавечае адкрыццё. Тое, што ўсе імкнуліся загладзіць, прыхарошыць, Міхась Стральцоў не пабаяўся выявіць. Чаму? Адказ у паэзіі Багдановіча: «Праці цячэння вады зможа толькі жывое паплыць. .» З тым балючым, што было ў лёсе Багдановіча, Стральцоў не пабаяўся сутыкнуцца. I гэта не прыватны матыў канкрэтнай біяграфіі канкрэтнага паэта і пісьменніка (маю на ўвазе і Багдановіча, і Стральцова); інтэнсіўнасць іх болю з нагоды чалавечай драмы — гэта мадэль нечага істотнага ва ўсёй нашай культуры Тут можна бачыць нейкія прыкметы року, кону, «ананке» Прыкметы таго што стагоддзямі навісае над беларускай культурай.. Вунь калі не «зарана» было гаварыць пра Стральцова НА ПОЎНЫ ГОЛАС — калі ён адкрыў «свайго» Багдановіча I па сёння ці адэкватна перажыта чытачом стральцоўская «Загадка Багдановіча»?..

Міхась Стральцоў па самой існасці свайго таленту — з нішы Багдановіча Ён увесь — з тых імпульсаў, што ад Максіма-кніжніка сыходзяць. АДТУЛЬ яго шлях.

Ю.З. Такім чынам на пытанне «АДКУЛЬ Стральцоў? » вы адказваеце — «Ад Багдановіча»?

У.Б. Так.

Некалі шмат хто ішоў за Багдановічам Але, як ведаеце былі 20—30-я гады Арбіты літаратурнага развіцця былі груба парушаны, і многія творцы былі адштурхнуты ад «багдановічаўскага шляху» Аднадумцам Багдановіча быў Бядуля — яны сябравалі Гарэцкі — сучаснік Багдановіча — маліўся на яго, распрацоўваючы свой накірунак (дарэчы Гарэцкі і Стральцоў — асобная тэма для даследчыкаў). I быў цэлы шэраг маладых паэтаў 20—30-х га-

---

маладзейшых пісьменнікаў. Немагчыма было забыцца, бо ў гэтай прозе пераҗытае тоесна лексіцы, і аўтарская інтанацыя бездакорная роўна настолькі, наколькі гэтага было патрэбна цнатлівасці пачуцця.

Дык вось, калі Ягоная паэзія — творчасць стомленай душы, для якой боль, выказаны ў слове, не застаецца словам, застаецца самім сабой — болем, то проза (у тым ліку і «Загадка Багдановіча») — маладое свята сінтаксісу, у якім і боль, і радасць, і тужлівы роздум яшчэ неад'емныя ад слова. З цягам часу ідэалізм гэтай неад'емнасці даўся ў знакі, ледзьве не ператварыўся ў таўталагічны прыгнёт, і Ён зразумеў, што неабходны змены — стылёвыя, жанравыя, нават светапоглядныя. У «Смаленні вепрука» — апавяданні апавяданняў беларускай літаратуры,— пішучы эпітафію нязздзейсненаму твору, Ён напісаў эпітафію і сабе, празаіку Мастакоўская метамарфоза адбылася — ідэалізм прозы канчаткова саступіў свядома абранай паэзіі.

Вядома, у гэтай метамарфозы былі і больш значныя падставы. Назаву іх нацыянальна-спадчыннымі. Ён, беларус, як ніхто з нашых пісьменнікаў адчуваў, што належыць да нацыі, якая ўсё яшчэ лепш сябе выказвае ў паэзіі, чым у прозе. Гэта асаблівасць, як вядома, тлумачыцца перш за ўсё маладосцю беларускага этнасу, пачуццёвай, а не разумовай спецыфікай яго мовы.

На жаль, Ягоная творчая метамарфоза не была пазбаўлена істотнай супярэчнасці. Свядома выбіраючы паэзію ў адрозненні ад прозы, дзе выбар жанру быў непрадузяты, мала залежны ад рацыянальных умоў, жадаючы выказацца лепш, абсалютна пабеларуску, Ён не пазбег, і не мог пазбегнуць, своеасаблівай эстэтычнай антыноміі. Назаўсёды развітваючыся з прозай, не падазраваў, што Яму, як мастаку, найпаўней наканавана было выказацца не ў паэзіі, а менавіта ў прозе, дзякуючы якраз непрадузятасці выбару апавядальнага жанру.

Прадчуваю пытанні: дык што, паэзія — памылка ў Ягонай творчай анкеце і Ён не паэт?! А як жа тады разумець пачатковую думку гэтага артыкула, што сутнасна Ён быў і застаецца паэтам?

А так і разумець, што перш за ўсё Ён паэт I не толькі ў вершах — у апавяданнях і ў эсэ таксама. I чыста жанрава Ягоная паэзія ніякая не памылка, а запозненае дзіця, народжанае не ад юнацкай страсці, а ад сталага жадання мецъ яго.

Яшчэ могуць быць пытанні: што значыць «назаўсёды развітваючыся з прозай, Ён не падазраваў...» і г.д.?! А калі Ён не мог далей пісаць?! Калі Ён скончыўся як празаік!

Не, не скончыўся. I пісаць Ён мог гэткія ж, як і пісаў, апавяданні, нават аповесці. Але Ён не мог сабе дазволіць паўтораў, таму развітанне з прозай было прадвызначана.

Пра «Загадку Багдановіча», бясспрэчную Яго мастацкую ўдачу[2], трэба сказаць асобна — асобна ў тым сэнсе, што гэта не хваласпеў самаму трагічнаму нашаму песняру, гэта, калі хочаце, інтэлектуальны ўздых, нават плач па нашых страчаных магчымасцях.

Асноўны матыў «Загадкі» скрушлівы — нарэшце лёс даў Беларусі паэта, праз творчасць

доў, якія адбыліся як творцы, але не цалкам раскрыліся . Ну а на спадчыну Багдановіча тагачасныя «ідэолагі» глядзелі праз павелічальнае шкло, вышукваючы што б там вырваць з літаратурнага ўжытку (прыгадайце, як доўга не перавыдавалася літаратурна-крытычная і публіцыстычная спадчына Багдановіча). Дык вось, Стральцоў — гэта не што іншае, як актыўнае аднаўленне глыбіннага разумення традыцыі, менавіта накірунку багдановічаўскай традыцыі як адной з вядучых у беларускай культуры (на мой погляд, дык і самай плённай). Сёння зусім відавочна што багдановічаўская традыцыя — адз ны нармальны шлях, на якім могуць быць вырашаны праблемы адраджэння нашы сённяшнія і заўтрашнія праблемы, вырашаць нашы сённяшнія праблемы калісьці пачаў Максім Багдановіч! Вось што важна зразумець, шукаючы адказу на вашае пытанне аб своечасовасці ні несвоечасовасці цяперашняй увагі да Міхася Стральцова

Так, праблемы нашага адраджэння пачаў вырашаць Максім Багдановіч Задаў танальнасць і ўзровень вырашэння гэтых праблем. Уладзімір Караткевіч ледзь не класічна ўпісваецца ў намаганні, да якіх далучаю Міхася Стральцова І пра Караткевіча можна сказаць што яго пачатак — ад Максіма-кніжніка Мы столькі дзесяцігоддзяў пагарджаем кніжнікамі. Мы любім — каб «ад вёскі» «ад сахі», «ад бараны» Ці зжытыя, урэшце славутыя заклікі «ўдарнікаў» у літаратуру?! Канешне, мо занадта завастраю. Ды не зразумейце так, быццам Купалу і Коласа процістаўляю Багдановічу Яны ж таксама — «ад кніжніка»

Ю.З. У мяне склалася такое ўражанне, што Стральцоў быў досыць адзінокім творцам у сваім часе.

У.Б. Ну які ж ён адзінокі калі побач — Караткевіч Разанаў Барадулін Адамовіч, Быкаў? Сёння развіваецца ў гэтым рэчышчы творчасць Уладзіміра Арлова, і дай яму Бог надалей асталявацца І сярод самых маладых сёй-той спараджае аптымістычныя надзеі

Ю.З. Баюся, Уладзімір Андрэевіч што ў нашай гутарцы скора перабяром усіх сяброў рэдкалегіі новай «Крыніцы» — Разанава Арлова Чытачы могуць не так зразумець

У.Б. Даруйце, але я не ведаю, хто сябры рэдкалегіі (Смяецца.) А што, Дранько-Майсюк, выпадкам не сябра рэдкалегіі? Мне карціць і яго тут назваць.— Дарэчы калі з Міхасём працавалі ў «ЛіМе» тыя матэрыялы дзе аўтары былі з намі нязгодныя, палемізавал мы ў першую чаргу рыхтавалі да друку старанна захоўваючы папрокі ў свой адрас. Падшыўкі газеты могуць пацвердзіць, што чыстую праўду кажу.— Я кажу пра Разанава і Арлова не як пра членаў рэдкалегіі а як пра пісьменнікаў якіх чытаю. Прадмет гаворкі вымагае таго каб іх мёны тут назваць — іншыя ў кантэксце гэтых разваг не стасаваліся б. Гэтак удакладняецца адказ на вашае няпростае пытанне: гэта сёння добра відаць, што Стральцоў не быў адзінокі А тады мабыць, і Стральцоў і Караткевіч і Разанаў і Барадулін — кожны па-свойму быў адзінокі Разанаў сёння хіба не адзінокі? (Прашу шаноўнага сябра рэдкалегіі захаваць і гэтае можа, занадта суб'ектыўнае меркаванне Што зробіш так успрымаю.)

Ю.З. Як Міхась Стральцоў пачуваўся ў кантэксце свайго часу і свайго пакалення, як ён рэагаваў на пэўную заангажаванасць — ці то палітычную ці суполкавую, як ён існаваў?

У.Б. Чалавеку які займаўся літаратурнай крытыкай існаваць у тыя часы было вельмі няпроста І шляхі выяўлення свайго стаўлення да таго што з'ўлялася ў літаратуры былі роз-

---

якога Беларусь магла б эстэтычна рэалізавацца ў свядомасці свету гэтаксама, як, напрыклад, Францыя рэалізавалася праз творчасць Верлена. Магла б, каб не занадта кароткі век паэта! У выніку праз Багдановіча, праз тое, што ён паспеў напісаць за свае няпоўныя дваццаць шэсць гадоў. Беларусь рэалізавалася толькі дзеля сябе самой — гэта значыць, не ў свядомасці свету, а ў сваіх яшчэ не надта нацыянальна-устойлівых думках і адчуваннях.

Для мяне, чытача, тэкст «Загадкі» — звычайны. Незвычайная ж пазатэкставая прастора, у якой аўтар і герой набываюць непарыўную еднасць. Мастацтва, радзіма і жанчына — вызначальныя каардынаты гэтай еднасці. У адносінах да мастацтва яны, аўтар і герой, сышліся на апалогіі Сальеры (праўда, пры гэтым не адмаўляючы і маларціянскаму падыходу да творчасці), у адносінах да радзімы іх аб'яднала пакута; у адносінах да жанчыны — расчараванне, якое вынікла з несумернасці выпадковай асалоды сямейнаму шчасцю.

Але ў гэтым яна і ёсць, доля паэтаў — за хараство хвілiннападуладнай асалоды расплочвацца перадсмяротным расчараваннем.

Леанід **ДРАНЬКО-МАЙСЮК**
10 траўня 1994

[1] Аднак не трэба разумець гэта ў сэнсе нейкіх спланаваных супраць Паэта рэпрэсій. Лёс выгнанніка быў наканаваны Яму ўласным талентам (заўвага мая. *Л.Д.-М.*)

[2] Праўда, мяне крыху бянтэжыць у гэтым эсэ празмерная колькасць цытат

ныя Для Стральцова гэта было няпроста па-свойму, у яго былі свае шляхі Яго інтэлігентнасць дапамагала яму знаходзіць выйсце, здавалася б, з безвыходных сітуацый Як ён рэагаваў на «заангажаванасць»?

У нас так часта гэтае паняцце напаўняецца неадэкватным зместам Мне здаецца выдатна разумеў сваю заангажаванасць і адказна да яе ставіўся Максім Багдановіч. Ён бліскуча выканаў усе задачы сваёй заангажаванасці Гэтак жа і Уладзімір Караткевіч, і Алесь Разанаў, і Васіль Быкаў і Алесь Адамовіч і кожны, хто па-сапраўднаму заангажаваны РОДНАЙ КУЛЬТУРАЙ Заангажаванасць, на жаль разумеюць часта зусім механічна. Гэта ж і ёсць той самы «сацыяльны заказ», які чамусьці блытаюць з заказам адміністрацыйным А справа ў тым што сацыяльны заказ (заангажаванасць) заказ адміністрацыйны — рэчы зусім розныя Адпаведным «інстанцыям» у свой час мабыць, было выгадна за сацыяльны заказ выдаваць заказ адміністрацыйны які і зыходзіў з «інстанцый» А сацыяльны заказ НЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ ні ад якой адміністрацыі бо ён фармулюецца не ёю, не ЦК партыі не парламентам ці Саўмінам незалежнай Беларусі — гэта калі заўгодна ПАТРЭБА ЭПОХІ Эпоха ангажуе творцу БЕЛАРУСЫ НІКОГА НЕ МАЮЦЬ? — «НЯХАЙ ЖА ХОЦЬ БУДЗЕ ЯНКА КУПАЛА»! Вось вам вырашэнне сацыяльнага заказу Аніякая адміністрацыя не была зацікаўлена ў такім вырашэнні Затым Багдановіч з'явіўся Яго выклікала да жыцця патрэба няшчаснай культуры, якая ніяк не магла асталявацца, заціснутая ў «Северо-Западном крае» Патрэба пашыраць рамкі роднай культуры, ставіць яе на «пачэсны пасад між народамі» (гэта Купалавы словы і больш познія) — Багдановіч гэта адчуў найвостра, заангажаваны роднай культурай. Вось жа была тая ноч у жыцці Багдановіча, калі ён стварыў «Пагоню» «Хай пачуюць, як сэрца начамі аб радзімай старонцы баліць» Хай пачуюць! Вось вам вырашэнне сацыяльнага заказу Трэба было зафіксаваць БОЛЬ І гэтым болем былі заангажаваны і Купала, і Колас, і Багдановіч, і Бядуля і Гартны, і Гарэцкі, і Гарун Мы заангажаваныя сёння, як некалі Алесь Гарун «Дык шануй, Беларус, сваю мову — Гэта скарб нам на вечныя годы, За пашану радзімаму слову Ушануюць нас брацця-народы!» Не чую гэтага чатырохрадкоўя сёння хоць зборнік Гаруна перавыдадзены ..

Стральцоў і вырашаў (у самых нетрах таталітарызму) сацыяльны заказ — сапраўдны а не адміністрацыйны У гэтым сэнсе ён быў заангажаваны як і Багдановіч, і Купала, і Колас... Як Быкаў сёння заангажаваны Уся творчасць Алеся Адамовіча — хіба гэта не заангажаванасць? Шчасце лёсу Стральцова ў тым, што ён адэкватна адчуваў і рэалізаваў сваю заангажаванасць. Ён вырашаў сацыяльны заказ эпохі зразуметы не вульгарна-сацыялагічна, а — сутнасна

У гэтым сэнсе своечасовая ці не своечасовая ўвага да Стральцова — не зусім тое пытанне. Аб'ектыўна ён існуе і застаецца нашай сучаснасцю. Ён — наша ПЯКЕЛЬНАЯ БАЛЮЧАЯ СУЧАСНАСЦЬ Варта разгарнуць любы зборнік яго вершаў эсэістыкі каб пераканацца. Міхась Стральцоў — еўрапейскага кшталту пісьменнік. І гэта — ад арыентаванасці на культуру, на творчасць, на літаратуру як ДАР (Багдановічава слова). Дар можа быць, калі мы патрабавальныя да сябе калі на еўрапейскім узроўні працуем і творым, калі не даем сабе паслаблення як Міхась Стральцоў Міхась не даваў сабе паслаблення за рабочым сталом, востра адчуваючы што не ў гісторыі а побач і Купала і Колас, і Багдановіч, і Адамовіч і Быкаў, і Барадулін, і Разанаў і тыя, што яшчэ прыйдуць. Не ў тым справа, у першым ці другім па-

---

«...скруха скорыцца журбе»

У архіве Валянціны Міканораўны Шчадрыной[1] сярод мноства лістоў беларускіх пісьменнікаў захоўваюцца і лісты ад Міхася Стральцова. Тры з іх прапануем вашай увазе. Пісаў іх паэт з мазырскага ЛТП.

Знаходжанне ў гэтай установе прыемным ніяк не назавеш. Паэту патрэбна была дапамога, маральная падтрымка. І шмат хто дапамог яму, у тым ліку і Валянціна Міканораўна. Даведаўшыся, дзе апынуўся аўтар «Загадкі Багдановіча», пазваніла ў Нароўлю свайму старэйшаму брату, папрасіла яго наведаць Стральцова. Вяла таксама перамовы з Іванам Шамякіным наконт датэрміновага вызвалення паэта з ЛТПоўскай зоны. Па просьбе Валянціны Міканораўны Шамякін звязваўся з пракурорам Гомельскай вобласці... Не ўсё проста складвалася ў гэтым, далёкім ад літаратуры, сюжэце — тым не менш, вызваленне было датэрміновым.

Лісты М Стральцова да В М. Шчадрыной маюць відавочную для чытача цікавасць, бо напісаны мастаком, які цудоўна валодаў і эпісталярным жанрам.

Рэдакцыя

каленні ён інтэлігент. Інтэлігентнасць — гэта не толькі адукаванасць, гэта — формула душы, яе вартасць, якасць, здольнасць адчуць БОЛЬ

Адчуванне болю ў Стральцова увесь час было. І можа, ад таго — яго асабістая трагедыя.. Міжволі прыгадваецца лёс Сяргея Ясеніна. Піў Ясенін не ад таго, што быў разбэшчаны як многія сцвярджаюць,— ЯМУ БАЛЕЛА. Каб зразумець асабістую трагедыю Стральцова ёсць адзін толькі шлях: паглыбіцца ў яго паэзію, пагарджаючы любымі плёткам Перш чым вымаўляць папрокі, варта як след падумаць, якія невырашальныя праблемы перад гэтай душой стаялі Наўрад ці акрэслім карані гэтай драмы Але мусім зразумець, як жа было чалавеку цяжка і балюча, што не заўсёды ён быў здольны спраўляцца са сваім душэўным станам

Ю.З. Хацелася б пачуць і пра тое, якім быў Міхась Стральцоў у звычайным, паўсядзённым жыцці, якія ў яго былі манеры зносін з сябрамі і калегам , як ён ставіў сябе ў літаратурным асяроддзі

У.Б. Вельмі няпростае пытанне Яно — прадмет асобнай гаворкі Абмяжуюся найістотнымі (і, на мой погляд, найкаштоўнымі) штрыхамі

Ён быў іранічны Гэта была адмысловая іронія вытанчаная — спецыфічна стральцоўская Але найперш — самаіронія «Ну, як жа мы ж з табою сябры а гавару з табою як класік! .» Гэта была культываваная самаіронія І — нярэдка балючая з разуменнем таго што нічога не пераробіш у пэўнай жыццёвай сітуацыі Адсюль — далікатнасць Адсюль — магутны але прыхаваны БОЛЬ Адсюль — бескампраміснае ўзіранне ў сябе.

Калі чужы артыкул трапляў на рабочы стол Міхася — ці ў «ЛіМе» дзе разам працавалі, ці ў «Нёмане», дзе ён працаваў апошнія месяцы жыцця — аўтар мог быць спакойны, бо ведаў артыкул будзе прачытаны адэкватна, адэкватна зразуметы і вельмі далікатна і асцярожна без страт для аўтарскай думкі, падрыхтаваны да друку Я, напрыклад, ведаў загадзя, калі пісаў па яго замове: Стральцоў усё зразумее дакладна і можна сябе не абмяжоўваць. Бывае, пэўны чыста эмацыянальны «піруэт» замяняе сабой пяць-шэсць абзацаў лагічнага разважання Стральцоў такія моманты заўсёды разумеў, умеў ім радавацца

У нас неяк не замацавалася ў побыце завядзёнка званіць па тэлефоне прачытаўшы кнігу ці артыкул калегі А Стральцоў не стамляўся званіць. (Яшчэ такі быў — Рыгор Бярозкін.) Можна было з ім год не сустракацца, але вось недзе выходзіць твой артыкул, які прыцягнуў яго ўвагу,— і раптам званок. «Гэта Стральцоў Стары я прачытаў маю сказаць. .» Не было слоў пустой пахвалы ці павярхоўнага незадавальнення — было аргументаванае ПЕРАЖЫВАННЕ таго, што табе ўдалося, а што — не.

Можна выводзіць Стральцова і ад Чэхава. Бо прынцыпы яго літаратурнага і чалавечага існавання былі замацаваны на маральных імператывах лёсу і творчасці Чэхава Не ўспрымаць сябе занадта ўсур'ёз. Ён, Стральцоў ніколі не ўспрымаў сябе «занадта ўсур'ёз» (як успрымаюць сябе многія сённяшнія літаратары). Да пісьменніцтва як да генеральства ён не ставіўся, у яго не было той надзьмутасці і пыхі, якой вее ад усякага «псеўда» Ён быў сапраўдны пісьменнік і добра ведаў што гэта накладвае шмат адказнасці І ён тую адказнасць нёс. Балюча нёс — мы слушна кранаем гэты матыў

Ю.З. І смерць яго была пакутнай.

У.Б. Вельмі Гэтая душа не заслужыла такіх пакутаў цела

P S Дыялог адбыўся «знянацку» Перачытаўшы тэкст, хацеў быў нешта дадаць. Аднак гэта стаў бы ўжо не той дыялог Таму — постскрыптум

Было шчаслівае лета калі штораніцы сустракаліся на Камсамольскім возеры не зважаючы на надвор'е, плавалі ў празрыстай яшчэ не парушанай купальшчыкам вадзе Пасля ішлі снедаць і — праз утульныя зялёныя дворыкі Старажоўкі — да плошчы Перамогі на вуліцу Захарава у «ЛіМ»

Бывала, і пад выхадныя ўвечары шлі з работы да яго — на Чарнышэўскага размаўлялі чыталі вершы да раніцы а з ранішнім сонцам — шл да мяне зноў гаварылі чыталі вершы Пра што гаварылі? Пра ўсё тое што эскізна закранута ў гэтым дыялогу (натуральна, у іначшых фармулёўках), пра жыццё, пра ўсё чыста Калі і напішу ўспаміны пра Міхася, дык размовы (напаўзабытыя) выдумляць, як гэта часам робяць мемуарысты канешне ж, не стану Але арыенцір для ўспамінаў, пра што гаварыл і часта, падоўгу знайшоў напрыклад, у яго «Вузельчыку на памяць» пазначаным познімі датамі — 1982 1985 Вось яно: «У Макса Фрыша. Ён — герой — пасля ночы блізкасці з каханай як бы мімаходзь адзначае сабе, «спадзяецца што ў сне не хроп» І далей думае пра нешта падобнае. Вось такая дробязь. А мне падумалася як часта мы абыходзім вось такія дробязі, якім у мастацтве няма цаны Каторы наш аўтар ці проста не звярнуў бы ўвагу на такое (банальна! дробязна!), ці такое, каб напісалася, выкрасліў бы маральна пільны рэдактар. Бо такое часам наша разуменне маральнасці мастацкасці»

Пацверджанне таго што не перабольшваю значэння Багдановіча для Стральцова аказваецца, ёсць у Алеся Адамовіча «І заўсёды з ім — можа як самае раднасае творча бл зкае — Максім Багдановіч Гэта не выпадкова .»

Пра Багдановіча (са Стральцовым) гаварылі шмат Мабыць, асабліва шмат калі даспявала яго «Загадка Багдановіча» З далёкіх часоў помняцца паэтычныя радкі Міхасёвы пра «жыцця зялёныя кругі» якія самкнуцца над галавой калі «перагару я ападу я» (як жа няблізка тады ўсё гэта вымалёўвалася .), пра яго адчуванне, што за ім «тыл з любві пяшчоты дабраты», нарэшце — пра выказанае ў адным з самых кароткіх яго вершаў «Ноч Сон не йдзе. Чую як гарыць цыгарэта кінутая некім на вуліцы — пад ліпу на ссохлы прыпылены дол Нянавісці да сябе праз сцяну не пачую. .»

Недзе ў Хэмінгуэя. «Мир был ясный и четкий лишь слегка затуманенный по краям .»

І ўсё чыста і апошнія сустрэчы (ён так хацеў каб яшчэ ў якой рэдакцыі папрацавалі разам!..) асветлены былі пачуццём тых першых гадоў калі столькі заставалася наперадзе калі свет сапраўды здаваўся незамутнёным «лишь слегка затуманенным по краям» (адліга! гэта пасля адлігі ўжо — розная муць), калі над чыстаю вымытаю даждажом травою, над спакойным люстэркам вады сарваўшыся з пясчанай водмелі чайка стартавала некуды ў блакіт

Сонца Нам шэнціла на сонечныя раніцы і дні і пазней насуперак усялякай муці што затуманьвала абсягі жыцця таксама пазней пазней «Мы, старычок, яшчэ папрацуем .» — чую Міхасёў голас.

Не, Хэмінгуэй не памыляўся «Трудно найти настоящие слова .»

Стральцоў — сонечны

Уважаемая
Татьяна[2] Никаноровна!

Говорить ли о впечатлении, под которым я нахожусь еще и теперь, несколько дней назад простившись с Вашим милым братом[3]? Скажу просто я очень и очень благодарен вам обоим — поистине, прав был кто-то, сказав однажды, что истинные белорусы живут где угодно, но... Простите мне готовую сорваться с языка хулу на «абарыгенаў».

Да, история моя в достаточной мере грустна, но что же делать? Стараюсь не ударяться по сему поводу в мировую скорбь...[4] Конечно, «медлительно влекутся дни мои», но упование и надежда на то,

Што скруха скорыцца
журбе,
Душа ізноў рахманай
стане —

и поддерживает, и даже духом воспарить иной раз понуждает Вот как в нашем с вами теперешнем случае и мне опять хочется сказать спасибо.

Напишите мне несколько слов, буде охота. Я знаю, некоторая одиозность моего теперешнего адреса Вас не смутит — просто не хочу слишком бессовестно посягать на Ваше время. Всё же напишите, а?

Что нового в стольном?

Будьте здоровы и благополучны.

Ваш М. Стральцоў
12.12.81
247760 Мозырь-11, ЛТП-2

Уважаемая
Валентина Никаноровна!

Ваши края, слава богу, милостивы ко мне Вспоминается много хорошего, связанного некогда с Гомельщиной. В свое время, когда в Гомеле жил Гречаников и иже, я довольно часто наезжал сюда. С тех пор, правда, многое переменилось. иных уж нет, иные далече (в разных смыслах) от меня, как и я от них, а новые дружбы после сорока трудны, ленивы, зыбки — даже и для Гомеля. Так уж мы устроены.

Чтобы не соврать, году в 58 был я, университетским студентом, на летних сборах в Мышанке. Там мы однажды с Бородулиным выбрались в самоволку (на танцы куда-то в деревню и на «сельхознапиток»). После танцев тайно заночевали в моей палатке (Бородулин жил в казарме), под утро проснулись от переполоха в моем лагере из-за исчезновения Бор.[одулина] Как-то были наказаны: помню, что очутились оба на кухне и что Бород.[улина] донимали его же стихами о «Настиной кухне» (целинными), а Бор.[одулин], как всегда, остроумно и не без ярой злости огрызался, захлебываясь словами: бу-бу-бу! — а потом, помнится, мы уединялись читать почему-то Фета и размышлять над природой его метафор. Неплохое было время!

Сейчас мне не особенно до стихов, хоть, правда, и пишу что же ещё? — стихи, занимаюсь этим грешным делом, которое, кажется, во мне упорно не одобряет Брыль[5], хоть так являя свою всегдашнюю привередливость. Бог с ним.

Время трудновато для пера, на прозу не разгонишься, но я замыслил (слово-то какое!) некие эссеи[6], заметочки о литер.[атуре], о разных разностях для разгона пера, что ли,— посмотрим, что получится.

Книгу Ваших переводов[7] пришлите — для меня это будет подарком, право. Жаль, что мне пока нечем отдарить. Буду должником, ибо долг этот необременительный и по-своему приятный.

Спасибо за предложение помощи при случае непременно воспользуюсь. Ещё не совсем огляделся.

Пишите. Ваш Михась.
15.01.82

Дорогая
Валентина Никанор.[овна]!

Сегодня у меня, как и везде на всех пространствах любезного отечества, субботник. Ворочал лопатой землицу, даже приятно было,— где-то у склада сломал веточку вербы с «коцікамі», принёс к себе, поулыбался, сел за стол писать Вам, а заодно и сочинить экспромтик, который тщеславно цитирую. Хораша Вы перадалі па-беларуску матчыну гаворку, спадабалася мне, вось і я Вам трохі па-наску·

Святлом ад «коцікаў»
вярбы
Вось гэты мой радок
атулен.
Крамзоліў нешта
Барадулін[8]
Пра іх — ды мне
такой журбы!

Я з ЛТПоўскага двара[9]
Сюды прынёс іх
неўпрыкметку,
Каб заключыць у верша
клетку
Ў надзеі славы і дабра.

І вось надзеяю гарым
Над нашым столікам
прытульным,
Што не падасца
Барадульным[10]
Наш верш — а значыць,
і старым.

Так веселим себя и так утешаемся. А Вы вспоминайте там меня, пожалуйста, при пасхальных куличах, верьте в воскресение души человеческой и в благодать от содеянного добра. Сим победиши, и сим опять же утешимся! Благо Вам!

Да, равнодушие обидно, но злопыхательство... Не есть ли это то же равнодушие, агрессивное только; ведь есть и пассивная доброта, наша славянская чисто,— уже от лени? Как только не защищается человек! Вроде бы и ничего нового в этом нет, сельавишка[11], не более, но вот всякий раз останавливаешься перед всем этим в некоем то ли просветленном, то ли душевном недоумении: «врагов имеет в мире всяк, но от друзей спаси нас, боже», как у Алекс.[андра] Сергеевича. Вон Саша Яскевич, есть у нас такой критик и прилежный ученик Вяч. Зайцева (был у нас такой, может, слыхали?) по части парапсихологии, белой магии, биополя и пр. и проч.— вызвался по собственной инициативе в письме ко мне проповедовать благостность страдания и прелесть его неизречённую, и всё это покликушески глупо как-то, не к месту, что я не утерпел и написал ему что-то отрезвляющее насчёт вериг, которые вполне смотрятся сегодня под модным пиджаком у кандидата наук и проч.— обиделся, видать, и не ответил. Дескать, вот я «самохаць да яго, з добрымі намерамі», а он... Вот Вам и вся цена добродетели нашей! Это уже я говорю. Смешно, конечно, но и нехорошо после от этого как-то на душе.

Ивану Петровичу[12] я написал второе письмо: честно, по-мужски, без плача и воздыханий. Думаю, этого довольно. А «положительный облик» здесь полагается каждому, и посмей его не иметь! Правда, ведь? Улыбнитесь! Я думаю, Иван Петрович всё поймет, и если сделает доброе дело (а это может сделать только он) — зачтётся это и в моих святцах и на небеси. Ценить добро я, кажется, умею, и обязательства, сопутствующие добру в моём случае, в отношении меня,— обязательства с моей стороны осознаю хорошо Словом, Ив.[ана] Петр.[овича] я не подведу — слава богу, давно дед уже и сам «за добродетель страдал и корпел», как говорили встарь.

Как хорошо, что Вы помогли Лёне[13] Нет, аборигенные «браткі-беларусы» просто чудо: я про себя называю их «скігітлівымі парсючкамі, што рохкаючь ля карытка з бацвінкай, скігічуць-скігічуць, а потым каторы, натапырыўшы хібок, і барсане лычам, барсане свайго браткусвінчо і за карак яго ўхопіць — і заенчыць, і заякоча зноў сам. І памкнецца хламкаць першы». Что-то в этом роде.

Впрочем, ну их всех на сухой лес!

Пишите, пожалуйста. А что Лёня? Он почему-то перестал мне писать. А я отвечал, кажется, аккуратно.

Будьте здоровы. Поклон Вашей матушке.

Ваш Михась.
17.04.82

P.S. Письмо уйдет только в понедельник, 19-го. Таков здесь порядок. Поэтому я стараюсь обычно писать в начале недели или в самом конце.

М.С.

Публікацыя
Валянціны ШЧАДРЫНОЙ

---

[1] Перакладчыца на рускую мову твораў У Караткевіча, А. Кудраўца, А. Асіпенкі, Я. Скрыгана і інш. У час ліставання з паэтам працавала кансультантам па беларускай літаратуры ў СП СССР

[2] Памылка паэта. Трэба: Валентина.

[3] Кахненка Віктар Міканоравіч, брат Шчадрыной В.М.

[4] Далей ідуць неразборлівыя тры словы.

[5] Пазней у кнізе «Сёння і памяць» Янка Брыль пісаў: «Сабраныя ў кніжку (зборнік «Яшчэ і заўтра» — *Рэд.*), яны прагучалі для мяне інакш — вершы таленавітага ва ўсім Стральцова... Кніжка Стральцова настроіла на светлы, працавіты лад».

[6] У лісце падкрэслена.

[7] Маецца на ўвазе зборнік аповесцяў Уладзіміра Караткевіча «Седая легенда» (М. «Советский писатель», 1981 Пераклад В. Шчадрыной.).

[8] Паэт цытуе верш «Экспромт». Канчатковая рэдакцыя другога і трэцяга радкоў першай страфы ў кнізе «Мой свеце ясны»:

...Мой роздум над радком атулен.
Пісаў калісьці Барадулін....

[9] Канчатковая рэдакцыя ў той жа кнізе: «Я з камунальнага двара...»

[10] У лісце падкрэслена.

[11] У лісце падкрэслена.

[12] І. П. Шамякін, у той час кіраўнік СП БССР.

[13] Паэт Л.Дранько-Майсюк.

За мяжою звычайнага

Сказаць, што Міхась Стральцоў мой кумір?..

Калі перачытваю «Смаленне вепрука» мо ў які пяцідзесяты раз, не пакідае ўражанне: гэтай рукою тады Творца вадзіў. Рукою Творцы Стральцова вадзіў найвышэйшы Творца. Напэўна, не выпадкова крахатуліна-глыба стала стральцоўскім развітаннем з прозаю. «Дабро і надзея тут накрэсліў свой круг».

Стральцоў для мяне адзін з нямногіх богаабраннікаў у сучасней нашай, як мог бы ён, сцішана ўсміхнуўшыся, сказаць, «изящной словесности».

Дзякуючы Багдановічу і Коласу я пакінуў пісаць на расейскай мове, а Стральцоў быў першы з сучасных суайчыннікаўлітаратараў, хто ўразіў мяне:

«Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім сваё. Ды і што тут было ашчаджаць ці шкадаваць! Яму здавалася, што не можа быць на свеце чалавека, які, уведаўшы, не палюбіў бы яго: ну хаця б за гэтую ягоную прагу спагады і ласкі для сябе і для ўсіх! Толькі часам, у шумлівым разгары ягонай з людзьмі злагады і любові, нечакана задумлівым рабіўся ягоны погляд, і здавалася тады, што цішыня, высокая і асцярожная, вырастала за ім, і адчуванне было такое, нібыта нехта ў яго стаяў за спіной. І час надышоў, і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы, і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай, і нудліва-вінаваты позірк сяброў, і нетрывалую ласку жаночага сэрца».

Мала каго Бог надзяляе гэткім тонкім пяром, гэткай глыбока ўнутранай, прыроднай (не нажытай-паказной-падманнай) інтэлігентнасцю, якую не запэцкаць анічым, бо яна іскрыцца шчодра з скупой-закрытай-адкрытай душы. Тут няма ніякае блытаніны. Гэта быў дужа нестандартны чалавек. Вельмі ўжо НЕПРАНУМАРАНАВАНЫ.

Можна сказаць, была загадка Багдановіча, «Загадка Багдановіча», была і загадка самога Стральцова. І не было аднячасова ніякае загадкі. Быў Талент А ён заўсёды — загадкавы і дзесьці ясны. Ну чаму так назваў Стральцоў сваю кнігу — «Мой свеце ясны»?..

Быў яшчэ Чалавек пад Богам. Быў яшчэ і Д'ябал перад ім. Чорны чалавек. Пра якога сам Стральцоў пісаў. Без змагання Бога з Д'яблам не бывае і самага прымітыўнага жыцця. А тут вунь якое яно: «Адзін лапаць, адзін чунь» — і жыццёвая мітрэнга. Зрэшты, мітрэнга гэтая і адбілася жыватворна ў лепшых стральцоўскіх творах Творы сталі гожым люстэркам ягоных, дарыўце, пакутаў, памкненняў «мятущейся души». Без мітрэнгі, што перакінулася ў высокае душэўнае напружанне, не было б і люстэрка. Люстэрка, у якое так прагна-балюча, шчымліва-соладка хочацца зазірнуць.

Нельга ні аб чым шкадаваць. Ён ёсць — ёсць такі — у адваротным выпадку яго зусім магло б не быць.

Цяпер багата хто, распавядаючы пра яго, не разумеючы зусім ладу жыцця, на ягонае падобнага, і ладу душы пры такім жыцці, піша, дзе трэба і дзе не трэба, пра ягоную слабасць, вульгарна спрошчваючы ўсё да прымітыўнае фізіялагізацыі. Спачувальна, а то і прыхавана-паблажліва разважае — ураўнаважаны і добраўладкаваны. Нібыта па-сяброўску (і ці ж па праву?), а на самой справе выступае ментарам. Эфемерная годнасць, розум-міраж. Як той, хто ніколі не бачыў мора, можа разважаць пра яго? «Вам не дано понять, что вдруг со мною стало...»

Не бывае так, на жаль. каб не пакутуючы ў жыцці пакутаваў мастак У ВЫНІКАХ ТВОРЧАСЦІ сваёй. Можа, і бывае, але тады гэта падман, які раскрываецца непазбежна і хутка Стральцоўскай душы было што распавесці, ды толькі распавядаць мала калі было — і зусім тут не слабасць прычынаю, а сіла душэўных хістанняў, чысціня сумлення. «А ці ж можна пісаць, калі нічога не чуеш?» — сказаў ён аднойчы ціха. О, каб яшчэ колькі людзей у нашай літаратуры так чулі!..

Мы сустракаліся з ім мала. Ён па-дзіцячы цёпла расказваў пра любімага майго Юрыя Казакова, які «паліць цяпер грубку недзе на лецішчы ў сваім Падмаскоўі». (Параўнайце: «Смаленне...» і «Во сне я горько плакал...» Не бачу раднейшых душ у нашай і расейскай літаратурах.) Прасіў называць яго панам Міхалам. З якім выразным позіркам пацісную мне руку, калі я ішоў з літарацкай трыбуны, абараніўшы «зашытага» Лёню Галубовіча ад нападак ноздары, што вялізнай сваёй заслугаю называў сваю месячную прысутнасць у Нью-Ёрку, на асамблеі ААН. (Дарэчы, цікавая драбніца Стральцоў, здаецца, за мяжою і не бываў ніколі. Хіба што за мяжою звычайнага.) Нарэшце, расказвалі мне, у рэанімацыі, трызнячы, шкадаваў, што ён не дапісаў разам са мною п'есы. Ён, які казаў мне колісь, што не ягоны гэта жанр...

Як холадна казытнула мне сэрца паведамленне пра страшную гэтую праяву нашае блізкасці!..

Цяпер, як згадаю яго, часта прыходзіць на памяць ягоны эпіграф з малавядомага нам і любімага ім выдатнага паэта Случэўскага: «И капля вод полна страданий и неизбежностей полна...»

І ўсё ж...

«Дабро і надзея тут накрэсліў свой круг».

Алесь АСТАШОНАК

Міша, Міша...

Вайсковыя могілкі, што на вуліцы Казлова (для мяне — на Даўгабродскай, бо ў даваенным дзяцінстве маім Даўгабродская пачыналася не там, дзе цяпер, а з таго вугла, дзе стаіць сёння Палац мастацтваў), дык вось, Вайсковыя могілкі гэтыя — мой вечны боль. Там быў пахаваны мой дзед, мамін бацька, Іван Панцялеймаў, і дзядзька мой, таксама Іван,— трапіў пад трамвай у ліпені 1938-га года, у семнаццацігадовым узросце Там была пахавана і мама — у жорстка марозным студзені 1940-га, падчас «фінскай вайны», калі павымярзалі ўсе сады. Каб выкапаць маме магілу, доўга палілі касцёр, адагравалі зямлю хоць трохі, бо і лом яе не браў у тым студзені...

Помнікаў усім траім паставіць не паспелі — над дзедам і над дзядзькам стаялі драўляныя каталіцкія крыжы, а над мамай — слупок з бляшанай таблічкай: ГАЛІНА ІВАНАЎНА ТАРАС 1913—1940.

Магілы тыя згубіліся. Я не знайшоў іх у сорак чацвёртым, калі вярнуўся з партызан. Крыжы зніклі, слупок таксама, усё вакол парасло быллём і папараццю, і варонка ад бомбы чарнела на тым месце, дзе былі магілы. Ва ўсякім разе, мне здавалася, што менавіта на тым. Дакладна паказаць месца магла б бабуля, але і яе я не знайшоў, вярнуўшыся з лесу, — яна была далёка, у Германіі, куды яе вывезлі немцы разам з маёй сястрычкай Таечкай і цёткай Люсяй, пра што я тады не ведаў А потым яны апынуліся ў Польшчы, адкуль паходзілі бацькі бабулі,— яе, сястрычку, і цётку я адшукаў у Познані толькі праз шаснаццаць год пасля вайны. Але і цётка, калі наведала Менск (бабуля была ўжо зусім старэнькая, нямоглая, так і памёрла, не ўбачыўшы родны горад), магілы тыя не знайшла... Вось ужо і паўстагоддзя прайшло з тых дзён, як згубіліся яны, а боль па іх не адпускае, і час ад часу, калі бывае асабліва сумна і горка, я іду на Вайсковыя могілкі, на тое прыкладна месца, дзе былі, як мне здаецца, родныя магілы, і моўчкі размаўляю з мамай, з дзедам і з дзядзькам...

Аднойчы я пабываў там разам з Мішам Стральцовым.

Не памятаю дакладна, калі гэта было — недзе ў 1978-м ці 1979-м годзе. Помню толькі, што было лета і што якраз у той дзень было мне асабліва горка і сумна.

Сустрэліся з Мішам на праспекце, тады — Ленінскім, перад скрыжаваннем яго з Даўгабродскай і Варвашэні Міша ўзрадаваўся сустрэчы, сказаў· «Нешта ты нейкі дужа сумны, старычок! Здарылася што? Ці проста кошкі на душы шкрабуць? Мо прагонім нягодніц? У мяне ёсць чым!..» І паказаў на сваю кішэню — там была пляшка гарэлкі.

Я і сам думаў пра тое ж: каб неяк «прагнаць кошак», але спачатку трэба было завітаць на могілкі, і я хацеў сказаць яму, што іду на могілкі, што, калі ён згодны, пойдзем разам, а потым можна будзе падумаць наконт «кошак», але ён апярэдзіў мяне. І здзівіў тым, што нібы прачытаў мае думкі, і сам прапанаваў пайсці на могілкі: «Давай, старычок, пойдзем на Вайсковыя, да Паўлюка! Там у мяне ёсць усё, што трэба і кілішкі, і відэльцы, і адкрывачка Пайшлі?» Я падумаў, што Паўлюк — гэта, напэўна, нехта з абслугі могілак, мо вартаўнік ці які адміністратар, у якога Міша трымае «ўсё, што трэба». Спытаў· «А што за Паўлюк?» «Там убачыш,— усміхнуўся ён.— Не бойся, ён свой хлопец!..»

І мы пайшлі. Купілі батон, кілбасы, бляшанку кансерваў «Сайра», бутэльку мінеральнай вады...

На могілках я сказаў яму, што спачатку пойдзем «на маё месца», да Паўлюка потым, і пачаў расказваць пра гэтае «сваё месца» пры тыя страчаныя ў сорак чацвёртым магілы, пра маму сваю, як і ад чаго яна памёрла ў студзені саракавога, як палілі касцёр, каб даць рады чыгуннай ад марозу зямлі, пра няшчаснага свайго дзядзьку Івана, пра дзеда, якога амаль не помню — памятаю толькі пах тытуню і люльку ягоную ў выглядзе галавы Медузы-Гаргоны, блакітныя вочы і залацістыя вусы, іх мяккі, нібы шаўковы, дотык, калі ён мяне казытаў імі. І зноў пра маму, якую смерць прыбрала гэтак рана — на дваццаць сёмым годзе жыцця...

Расказваючы, азірнуўся на Мішу. І ўбачыў, што ён плача, што вочы ў яго поўныя слёз. І толькі тут у мяне ў самога выступілі слёзы і горла перасмыкнула плачам. А Міша заплакаў амаль рыдам.

Вядома, нехта скажа, што гэта гарэлка плакала, а не Міша. Што ж, гэта праўда. Але і няпраўда таксама. Злосная няпраўда. Бо піў ён (а піў часам страшэнна, тут няма чаго наводзіць на яго «хрэстаматыйны глянец») праз неабароненасць сваёй душы, праз яе дзіцячую, ці, хутчэй, нейкую дзявочую чуллівасць. Нездарма ён і быў падобны на дзяўчыну, нясмелую, далікатную, сарамлівую, і чырванеў як дзяўчына — лёгкім пяшчотным румянцам, апускаючы вочы з даўгімі вейкамі. І хіба не жаноцкасць яго характару, яго натуры абумовіла і тонкасць яго прозы, пранізлівую пяшчотнасць яго паэзіі? І разам з тым ён быў чалавекам мужным, нават зацятым у сваёй мужнасці, калі бараніў тое, у што верыў, у чым быў перакананы. Але бараніў не дрынам, не кулаком, а шпагай — зброяй шляхетнай і рамантычнай, зброяй кавалераў Прыгожай Дамы. Ды тут — у гэтым маім успаміне аб ім — кажу пра гэта між іншым... А тады мяне проста ўразілі і расчулілі яго слёзы, і не аналізаваў я, чаму ён плача, і не думаў, што гэта плача гарэлка, якая, дарэчы, для каго проста згубная прывычка, а для каго — лёс...

Пастаялі, памаўчалі... Міша ўздыхнуў: «Спачуваю табе, старычок. Пойдзем да Паўлюка, памянём тваіх». І ён павёў мяне да Паўлюка, але не ў старожку, як я думаў, а некуды ў глыб могілак, туды, дзе былі самыя старыя магілы, яшчэ дваццатых, пачатку трыццатых гадоў. І падышлі мы да непрыкметнай магілкі ў гушчары кустоў, пад густымі зялёнымі шатамі дрэў, і там на сціплым, заімшэлым помнічку прачытаў я імя нябожчыка: ПАЎЛЮК ТРУС.

«Ну, здароў, Паўлюк,— натуральна, нібы з жывым чалавекам, паздароўкаўся Міша. – Бачыш, нядоўга ты мяне чакаў Сёння я не адзін, сябра са мною, Валя Тарас. Свой хлопец, Паўлючок, свой хлопец!.. Трэба нам тут разам з табою пагаманіць...»

Недзе каля самага помніка, у густой высокай траве, была ў Мішы схованка. Ён пакорпаўся тамака, дастаў гранёныя кілішкі, цэлафанавы мяшэчак, у якім былі відэльцы, адкрывачка, соль, нават папяровыя сурвэткі. Дастаў з кішэні і паставіў на траву бутэльку «Сталічнай». Усё гэта ўпарадкоўваючы, ціха прамовіў нібы сабе самому· «У школе вывучаюць, дысертацыі пра «Дзесяты падмурак» пішуць, а на магілу нікто ніколі не прыходзіць. У Саюзе пісьменнікаў начальнікі нашы, відаць, і не ведаюць, дзе Паўлюкова магілка... Ну, сядай, старычок!.. Наразай батон, кілбаску...»

Мы доўга сядзелі каля той Паўлюковай магілы, выпівалі няспешна і гаманілі, гаманілі, гаманілі. Аб усім на свеце!.. Мне было лёгка з ім і проста, хоць і зусім розныя мы людзі, і ва ўзросце розніца паміж намі была даволі значная: ён быў роўна на сем гадоў маладзейшы за мяне. Але ўсё ж нарадзіліся мы пад адным знакам — пад Вадалівам. Я — 9-га лютага, ён — у дзень святога Валянціна, 14-га, на мае імяніны. Таму, нягледзечы на ўсю розніцу характараў і жыццёвага вопыту, было ў нас і нешта агульнае, блізкае і аднаму і другому Мо таму і ўдалося мне хораша (ён сам казаў, што хораша) перакласці на рускую мову радкоў трыста ягоных вершаў. На старонках «Нёмана» ён яшчэ ўбачыў іх, а ў асобнай — маскоўскай — кніжцы не ўбачыў, яна выйшла пасля яго смерці.

Але самае значнае, што я зрабіў для яго, — гэта пераклад выдатнейшага яго апавядання «Смаленне вепрука» (у перакладзе — «Смаление вепря»), якое было надрукавана ў часопісе «Дружба народов», а потым уваходзіла ва ўсе анталогіі лепшых беларускіх апавяданняў у перакладзе на рускую мову, у анталогіі лепшага савецкага апавядання. Перачытваючы «Смаленне...» сёння, бачу, што ў ім — увесь Міша, з усёй яго трапяткой, пяшчотнай, чыстай душою, з яго танчэйшым, пранізлівым адчуваннем жыцця — светлага і трагічнага адначасова. І калі перачытваю, успамінаецца мне той летні, ці то ліпеньскі, ці то жнівеньскі дзень, як сядзелі мы каля магілы Паўлюка Труса, як хораша, хоць і сумна нам было за той горкай, але і салодкай чаркаю памінання І ўспамінаецца другі Міша, якога вылечылі ад гарэлкі. І той самы, здавалася б, чалавек, і — не той Адбылася ўсё ж нейкая падмена асобы, нешта штучнае, ненатуральнае з'явілася ў ім. І думаецца, што не трэба чалавека — дарослага — лячыць ад яго самога, не трэба яго перавыхоўваць, калі лёс ужо акрэслены, вызначаны Богам, наканаваны нябёсамі. Хай чалавек застаецца такі, які ёсць, быў бы ён — ЧАЛАВЕК, а ўсё астатняе можна і трэба сцярпець. Хоць гэта і цяжка...

З таго дня Вайсковыя могілкі для мяне — не толькі апошні прытулак мамы маёй, дзеда Івана і дзядзькі Івана, не толькі боль па страчаных іхніх магілах, але і месца, дзе засталася часцінка Мішавай душы. І разам з уздыхам па маме, па дзеду і дзядзьку нараджаецца, цісне грудзі і ўздых успаміну пра сябра: Міша, Міша...

Валянцін ТАРАС

Яснае святло з суседняй вуліцы

З Міхасём Стральцовым мы не былі асабліва блізкія, але мелі ўзаемную, як хочацца думаць дасюль, прыязнасць адзін да аднаго. Ён звяртаўся да мяне па імені, я таксама. Не адступлюся ад гэтага і цяпер...

Разрыў з сям'ёй Міша перажываў страшэнна Па ўсходнеславянскім звычаі піў Герцэн некалі пісаў, што піць з гора не такая ўжо дрэнная звычка, як аб ёй думаюць. Але віно не памагала, і такая тонкая душэўная арганізацыя, як у Мішы, адгукнулася, відаць, на непазбыўнае гора смяротнай хваробай. Ён быццам адчуваў гэта. У застойна-нерухомыя 70-я пасля работы ў «малым Доме друку» мы ішлі ў магазінчык на супрацьлеглым баку плошчы Перамогі. Там разлівалі таннае віно. Міша хутка п'янеў і, калі

выходзілі пакурыць, штосьці прагаворваў для сябе і час ад часу, адлучана гледзячы не на субяседніка, а кудысьці ўдалечыню, паўтараў, зноў-такі для сябе аднаго: «Скоро стану добычею тленья. Тяжело умирать, хорошо умереть...» Някрасаў напісаў гэта за тры гады да смерці. Таксама адчуваў? Ці апраўдваецца сказанае камусьці з паэтаў Барысам Пастарнакам: не прарочце ўласную смерць — збываецца?..

Часта праходзячы па вуліцы Прытыцкага, гляджу на акно вуглавой кватэры на 8-м паверсе. Бываў там, калі ў ёй жыў Вячаслаў Адамчык. Аднойчы туды прыйшоў Міша з першай жонкай, было добрае застолле. Потым хадзіў ужо да Мішы з перакладамі для кнігі «Свет мой ясный» Перакладаў доўга і цяжка, таму што я, з дазволу сказаць, паэт графічны, а Міша — акварэльны Акварэль — прадмет маёй зайздрасці: думаеш пра пяшчотны каляровы мазок, а выходзіць чорная «сацыялагічная» лінія. Як сапраўдны лірык, Міша жыў самадастатковым жыццём пачуцця і думкі, за якімі, аднак, ненавязлівая сацыяльнасць адчуваецца, можа быць, нават глыбей і вастрэй, чым у іншых адкрыта палітычных вершах Міша стрымана хваліў пераклады і з усёй яго далікатнасцю змоўчваў пра графічнае ажыццяўленне ягоных акварэляў Зрэшты, яго паэтычная палітра многае ўбірала і ад яго «зоркай» прозы, была ў ёй таксама яснасць выяўлення цяжкавымоўнага.

Мгновения мучительного счастья,
Что выпадают на твоем веку,
Ни целиком, ни даже малой частью
Не заключить и в лучшую строку.
Любое слово станет оскорбленьем
Для золотого чувства твоего,—
Тогда живет оно самодовленьем,
Тогда в нем только жизнь как волшебство.

Такіх імгненняў у кнізе «Свет мой ясный» шмат, яны апраўдваюць слова «свет» у яе назве, і хай не будзе банальнасцю сказаць, што сам ён быў СВЕТЛЫМ чалавекам, і чорныя гады яго жыцця толькі адцянілі гэта. За ўвесь нямалы час няблізкага, але і не шапачнага знаёмства я не пачуў ад яго ніводнага дрэннага, брыдкага, агіднага, ці проста злога слова ні ў чый адрас. Не магу ўявіць яго пагардлівым, грубым, хітрым, двурушным. Канечне, у кожнага чалавека свае ўяўленні аб добрых людзях, але я перакананы, што ў стаўленні да Міхася Стральцова такія ўяўленні ў тых, хто ведаў яго, супадуць. Увесь сакрэт мастацтва, гаварыў Л.М.Талстой,— У ДУШЫ мастака...

Апошняя, як аказалася, наша сустрэча адбылася на праспекце Машэрава. Выйшлі з выдавецтва «Мастацкая літаратура», чакалі 39-ы тралейбус, нам было па дарозе. Гарбачоўская перабудова танула ў словаблуддзі, Міша быў хмурны, як заўсёды ў апошні час, адлучаны, паглыблены ў сябе (ведаў ужо?), негаваркі і толькі сказаў з прыкрасцю не зусім яму ўласцівае «Ничего... чем хуже — тем лучше!..» — па-руску Я зразумеў яго: горш за супакойлівую хлусню, якая працягвалася, ужо нічога не можа быць. І згадзіўся з ім: хай раскрыецца УСЯ глыбіня бездані, да якой мы коцімся!..

Усміхнуўся, кіўнуў галавой ад пярэдніх дзвярэй і сышоў на вуліцы Прытыцкага...

Для мяне Міхась Стральцоў — адзін з тых, чыё фізічнае і духоўнае аблічча ўспамінаецца разам са шчымлівым вершам В.Жукоўскага: «О милых спутниках, которые наш свет Своим сопутствием для нас животворили, Не говори с тоской: их нет, Но с благодарностью: были». Прыгожы быў чалавек, і мая памяць аб ім светлая.

Фёдар ЯФІМАЎ

Конь гуляў па волі

У музычным свеце, у музыказнаўстве маецца паняцце абсалютны слых. Паняцце гэтае льга прымяніць і да літаратуры, хутчэй за ўсё да вылучнага пісьменніка, хіба што з невялічкім удакладненнем — абсалютны слых і абсалютнае адчуванне слова, ягоных магчымасцяў, ягонай незаменнасці і дакладнасці ўжывання. Гэта, відаць, болей, чымся ў музыцы, у літаратуры талент надзвычай рэдкі.

Вырай беларускіх паэтаў і празаікаў пачатку 60-х гадоў шчаслівы быў тым, што ў ім з першага прылёту быў Міхась Стральцоў, які меў прыроджаны абсалютны літаратурны густ Сказаць пра яго — талент, будзе правільна, асоба — таксама Але, бадай, слова з'ява трохі акрэсліць маштабы Міхася Стральцова У свой час сярод іншых сяброўскіх эпіграмаў пісаў я сваймy сапраўды сябру і такую:

За Гамера спрачалася сем гарадоў.
Тры секцыі —
За Міхася Стральцова:
Празаік Стральцоў,
Лірык Стральцоў,
Крытык Стральцоў?
За вечнасцю слова!

Вечнасць скажа сваё слова пра ўсіх. Але на тое яна і вечнасць, што не звыкла спяшацца, бо часу, калі можна так сказаць, у яе нямерана, няважана, нялічана. Міхась Стральцоў ведаў пра характар вечнасці, таму і не мітусіўся, не мітаўся, як адначаснікі ягоныя, каб хоць у імгненні затрымацца, каб палюбавацца на сябе ў люстэрку бяглівых дзён. Ён проста працаваў і думаў, шмат думаў. Не адна змена ў беларускай літаратуры вырасла пад апекаю ягоных слованастаўленняў, пад апекаю ягонай падтрымкі і ўвагі, пад апекаю ягонае творчасці.

Міхась Стральцоў даў інтэлектуальны пачатак сучаснай яму прозе, пачуццёвую глыбіню эсэістыцы, шырыню і гарызонтнасць крытыцы, акварэльнасць і адухоўленасць паэзіі ад класічнага радка да верлібра. Да Стральцоўскіх ацэнак прыслухоўваліся ад самакаранаваных убурэлых класікаў да самых утрапёных нізрынальнікаў усяго ў прозе і ў паэзіі. Дзе б ні працаваў Міхась Стральцоў, да яго хвасцілася чарга, як пасля вайны на млын. Так было ў рэдакцыях «Маладосці», «Літаратуры і мастацтва», «Полымя», «Нёмана». Які б аддзел ні ўзначальваў Міхась, у ім засяроджваліся ўсе аддзелы — і прозы, і паэзіі, і крытыкі, і публіцыстыкі.

Міхася, крытыка і даследчыка, бядзіла загадка Максіма Багдановіча Думаю, што нашых літаратуразнаўцаў мусіць зацікавіць загадка Міхася Стральцова. Адкуль гэтакія веды, гэтакая азарлівасць, гэтакая нястомнасць? Асабліва нястомнасць. Бо фармальна спадчына Міхася Стральцова не дужа ўжо і шматтомная (помніцца, як прыжмурыста ўсміхаўся патрабавальны да сябе майстра з аднагодка, што налічыў сваёй прадукцыі на збор твораў у шасці тамах), яна пераважыць тысячу і адну ноч адначаснікаў-эпапеістаў А варта ўлічыць толькі адну акалічнасць — колькі раманаў, аповесцяў, кніг крытыкі і саветызаваных нарысаў ён перапісаў Якраз перапісаў, пра праўкі, заўвагі, пра перапісаныя падборкі вершаў і не кажу Стральцова расцягвалі, разбіралі, як той Акропаль турысты, сябры, знаёмыя, проста выпадкоўцы, каму хацелася быць сваім чалавекам у літпрацэсе. Праўда, адзіныя, хто, пэўна, даваў знаўцу ўсяго вытанчанага і ўзнёслага сілу і натхненне, былі да́мы як з адвечным, так і з літаратурным клопатам. Цяпер, калі не стала Міхася ці Мішы (як каму пяшчотней было называць), некаторыя калегі, каб хоць як узвысіцца ў сваіх жа вачах, пачынаюць крычаць пра сваё ледзь не меценацтва, падкрэсліваць любоў Стральцова і да чаркі. Гэтак жа плявузгалі і пра Караткевіча. У так званыя застойныя часіны ў застолле ішлі, як у партызаны, уцякалі ад хлусні, ад маны, ад абавязку славіць догмы, уцякалі, душу ратуючы. Было, што Стральцоў браў і лішнюю чарку, але ж ён не дапіўся да пасады рэдактара часопіса, сакратара Саюза пісьменнікаў, да члена ЦК КПБ не выслужыў сабе тытулаў Кіраўнікі Саюза пісьменнікаў, сакратары пісьменніцкай партарганізацыі абавязкова са згоды ЦК складалі спісы на выбраныя шматтомнікі і аднатомнікі, спісы часткова прывязаныя да юбілеяў творцаў Усім было адшчодрана па два і болей тамоў, акрамя Міхася Стральцова да ягонага пяцідзесяцігоддзя. Фармальна ўсё зацвярджалася ў Маскве, вядома, з падачы рэспублік. Не ў заслугу сабе стаўлю, але не забыўся, як давялося ехаць у СП СССР да Юрыя Верчанкі хадайнічаць за сябра. Добры па натуры чалавек, майстра кабінетна-апаратных гульняў Верчанка званіў у Камітэт па друку свайму сябру, прасіў, каб дадаткова ўключылі ў план аднатомнік Міхася Стральцова. Пачынаў з уступу, з успаміну, як ён, Верчанка, разам адпачываў з камітэцкім чыноўнікам на поўдні. Пад дазвол Стральцову ў нашым камітэце па друку старшыня дадаў другі том Гаўрылкіну Па-зямляцку. Толькі карэктуру паспеў вычытаць Міхась свайго першага аднатомніка.

Засяроджаную роздумнасць характару Стральцова ведалі ўсе. Падчас і выкарыстоўвалі немітуслівасць і нетаропкасць задуменца ягоныя ж сябры. Ляжаў у Бараўлянах. У Маскве, здаецца, літаратурныя шанавальніцы стральцоўскага таленту парупіліся падтрымаць — прапанавалі выдаць кнігу прозы і эсэістыкі. Сябры прыходзілі наведваць. Падзяліўся Міхась прыемнай весткай. І кінуліся сябры навыперадкі заняць гэтую пазіцыю ў маскоўскім выдавецкім плане, як на вайне. Перамог спрытнейшы і рухавісцейшы, бо хутка зрабіў расклейку А Стральцоў да апошняга працаваў думкаю, багацеў душою цікавіўся філасофскімі развагамі Розанава, перачытваў новае, паслязабароннае выданне «Столбцов» Мікалая Забалоцкага. Яму дачка прынесла паасобнік, папрасіў, каб і мне купіла, падарыў праз колькі дзён.

Сябры праяўляліся і пры апошнім развітанні. Можа, зашмат кажу пра сяброў Але ж Міхась, думаю, і жыў сябрамі, і жыў для сяброў Хвароба, як і смерць, былі раптоўныя. Жонка Алена Змітраўна з дачушкай Алесяй, пястункай Міхасёвай, засталіся без капейкі. І калі пачаў я збіраць нейкія грошы, адчуў цану сяброў нябожчыка. Пра актыўнага ўспаміншчыка не хачу казаць, а вось крытык і аж празаік, які сядзеў на шыі Стральцова ды прасіў уладзіць ягоныя «нетленки» абавязкова ў маскоўскіх выданнях, артыстычна-нарцысіста сказаў, што пры сабе мае нейкіх паўтара рубля. Прапанову прынесці грошы заўтра не пачуў Адгукнуліся на гора Быкаў, Брыль, Адамовіч і на радасць (хоць на магільніку слова гэтае гучыць не зусім натуральна) шмат сяброў і проста знаёмых. Гэта да ўпамянёнага вышэй

аднатомніка Алесь Адамовіч уночы пісаў прадмову, а раніцай ляцеў у Амерыку са сваім фільмам «Ідзі і глядзі». Пахаваны Міхась Стральцоў на Чыжоўскіх могілках, там жа, дзе ляжыць дужа малады сябра нашых маладых гадоў Сымон Блатун. І ніколі не бачыў я такіх выплаканых, да паветра, вачэй, як у жонкі Міхася Алены. І зноў непрыемна чытаць некаторыя ўспаміны, дзе кідаюцца камяні ў яе. Калі ўжо замінае чалавек, дык і жонка ягоная не такая. Народжаныя ў балоце без бузы не могуць.

Пішу пра сумнае, нават пра недарэчна брыдкае, а пад руку штурхаюць успаміны пра вясёлыя гады, пра сумесныя падарожжы, вандроўкі. Ездзілі ў Маскву на ўсесаюзную нараду маладых, на Гомельшчыну, з рэдакцыяй «Маладосці» ў шмат якія раёны Беларусі. Была і апошняя нашая паездка ў веснавую, яшчэ з плямкамі снегу, Вушачу.

А першае нашае падарожжа было ў 1957 годзе. Пра яго нагадаў мне Міхась у лісце з Палесся ад 15 лютага 1982 года, дзе ў прыватнасці пісаў: «Чулае слова ад цябе было мне асабліва дарагім, бо нібы другі раз пасля мышанскай эпапеі (памятаеш тое лета вайсковых збораў на Мозыршчыне?) злучыла нас — праз добрае слова і шчырае сяброўскае пачуццё — і вось я прыгадваю і патаемны наш начны паход у паляшуцкую вёску, і начоўку ў палатцы, і начную ці перадранішнюю трывогу з выпадку гэтага, і тваё дзяжурства на «Насцінай кухні», і тое, як чыталі мы з табою Фета, абмяркоўваючы прыроду ягонага вобраза, і, і... як падумаеш, чаго толькі не пракацілася на «палянах» нашых вачэй...» Трывога тады была сапраўды вялікая, бо я вырашыў пераначаваць у палатцы, дзе халадней і паветра досыць, а не ў душнай двух'яруснай казарме, таго не ведаючы, што гэта ледзь не ўцёкі.

У Стральцова быў своеасаблівы, чыста беларускі, магілёўскі нават гумар, пераплецены з лірычнасцю, як суровая нітка з ваўнянаю. На дне вачэй ягоных сонечна пераліваліся хітрынкі, прабіваючыся праз смугу смутку і душэўнага клопату У тым жа лісце напрыканцы далікатна годная просьба, сяброўская просьба з лёгкім пакепліваннем з мяне і з сябе: «Да цябе просьба: памажы да ладу маю кніжку ў вас і можа возьмешся, калі захочаш, яе рэдагаваць. Там трэба дадаць друкаваных вершаў (у мяне нічога няма пад рукой): з «ЛіМа», здаецца, можна, можна з апошняй «палымянскай» падборкі. з вершаў, якія я пераслаў на перадрук Але Іванаўне. Дома ў мяне недзе ёсць недрукаваныя вершы, але дзе цяпер яны — эх, лепш не гаварыць. Але зразумей: я хачу, каб быў, аж і на мой ніякі-сякі ўзровень, больш-менш прыстойны зборнічак — тут ужо табе, як рэдактару, поўная воля, бо густу твайму я давяраю цалкам. Кажу гэта таму, што мы з табой часта і яшчэ гаварылі пра вершы і адзін другога разумелі. Выбірай на чатыры аркушы (не, 4,4 — для саліднасці): я не Цютчаў, а ты не празаік, як Тургенеў, хоць і ён забаўляўся ў маладосці вершыкамі — можа я і не акалечуся. Праўда Памажы...» Зборнік Міхася Стральцова «Яшчэ і заўтра» выйшаў у «Бібліятэцы беларускай паэзіі».

Калі Міхась вярнуўся з Палесся, задумаў напісаць новую рэч. У часопісах анансавалася: «Конь гуляў па волі». Радок з вясёлай бяседнай песні. Бо Міхась Стральцоў любіў волю, не цярпеў ні хамута, ні цугляў, якімі яго хацеў ацішыць рэжым. У працу ўваходзіў цяжка. Ненавязліва стараўся я ўцягнуць сябра ў рабочы стан, просячы перакладаў што цікавага было ў «Братэрства». Пішу, што расцягвалі, расхоплівалі час Стральцова, а сам першы з тых злодзеяў. Колькі я натлуміў яму галаву сваімі вершамі, перакладамі, артыкуламі, просьбамі прадмоваў да іншых і да сябе таксама. Наіўна лічыў, што абуджаю смак да пісання, ды цяпер здаецца, што, можа, усё наадварот выходзіла. Дый адчуваў Міхась сваё расстанне. Ездзіў дадому выбіраць бульбу, а хутчэй за ўсё, паспець развітацца з бацькам. Перад самым днём свайго пяцідзесяцігоддзя (нарадзіўся Міхась Стральцоў на Грамніцы — 14 лютага 1937 года) паехалі з тэлебачаннем у роднае гняздо. Па выгаленым лесе ехалі, як па Марсе. І лютаўскі Сычын сустрэў Міхася неяк маўкліва. Каля хаты радні адламаў сталічны госць галоднаму сабаку кавалак хлеба, кавалачак каўбасы, напханай невядома чым, але таўстой. Гэта з сабой прывёз зямляк закусь і колькі пляшак куплёнай. Пры слабым святле сельскай электралучыны вячэралі. Была маці, сястра, дачушка Алеся — прыехала з бацькам.

Нетутэйшы быў позірк у Міхася ў бацькавай хаце, расхрыстанай, расцягнутай, яшчэ з цэлымі шыбамі. Не нахінуўся, не ўзяў ніякой драбязінкі. Ведаў, што ўжо ніколі не адчыніць гэтыя дзверы, у якіх ужо няма замка, не сядзе за стол, што рабрыўся крыгаю ў крыгаходзе агульнага бязладдзя, безгаспадарчасці. І маўклівы выйшаў з бацькоўскай хаты. Рыжая шапка. Да каўняра караткаватай паддзёўкі прышыта таксама рыжая шкура аўчыны, каб зімовай апранаха здавалася. На галаве і на плячах агонь нябыту загараўся, каб спаліць. І прысак снегу засыпаў усё, што было...

Апошняя сустрэча з Міхасём Лявонавічам была самай кароткай. У Бараўлянах. Цяжка было гаварыць яму, стамляўся, дагасаў Але, самому сабе хлусячы, казаў, што з'ездзім яшчэ ў Вушачу, у Каралішчавічы, і адразу ж паправіўся — у «Іслач»... А мне і дагэтуль у натоўпе ўзнікае сябра Забудуся Узрушуся Прыгледжуся — нечым падобны. Няйначай Тварэц Усявышні ўпадабаў такі вобраз, як самы дасканалы.

І раптам хлопец малады
З аблічам Міхася Стральцова
Расчырванелы ад хады
Узнікне,
Быццам выпадкова.

І пацяплеюць халады.
Замлеюць каташкі марцова.
Дамы́ заселяць гарады,
Як да́мы Міхася Стральцова.

Праступяць праз траву сляды.
Ад снегу абтрасецца слова.
Пайду да Міхася Стральцова
На шклянку думкі
Як тады...

Рыгор БАРАДУЛІН

Астатняе - у маўчанні

...Ты вось кажаш: Стральцоў... Так, і Стральцоў таксама. Згодзен.

Але якая ж усё-такі жорсткая рэч — час! Як бесцырымонна аддаляе ён тое, што яшчэ ўчора было тваім!..

Так у мяне цяпер і з кнігамі Стральцова.

Як табе растлумачыць? У адной п'есе кажуць: «І гэта таксама пройдзе». Ну вось, прайшло, відаць, і гэта для мяне. І крытыка ягоная, і вершы... І апавяданні. Праўда, за выключэннем «Вепрука», амаль усяго. І некаторых стылістычных ходаў у «Лапці». (Напрыклад, галасы застолля, чутныя малому пасля глытка гарэлкі; або маналог дзеда Міхалкі).

Астатняе ж... Так, сапраўды, *прайшло* — ну што ты зробіш? І сённяшнія кнігі Быкава, Брыля,— здавалася, бясспрэчных антыподаў Ловіш сябе на адчуванні, што... Ну, словам, болей не расцеш на гэтым, разумееш?

Яно, канешне, і дагэтуль свеціць мне. Але ўжо не грэе. Восеньскае сонца.

Могуць спытаць: але чаму, чаму? Трэба ж даводзіць.

Нават не падумаю. Тут жа не інстытут літаратуры.

Проста такі выпадак Асабісты. Ты перарос, ты вырас з нечага ці проста страціў штосьці ў тлуме, у калаўроце сваіх дзён,— гэта ўжо толькі твае праблемы.

Вось яго кніжкі на маіх паліцах. Стаяць, нібы чаго чакаюць. Адна, маленькая, танюткая, але ў дэрмаціне — «Загадка Багдановіча». На вокладцы — пытальнік.

Барыс Забораў мастаком быў той кнігі. Зараз ён далёка, у Парыжы. А Стральцоў — тут, у нас, у Мінску На Чыжоўскіх могілках.

Мы пазнаёміліся ў пяцьдзесят чацвертым, на першым курсе аддзялення журналістыкі тагачаснага філфака.

Гарэзлівыя дзеці горада, мы ўпершыню бачылі побач вясковых адналеткаў і бавілі з імі час.

Ветлівыя, але насцярожаныя дзеці вёскі ўпершыню сядзелі разам на занятках і бралі чарку ў інтэрнаце са сваімі гарадскімі знаёмцамі.

Асаблівага збліжэння не было. Прынамсі першыя гады. Размаўлялі ўсе па-руску. Здаецца, нават і Грыша Барадулін, наш філфакавец.

У Стральцова знешнасць была невясковая. Вясковасці я ў ім не адчуваў.

Што ён прыкмячаў ува мне, не ведаю.

Ведаю толькі, што яго нічога не адштурхоўвала ў тагачаснай нашай, сказаць так, юнацкай гарадской культуры. Ейнымі ж рысамі былі: нефанабэрлівы гонар людзей сталічнага цэнтра, хоць і збольшага, але начытанасць і нейкая асаблівая, прывабная для нас сумесь знешняй інтэлігентнасці і гэткай элегантнай блатнаватасці. Яе пакінула ў нас школьнае пасляваеннае жыццё-быццё. Спярша фантасмагорыя распусных і вычварных гульняў, боек у руінах. Пасля — футбол, трафейнае кіно і джаз.

Мы пачалі неяк збліжацца са Стральцовым.

Я прывёў яго аднойчы да сябе. Ён глядзеў толькі на кнігі і маўчаў. Кніг было мала. Ён узяў двухтомнік «Маяковский. Театр. Кино» — і нават не гартаў, толькі трымаў на далонях новенькія тамы ў гладкіх вокладках. Цяпер я думаю, яму было ўсё роўна, хто там аўтар. Яму проста было прыемна браць у рукі кнігі, так...

І ён прывёў мяне аднойчы да сябе таксама. І мы пераначавалі ў пакойчыку яго інтэрната пасля рэстарана «Заря», што быў тады насупраць кінатэатра «Победа».

З ягоным прозвішчам я ніяк не мог звыкнуцца. Бо тады якраз грымнула такое ж прозвішча з Масквы па радыё, у футбольных рэпартажах — Эдуард Стральцоў «Эдзік» — пісалі крэйдай у дварах на сценах. «Стральцоў» — чуў я ў нашай аўдыторыі, але адразу прыгадваўся той, каго ўслаўлялі тады на стадыёнах ад Мінска да Стакгольма...

Чаму ў Міхася такое рускае прозвішча? — думалася мне.

Прайшоў час. Ён ужо быў сапраўдным, вядомым пісьменнікам. Ён добра ведаў і любіў рускую класіку, мы гаварылі з ім пра гэта, і сляды гэтага я бачыў у яго творах. Але аднойчы ледзь утрымаўся, каб не сказаць.

—Ну навошта, навошта ты такі... «рускі»?

Не, справа не ў насычанасці яго тэкстаў, яго стылю рускай мастацкай традыцыяй. Справа

не ў творчасці наогул, а ў жыцці.

Справа ў падуладнасці той раз'юшанай жыццёвай стыхіі, якая ў славянаў, асабіста ў рускіх, цягне нібы ў вір ці да апошняга краю бездані, да самазнішчэння ў рэшце рэшт (Нешта падобнае, здаецца, адбывалася і з Караткевічам.)

Гэта нейкая загадкавая, містычная прага безагляднага захаплення, пасля якога ўсякае намаганне ці стрымліванне сябе ўжо — сум, нудота, шэрая проза пасля паэзіі.

Гэта звыклая для герояў Шукшына прага «свята ў душы», без чаго яны не ведаюць, што з сабою рабіць.

Гэта нясцерпная патрэба «постоять на кр-раю», як спяваў Высоцкі. «Чую гибельную радость — пропадаю, пр-ропадаю!..»

Так, менавіта гібельная радасць — празмернасці пачуццяў, душэўных узлётаў. Безабароннасць перад гэтай спакусай, але і гатоўнасць да яе.

Тыпова славянская, няўцямная для руплівага Захаду, бяздонная шырокасць, дзе свята, пераходзячы апошнюю рысу, спапяляе сябе, абрынаючыся ў цемень, у нішто.

Такая шырокасць у жыцці не пакідае ўжо сіл для творчасці.

Ніхто і ніколі не дакажа мне, што Стральцова знішчыў «час».

Гэтая заўсёдная адмычка ў савецкіх тлумачэннях лёсу творцаў тут не спрацуе.

Не трэба нагадваць ні пра застой, ні пра вязняў сумлення, ні пра парушэнні правоў чалавека.

І пра цэнзуру ці адсутнасць палітычных свабодаў таксама не трэба.

Бо Стральцоў стварыў свой непаўторны мастацкі свет і сябе якраз у час гэтай адсутнасці. Таксама як і згаданыя Караткевіч, Быкаў, Брыль...

Ён пагаджаўся з Пушкіным, якога так добра ведаў і цытаваў, што без палітычных свабодаў жыць яшчэ можна, а вось без свабоды ўнутранай — нельга.

Але небяспека і ў занадта вялікай свабодзе творчай асобы ад звычайных жыццёвых цяжкасцяў. Мастаку тады пагражае адчужэнне ад жыцця, самазамыканне.

Як рэдка спалучаюцца ў славянскім творчым духу гэтыя процілегласці, але аднолькава неабходныя бакі:

глыбіня, багацце паэтычнага пачуцця і строгая дысцыпліна;

вялікае жыццялюбства і самаабмежаванне;

адоранасць міласцю боскай і вялікая патрабавальнасць, самакантроль;

вытанчанасць, артыстызм і суровая мужнасць мэтанакіраванай працы, цярпенне і трываласць.

Стральцоў меў залішне многа свабоды ад жыцця. Жыццё не дазваляе, не даруе гэтага.

У самой такой свабодзе закладзена ўжо і пакаранне за яе. Яна робіцца цяжкай. Невыносны цяжар свабоды кідае нас на пошукі таго, куды можна было б здаць, зваліць гэты груз са сваіх плеч.

Доўга шукаць не даводзіцца. Шмат чаго ў жыцці толькі і чакае гэтага, цікуе за намі і бачыць: вось гэты гатовы аддаць.

Да таго ж, тое жыццё, што абступала Стральцова ў апошні час, ужо не паддавалася ягонай любові — так востра, хваравіта ўспрымаў ён увесь гэты навакольны гул і раз'юшанасць.

Творчы арганізм Стральцова, надзвычай чуйны і трапяткі, у добрым сэнсе ломкі, не змог ахапіць гэтага, зрабіць сваім — і ўвайшоў у безвыходны канфлікт з жыццём.

Мне здаецца, пасля «Смалення вепрука» ён пачаў баяцца няўдачы. (Дарэчы, больш нічога ў прозе ён і не пісаў.)

Аднойчы я сказаў яму:

—Пасля такой рэчы, як «Вяпрук», трэба, каб час прайшоў Каб у душы зноў насачылася і досыць назбіралася...

Ён усхапіўся, нібы толькі гэтага і чакаў·

—Вось бачыш, як ты разумееш!.. На якім узроўні! Канешне, час патрэбен. І яшчэ які!..

Ён змоўк спакойны, задаволены. А я, грэшны, падумаў· «Баіцца рызыкі. Баіцца прайграць. Разумее: усё, што ні напіша, спярша паставяць у параўнанне з «Вепруком».

Я не ведаю, што б ён яшчэ зрабіў, калі б жыў Але ведаю, чаго б ён НЕ зрабіў. І для нашай літаратуры гэта нязробленае ім было б не менш істотным, чым шмат што зробленае іншымі.

Як празаік, ён бы не пісаў такіх аповесцяў ці раманаў, дзе аўтар ні ў адным сказе не можа ўзняцца вышэй за сваіх герояў, з галавою зарываючыся з імі ў снег або ў траву

Ён бы не браў у свае героі людзей ужо за адно тое, што яны людзі «простыя», «бедныя», як гэта рабіла ўся савецкая шматнацыянальная літаратура. упэўненая, што галеча ледзь не ідэал.

У крытыцы ён бы і цяпер не кляўся славутай народнасцю як вышэйшай якасцю мастацтва, бо ніколі не рабіў гэтага і раней.

Ён не пісаў бы літаратуру з абавязковаю мэтай «адлюстроўваць праўду жыцця». Бо разумеў, што мэта літаратуры не ў набліжэнні да жыцця, а ў такім мастацкім пераўтварэнні яго, калі толькі і адкрываецца нябачная дагэтуль праўда.

Гэта што датычыць непасрэдна творчасці. А для пісьменніка існуе яшчэ паняцце творчых паводзін.

Стральцоў сёння ні ў якім разе не жаліўся б на людзях, у газетах на мізэрныя ганарары за свае кнігі, называючы лічбы і для большага ўражання пералічваючы сотні тысяч няшчасных «зайцоў» на дзесяткі долараў

Не. ён бы не трос рыззём і трантамі, стоячы пасярод рынка ў позе жабрака-паэта і дакараючы сваім гібеннем урад ці дэмакратаў

І ён бы не праўляў прыватны апакаліпсіс і не клікаў бы на жалобу па сваіх чытачах, якія, маўляў, раптам пакінулі яго, спакусіўшыся раманамі з жыцця геніталіяў, — нашто яму такія чытачы?

Ён разумеў: чытача заўсёды няма — і чытач ёсць заўсёды.

Чытача ж масавага мае толькі газета. І яго не мелі на самой справе нават пісьменнікі з афіцыйнай абоймы. Ім толькі здавалася так з-за сваіх тыражоў, якія былі дзяржаўнымі ўзмацняльнікамі іх імёнаў· масы чулі іх імёны — і не чыталі іх кніг

А сёння скончылася гучная дзяржаўная вядомасць. Не чытач адвярнуўся — узмацняльнік адключылі.

І для Стральцова сёння ўсё было б як і раней. Ну сапраўды, што б ён такое ўжо страціў?

Званне, пасаду, прэміі, лаўрэацтва, месца ў прэзідыуме ці замежную вандроўку?

Не меў і не атрымліваў. Не сядзеў і не ездзіў

Ён быў пісьменнікам — не болей. Але ж і не меней.

Ён змог ім стаць — ён змог ім і застацца, ужо назаўсёды. І сказаць тое, што сказаў

Астатняе у маўчанні.

Аляксандар СТАНЮТА

Наступны, яшчэ не аб`яўлены, змест

Рэаліі ў творах Міхася Стральцова маюць уласцівасць прыкмет З іх можна выводзіць сімвалы, як, напрыклад, з назвы апавядання «Сена на асфальце» і, акцэнтуючы ўвагу на сацыяльным, казаць, што гэта сімвал беларускай інтэлігенцыі, якая выйшла з вёскі, а жыве ў горадзе, альбо, калі карыстацца «эстэтычным» ключом, ікэбана — дзівосны букет, што неспадзявана склаўся сам.

Аднак па сваёй прыродзе і сутнасці — гэта прыкметы. Яны самадастатковыя, поўныя жыцця, аднак яно тоіць у сабе наступны, яшчэ не аб'яўлены, змест

Паглядзіце, якія выверaныя, важкія, дакладныя рэаліі ў тым жа «Смаленні вепрука» Яны прадчуваюць і прадбачаць тое, чаго яшчэ няма, але што мусіць здарыцца і, уцягнутыя ў віртуальную сферу надчасу, становяцца часткамі нейкага невідавочнага механізму

Нават тыя персанажы, якія ведаюць, што будзе далей, у апавяданні паводзяць сябе, як быццам сумняваюцца ў сваім веданні, і шукаюць доказаў, якія пацвердзілі б, што яны не памыляюцца. Яны ўслухоўваюцца ў нешта, што прысутнічае ў наваколлі, і ўведзены ў сістэму прыкмет І насампраўдзе не яны, а рэаліі, чуйныя, пільныя і адстароненыя рэаліі — галоўныя дзейныя асобы апавядання.

Міхась Стральцоў распазнаваў тое, што ўжо распазнала яго, прыкмячаў тое, што ўжо прыкмеціла яго. Яно, тое *тое*, было сваім, але сваім па нейкай іншай, чым у штодзённым жыцці, суадпаведнасці, па нейкай інакшай прыналежнасці; з ім было звязана самае істотнае, але, як у хованках, яно абвяшчала аб сабе і не абвяшчалася само.

У завулках старога горада, у размаітым людскім натоўпе, у жыццяпісах творцаў Міхась Стральцоў заўважаў свае знакі, якія станавіліся знакамі яго творчасці. І ўжо блізка ад яго, як надзвычайная вестка, праслізгваў човен Харона, цень ад вясла якога ён прыкмеціў. Ад яго патрабавалася адно — заставацца мастаком надалей. верыць свайму відушчаму пачатку — інтуіцыі, прымаючы ўмовы гульні, усё глыбей распазнаваць яе ўмовы, бо тое, што ў ёй загадвалася, і разгадку мела ў ёй самой. Па-за ёй — низдзейсненыя задумы, чужая рэчаіснасць, ЛПП...

Семантычнае поле прыкмет значнейшае і багацейшае за поле фактычных рэалій Сюды ўваходзіць і ненапісанае.

Алесь РАЗАНАЎ

Вусцішнасць быцця

Увесь Ён — нязбыўны сум з прычыны непазбежнасці вяртання ў нежытво.

Мы ўсе прамінаем гэты шлях, але да пэўнае пары лішне не смуткуем з такога наканавання. А ён ці не ад пачатку ўзяў занадта блізка да сэрца неадпрэчнасць смерці — і тым жыў. І таму так жыў, як жыў і пісаў перавaжна з тае нагоды, што трэба будзе памерці (калі не фанабэрыўся, не падрабляўся, не блазнаваў).

Раней я думаў, што ягонaя засяроджанасць на татальнай прысутнасці смерці ў жыцці паходзіць ад хранічнай любові да жыцця. Толькі гэта. здаецца, не зусім так. Жыццё ён, натуральна, любіў, але не больш хва-

равіта, чым нехта іншы. А вось *адчуваў* яго — з усімі пахамі, фарбамі, гукамі,— як мала хто яшчэ. З гэтага фатальна абвостранага ўспрыняцця існага і вынікала такое ж вострае пачуццё непазбежнасці страты ўсяго, што ёсць «пад гэтым небам сінім і любімым». Адсюль нязбыўны сум і нават у спякоту падняты каўнер, якім ён атуляўся ад сцюжы за спіной, адсюль жанчыны і віно, як марная вымога сагрэць заўсёды восеньскае сэрца, адсюль і сцішаны дакор, вымаўлены на паваротцы ў вечную засень. мой свеце ясны...

«Ёсць таленты... што самі нібы ўвасабленне пакутнага духу, адрынутага паводле нейкай незразумелай прычыны ад самога жыцця і асуджаныя трапятацца ў вечнай празе зліцца з ім».

Ён не стамляўся (і ў траве, і на асфальце) выглядаць жыццё, прагнучы адшукаць вечнае вымярэнне сваёй прысутнасці ў ім, але ўсюды з-за нечага паўставала *нішто*. Найдалей ад *нішто* было дзяцінства, і ён не аднойчы ўцякаў з даросласці туды — у свае раннія ды маладыя гады. Аднак і там заўжды нешта (ці нехта) канала: само дзяцінства, юнацкае каханне, дзед Міхалка...

Кажуць, у яго было шмат жанчын. Напэўна, гэта насампраўдзе так, бо ён не любіў жанчын. Ён толькі персаніфікаваў жыццё ў той ці іншай жанчыне і такім чынам «заляцаўся да жыцця» «ў вечнай празе зліцца з ім». Але чым тужэй згортваўся ў каханні, тым тужлівей ападаў на сэрца сум. Бадай, з гэтага амаль адчайнага суму ён мог здагадацца, што той, хто хаваецца ад тэрору небыцця ў каханне — самахоць прыспешвае сваю невараць, бо чалавек найперш памірае ў жанчыне, а ўжо потым — сам у сабе... Ён не здагадаўся, хоць сэрцам адчуваў небяспеку і таму доўга не трываў жанчыну побач, хаваўся ад адной за другую, ці сыходзіў ад усіх да мужчын (сяброў) і віна.

Чулліві і пяшчотны, ён шукаў у сяброўстве абароны і прытулку, а разам з тым непадманнага духоўнага хаўрусу, агульнай інтэлектуальнай прасторы, урэшце — высакароднага чыну.

«І вобраз дружбы —
даўні і нягоркі
Бо мы ж яшчэ, напэўна,
не забылі
Як некалі яе адну любілі —
Ну, дружбу нашу.
Помняцца спатканні
Дзвюх нашых душ.
Любоўныя расстанні
Адна з адной. Да заўтра.
Ненадоўга.»

("Прыехаў сябра")

Але як цялесны саюз з жанчынай, так і духоўная мужчынская звязь істотным чынам не мянялі перспектыву небыцця. Хованкі ў каханні набліжалі да смерці, хованкі ў сяброўстве трохі адсланялі яе, аднак ні тое, ні другое не яднала з жыццём. Яднала хіба — віно; праўда, ненадоўга, і таму віна трэба было многа, і ўсялякі раз, калі яно заканчвалася, гульня таясамасці экзістэнцыйі (ягонай і жыцця) перапынялася яшчэ вялікшай тугой...

Жыццё, смерць, каханне, сяброўства, віно... Засталося — *слова*...

Ці *слова* было наперадзе ўсяго: і сродкам і мэтай жыцця?

А калі адно спосабам не-магчымасці жыць?

Часам мне здаецца, што ён нарадзіўся не жыць, а выглядаць смерць (у восеньскай смузе, у ціўканні сініц, «у мінулым, сённяшнім, наступным»). Крэмзанне паперы «прозай» ці «вершамі» было ўсяго толькі адным са спосабаў (а, можа, як для яго, то і адзіным) гэтай «не-магчымасці жыць». І ці не таму ён кангеніяльны, тоесны свайму скрушнаму лёсу/генію там, дзе ў яго адрэфлексавана развітанне, расстанне, кананне; там, дзе памірае маладым Максім Багдановіч ("Загадка Багдановіча"); там, дзе памірае дзед Міхалка ("Адзін лапаць, адзін чунь"), там, дзе гіне УСЁ — вяпрук, жыццё, надзея ("Смаленне вепрука").

Дух смерці лунае над гэтым геніяльным апавяданнем, напоўненым пахамі, фарбамі і гукамі нежытва: «Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі — падаюць інеем сырыя туманы. Чарсцвее зямля, і цёмным, ільсняна халодным зяленівам б'е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зябліва, пасівела ў гародчыках і пазванчэла бадыллё, і панішчымніла паветра. Неба ўдзень ужо ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі. Яшчэ выганяюць на пашу кароў — далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле».

У «Смаленні вепрука» ён пераражыў свой метафізічны сыход. Тут невараць урэшце запанавала ўсюды і найперш у ім самім. Ён сам быў тым, каго забіваюць, ён сам быў тым, хто забівае, ён сам з сябе склаў ахвярнае вогнішча і сам быў тым ахвярным дымам, што завершыў яшчэ адзін кругазварот быцця.

З тым дымам ён і адышоў у нябёсы, «а душа ўзяла і засталася», затрымалася на нейкі час і вярэдзіць маю душу ягоным сумам па немагчымасці інакш пазбегнуць смерці, як толькі памерці.

Валянцін АКУДОВІЧ

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

МЫ



Вершы для А.

***

Не маннай вусны пахнуць — ацэтонам
І пылам закулісным даміно,
І шкляр заместа шыбіны кардонам
Залечвае пабітае акно;

І Свіслач, як Венецыя ў тумане,
І гандаль на Нямізе — паляванне
Нязвыклай ветлівасці на мяне:
«Что вам угодно?» «Бульбы ў чыгуне...»

І Лупанур, абсоплішы манжэты,
Аўкцыённым грозіць малатком...

Ёсць буржуа, і ёсць яшчэ паэты,
І шчасце ёсць прачнуцца жабраком.

Але, напэўна, нечага я варты,
Калі пусцілі мой рэкламны міф
Бадзяцца па Купалаўскім тэатры
Паўгода на паўставачны тарыф.

Везувіем аглушаны, Раеўскі,
Жадаючы не надта дакучаць,
Адно што віжаваць за Дастаеўскім
Прасіў мяне — чытаць і скарачаць.

І я чытаў — прыходзіла бяссонне,
І скарачаў — стамлялася рука,
А паўз тэатр правозілі «Пагоню»
І ўзносілі на жоўтае ЦэКа.

Не пакідаў ніякага я лішку,
З рамана п'есу выціскаў наўпрост
І князя недарэчнага, як мышку,
Лавіў за спінку, а часцей за хвост.

А Лупанур — то хціва, то гулліва —
З драматургічных высілкаў маіх
Пасмейваўся, але змаўкаў раўніва,
Як бачыў А. — адну ці нас дваіх.

У рэўнасці яго быў мудры вырак,
І я з тэатра збег, бо зразумеў,
Што я ў жыцці не драматург, а лірык,
Мой лёс — мяняць спадзеў на неспадзеў,

А. цалаваць у радасці замглёнай,
Боль запіваць гарачым малаком
І назіраць, як Лупанур натхнёна
Аўкцыённым грозіць малатком.

23 красавіка 1994 г

***

На вуліцы Сухой у змроку радасным
Мы дыхалі забытаю лавандай,
Лагчынаю прыйшлі ў завулак Транспартны
І дом убачылі з бярозай і верандай,—

Драўляны сон. І ты ўздыхнула весела:
«Мы купім гэты сон — увесь ці частку,
Ці хоць веранду, што ў халодным месяцы
На рамантычную падобна пастку.

Пакуль у пастцы салавей з гародчыка
Не стоміцца круціць сваю катрынку,

Я нарадзіць табе хацела б хлопчыка,
Калі не хлопчыка — тады дзяўчынку...»

І змоўкла ты, як лютня адбалелая.
Я ўдзячны быў за гэтае прызнанне,
Як і за тое, што бяроза белая
Шумела, як метафара змяркання.

Не ведаю — маё яно ці ўкрадзена,
Але ж прыйшло такое разуменне:
Жанчына хоча больш, чым Богам дадзена,
Мужчына тое ж хоча, толькі меней.

І я вось гэтым «меней» заахвочаны
І выбар свой апраўдваю высновай,
Што беларусы — нацыя жаночая
Не з бацькавай, а з матчынаю мовай...

Мы йшлі далей, і колер фіялетавы
Усё гусцеў і не рабіўся іншы,
І на Тэатр Музычнае Камедыі
Ляцелі фіялетавыя вішні.

27 студзеня 1994 г

***

Снапок-букецік-матылёк,
Чырвонай ніткаю звязаны,
У тытунёвы трапіў змрок
І задыхнуўся, пакараны
Табой і мною. Ад цябе
Я йшоў па Ракаўскім прадмесці,
І ў хлебным, снежаньскім цяпле
Пах тытуню губляўся дзесьці.
Зіма купляла свежы хлеб,
І я падумаў нечакана:
У гэтым снежаньскім цяпле б
Знайсці пачатак для рамана
Кароткага — ў адзін радок
Аб тым, як трапіў у сутонне
Снапок-букецік-матылёк
З маіх вачэй, з тваёй далоні...
Другім радком была б, відаць,
Зіма і сцежка паўз пякарню,
Якой ісці і шкадаваць,
Што патушыла ноч ліхтарню
Невыпадкова, а знарок,
Каб мы ні зблізку, ні здалёк
Не ўбачылі, што памірае
Снапок-букецік-матылёк —
Твой падарунак, дарагая.

23 снежня 1993 г

***

Я палюбіў дарогу начную
І палюбіў з нядаўняй пары
Рызыкі яснай тканіну льняную
Накідваць на вулічныя ліхтары.

І ў разуменні, што гэты занятак,
Пэўна, вар'яцкай душы акурат —
Я між вар'ятаў усіх і вар'ятак
Самы шчаслівы на свеце вар'ят.

Я растлумачу, што значыць вар'яцтва —
Гэта, крануўшы мінулае тло,
Шчыра каханай жанчыне прызнацца
Колькі ў цябе некаханых было.

Потым раскайвацца — жартам спытала,
Жартам і свой напаіў бы адказ...
Позна. Сляза налілася металам.
Стаў непрыступны алькоўны атлас.

Позна. Вяртайся асфальтавым долам,
Свечкі трамвайнай губляючы бліск.
Ноч не ўратуе Чырвоным касцёлам,
Домам Урада, гасцініцай «Мінск»...

Цемру любі і дарогу начную,
З рызыкай яснай зайдзі ў казіно
Выйграць настрой, каб тканіну льняную
На дарагое накінуць акно.

5 снежня 1993 г

***

Не веру, што ён лепшы за мяне,
А хоць і лепшы — ўсё адно не веру.
Яму пашанцавала замяніць
Маё каханне на сваю хімеру.

Мяне суцешыць рэстаран «Патсдам»,
І зноў наймуся да цябе ў анёлы,
Не проста словы я табе аддам,
А старажытныя аддам глаголы.

Не толькі пакладу акропаль свой
Да ног тваіх, агнём пацалаваных,
А першаю біблейскаю вадой
Абмыю грэх, такі неспадзяваны;

І выцалую ночы ўсе і дні,
Напоўненыя не маёй уладай...
І, прагнучы да болю чысціні,—
Усё тваё не назаву я здрадай.

20 лістапада 1993 г

***

Ласкавасцю тваёй не наталіцца,
І ў лебядзіным возеры тваім
Мне чуецца і мроіцца і сніцца
Расстання нашага ерусалім.

Што мне пакінеш?! Сум і прахалоду,
Якімі давядзецца з году ў год
Паэзію славянскага зыходу
Аплакваць, павярнуўшыся на ўсход.

Не здолею пазбегнуць гэтай страты
І толькі зразумею, што паэт
Перад каханай вечна вінаваты,
І свет яго — штодзённай страты свет.

Пакуль яшчэ магу цябе кранууца,—
У лебядзіным возеры тваім
Няхай мае жаданні застануцца
Да старасці, да смерці — назусім.

Калі а д т у л ь твая прыбудзе вестка,
Асветленая радаснай тугой,—
Я адкажу цяплом начнога Менска,
Бо толькі ноч дае мне супакой.

Да паэтычнай глухаты гатовы,
Сатру з аблічча эстэтычны грым,
І лепшыя мае патонуць словы
У лебядзіным возеры тваім.

17 кастрычніка 1993 г

***

... і з нечаканняў дарагіх
Я выбраў тое нечаканне,
Якое зрок дае і слых
Майму палессю і тascане.

Быў цэлы свет — і прамінўў.
Пяшчота — любая айчына,
Яна мне дорыць навіну,
Што жыць пакуль яшчэ магчыма.

І гэта шчасце для мяне,
Бо існую ні ў якай іншай,
А толькі ў гэтай навіне,
Сябе па-новаму адкрыўшы.

Быў цэлы свет і ўжо няма.
Адна пяшчота засталася,
І раніца яе пісьма
Ляжыць на пачуццёвай пласе.

Былі жанчыны (дзе яны?!),
Пасля якіх такая роўнядзь,
Што ані суму, ні віны
Душа не ведае, не помніць...

Я ўдзячны вопыту твайму —
Найдарагому нечаканню! —
Што ранішняму даў пісьму
Надзею на выратаванне.

Я на каленях, над табой,
У рыфму трызнячы аб раі,
Вясну магноліі тваёй
Па кроплі вуснамі збіраю.

19 верасня 1993 г

***

Вяртанне адбываецца паволі,
Заціснутае ў філігранны дрот,
І боль, забыты ў цёмнай альвеоле,
Б'е ў паднябенне, раздзірае рот...

Апошнюю я размяняю лепту
На прагу з фізіялагічных нор,
Каб дакрануцца да рукі тваёй і шэпту,
Замкнутыя на сухасць і мінор.

Назад ікону тройчы адцалую,
Якую цалаваў я тры разы,
Калі ляцела ты ў імглу чужую,
Страх пакідаючы на дне слязы.

Вярну наш травень — шосты дзень ягоны,
Напоены правансам да краёў!
Як трубадур дзеля цудоўнай донны,
Я для цябе прыручваў салаўёў;

На дробныя да зніку тэль-авівы
Я разбіваў вялікі тэль-авіў...
Апошні раз у гэты дзень шчаслівы
Перад расстаннем сокала злавіў.

І гэты дзень — адзіная патоля,
Якая прымушае зразумець,
Што ўсё цудоўнае вяртаецца паволі
І што жыццё лягчэйшае за смерць.

30 жніўня 1994 г

Ала СЯМЁНАВА

Я і ТЫ



Адносіны паміж смяротнымі бессмяротныя.

Барыс ПАСТАРНАК

БЭЗАВЫ ПОПЕЛ

Эпісталярна-прывідны ўспамін

ULTIMA RATIO[1]

Чалавечы голас Жан Както недарэмна адчуў таямнічую ўладу гэтай слухаўкі Хто абышоўся без яе ў XX стагоддзі? Адстаронена-зблізжанае судачыненне чалавекаў Хуткамоўленне людзей спраў Скоклівая гарэзія балбатні Вохклівыя анкі старых. І — доўгія размовы закаханых. І — нечаканыя званкі. І — чаканне званка.

«Алё. .» Голас добразычліва-свежы, усмешлівы, ранішні нават калі ён гучыць а дзесятай гадзіне ўвечары Голас жанчыны, якая ўмее ўгадваць час слова і радасць аднаго імгнення «Добры вечар. .» Голас нібыта крадзецца і хаваецца ад некага «Прывітанне!» Голас — як стрэл Словы — што пытанні анкеты «Алё!» Голас як быццам робіць ласку Словы пагойдваюцца, калыхаюцца, робяць кругі, голас нібыта ведае нешта такое, пра што ніхто не здагадваецца. «Вечар добры!» Голас вуркатліва-глухаваты «Вечар добры .» — нібы табе а нібыта і сам сабе Ён так і будзе размаўляць нібыта з табою, нібыта з сабою самім «Перадай прывітанне маме. Не, паклон»

Я не пачую больш ні гэтага голасу, ні матчынага У маці быў дзіўны запамінальны голас Арганны — малады, звонкі асноўны тон і гартанныя, кантральтовыя падгалоскі Гэта не маё ўражанне — іншых. «Слухаю вас. .»

А той вуркатліва-глухаваты голас — Міхася Стральцова

Размовы нашыя з ім часцей былі менавіта тэлефонныя. Доўгія на гадзіну, а то на дзве Званіў ён ці ўранку, гадзіне а дзесятай, ці гадзін у дзевяць а не дык і адзінаццаць — увечары. Пра што былі гаворкі? Пра чытанае слуханае пра тое што ён збіраецца пісаць (згадваў неяк кнігу пра Янку Купалу, накшталт «Загадкі Багдановіча» не напісалася на жаль), пра дробязі пра «закон звезды и формулу цветка» Мудрыя і абачлівыя людзі ў такіх выпадках занатоўваюць размовы У мяне ніколі не было тых дабрачыннасцяў ні мудрасці ні абачлівасці Не, я заўсёды ведала, хто такі і што такое Міхась Стральцоў. Спрабавала пісаць пра яго хоць разумела: «Страшна — усё роўна як узбіўся на дзёрзкую думку вывесці формулу роздуму ці ўзяць на далонь, каб разгледзець, агонь або снег» Была рэдактарам дзвюх яго кніг Крытыкі

Разумеючы, хто ёсць Стральцоў, неяк не магла сябе прымусіць занатоўваць размовы Здавалася — гэта што сачыць за сабой у шчыліну замка Глупства? Недаравальнае легкадумства? Магчыма Затое лёс падараваў мне — ветрагонам шанцуе — скарб. 46 лістоў Міхася Стральцова Ліставанне тое было не ў самы лёгкі год для яго і досыць складаны для мяне Ягоныя і мае мітрэнгі не мелі судачынення У кожнага было сваё Аднак мо і быў у тым нейкі патаемны знак.

Помню, як я атрымала першы ліст Стральцова. Восеньскім вечарам у Дубултах — званок. (Зноў званок.) Тэлефон унутраны Адзіная знаёмая жанчына з'ехала Пажар? Паводка? Сусветны патоп? «Вам ліст атрымайце» З дому мне пісалі «да запатрабавання» Ад каго? Почырк незнаёмы Востранькі Малачытэльны Не почырк — клінапіс Чытаю — ці хутчэй разгадваю, расшыфроўваю

«Дарагая Ала Іванаўна!

Ну, ну, не хмурней брывом у выпадку такога сур ёзнага звароту Проста мне ўспомнілася як міла ты мне выгаворвала адноечы за Алу Іван.[аўну] — вось і закарцела падражніцца

Нешта падобнае да невялічкага катаклізму адбылося надоечы ў маім жыцці Для здароўя і самаадчування майго карысным было прызнана двухгадовае знаходжанне ў па[ў]днёвых мясцінах спагаднага і мілага нашага краю Вось і абзываюся адтуль, з самага дна колішняга мора Герадотавага спакойна і павольна як у зачараваным сне апетага сённяшнімі тэбульцамі [так у Стральцова]. Х. У Z^2 і інш.[ымі] шаноўнымі турамі пяра О я на родине этих мужей телом тучных и голосом рыкающих. Хвала им! Бессмяротнае слова іх падтрымлівае і мяне ў сумную хвіліну а пазней думаю натхніць і на сціплы подзвіг пяра — чаму не натхніцца вартым пераймання прыкладам? Так што хутка я запішуся калі прымуць, у секцыю «чающих воды» (Як гэта хараша і глыбакадумна сказана ў рамане У «Усюды — куды ні глянь — была вада!» А было гэта ў часы сусветнага патопу і NN-чу нейкім чынам давялося прысутнічаць пры гэтым у якасці духу боскага ці як?— «И божий дух носился над водою» Глыбака капаюць і высака лятаюць палешукі!)

А слухай усё ж. мясціны гэтыя мне былі і раней трохі знаёмыя — быў некалі непадалёк адсюль на вайсковых зборах. І тое-сёе ў маім тутэйшым бытаванні нагадвае колішняе Але толькі тое-сёе. На жаль.

КПП Там круціцца пласцінка
Хрыплаватым голасам пяе.
«Ты — галінка я — твая расінка»,—
Мне чуваць у голасе яе
Я міну лінейкі і газоны
Гэткія, як некалі раней

Успамінак даўні гарнізонны
Ціхім смуткам сэрца мне кране і г.д.
(КПП — кантрольна-прапускны пункт.)

Але хопіць Ты павінна здагадацца ўжо, што напісаў гэта я толькі затым каб атрымаць ад цябе ліст Не палянуйся га? Пішы — мне ўсё будзе цікава.

Міхась»

Нейкім дзівам у мяне засталося некалькі чарнавікоў маіх лістоў — ці шчыра кажучы проста было вельмі накрэмзана то перапісана а неперабеленыя асобнікі я паклала разам з лістамі Стральцова Увогуле, што сталася з лістам адрасаванымі Міхасю Стральцову не ведаю Камісія па спадчыне не мае ні лістоў Рыгора Барадуліна ні Карласа Шэрмана ні Валянціна Аскоцкага ні Вячаслава Івашчанкі ні многіх іншых.

Але — лісты Міхася Стральцова ў мяне цалюткія — усе (Сямейная традыцыя была — захоўваць лісты, калі яны не кампраметуюць нейкім чынам адрасата Лічу, што лісты Стральцова мецяць вышыню і высакароднасць яго натуры.)

А першы мой ліст (чарнавік якраз ёсць) пачынаўся так:

«Дарагі Міхась!

Не буду паважна дражніцца — Лявонавіч!

Дык вось. Сяджу гэта я надвячоркам гляджу як гойдаюцца сосны ў балтыйскім небе і дыбаюць на вечаровы шпацыр хмаркі — што масквічоўкі з Дома творчасці — тут табе і ружовыя, свежанькія і вяршкова-пульхныя чырванавата-шэрыя сівенькія .» І пісала я там пра нейкую драбязу пра тое што «пан Езус наладзіў тут навальніцы і +25 па Цэльсію ў канцы верасня», што ў Мастацкім музеі ў Рызе адбылася выстава Барыса Берзіня і мне страшэнна спадабаўся ягоны аўтапартрэт «немалады немаўля ў раскудлачаным вянку-веніку на галаве» пра дзівосы-аб'явы «Ригас балс» «Одинокий мужчина или вдовец. может написать письмо женщине-вдове, кареокой и чернобровой брюнетке». Была восень 1982-я ад нараджэння Хрыстова, усе хат- і бодзі-шопінгі (усё на продаж цела і душы) былі наперадзе, і я здзеквалася як магла з той, што займалася наіўна-таннай самарэкламай: «кареокая и чернобровая».

Міхась адпісаў І было ліставанне Даўжынёю ў год — з восені 1981 да восен 1982 года (больш дакладна — да снежня). Пакуль ён быў у Мазыры

Ліставанне Тэлефонныя званкі Сустрэчы — часцей выпадковыя «Есть в близости людей заветная черта .» У нашых адносінах гэта заўсёды была дыстанцыя Тая дыстанцыя што змяшчала і нязмушанасць сяброўскіх адносін і літаратурна-мройнае дадумванне адно аднаго І аберацыю часоў Студэнцкіх. Нядаўніх. Сённяшніх. Было магчыма і тое, пра што ён напісаў у адным са сваіх вершаў якія былі ў лістах. «Так размінаецца душа З другой душой — і плача вецер .»

Дыстанцыйны стыль адносін ён заўсёды накладвае свой адбітак. І — як сведчыў Пастарнак, «вобраз чалавека . большы за чалавека» Але пра гэта крыху пазней — з нагоды Стральцоўскіх разваг пра «адрасатаў» і «герояў» вершаў (Згадваю ўсё гэта не дзеля таго каб давесці свету гісторыю нашых узаемаадносін а каб пазначыць вельмі важныя стасункі для разумення такой творчай асобы як Міхась Стральцоў)

Дарэчы, па універсітэце я Стральцова не памятаю А ён недзе здалёк заўважыў але не падышоў «Можа і добра — гаварыў ён год праз дваццаць — напакутавалася б ты са мной» Ну, але ж — дваццаць год накладваюць такі своеасаблівы адбітак на любое вызнанне хочаш — жартуй не хочаш — таксама жартуй Была ў ягонай рэплікі добрая доза іроніі і не адну мяне, безумоўна заўважала яго вострае юнацкае вока Але — жанчыны любяць салодкі падман «Ах, обмануть меня нетрудно, я сам обманываться рад» А я тады, у студэнцтве і ад блізарукасці, і ад галавы, «поўнай сонцам» і ад таго, што неба было для мяне колеру мары а край свету недзе побач на рагу знаёмых вуліц, ад звоннага тлуму сталіцы пасля наваградскай цішы — не пабачыла не згледзела Шмат чаго не пабачыла не згледзела А блакітны вецер Стральцоўскай мары заспеў мяне, канечне ж, насуперак логіцы (наскрозь алагічны чалавек) у маёй любімай бібліятэцы

«У радасці свая вясна і калі стане вясновай душа — народзіцца радасць

І неабавязкова ёй прыходзіць да чалавека вясной ёсць яшчэ лета і зіма, ёсць восень і ёсць яшчэ дзень і ноч, усход і заход сонца Зімою трашчыць уночы на рэках лёд, і гул ідзе высока, аж да неба а раніцай ляжаць снягі ружовыя і чыстыя як радасць А ў жытнёвае лета вісіць над зямлёю яблык, пераспелы светлы як даўняя журба ён упадзе — надыдзе восень, а восенню хлапчукі пякуць на полі бульбу і ўвосень прыходзяць да чалавека ўспаміны пра маленства Але толькі высока ў небе клічуць радасць журавы і кал яна запозніцца да цябе зімой ці летам, удзень ці ўночы дык абавязкова прыйдзе з гэтаю песняю і ты можа спазнаеш тады і трывогу, і шкадаванне, і журбу але ўсё адно гэта будзе радасцю»

Свет існаваў Свет руйнаваўся На вачах. Камінка ў мяне не было. Грубка роднага дома

была за сто пяцьдзесят кіламетраў Класічны, прыгожы спосаб знішчэння ўласных допісаў — спаліць! каб быў толькі попел — не існаваў І я ціха шматкавала спісаныя замашыстым почыркам лісткі ў сметніцу бібліятэкі «Уже написан Вертер. .» (Пазней даведалася, што адчуванне тое было знаёмае і самому Стральцову «Бывае ўсё-такі зайздросна, Вось ты высільваўся, пацеў, А твой радок надзіва проста У вершы сябра заляцеў».) Я суцешылася тым, што ў якую трансцэндэнтную гадзіну, калі шэра-бэзавы надвячорак ранняй вясны строгая графіка дрэў, напаўрэальнае мройлівае паветра, трывога надзеі ў вясновага птаства — і ты сам-насам з усім гэтым, з пранізлівым усведамленнем прыроднай явы — там недзе, на самым донцы свядомасці жыла памяць. ёсць чалавек, для якога ўсё гэта таксама не толькі кругазварот прыроды не толькі час кал пачынаюць прыкідваць планы на адпачынак.

Сустрэліся мы першы раз. Хаця гэта была хутчэй, «невстреча» Адбылася яна таксама напрадвесні

Два разумныя хлопцы сябры Міхася Стральцова напісалі два артыкулы аркушы са тры кожны Артыкулы добрыя Але нешта ім стрэліла ў голаў зляп ць іх разам пазначыць як кнігу А Стральцоў падпісаў рукапіс як тытульны рэдактар — ганаровы так бы мовіць Быў ён тады ў зеніце сваёй славы Яшчэ малады — а ўжо вядомы Толькі што выйшла яго кніжка ў Маскве («Что будет сниться») са знакамітай прадмовай Янкі Брыля· чытаў «амаль на адной хвалі прыёму» з Буніным

Мае аўтары, мабыць, ужо распавял Стральцову пра нашу спрэчку — я лічыла што два розныя артыкулы розных аўтараў яшчэ не кніга — і Стральцоў уляцеў у рэдакцыю шапка набакір, кажушок наросхрыст (кажушок на тую пару самы ўсхліп моды). Маналог свой ён пачаў ад парогу Я то рабілася белай як мой шыкоўны з кутасамі шалік (радасць аж захліствала мяне, калі суседка з Наваградка прэзентавала гэты дарунак з Аўстраліі), то чырвонай як мая святочная сукенка (Канечне ж, я насунула на сябе ўсё лепшае што ў мяне было — барані Божа, не дзеля таго, каб спадабацца ці зрабіць ураджанне,— не я толькі ліхаманкава імкнулася адпавядаць урачыстасці моманту· прыйдзе сам Міхась Стральцоў!) А момант быў сур'ёзны Гняўлівы Стральцоў распякаў мяне, як мог Я моўчкі стаяла на сваім максімалізм заклятай выдатніцы

Урэшце тыя хлопцы выдалі кожны сваю кнігу А са Стральцовым мы сустрэліся гадоў праз пяць у выдавецтве «Мастацкая літаратура»

Быў тады як кажуць самы застой Цэлыя пласты гісторыі і літаратуры нібыта і не існавалі — маўчанне Шмат каго і шмат чаго не друкавалі Шмат чаго мы і не разлічвалі надрукаваць. Многа чаго адстойвалі «кідаючыся на амбразуру» Але Ці то таму, што пачатак кожнай справы надае ўсяму імпэт ці то таму што Мікола Гаўрылавіч Ткачоў наш дырэктар адміністрацыйны геній стварыў атмасферу будзённага свята аднак «в те дни «МЛ» была Элладой», калі перастварыць вядомыя радкі Не садоў Акадэміі ў нас не было усе рэдакцы сядзелі ў двух пакоях Ажно дзе-небудзь апоўдні ў пакоі в хурна з яўляўся Рыгор Барадулін — толькі што ці то з Ушачаў ці то з Багамскіх астравоў Увесь у рыфмах, яркі шчодры і незбыт добры, і незбыт з едлівы адначасова «Як захлынуўся ад радасці жаўранак...» Праходзіла праз пакоі Алена Васілевіч — сама жаноцкасць, у выкшталцоным паліто і рамантычным капелюшы .. У вэлюме сваіх апавяданняў сваёй трылогіі .. Узнікаў канцэнтраванаінтравертны Алесь Разанаў нібыта толькі што скончыўшы дыялог ці то з Сакратам ц то з Хайдэгерам Шпарка крочыла з ахапкам кветак Вера Палтаран — і валашковым цветам цвілі яе вочы Сыходзіў з нейкай урачыстай явы ў шалёна выразнай форме каўтаранга Васіль Хомчанка Схіляла над рукапісам класічны профіль Галя Шаранговіч У палоне вандроўнай рамантыкі 60-х шукала сапраўднасць свайго «я» яе іменнічка Галя Нужкова Вялі інтэлектуальныя размовы малодшыя рэдактаркі Уводзілі ў ашалом душы паэтаў красунімашыністкі

Царавала атмасфера паразумення, надзей спадзяванняў

Заходзіў і Міхась Стральцоў Знакаміты Але да той, незамглёна-светлай славы дадалася яшчэ адна Тая слава што спадарожнічала не адному і не двум паэтам Празаікам Мастакам Тая слава што прыляла і ў Мазыр, адкуль я атрымала ліст..

З пачатку 70-х ўзніклі тэлефонныя «спатканні» Нейкай парою ён званіў часта нейкай — гады ў рады. Заходзіў у выдавецтва «Правожу цябе да тралейбуса» — «Чакай я куплю піражок» Ён гмыкаў, пасміхаючыся І купляў тых п ражкоў на цэлы рубель (Ці не апошні? Ён тады не рабіў афіцыйна грошы не вяліся ў яго.) «Ведаеш, я буду цябе сустракаць, як з дзіцячага саду» І мы доўга шпацыруем — з Паркавай магістрал (сённяшняга праспекту Машэрава) прысадамі разлеглым яблыневым садам «Ведаеш Алеся (малодшая дачка ад другога шлюбу) збіраецца ў секцыю тэнісу» «Хто твой муж? Я ніколі не буду пытацца ў некага». «Вераніка мая малодшая дарослая дачка піша Здаецца нешта ёсць»

Ведала я яго безумоўна з лепшага боку Нават і адтуль, з Мазыра ён не пісаў як яму там

што з ім, які ў яго побыт і небыт Пра гэта згадвалася, можа, іншым адрасатам? А ў лістах да мяне часам прарывалася агульнай раздражнёнасцю ды хіба вось такімі радкамі. «Я сантыментальным яшчэ не стаў, але здагадваюся ўжо, што нешта падобнае чакае мяне наперадзе. Гэта, мусіць, ад адзіноты, уяві сабе многа-многа мужчын у адным месцы, да таго ж падобных адзін да аднаго, як шпакі **И все с болячками**, с пупырышками — душевными, конечно,— бр-р!» Або: «Не забывай мазырскага палонніка»

Агульны тон лістоў быў іранічна-лірычны, многія лісты былі з вершамі Як згадваў ён сам «. .адбываю рату вершамі» Часам ён так і пачынаў·

«Дзень добры, Ала!
Не сумую сягоння навошта?
Мо цягнік пастараўся, а мо
Галубіная лёгкая пошта
Мне прынесла твaё пісьмо.
А чаму не паслаць было чаіц
Ад шумлівых тваіх берагоў,
Каб вясёласць маю прывячалі
Над маркотай асенніх лугоў?
Іх маркота хаця б з нагоды,
Што зняверыўшыся ў журбе
Лістападаўскае прыроды,
Свет зняверыўся і ў сабе
Што ўжо рэчкі, стагі і долы
І прадзьмуты вятрамі лес
У задумнасці невясёлай
Пакарыліся восені спрэс,—
Хоць ад замеці ліставея
Скразнякамі святло ў барах,
Хоць і ў сэрцы трымціць надзея,
Як лісток на тугіх вятрах.
Гэта ўсё так табе знаёма!
Не падумаю я з тугой,
Што ты бліжай цяпер да дома,
Чым я дома да дома свайго,—
Проста гэту асеннюю замяць,
Гэты лес у асеннім агні
Пасылаю табе на памяць.
Мне вясною яго вярні![3]
..»

Ліст з «падарункам» я таксама атрымала яшчэ ў Дубултах. А перад ім быў вось такі

«Дзень добры Ала!

—А таечка мая а слухай-ка ты сюды-ы,— як любіла выражоўвацца адна вясковая кабетка,— ляжу гэта я на казённым ложку, пятою збэрсаўшы казённае прасцірадла **вырачыўшы** вочы і **ўталопіўшы** іх у столь (цьфу,— зноў слоўца бессмяротнага У.!), дык ляжу гэта я і думаю: а што было б каб, скажам Д. раней за Х. стаў акадэмікам і што сказаў бы на гэта Саша Яскевіч? Га?

І тут мне прыносяць нешта падобнае да пісьма Гм! Почырк, скажу я востранькі такі але і завітушачкі ёсць — ну не раўнуючы — **калючая ружа**! Эге,— думаю, і ўспамінаю што казаў у такіх выпадках мой сусед — «Эх, **Мяндоза**, тут няйначай нейкая **Мяндоза**!» — Гэта ён некалі шэкспіраўскі спектакль па тэлевізары бачыў класіка яго праняла Гляджу далей: Гвадалупа не Гвадалупа, Ганалулу не Ганалулу, Ганалес не Ганалес — **Паланга** нейкая А самае дзіўнае· там дзе подпіс павінен быць, ці то вензель, ці то адмысловая пячатка. Падобная і да жука скарабея і да кітайскага ці японскага знаку Ну думаю, тут без М Ф Фядоранкі (ці Федарэнкі?) не разбярэш Ці то хіба кавабату на дапамогу паклікаць.

Але ўсё-такі таечка ты мая сэнсу я даўмеўся і дапяў і дапаў, і насалоду як Караткевіч ужо кажа тымчасам меў Дзякуй

Ну дык вось. Хмаркі, дзякуй богу плывуць і тут а куды і з якім намерам нават на КПП (кантрольна-прапускны пункт) не ведаюць. А сосны тут таксама ёсць, і над імі музыка пад вечар да знямогі грае запрашаючы праімчацца на аленях ранкам раннім а бывае, што над безабаронным птаствам і сімфонія грыміць. Невядома навошта, так сабе Хочаш вершык пра гэта?

Вось гэта музыка сама
Сабе гучыць. .»

Далей ішоў цалкам верш Ён ёсць у яго кнігах.

Лісты былі розныя паштоўкі-віншаванні часцей — вялікія часам на некалькі старонак яго спорнага, сціслага почырку. Я была акуратным рэспандэнтам. Яму быў патрэбны такі

Яго лісты Не толькі ў мяне, вядома А я, перагортваючы іх — перакладзеных паперай бібулковай,— баюся дакрануцца. лісткі клёну, пялёсткі браткаў, бэзу яшчэ нейкіх кветак,— яны рассыпаюцца ад дотыку І застаецца бэзавы попел Бэзавы попел Тут свой патаемны сэнс. Той, які ўкладваў у яго Барыс Пастарнак.

Некалі я адпісала Міхасю ў Мазыр, што не маю права адна валодаць такой раскошай — ягонымі вершамі Ён надрукаваў іх.

То і гэтымі лістамі я адна не мела права валодаць. Пэўна

Мабыць, было б больш этычна — і разумна!— дачакацца моманту калі цвярозы рэалізм прыроды нават усіх эўдэманістаў прыводзіць да той рысы, што неаспрэчна дае права на думку —ultima ratio смерць — апошні довад усяго І трэба было б, прыгожа-традыцыйна ўклаўшы рукапіс свой і арыгіналы лістоў Міхася Стральцова ў тэстамент, пакінуць нашчадкам гэтую турботу Але — што будзе пэўным, калі ўжо і мая воля захлынецца зямлёю ці попелам крэматорыю? Таму і пазначыла я сабе публікацыю як права. Не — як абавязак. Хаця б таму ўжо, што ў лісце сваім, без даты (на канверце — 19 IV.82 г.) Міхась Стральцоў пісаў· «Гэтым разам я не буду такім увішным, як мінулы раз — не назнарок, а таму што ўчора, у чацвер ніяк не здолеў табе адпісаць, і тое пісьмо, ненапісанае, не пайшло раніцай сёння, а раніцай быў апошні тэрмін пошту цяпер забяруць толькі ў панядзелак. Два дні калі не болей, для нас з табой прападуць.

Але ўсё роўна пішу вось у пятніцу суцяшаючы сябе тым, што калі захачу магу прадоўжыць і заўтра, і паслязаўтра — нешта накшталт дзённіка распачаць можна»

А ў лісце ад 30.VI таго ж года зноў даводзіў· «Пра жыццё-быццё сваё «дыярыуш» так сказаць, свой я табе так ці інакш выкладаю» То, мабыць, усё ж — абавязак ёсць. Перад Стральцовым. Перад яго памяццю. І ў абарону таго, што яго пяро не згубіла свае здольнасці — мне даводзілася чуць, што празаік Стральцоў «все, что мог уже совершил» І таму, што драма жыцця Міхася Стральцова — у нечым і драма пакалення. Даючы фрагменты, эпізоды, абразкі гэтай драмы я хачу даць штрышкі, пункціры існавання яго як выразніка нашага пакалення Пакалення — маючы на ўвазе тых людзей, якім блізкі светапогляд Міхася Стральцова. Яго настрой Яго свет

Аповед гэты — і пра экзістэнцыю чалавечых адносін, першаіснасную самоту чалавека, пра падзею быцця, падзею існавання ў нейкіх важных сваіх выявах. Пра незалежную субстанцыю духа. Пра тое, як чалавек імкнецца дастасаваць сябе да людства і адначасова адстароніцца ад яго

«РАНІЦАЙ ЯСНАГА МАЯ...»

Фотаздымак (Міхась Стральцоў аддаў мне яго і іншыя здымкі пасля перадачы па тэлебачанні), на якім малады, нават малы яшчэ, раскудлачаны Міхась — заспеў нейкае гарэзлівае, імклівае імгненне. Нібыта бег ён з вясёлай гульні — і на хвіліну спыніўся, задыхаўшыся. каб бегчы некуды зноў. Каб адчуць «шумліва-порсткі, роспачна вясёлы» вецер, паслухаць «лапатлівых» вераб'ёў, падпільнаваць птушак на лясоўцы. Як герой ягонай аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» І мабыць, як ён, быў у атопках пасляваеннай пары І верагодна, ягоны дзед Міхась, як дзед Міхалка з тае аповесці, прасіў пана Бога за ўнука: «Пашлі выпрабаванні яму па сіле» Дзеда з матчынага боку, Міхала Ігнатавіча Кузьміцкага, Міхась Стральцоў згадваў нeяк у лісце. «. .дзед памёр надта рана для ягоных год, але першапачатковым выхавацелем маім, калі гэта, вядома, можна было называць на той час і ў тых умовах выхаваннем, займаўся ён»

Дык прыехаў гэты хлопец — Міхась Стральцоў — у сталіцу парой, якую пазначаюць «хрушчоўскай адлігай» У сярэдзіне 50-х гадоў У пару ашаламляльнага сацыяльна-грамадскага прарыву Было вернута натуральнае права на ўспрыняцце сапраўднай рэальнасці, а не фантомнага сёння дзеля светлага заўтра Праўда неўзабаве нам паабяцалі што мы будзем жыць пры камунізме. Аднак скептычнае наша пакаленне (рамантызм спакойна суседнічаў з самаіроніяй і скепсісам) успрыняла гэтую дэкларацыю як дэкларацыю — не больш Затое мы займелі права на самавыяўленне На сумніва. «Нас вырастил Сталин .» — догма нашага дзяцінства была абвергнута, мы вярнуліся да натуральнай высновы, што гадавалі нас бацькі, больш маці (таты нашага пакалення ці не праз аднаго загінулі на вайне), бабкі дзяды цёткі Дзіцячыя дамы.. «Я другой такой страны не знаю, где так вольно дышит человек. .» — гэтая прыемная ілюзія таксама знікла пасля першых афіцыйных звестак пра рэпрэсіі Неаспрэчнае веданне пра тое, што ў нас усё — самае лепшае, руйнавалася рэчаіснасцю Нашы парколёвыя «футболкі» пэўна не маглі канкурыраваць нават з немудрагелістымі світэрамі якога шатландскага вырабу — з'явіліся першыя пасылкі «адтуль» з-за кардону Лаліта Торэс спявала з экранаў пра цудоўны горад Паімбру таксама не ў лахманах, а Ліз Тэйлар то ўвогуле ў «Рапсодыі» не так выконвала ролю і ірала на фартэп яна (па ролі — яна піяністка), як дэманстравала сваю бездакорную постаць у недасягальна шыкоўных строях. Надавалі сацыяльнай самаўпэўненасці хіба што італьянскія неарэалісты — ваша галеча на нашу галечу· хто, так бы мовіць, пераможа

Галоўнае ж — пасля ўнармаванасці духоўнага жыцця выключна паводле мастацкіх узораў кшталту «Кавалераў залатой зоркі» і «Кубанскіх казакаў», пасля па сутнасці суцэльнай забароны пэўных тэм плыняў, стылю, манеры пісьма ў літаратуры мастацтве з явіліся Хемінгуэй і Рэмарк, Олдзінгтон і Дос-Пасас, Быкаў і Брыль. Займелі зноў літаратурныя і чалавечыя правы Дубоўка і Скрыган, Ахматава і Цвятаева Пачалі з'яўляцца і згадвацца творы Сент-Экзюперы, Сартра, Камю, Ануя Гамсуна Както. . З явіліся фільмы Дэ Сіка Феліні Вісконці, Уайлера, Фішэра, Крэмера, Карнэ. З цэлым гуртам зорак. Жан Габэн Жэрар Філіп, Жан Марэ, Алан Дэлон, Сімона Сіньярэ, Бэт Дэвіс Марлен Дзітрых, Віўен Лі Марына Ўладзі, Одры Хэпбёрн, Грэгары Пэк, Максіміліян Шэл

Мы глядзелі «Ляцяць журавы» Р Калатозава «Баладу пра салдата» Р Чухрая «Гамлета» Р Козінцава і «Звычайны фашызм» М Рома З явіліся новыя творы А. Твардоўскага усіх скалануў «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» А. Салжаніцына Пачалі друкаваць І Бун на Пісаў сваю новую прозу В Катаеў «Святы калодзеж» «Алмазны мой вянец» Увараходзілі ў літаратуру Юры Казакоў, Алег Бітаў Георгі Сямёнаў

Пасля бясконцых рэпрадукцый накшталт «Ленін і Сталін у Горках» і «Раніцы ў сасновым лесе» мы гарталі, зачытваліся, глядзелі «Гісторыю імпрэсіянізму» «Ад Манэ да Латрэка» Ліянела Вентуры, праглыналі ўсё, што з'яўлялася пра Пабла Пікаса і Сальвадора Дал Чыталі ўсё, што трапляла пад руку пра экспрэсіяністаў сюррэалістаў кубістаў Да «замруцэня гловы» ўглядаліся ў альбомы рэпрадукцый старых майстроў Хапалі як гарачыя піражкі польскую прэсу, пільнавалі «Иностранную литературу» і «Новый мир»

У Саюзе візытавалі Іў Мантан і Жэрар Філіп Гелена Лаўбалава ў атракцыйнай чырвонай сукенцы фацэтна какетавала галаскам з мілым акцэнтам «Крьасную рьозочку крьасную рьозочку я тебе дарью .»

Мы запісвалі на рэнтгенаўскую плёнку Булата Акуджаву Уладзіміра Высоцкага Зачытваліся Максімам Багдановічам адкрываючы для сябе наноў «хрэстаматыйнага» паэта Даведваліся пра тое, што ў беларускай культуры былі Браніслаў Тарашкевіч, Мікола Шчакаціхін, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Браніслаў Эпімах-Шыпіла Ядзвігін Ш Зоська Верас. Антон Луцкевіч Вацлаў Ластоўскі, Язэп Лёсік. Але тут дзверы зачыняліся Нельга не дазволена, не пажадана

Канец 50-х — пачатак 60-х. Ілюзіі надзеі спадзяванні

Было вернута права на лірыка-філасофскую прозу На інтымную тэму На камернае так бы мовіць, светаўспрыманне. Хаця ўвесь час афіцыйная перавага аддавалася эпахальнаму маштабнаму, падкрэслена сацыялагічнаму І ўсё ж.

Падавалі — упэўнена і па-ранішняму свежа — галасы Уладзімір Караткевіч Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі Яўген Яўтушэнка Андрэй Вазнясенскі Бэла Ахмадуліна. Вера Вярба. (Славутых сёння Іосіфа Бродскага, Уладзіміра Сакалова мы прачыталі пазней)

Было вернута права на скепсіс. На іронію. На парадаксальнае мысленне Абнаўлялася рэчаіснасць Рабілася іншай літаратура Дарэчы не тольк ў разварушаным ідэёвымі віхурамі Савецкім Саюзе. І там, на Захадзе, з явілася так званае раз'юшанае пакаленне· Джон Уэйн, Джон Осбарн, Джон Портэр. Там быў абвешчаны антыраман· Наталі Саррот, Алан Роб-Грые, Мішэль Бютор Зноў па ўсім свеце пайшла мода на парадоксы Бернарда Шоў і Оскара Уайльда, усе сцэны былога сёння Soviet Union бралі ў палон «Варшаўская мелодыя» В Зорына (пра нешчаслівае каханне полькі і рускага) і «Двое на арэлях» У Гібсана (таксама — гісторыя кахання), праўда гэта крыху пазней, на схіле 60-х.

А ў сярэдзіне 50-х юнака са Слаўгарадчыны, з вёскі Сычын, Міхася Стральцова у горадзе Менску сустрэлі сінкопы яшчэ мала дазволенага ў нас джаза, хаця рытмы класічнага дыксілэнда паўсюдна ўжо ірваў на часткі пераможны рок-н-рол. На пляцоўцы ж паміж інтэрнатамі універсітэта на Бабруйскай і хім- і фізічным карпусамі акуратна вальсавалі — «шэрачка з машэрачкай» — учарашнія дзесяцікласніцы смела пратоптвалі падэшвы вальсбастонамі спрактыкаваныя танцоры старанна-зухавата перам наліся з нагі на нагу урбанізаваныя «элементы», рытмічна млелі ў танга парачкі «Домино домино, будь веселым не надо печали»,— гнаў распеўна радкі ўзмацняльн к. «Ты ходишь в галстуке ты куришь сигареты»,— вясёла ці то папракаў, ці то канстатаваў нехта борздзенькім рытмам Пераможна-

няголасна грымела «Мишка Мишка где твоя улыбка .» А на юрфаку, дзе месціўся з канца 50-х і філфак (журналісты былі ў яго складзе), адбывалася нешта і зусім па тым часе забароненае: мясцовы аркестрык жвава «выдаваў» рэпертуар Элвіса Прэслі і Дзіна Рыда I куляліся, скакалі юрысты, філалагіні журналісты — ажно да вялікага гневу мясцовых камсамольскіх улад. Якія, дарэчы, у супольцы з рознымі актывістамі вялі цяжкія «ідэалагічныя» баі якую шырыню павінны мець штаны ў савецкага маладзёна і як гэная шырыня адбіваецца на ягоным інтэлектуальным узроўні і патрыятычных пачуццях.

А насупраць філалагічна-юрыдычнага корпуса была наша сапраўдная Alma mater — «Ленінка», сённяшняя Нацыянальная Дзе мы і набывалі па праграмах а больш самапасам — адукацыю Чыталі клас каў і некласікаў Здаецца Міхась Стральцоў «Ленінку» не вельмі наведваў, любіў спасцігаць мудрасць у больш камфортных, хатніх умовах. Як і не быў заўзятым танцорам. Але. і ён, і яго героі жыл ў тым часе Дзе былі тыя ж «захвыцэнні» тыя ж гукі, тыя ж кнігі. Як згадваў яго герой-равеснік з аповесці «Свет Іванавіч былы донжуан» «Недзе на трэцім курсе я адпусціў доўгія валасы — тады гэта было модна I падняў каўнер курткі — гэта таксама здаецца. лічылася што няблага Тады катастрафічна увачавідкі вузелі ў хлопцаў штаны, затое так прасторна было плячам пад шырачэзнымі пінжакамі Праўда гэта ўжо мяне не датычыла Доўгія валасы — няблага I падняць каўнер — таксама Я чытаў тады французскія раманы Эміль Бландэ, Люсьен Рубампрэ Галантны век дасціпнасць I скепсіс»

У кожнага з нас быў свой час спасціжэння «Страчаных ілюзій» Я праглынула 13 тамоў Бальзака, якія толькі што выйшлі з друку карычневыя асобнічкі адзін да аднаго недзе ў 9-м класе, і прыблізна тады — Стэндаля Уайльда Шоў герой Міхася Стральцова — на трэцім курсе. Некалі прачытаў іх і сам Стральцоў Наша пакаленне адкарасквалася ад Бабаеўскіх і Кочатавых, мы мелі інтарэс да замежных раманаў Рамэна Ралана Томаса Мана Рожэ Мартэн дзю Гара, Джона Голсуорсі I тыя самыя раманы Фільдзінга Дзікенса, дзе «шматпакутныя героі пад эпілог сыходзіліся на ласкавы агонь камінка За апушчанымі шторамі выў халодны восеньскі вецер. Кам нак быў узнагародай Цаной былой неўладкаванасці і нягод» Ва універсітэцкі і пазнейшы час пра ўсё гэта мы, як і герой Міхася Стральцова згадвал з іроніяй Самаіронія рабілася зброяй самаабароны пафас быў прыладай састарэлай і штучнай

У польскай перыёдыцы мы чыталі Пруста і Кафку

Героі таты Хэма крышылі ўсе ўяўленні пра свет і пра нас Разгортвалі новую кнігу і чыталі «А потым што мы рабілі?» —спытаў ён» I ўсё — ніякіх табе прэамбул. тлумачэнняў апісанняў Мы адчувалі на сабе ўздзеянне таго самага таямнічага падтэксту разуменне якога пазней зацягалі заштампавалі а ў нас, на Беларусі так і не навучыліся ўспрымаць беручы пад увагу як адзіна магчымую, так бы мовіць, нацыянальную школу апісальна-крытычны рэалізм, падрабязны непаспешлівы грунтоўны Так і толькі усё астатняе ад «лукавага». Праўда, Міхасю Стральцову непадобнасць ягоную неяк даравалі. Ён пачынаў не «расцякаючыся думкаю па дрэву». «У тэлефоннай будцы было двое. я ненавіджу іх» Вы не знойдзеце такога пачатку ні ў кога з ягоных літаратурных равеснікаў Хацця да ўсіх прыйшла літаратура якую даўно не друкавалі ў Саюзе Хаця ўсе былі «дзецьмі XX з езда» «дзецьм вайны» амаль усе — «з хат» Праўда вось гэта было канкрэтнай рэал яй для ўсіх. «Партрэт «бацькі ўсіх народаў» пыліўся ў інтэрнацкай шафе-кладоўцы» Рэаліяй што давала магчымасць думаць па-рознаму, успрымаць па-рознаму Было такое ўяўленне падчас чытання Стральцова — у нечым гэта аб'ектыўная а ў нечым суб ектыўная рэальнасць Таму што час, пал тычныя абставіны — Стральцоў пазначаў штрышком Яны прысутнічалі і досыць відавочна — скажам, адзін лапаць, адзін чунь з яго аднайменнай аповесці рэаліі ваеннага, пасляваеннага часу. Але яны — толькі штуршок для аповеду Стральцоў экзістэнцыяльна ўспрымаў свет і падзеі — у яго ў цэнтры ўвагі асоба чалавек. Астатняе фон — гістарычны, сацыяльны, падзейны. Абставіны рэчаіснасці Якія Стральцоў умеў пазначаць сціпла і трапна, не любіў сумна-сумленна расцягваць на безліч старонак. «Я — малафарматнік».— гаварыў ён Крыху пацвельваючыся

Хлопец з вёскі Сычын меў прыроджаны тонкі, выкшталцоны густ Адразу займеў арыентацыю на ўзровень мыслення і пісьма класічна дасканалы Любіў і ведаў «гудящие строфы» Эсхіла і Піндара, «литургийно стройное и прекрасное» сярэднявечча. высілкі «неуемного разума» новага часу. I, дарэчы, нейкую асаблівую зваблівасць мелі для яго паэты пушкінскай пары і сам «абраннік сонечнага Феба», і сядзібная «усадебная» культура XIX стагоддзя З XX стагоддзем адносіны ў яго быў уважліва-складаныя Ён падоўгу трымаў кніжкі, што браў у мяне: Ж.-П Сартра («Экзистенциализм — это гуманизм» «Слова» «Пьесы»). Тэяра дэ Шардэна («Феномен человека»), Бертрана Расэла («История западной философии»), Рожэ Гарадзі («Реализм без берегов»), Самарыя Велікоўскага («Грани «несчастного сознания»).

Гэта, праўда, было ўжо ў 70-я, 80-я гады. А на тую, маладую пару яго не мінулі, здаецца, усеагульныя «ідалы». Згадаем хаця б гэта у «Дні ў шэсцьдзесят сутак» «Сцеражыцеся рыбы-лоцмана!» Назва раздзела «паўночнага дзённіка», увесь гэты раздзельчык «адступленне літаратурнае» — пра Хэмінгуэя Пра рыб-лоцманаў што цікавалі і за Хэмінгуэем, і за Чэхавым (Стральцоў прыгадвае тут яго). Мы, мабыць, можам дадаць — за самім Стральцовым. I пра тое, што «літаратура была для Хэмінгуэя адным з даступных чалавеку сродкаў сцвярджаць сваю годнасць» і пра тое як яго «брала ў палон даведзеная да самай звычайнай рэальнасці ілюзія перададзенага словам жыцця». I Стральцоў меў жыццёвыя і літаратурныя прыхільнасц свайго пакалення той яго частк для якой ён пісаў Ці чытала яна яго? Пытанне не простае I пра гэта крыху пазней А тады мабыць і Стральцова як усіх нас ваб ла нязвыкласць нязмушанасць, натуральнасць герояў Хэмінгуэя інтрыгаваў іх стыль жыцця Жалезная заслона толькі-толькі скрогатна цяжка падымалася а героі Хэмінгуэя сёння — у Парыжы, заўтра на бoі быкоў у Памплоне пасляз аўтра — на сафары ў Афрыцы Мы ўзбройваліся скепсісам Генрыха Бёля і Эрыха Марыі Рэмарка « бліскуча замілаванае нішто уталентаванае ў сваёй нікчэмнасці» «Хто ні на што не спадзяецца, не будзе расчараваны» «Толькі не прымаць нічога блізка да сэрца Тое што прымеш, маеш намер утрымаць, а ўтрымаць нельга нічога» Мы адпрэчвалі плакатна-пустазвоннае ўчора Мы хацелі адкаснуцца ад стэрэатыпаў

Мы вызваляліся ад пафасу бацькоў і дзядоў ад ілжэідэалогі ад ілжэідэалаў мы пагарджалі наменклатурнымі чыноўнікам ранічна-скептычна ставіліся да афіцыёзу Вышэй за ўсё для нас былі звычайныя чалавечыя адносіны шанавалі перавагу інтэлекту і таленту але не перавагу пасады Не мелі пашаны да маёмасці Пра грошы гаварыць не было завядзёнкі Спытаць — колькі зарабляеш?— было дурным пачварна дурным тонам

Дарэчы сказаць, высокія чыны ўвогуле чыны мала хто займаў з нашага пакалення Калі займелі — досыць позна. Напачатку лічылася — занадта маладыя «сталінская гвардыя» моцна трымала пазіцыі калі прыйшоў да ўлады Гарбачоў было пазначана спачатку неаспрэчна — старыя, у архіў Хаця крыху пазней наша пакаленне аказала сябе вельмі актыўным вырашальна актыўным — і падчас так званай перабудовы падчас пазнейшых падзей Але гэта ўсё рэплікі «ў бок» як пазначаюць драматургі Большасць — не імкнулася да пасад. «Не прымяраў мундзіраў» —гэта пра сябе мог сказаць не толькі Рыгор Барадул н (яго словы). А і Уладзімір Караткевіч і Васіль Сёмуха і Арсень Ліс, і безумоўна Міхась Стральцоў «У пісьменніка няма іншай кар'еры, акрамя творчай» — словы таго ж Хэмінгуэя I яно заўсёды было так, як у ўсе часы Але на нашу пару — пачынаючы ад 30-х гадоў — адукаваныя мецэнаты зніклі, за кіраўнічыя сталы траплялі вельмі рэдка людзі дасведчаныя і талерантныя звычайна з трафарэтным і ваяўніча выпрастаным уяўленнем Хаця — літаратурнаму пакаленню Стральцова пашанцавала у «Полымі» на пачатку іх літаратурных спроб быў Максім Танк. у «Маладосці» — Пімен Панчанка Прозу Стральцова блаславіў Янка Брыль. Аднак — у выдавецтве, што выпускала мастацкую літаратуру тады былі дырэктарамі К.Майхровіч і Матузаў Гэта пры іх рассыпалі набор кніг Уладзім ра Караткевіча Гэта пры іх рассылаліся загады і вердыкты — што можна што трэба і што не трэба пісаць.

Міхась Стральцоў выбраў сабе шлях, які ў 60-я 70-я гады ніхто не забараняў асабліва не заахвочваў Не лаялі а так пашкрэбвалі словам немаштабна, камерна, неактуальна Лірычна-філасофская проза Крытычная проза Пазней — паэзія Тут было выратаванне Тут была трагедыя

Наша пакаленне ў відавочныя маразы пасля адлігі «залегла» ў рамантычна-апалітычны дрэйф «А я еду, а я еду за туманом за туманом и за запахом тайги» — гэтую немудрагелістую мудрасць падхапілі невыпадкова Бегчы — было яшчэ магчыма I не толькі за мяжу (гэта было досыць складана між іншым). Хаця ведама выяўлялася што ў тайзе або каля праліва Лаперуза — тое ж самае што ў роднай Беларусі ці дзе-небудзь у так званай сярэдняй паласе нашай былой неабсяжнай «Вясёлую планету» Калыму здаецца так актыўна ўжо не асвойвалі аднак трапіць у псіхушку ці проста ў спісы нядобранадзейных было вельмі проста Узварухнулася абудзілася была надзея на ўзнаўленне калі не Адраджэнне беларускасці — і пайшла пад лёд пасля адлігі Адлучэнне ад беларускага ішло неўпрыкметку нібыта але запланавана няўхільна Паводле прадпісанняў тэорый пра адміранне нацый. З явіліся «ліберальныя» паслабленні хочаш — вучы не хочаш — не вучы У навучальных установах знікла мова На ўсіх узроўнях. Забываліся на мову тыя хто яе ведаў нашы аднапеткі Які інжынер якая лекарка мелі нармальную магчымасць гаварыць па-беларуску? Пісалі пра нашу мову Уладзімір Караткевіч, Рыгор Барадулін даводзілі выдатныя ўзоры літаратурнага існавання яе Вячаслаў Адамчык, Іван Пташнікаў Анатоль Кудравец, Іван Чыгрынаў Алесь Жук. Пакутна раздумваў пра «загадку Шамісо» Міхась Стральцоў у «Загадцы Багдановіча» Тут было выратаванне Тут была трагедыя

У канцы 80-х гэтае пакаленне папракалі Жылі ў застоі У турму не ішлі. Штандар нязгоды не выкідвалі. На мітынгі не выходзілі (далёка не зайшлі б, між іншым). Адным словам, мелі нахабства — існавалі. Паслухмяна запісвалі ў анкеты «Не быў», «Не ўдзельнічаў», «Не маю» Так.

І захоўвалі свабодны дух. Хаця «ламаліся» нашы равеснікі, тыя, хто нарадзіўся ў канцы 30-х — пачатку 40-х, часцей, як больш старэйшыя ці маладзейшыя. Адны, старэйшыя, набылі жыццёвага вопыту і маўклівага скепсісу яшчэ пры «правадыру ўсіх народаў» Маладзейшыя — набывалі імунітэт самазахавання ў брэжнеўскія часы Мы, загартаваныя ў дзяцінстве лозунгамі накшталт «За справу Леніна—Сталіна будзьце гатовы!» —«Заўжды гатовы!», у гады сталення і ўзроставага максімалізму паверылі «назаўсёды» культу асобы не будзе таталітарызму не будзе, хлусні не будзе. Рамантызм, высокія ідэалы, іронія, скепсіс, вера і нявер'е — усё перакруцілася ў досыць складаны скрутак А тут пачалося — інверсіі, эўфемізмы «быў рэпрэсіраваны», праз пару гадоў — «трагічна загінуў», яшчэ праз нейкі час — дабрачынна «памёр» Пра ўсіх ахвяр 30-х гадоў Прывучаныя да аскетызму як да нормы жыцця, існавання — мы бачылі, што гэтыя прынцыпы ў пару «развитого социализма» не маюць цаны, увогуле пачаліся масавыя «абмены» — купля-продаж на масавым, прымітыўным і нейкім бессаромна-танным узроўні

Праўда, можна было цешыць сябе «маленькімі радасцямі»· чытаць кнігі (яны былі досыць танныя і з'яўлялася багата цікавага), хадзіць у тэатр (у 60-я гады быў сапраўдны тэатральны бум), слухаць музыку (сур'ёзныя, класічныя творы былі не толькі ў пашане, былі ў модзе: неблагая мода), хадзіць у кіно (а глядзець было што — фільмы Бергмана, Антаніоні, Андрэя Таркоўскага). Дарэчы, напрыканцы 50-х, у 60—70-я гады мы слухалі Святаслава Рыхтэра, Эміля Гілельса, Давіда і Ігара Ойстрахаў, Віктара Траццякова — білеты былі недарагія, а пазнейшага абавязковага «блату» нішто не вымагала. білеты набываліся проста ў касах. Мы слухалі Баха, Моцарта, Шапэна, Шумана, Паганіні, Вівальдзі А Брамса і Ліста выконваў выдатна наш менскі філарманічны аркестр. Дырыжыраваў — як дырыжыраваў!— Віктар Дуброўскі

Можна было прыдбаць новыя пантофлі, з'есці смачных цукерак, паспрабаваць паехаць за мяжу, дыхануць «пылам стагоддзяў» (гэта было досыць складана але магчыма). Пайсці ў кавярню, выпіць кубачак кавы, келіх віна Адчыняліся сімпатычныя кавярні якіх раней не было (на тую пару, калі я пішу — у 1991—1992 годзе кавярні робіцца прытулкам для не, не для эліты, а для абраннікаў Мідаса — праўда, модны сучасны Мідас мае палёгку· можа ператвараць і наадварот· золата ў рэчы і рэчывы).

Шмат было дробязных і менш дробязных, і вызначальных — прывілеяў што былі даступныя кожнаму На побытавым узроўні На свядомасным

Можна было колькі хочаш раздумваць пра лёс свой Лёс народа Шляхі чалавецтва Тут было выратаванне. Тут была трагедыя

Цяпер, калі я пішу гэтыя радкі, вельмі модна выдаваць сябе за ахвяру рэжыму пакутніка Нават тым, хто няблага ўладкоўваўся ў розныя часы Не быў ані бедным, ані «ніцым»

Міхась Стральцоў не выдаваў сябе за пакутніка Не адчуваў сябе ім Не быў ніколі прыстасаванцам Жыў у рэчаіснасці І ў свеце, створаным ім самім У той рэальнасці, якую ён назваў —«Мой свеце ясны» Беларускае слова для яго было натуральным, сваім нязмушаным. Ён не змагаўся за яго, не Ён жыў ім. Ён і ў тую пару што я пішу гэтыя радкі, наўрад ці займаў бы трыбуны, наўрад ці зрабіўся б членам якой партыі Ён быў сузіральнікам Філосафам па натуры Душу свайго народа адчуваў глыбінна сутнасна. Першаісна. Вылсловіў гэта Непасрэдна — больш у «Загадцы Багдановіча», апасродкавана — ва ўсіх сваіх творах. Ці адчуваў трагедыю беларускага слова? Безумоўна Як змагаўся за яго? Адпаведна з прыродай свайго таленту і чалавечай натуры

Пра творчасць, пра творчую асобу думаў заўсёды Не толькі пра літаратараў.

ЗАГАДКА «НАЗСКІХ» НАТУР

Вось і ў адным з тых лістоў пазначыўшы з сумнаватай іроніяй абставіны свайго быцця «дзяліцца асабліва няма чым тое, што акаляе ці стаецца ўтокам быцця — аднастайнае як расклад, а ў нутро сваё, сказаць праўду, заглядваць не хочацца. нехай там мірна спяць і анёлы, калі яшчэ кволяцца трохі, і другія, інфернальныя так сказаць, істоціны і стварэнні» ён працягваў адказ на мой ліст·

«Толькі вось твая згадка пра Шапена ўзварушыла трохі мяне і ўспомніліся свае хвіліны з панам Фрэдэрыкам і кніжка, здаецца Яструна [так], пра яго, між іншым, неблагая — ёсць і яшчэ нейкая адна, не яго («Воблік любві» — (Брашкевіч?) ці як?) [так] — праглядаў некалі — не спадабалася. Пра Шапена цікавае ёсць у артыкулах Метнера, таго, які сябраваў з Рахманінавым быў сам неблагім кампазітарам, але [нечытэльна] па-мойму цікавым тэарэтыкам гармоніі

Праз Шапена добра адчуваеш назскую натуру — не ў той іпастасі у якой, скажам, гэта вонкава (часта) падаецца ў Веняўскага ці ў куды як слабога залюбёнага абывацелем Агінскага У Шапена амаль намёку няма на рамантычныя транты — каласальная логіка імправізацыі пры ўсіх нерастрачаных «расё і пылку» (водару) успамнення пра пачуццё,— і геніяльная настр529уненасць, аркестроўка (на фартэп яна) [мабыць, ён меў на ўвазе — аранжыроўку] сугуба назскага ладу рэфлексіі (гэта ў іх ёсць),— і гэта ўжо як бы іхняя нейкая загадка Адна са славянскіх загадак так званых, а назская — асаблівая»

Увогуле Міхась Стральцоў быў з тых, для каго існасць рэчаў падзей і свет літаратурны, мастацкі былі заўсёды відавочнай рэальнасцю, неад'емнай Не ў рэчышчы дурной літаратуршчыны а ў тым неад емным сэнсе які дае існаванню чалавека высокая культура Калі свет ужо не ўяўляецца без Дантэ і Скарыны без Рафаэля і Моцарта, без Блока і Багдановіча

Не, жыццё не было для яго толькі літаратурным матэрыялам. Першая і другая рэальнасць суіснавалі ў яго ўсведамленні Ён вельмі тонка адчуваў код узаемаадносін паміж існасцю і мастацтвам паміж «перадмастацтвам» і ўласна творчасцю. Паміж шэрай звычаёвасцю і таямніцай Таямніцай чалавека, асобы творцы Жанчыны Раздумваў над тым Меціў задумамі. Згадваў пра няспраўджанае. Можа у эпісталярным жанры гэта ўсё не мела той эстэтычнай крышталёвай завершанасці, як, скажам у «Смаленні вепрука», але мела сваю стыхію дакладнасці, сваю дысцыпліну роздуму і пачуццяў Прырода яго чалавечага таленту змяшчала ў сабе непадзельнасць роздуму і ацэнак, плыні жыцця і ўсведамлення яго Як і таленту пісьменніцкага

«Во — хацеў я аднойчы напісаць апавяданне пра танцпляцоўку (даўно) і задума, здавалася, цікавая была нябожчыку Рылько [Алесь (Аляксей Іванавіч) Рылько — празаік, публіцыст драматург] нападпітку неяк расказаў, а ён уталопіў вочы ў мяне, доўга глядзеў неяк тужліва-хітравата, як гэта ён умеў а потым кажа нешта накшталт гэткага· а ты даўно, хлопча, каровы пасвіў, касіў ці дровы пілаваў? І пра Дастаеўскага нешта сказаў і пра ягоную «хромоножку» са Стаўрогіным — маўляў вывіх і выбрык. Разумны быў чалавек, і мы гадамі розныя сябравалі, можа, па-сапраўднаму а больш ён нібы бацька мне быў А пра Даст.[аеўскага] ён сказаў нездарма у мяне ў той задуме нейкім саматужным Фрэйдам патыхала ён гэта неяк адразу зразумеў А задума ці не забылася памятаю толькі і цяпер чамусьці ўпэўнены, што далібог неблагая была Калі-небудзь, можа, успомню, нечага з другога вопыту дадам і дадаўшы, можа напішу Бо начытаешся, як У з В «живописуют» жанчын і каля, дык не па сабе неяк робіцца і тэмы шкада, і праўды шкада, той праўды, пра якую стары Талстой (у адносінах да жаноча-мужч.[ынскай] прабл.[емы]) выказаўся неяк так. я пра тое голас падам калі адной нагой у труне буду і выкажуся, шасну ў труну і векам накрыюся Так. здаецца Горкі перадае — чалавек, які выдумаў сябе і выдумляў другіх, страшная ў яго гэтая ўласная выдуманасць, упэўненасць дзяка ці царкоўнага начотчыка Можа, адзіны з рускіх літаратараў вёску не разумеў і не любіў Яно дык любіць, канечне, мала за што можна, але ягоная яўная, а часцей схаваная, варожасць да інтэлігенцыі даказвае толькі тое што ён самавук і тое, што інтэлігентам трэба нарадзіцца Прапаведваць веды з аднаго боку успаўляць волю і нейкага чалавека, паднаўляючы зноў жа саматужна Ніцшэ, і забыць пра Акакія Акакіевіча як гэта было ў Горкага,— гэта і не па-руску неяк і не па-асветніцку нават Пану грамата цяжка даецца, а калі даецца, дык прымаўкай робіцца нездарма

А наогул, самавукі небяспечныя людзі — гэта можна ўбачыць, напрыклад, і на нашым S. Прыгледзьцеся

Надвор'е ў нас даўно ўжо сапсавалася — сырасць, макрэча — не ведаю, як у вас. Радыё я не слухаю, ды і ўключаюць яго прапары цэнтралізавана, так сказаць, калі захочуць. Футбол я не гляджу Вось пішу табе (гэта раніцай палова восьмай, да паверкі) — дождж шастае. а ў мяне круцяцца рубцоўскія радкі

Седьмые сутки дождь не умолкает —
И некому его остановить!
Все чаще мысль угрюмая мелькает,
Что может всю деревню затопить.

Цытую па памяці, таму і сумняваюся Неяк так. Там яшчэ, здаецца ёсць радкі «на кладбище, как будто крокодилы, ворочаются спятивши, гробы»[4] Бр! Мальчишка Часто «смешной и милый», кажется у него эта страсть пугать и легкомысленничать. Вроде:

Прозрачно небо голубое,
Прозрачен воздух голубой
Какое место вам? — Любое!
Любое время, край любой![5]

АХ ТЫ, БОЖА МОЙ!

Як яму ў тым абраным ім ці некім другім краі цяпер, адзін бог ведае Напрадракаўся «Я умру в крещенские морозы» Так, здаецца і было. Някрасаўскі пейзаж нейкі над намі да Кальцова не дараслі ці перараслі,— распяшаліся. Але нешта я сумнае пад дождж пачаў — не буду Вось табе зноў славянская рыса» (5 VI.82).

Засталося ненапісаным і тое апавяданне і ншыя апавяданні эсэ Стральцоў не любіў ні саматужнай нудоты прымусу і самапрымусу не апускаўся да хуткапісу важных праблем Увогуле ж — задумваючыся над безданню і вышынямі чалавечых пачуццяў і розуму выяў жыцця існавання заўсёды заставаўся ў арэале Быцця не пацвельваючыся з Небыццём з тым што па-за рысай нашага існавання

Загадка ж творчасці і творцы заўсёды мабыць займала яго. Заўсёды меціла яго думку Часам і перашкаджаючы Не даючы спраўдзіцца намерам Ці можа нават замінаючы першаадчуванню, ці што, жыцця І — прыходзілі вось такія згрызотныя думкі Думкі ягоныя — наконт свайго занятку, і наконт маласпрыяльнай нашай глебы для сапраўднага таленту. А дзе, дарэчы для таленту — спрыяльная глеба?

«А **толькі** літаратурай займаюцца ў нас ці адпетыя дурні накшталт мяне (ды каб жа яшчэ займацца было можна, седзячы за айчынным дротам) [ЛПП — лекава-працоўны прафілакторый], ці чыноўнікі, якім здаецца, што без іх **літаратура** загінула б і тут ужо яны аддаюцца ёй цалкам, няўхільна шнуруючы яе пад ранжыр,— хоць тут ужо можа не літаратура, а нейкая кітайская плантацыя А С і Д. стаяць над гэтай плантацыяй і ў калатушкі б юць — адпуджваюць вераб'ёў Ну іх!»

«Кінуць бы ўсё гэта, ды вось бяда — позна нічога другога не ўмею а вучыцца другой навуцы — калі? Ды і ранейшае такое-сякое ўмельства, па-праўдзе, растрачана ўжо .» (На канверце дата — 29.5.82.)

Думка гэтая, пра тое, што ўжо ўсё растрачана і Стральцоў «адпісаўся», была вельмі ж папулярная ў так званым літаратурным атачэнні Я нездарма зноў згадваю яе

Міхась Стральцоў часам, не толькі са мною уголас даводзіў думкі свае асабліва ў якую роспачную хвіліну У лістах ён пісаў нават такое: «Усе мае (амаль усе — бо не паверыш) кволыя літздольнасці і скупыя вольныя хвіліны забіраеш ты .» (12 VI 82). (Маюцца на ўвазе лісты.) Я так і не паверыла і зараз не даю веры Былі шматлікія абставіны, былі своеасаблівасці характару, была здаецца калі не лянота дык хісткая самадысцыпліна Было і такое: «А каму гэта трэба? .» Сапраўды талент тонкі, ламлівы, элітарны Не з тых, кім захапляюцца хатнія гаспадыні і дзяўчаткі з універмагу Ці хлопцы з ПТВ Я не збіраюся прынізіць ні тых дзяўчатак, ні тых хлопцаў Там таксама між іншым ёсць выключэнні Але ж каб слухаць Баха, трэба мець хаця б прыродную схільнасць да гэтага Сякую-такую падрыхтоўку, накіраванасць менталітэту і пачуццяў Ну і ўсё ж нейкія ўмовы передумовы. І Гегеля не ўхопіш, прызвычаіўшыся чытаць выключна дэтэктывы І Поля Валеры наўрад ці агораеш калі вока і розум шукаюць адно: хто каго любіў хто каго забіў Патрэбны чытач што ўмее размежаваць побытавую і пазазвычаёвую свядомасць.

Чытаць Міхася Стральцова — таксама трэба мець і пэўныя схільнасці і пэўныя варункі Гэта пісьменнік для людзей падрыхтаваных. Разумова і духоўна. Пісьменнік вытанчаный празрыстай мовы Беларускай мовы На рускай мове таго Стральцова, якога ведалі мы ужо не было. І Міхась Стральцоў фатальна рабіўся пісьменнікам для вельмі вузкага кола людзей Хто ведае? Хто чытае? Была, мне здаецца, і яшчэ «стрэмка» Ці хутчэй, «стрыжнявая» «зацыкленасць» Натура, якая міласцю сваёй вялікай Боскай, дорыць талент, «выдае» да яго і бясконцага сумніву незадаволенасці сабою і іншымі, і прагу абсалюту Абсалюту ва ўсім У стасунках высокага розуму і пачуццяў У звычайных побытавых з'явах. У адносінах з людзьмі — увогуле. З сябрамі З жанчынамі Абраннікі Боскія ствараюць вобразы Прагнуць гармоніі А рэчаіснасць падкідвае мітусню і сурагаты Замест сапраўдных пачуццяў Высокіх ідэяў Бездакорных адносін

І поўзае чыноўнае вока па выпакутаваных радках, дзе словы — і міласць і дараванне і дабро, і Зло і пакуты, і шчаслівы крок лёсу Расчыненая Кн га Быцця І чалавечае «я» сціскаецца ад гэтых позіркаў ад чужой знешняй сілы бунтуе супраць ахвяравання супраць парушэння існасных сувязяў І супраць мітуслівага нібыта клопату тых хто побач, хто перашкаджае існаванню на ўзроўні вышэйшых сутнасцяў І Чалавек, Творца бяжыць ад усяго, і недзе знікаюць раструшчваюцца думкі праекты ідэі

Складаныя адносіны звычайна здараюцца ў творцаў з уладамі (не будзем лічыць «лукавых царедворцев» стваральнікамі сапраўднага). Невыпадкова, мабыць, Міхась Стральцоў меў такую сталую схільнасць да рускай «усадебной культуры» Яму патрэбны был незалежнасць адстароненасць, магчымасць размысліць, быць вольным Мастакі ці не заўважаюць уладароў, ці бягуць ад іх — калі гэта магчыма Ці ўваходзяць у канфлікт Ці адкрыта змагаюцца

Але не будзем перабольшваць. Безумоўна «несть числа» тым, хто пакутаваў хто загінуў, хто пісаў у пекле ці пасля пекла, хто меў творчасць як зямны крыж і як зямное збавенне хто ведаў здраду і ўціск. Але «спісваць» усё на сацыяльныя варункі — ці то ў часы Мікалая І, ці то падчас сталыпінскіх рэформаў, ці то ў часы сталінізму ці ў часы так званага застою — таксама вульгарызатарства і спрошчанасць. Прыгонны лад, царскія сатрапы, паўстанні перавароты і рэвалюцыі сталінскі ГУЛАГ брэжнеўскія ўшчыльніцелі духу — было Усё гэта некага змусіла да подзвігу пяра некаму прысудам зрабіла духоўную смерць, некаму — зрабіла прымусам немата Але — былі і заўсёды застануцца — пры ўсіх уладах і ў самым росквіце эканамічным і палітычным і чалавечая зайздрасць (досыць заўсёды акуратна і абмежавана здольных Сальеры і так мала таленавітых, ад Бога — Моцартаў), і пэўныя абставіны лёсу і цяжкае Быццё ў свеце чалавека для якога норма — адыход ад нормы, а ўзлёты мяжуюць з наканаванасцю бездані урэшце, чалавек — гэта не толькі прыродна-грамадскае існаванне, гэта існаванне самога з сабой добрага і злога высокага і н кчэмнага прыгожага і страхотлівага У сваёй неад'емнай залежнасці ад людзей і ў сваёй суцэльнай экзістэнцыі калі ў самыя роспачныя, цяжкія хвіліны чалавек застаецца сам-насам ніхто і нішто не можа яму дапамагчы. ні спрыяльныя сацыяльныя абставіны ні каханне жанчыны ні прыязнасць сяброў, ні прывілеі службовыя ні дарункі Фартуны Лёсу Ні ўсмешка дзіцяці Ён сам-насам у сваёй Ладдзі Роспачы (паводле Караткевіча), сам сабе прысуд, сам сабе суддзя, сам сабе ратавальнік. Праз што? Праз вялікае ўзрушэнне Праз якую драбязу Праз нейкі патаемны імпульс. Праз. Тут у кожнага сваё. Мне так, прынамсі здаецца Але ад гэтага залежыць — здзейсніліся задумы ці не Спраўдзілася дараванае Богам ці не

Загадкі Загадкі Загадка Багдановіча Загадка Купалы Загадка Стральцова

Ад людзей розных даводзілася чуць. чаму Міхась Стральцоў напісаў мала? Чаму не пісаў апошнім часам?

Загадку гэтую Міхась Стральцоў панёс з сабой Але ён збіраўся пісаць Згадваў Прыкідваў Не згубіў ключы ад Сезама. Яго лісты — сведчанне таго. Яго эпісталярная проза Хаця сумніву, самазнішчэння ў іх — хапае. І роздуму — пра творчасць пра іншых пра сябе — таксама

.Неяк Міхась даслаў мне ў Каралішчавічы у стары Дом творчасці такі ліст Датаваны 12 08.82

«Гм, гм! Каралішчавічы Усе мы праходзім праз іх, як праз эдэмскія вароты, у сваім паляванні па забароннa-салодкую садавіну-пладавіну якой спакушае нас здзеклівы змій творчасці І мы, надаткусіў, грашым а хітры змей-спакушальнік, асляпіўшы і азяліўшы адно падсоўвае нам яблычкі-зелянухі замест райскіх пладоў ды воўчую ягаду замест блаславёнай смоквы.

Творчага палявання я табе, вядома, вунь як жадаю а так, у вольны час бязлітасна спаганяй аброк з матухны прыроды ў выглядзе звычайных грыбоў ягад, дажджоў вятроў і азону прагульвай вечарам і ранкам розных там Джэры і Джульбарсаў мо не перавяліся яшчэ? (І барані цябе бог сябраваць з літаратарамі-п яніцамі (нават для Сцяпана Захаравіча [Гаўрусёва] выключэння не рабі, выключэнне — для мяне), не ўваходзь у кантакты з прыезджымі інжынерамі і забеспячэнцамі з Мінскага трактарнага і аўтамабільнага, якія чамусьці маюць звычку там у гэты час адпачываць, успамінай лепш ншым часам мяне а дзеля гэтага пагляздзі, хто жыве ў 14, здаецца, пакоі з верандай (на першым паверсе) — там апошнім часам заўсёды жыў я Але захадзіць туды не заходзь — крый божа! Духу майго там усё роўна даўно няма таму сцены цябе могуць не прызнаць Не заходзь каб там нават жыў і настойліва запрашаў Міх[аіл] Навум[авіч] Герчык, празаік — чалавек прыкладны ва ўсіх адносінах і вялікі працаўнік.

У Каралішчавічах, гэтым патрыярхальным месцейку вядома, можна і жыць-пажываць, і працаваць, як, урэшце у любым месцы якое не паспела апрыкраць Мне, напрыклад, не тое што апрыкрала, а звыклася і адзінае, чым я займаўся ў апошні наезд, гэта шастанне па лесе, а занятак гэты я люблю Нават калі не знаходзіў грыбоў дык знаходзіў у якім-небудзь нечаканым месцы ўспамін пра тое, пра сёе.

Але, сказаць праўду калі-нікалі працавалася — са смяшком душэўным з тых. хто гнаў кожны дзень «норму» з самога сябе, што рашыўся-заахвоціўся і дасць бог якое-небудзь апавяданейка дагоніш да канца

Наогул жа,— не люблю я працаваць вось абдумваць бывае падабаецца бывае што думаецца нішто, што як бы расхінаецца на момант далеч нешта вабіць і зырчыць,— о, гэта харошыя хвіліны! Тут пастка, эйфарыя ці што, і небяспека палюбіць гэты працэс «парения» больш за пакутлівае «рабочае» назіранне да яго: а накш, без работы як яго ўтрымаць? Утрымаць можна ў памяці (ці надоўга?) або на паперы. Апошняе — і цяжэй, і ўдзячней. ці не так?

Аповесцейку сваю я колькі разоў губіў тым, што загарэўшыся ёю ужо як бы адчуўшы цалкам, не садзіўся ў час за стол — і перагараў Вось яшчэ, чаму самадысцыпліна ў працы — усё

ж вялікая рэч I справа тут нават не ў тым можа каб кожны дзень, як сцвярджаюць каторыя, пісаць — па-мойму, гэта лухта Танк, напр.[ыклад], кажуць, праклламуе' страляй і галку і варону — мо — і ў каршука ці арла патрапіш Можа Але качак і варон не абавязкова страляць «на паперы» і не абавязкова ўсенародна прад'яўляць справаздачу аб гэтай страляніне сваёй Іншая справа змарнаваць па-сапраўднаму творчую хвіліну (а як ты да яе рыхтуешся справа твая), тут ужо нешта падобна на злачынства перад сабой і на здраду сабе. У мяне на жаль, многа такіх здрад. Справа, канечне, непадсудная але ведаеш часамі бывае прыкра Толькі хопіць пра гэта. Пра ўсё гэта мы мала што ведаем бо ўсё, сапраўды у руцэ і волі божай і нават сказаўшы слова «нам не дано предугадать. .» і г.д.

Можа, адзінае што вартае,— старацца жыць і рабіць так, каб патрохі «расла душа» Гэта словы, здаецца Буніна, і сказаны яны калі не памыляюся пра Чэхава — пры ўсіх раўнівых па-свойму адносінах першага да другога Карацей варта дбаць пра «душу жыву» і калі скажам, слова памагае гэтаму — хвала слову! Праўда і слова памагае не заўсёды і слова можа быць (а яшчэ як усё, што звязана з ім) ворагам нашым асабліва калі паверыш занадта ў сваю ўладу над ім Крайні прыклад — графаманія. Вось яшчэ чаму я мала веру ў розныя афішкі накштալт «ні дня без радка» Можна сказаць і па-другому (другое), і вось М Ушакоў сказаў нешта наконт маўчання-крызіса «чем продолжительней молчанье тем удивительнее речь» — паводле формы і энергіі Цютчаў — спачатку і зблытаць можна палічыўшы за цытату з «Silentium!» Можа, гэта і сапраўды адтуль — генезісам генетычна так сказаць Няхай усім гэтым займаецца Саша Яскевіч ён любіць рознае шаманства а мы будзем думаць пра ўсё гэта «па-хатняму», а за работу ўзяўшыся калі не перахрысцімся на абразы дык на пальцы паплюем

Нагаварыў я табе многа мо пара і канчаць.

А ўсяму віной — Каралішчавічы Напраўдзе мне дык нечага спакайней што ты тут недзе адносна блізка, а не лётаеш па замежжу ці яшчэ дзе. Дальбог каб тваім мужам быў прывучыў бы сядзець побач перад камінком і варушыць на подзе агонь ці вуголле Гэта — зімой. А летам ты б у мяне ў агародзе да цыпак на нагах корпалася я капаў бы міжкалгасны ці міжсаўгасны магістральны канал, а надвечар, сабраўшыся ў хату мы выхадзілі б пасядзець на ганак і мо лагодна гаварылі б пра нешта — пад мяккае вечаровае шасценне кажановых крыл ці пад лугавое дорганне дзяркача — калі іх яшчэ не атруцілі прадукцыяй Мазырскага нафтаперагоннага ці Салігорскага калійнага, тых мясцін блізка якіх ёсць, дарэчы установы, у якіх вучыцца правільным поглядам на жыццё наш брат Я ў тым ліку вядома I заслугоўваю так ідылію, пра якую табе пішу, а ты гэта ацані — калі не ідылію, дык мару маю. Зразумела?

Толькі цяпер вось скажу што твая карацелька-пісьмо здалася мне чамусьці мілай заклапочана-пахаплліва-мілай, і я канечне удзячны табе у тым ліку і за прысланы «ЛіМ» Два **твае** вершыкі не сышліся чамусьці разам Я засмуціўся спачатку быў, але, падумаўшы суцешыўся тым, што ты іх ведаеш, а надрукаваць — надрукуецца ў свой час. Памылачак друк.[аваных] трохі нарабілі але без гэтага «ЛіМ» не быў бы ім там бязбожна правяць аўтараў ці так «даўраюць» ім што не вычытваюць здадзенага ў друк.

А я ніводнай рэцэнзійкі нават не напішу мусіць, тут — не даходзяць рукі ды часу няма Можа, наастачу ўсё ж ірвану дзеля ўласнага супакаення хаця б і дзеля скасавання рэдакцыйнай запазычанасці Праслаўлю скажам, .. И ?

У «ЛіМе» неблагая рэц.[энзія] на Гаўр.[усёва]. Парадаваўся за яго. Ён варты разумнага і добрага слова I справа урэшце, не ў ім а ў паэзі сапраўднай робім з розных Т -аў ледзь не нац.[ыянальных] Іванаў Франко ці Сімеонаў Полацкіх новых, а літаратару воляй боскай трэба радавацца як манцы нябеснай успаміну ўласнага прозвішча ў друку I тое што хлопец малады [аўтар рэцэнзіі — паэт Алесь Пісьмянкоў] пра яго напісаў тое, што не дзеля службовай нейкай выгады ці «ласкацельства» —даказвае, што зерне не заўсёды падае на камень што напісанае, можа, і застаецца.

Адным словам, за Сцяп.[ана] Зах.[аравіча] я рады Ён моцны чалавек. але і моцнаму трэба тады-сяды расслабіцца і перадыхнуць — «пусть благосклонная рука потреплет лавры старины»

Ну добра. Даражэнькая ты таксама перадыхні плюнь на рукапісы адно мне колькі слоў напішы А так — гуляй па лесе вершыкі мармычы а то і без іх абыходзься — ці толькі тая праўда ў адных вершах?»

Ліст заўсёды мае тую перавагу што ты імкнешся трапіць калі не на хвалю свайго адрасата, дык трымацца ў рэчышчы яго думак і настрояў, нават калі ідзеш супраць плыні А супраць плыні я ішла часта Часам — і «посуху» кінуўшы човен і вёслы

Цяпер, паспрабаваўшы пазначыць асобна «праблемна» тое што датычыць Міхася Стральцова ў нечым свядомасным сацыяльным «тэматычным» я адчула што знікае ў цытатах своеасаблівасць эпісталярнага стылю Стральцова стылю у жанравай эклектыцы якога ёсць свой шарм, свой водар, непадробны імпэт I таму вяртаюся зноў да лістоў Міхася Стральцова — у парадку храналагічным.

Ліст, датаваны 24.ХІ.81 г

«Дык вось, даражэнькая, дужа ўсцешыла ты мяне сваім пісьмом, і акрыяў я, і, хораша думаючы пра цябе і пра сябе, чамусьці лепш думаць пачаў, і пражэкты розныя пачалі роіцца ў маёй галаве — накшталт таго, што вось выкую я ў маіх змрочных сутарэннях на ўзнагароду чалавекалюбству сталёвы «дзекабрысцкі» пярсцёнак і некалі ўручу яго табе і адбяру ў У сваё пяро. Можа, і пазнавата будзе тое, бо рукатворны Збор твораў ён у выдавецтва, мусіць, ужо зацёг, але ж і мне на нейкі ЭСТ, як жартуе Вера Сямёнаўна [Палтаран], тое пяро яшчэ можа прыдацца.

А далей, далей.. Якім садам-вінаградам духоўным падражнілася ты перада мной, прасцёр я насустрач яму свае дрыготкія рукі, і вось мушу сказаць, што зелен, зелен вінаград!

Не, не дражніся!

Прозы, прозы!

К. я атрымаў Дзякуй Проза яго ная ніколі, сказаць праўду, не захапляла мяне, да таго ж, стаўка R. у спрэчцы (пазавугольнай) аб уплывах «сярэдняга» пакалення празаікаў (R., Y , L. і г.д.) на дастойную змену прыспешнікаў і аруженосцаў Мяне ўсё гэта датычыць мала, я прачытаю ўважліва, і, можа, разварушуся на што-небудзь хаця б «з нагоды» Так? [. .]

Адмяняй О , адмяняй! Пра яго я ў лепшыя часы напішу, хоць старыя, я разумею, чамусьці асабліва прагнуць як найхутчэй газетнага ці часопіснага пустазвонства вакол сваіх імёнаў Няўжо і мы дарасцем да гэтага?

Што яшчэ? Ага, я не адбыў яшчэ раты вершыкам. Тады слухай»

I цалкам ішоў верш «Хто гадаваўся ў цішы дрэў .»

А ў наступным лісце ён даваў мне такога «пшыпальца», што варта нейкія кавалкі з маіх крымзоляў (захаваліся якраз) падаць:

«Строгий юноша Міхась!

Прывітанне табе з тых мясцін, дзе нават пераспелы вінаград бывае зело зелен Дзе ж іх узяць, тых гатункаў, якія нават у «эскізах» будучага ўраджаю маюць імпэтны колер таго «золотого, как небо, аи» I ўвогуле, не ў нас, а «На Венере, ах, на Венере, солнце пламенней и золотистей, на Венере, ах, на Венере, на Венере синие листья» Мабыць, тыя самы-самы з сімвалістаў і добра рафінаваны акмеіст, яны ведалі сакрэт колераў Нават і выпрабаваная зялёная фарба («Глядзіце на траву, хай на зеляніне адпачнуць вашы вочы») не так каб у цане. Больш ва ўжытку канструктыўна шэры і той колер, у якім вельмі ж смачна акрэсліваюцца толькі фарбы асігнацый будучага ганарару I, як гавораць мае любімые французы «Chaque sot trouve un plus sot qui l'admire» — «Кожны дурань знаходзіць яшчэ большага дурня, які ім захапляецца» Я зусім не навязваю табе гэтую ролю. Лепш падзякую табе за каралеўскія дарункі вершамі А я не ведаю, якія словы і «деяния» прыдумаць. Тут не выратуюць салонныя рэверансы ў стылі m-me Рэкам'е. Ах, зноў французы. Гэта з тых часоў, калі быў у галаве такі прыемны літаратурны тлум, змяшаны з утульным ліпеньскім дажджом, з хрусткім свежым снегам, з пабітай цэглай таямнічых руін Тых самых «чароўных паветраных замкаў», ад якіх «хапіла б і рэштаў» Божа ратуй мяне. I цябе. Зноў французы»

Вось тут Міхась і аказаў свой нораў I за таго К., што я прапанавала ў адным перыядычным выданні даць яму на рэцэнзію, і за маіх французаў Гэта была, праўда, нагода прычына была ў тым, што нешта зацягвалася з выданнем ягонай кніжкі ў серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі», прапанавалі не той памер і г.д.

Ліст пачынаўся без усякага звароту'

«Благодушествуете, почтеннейшая, ох, благодушествуете! Ну добры дзень!

У адказ на твой цудоўны «quilich»[6] мне застаецца толькі ўнутрана сцяцца, а пасля выдыхнуць з сябе грубавата-нямецкае «Unmöglich»[7] I спытаць хто гэта мяне там у вашым цудоўнейшым выдавецтве так паслядоўна і даўно мае за дурня, за вочы, можа, і хвалячы, як дурня, за сціпласць? [...]

Цяпер жа я ўспамінаю, што ў заяўцы на вершы я прасіў 4 арк. прэтэндуючы на **мінімум** і **стандарт** Мне, зазірнуўшы, мусіць, папярэдне ў мой пісьмовы стол а яшчэ раней, мусіць, вызначыўшы маё месца ў паэтычнай іерархіі, прапануюць **3 арк.**, замест чатырох. Шанцуе на тройцу!

Дык вось, калі я прэтэндую на **серыю**, дык значыць, што я прэтэндую на **стандарт** Ні вышэй, ні ніжэй каго-небудзь я стаяць не згодны і катэгарычна патрабую тлумачэнняў Не люблю жанру скаргаў але, дальбог гэта зраблю, кал шаноўныя выдаўцы не ўтаймуюцца Я даволі паблажлівы да жыццёвых абраз, але ў літаратуры таптацца па сабе ўсё ж не дазволю. I я абавязкова спытаюся «А судьи кто?»

Перагаворы пра гэта з Барадуліным — ён жа працуе там і грэх яму не заступіцца»

Вось яны «арэлі» Стральцова «кволыя літздольнасці» — і «ў літаратуры таптацца па сабе ўсё ж не дазволю» І роспач і годнасць і гонар. І адно і другое і трэцяе ўласціваe яму

Кніжка ж выйшла — у 83-м годзе. Памерам 3 91 аркуша Па сутнасці — чатыры Рэдактарам быў Барадулін Барадулін увогуле спрыяў як мог выданням Стральцова І кал той быў у Мазыры і пасля звароту Міхась Стральцоў спадзяваўся — і меў рацыю — на надзейнае высакародства сябра.

Неўзабаве Міхась усцешна згадваў «Барадулін ліст прыслаў Шчодры як сам гаспадар Але добра што азваўся Вершы новыя абяцае ўключыць Адсутнасцю датаў папікае. [. .] На назве раіць спыніцца. «Яшчэ і заўтра» Гэтым ён палесціў мне. Мне самому пакрыёма падабалася з усіх. Пакідайце калі можна [ ]

Хочаш ведаць, які вершык прыслаў мне Барадул н?

Лёг спакой
На халадок атавы
Вытрасшы трывогі з рукаўцоў
Маладзік прарэзаўся
Танклявы
Быццам малады Міхась Стральцоў

Во дае! Во ў каго ты дыпламатыі вучышся! Ведаю цяпер!»

Міхась умеў быць такім — ціха ўзрадаваным Спакойна-разважлівым Далікатным Высакародным Шляхетным І раптам як у папярэднім лісце, выбухаў гневам Так, ён жорстка бязлітасна судзіў сябе сам Але не дазваляў гэтай раскошы іншым Тым больш тым чый суд быў для яго толькі абразай Ці заўсёды быў справядлівы Стральцоў? Па-мойму не Нават безумоўна — не. І ў лістах. І пазней калі давялося рабіць разам і мы з ім часам не тое што спрачаліся але больш трымалі маналогі кожны — свой Кожны як быў так і меўся застацца са сваімі меркаваннямі Асабліва калі браць пад увагу беларускіх сённяшніх празаікаў

Міхась Стральцоў не любіў шматслоўя а нават і дакладную падрабязнасць «не жаловал» Ведаў цану мастацкаму слову выпеставанаму пачуццём і высокай думкай Максім Багдановіч Янка Купала, Максім Гарэцкі Кузьма Чорны (не ўсё), Янка Брыль. Астатняе — не тое каб ад «лукавага» але. не для яго Было магчыма патаемнае жаданне не ніжэй за іх. Ці так, ці ніяк. Тут таксама на маю думку, загадка «малапрадукцыйнасці» Міхася Стральцова У канцы 1981 года я выслала яму часопіс з ягонымі надрукаванымі вершамі

«Дзякуй за часопіс. Пакутлівая гэта справа — бачыць надрукаванымі свае радкі Купрын недзе пісаў што той час, калі адзін пагляд на друкаваную старонку з тваім тэкстам і хвалюе і кідае ў прыемныя дрыжыкі, мінаецца скора, і што ён цяпер раўнадушным позіркам абягае друкаваныя калонкі і спакойна запісвае ў гросбух сумы прыбыткаў і даўгоў Максімаліст Брыль з гэтае нагоды нават недзе абураўся а па-мойму дарэмна «Не продается вдохновенье .» Але вось бяда дзе тое натхненне возьмеш? І знаўцы творчай псіхалогіі паслужліва адказваюць ужо, што чалавечыя здольнасц на 90% — пот А Танк, наш мнагадумны і мнагатомны Танк, кажуць сцвярджае і такі прынцып б сароку варону — можа і ў сокала патрапіш! Правільна але навошта чакаць надворных ндыкоў?— як ён гэта часцяком і можа з прынцыпу робіць На ндыка лазіна і прабач любая свіння справіцца з ім

Адным словам, вершы мне здаліся і халоднымі і прымітыўнымі нават а на часопіснай старонцы ўся лірыка вытхлася з іх ушчэнт Але будзем падлічваць радкі Пра гэта і пойдзе далей гамонка

Ці не засталося яшчэ ў Вялюгіна [Анатоль Вялюгін — паэт На тую пару — загадчык рэдакцыяй паэзіі часопіса «Полымя»] колькі маіх вершаў? Адзін ці два я прыпомніў — не тэкст а тое што такія вершы здаецца былі Пасля летась я даваў гэтыя вершы (не ўсе, вядома) Макарэвічу на радыё Перадача была але нешта мусіць, і засталося Як даведацца пра гэта? Справа ў тым што вершы спатрэбяцца для кніжкі, ці для друку ў тых жа часопісах нават Не хочацца каб згубіліся А дома — не памятаю ці ёсць яны ў мяне А калі ёсць — іх можа не стаць А ўзнавіць іх я ўжо не здолею [ ]

Уяўляю якія цябе скора дрыжыкі будуць браць пры адным намёку на вершы — не толькі мае!

А я ж табе тут ужо новых нарыхтаваў цэлы стос!

Вось слухай:

А будзе час, калі і без нагоды...»

І далей ішоў увесь верш Ліст быў датаваны 18.XII 81 г

Тымчасам надыходзіў Новы 1982-гі год. Не ведаю, як яго сустракаў Міхась Стральцоў Але мне ён даслаў сімпатычную жартаўл вую паштоўку

«Віншую з Навагоднім
святам, з іскрыстым
зімовым сонцам, з ру-
жовым ранішнім і ве-
чаровым шаравіком
з уздыхамі па вясковай
грубцы ці камінку
па гарбузіках і вяндлі-
не, па дабрадушным кампліменце грука-
ча-механізатара
ці шыкоўнага кіншчы-
ка .»

А я, меўшы нейкую вольную хвіліну перагледзела ягоныя лісты і адпісала што гэта злачынства — толькі я чытаю адна яго вершы Трэба друкаваць. І Міхась даслаў перапісаныя для публікацыі вершы (усе яны былі ў лістах):

«Хто гадаваўся ў цішы дрэў .»
«Не сумую сягоння, навошта? .»
«Яшчэ не ўшчаліся вятры .»
«Вось гэта музыка сама .»
«І рытмы тыя, ды ўжо лад. .»
«КПП Там круціцца пласцінка .»
«Пад шоргат кропель дажджавы .»
«А фотаздымак на стале .»
«Развагай сталае пары .»
«А будзе час, калі і без нагоды .»
«Я не скажу, нібыта .»

Вершы я передрукавала і занесла па згаданых Міхасём адрасах. Між іншым перадрукоўваць папрасіла адну сімпатычную душу — сама я друкую пасрэдна А была тая сімпатычная душа і знешне прывабная і мела вышэйшую адукацыю і была машыністкай экстра-класа Да таго ж мела літаратурны густ І давяла на маю спробу различыцца «За такія вершы грошы не бяруць» Святлана Кухарчык (у замужжы — Расянчук), яна і цяпер робіць у «Мастацкай літаратуры», на другім службовым месцы Згадваю тое нездарма — да сакавіка 1982 года Міхась Стральцоў пісаў мне на выдавецтва — і добра памятаю з якім грэблівым і пагардлівым выглядам прыносіла мне лісты Стральцова другая службовая істота. Усім было вядома, што Міхась Стральцоў не ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і не ў творчай камандзіроўцы ў якім прэстыжным месцы планеты Зямля І жанчына ў канцылярыі — таксама з вышэйшай адукацыяй, з вялікімі амбіцыямі — ледзь не ў хірургічных пальчатках несла той ліст І глядзела на мяне, як на істоту ніжэйшага парадку. Не ведаю, ці чытала яна Міхася Стральцова. Празаіка, паэта, крытыка, філосафа Можа, толькі бачыла — і не ў самыя лепшыя яго хвіл ны Ці проста мела звесткі — трапіў чалавек ва ўстанову не турэмную, але паднявольную.

Я заўсёды ведала Міхася Стральцова з лепшага боку І ў лепшыя хвіліны. Больш здалёк. На той самай дыстанцыі Хаця — для мяне не было таямн цай Хто не ведаў пра яго відавочную слабасць. Якое ён не хаваў

Ці спрабавала ў нечым яго пераканаць? Не. Грэшная Не спрабавала Хіба можа чалавек спасцігнуць чужую душу? І трагедыю яе? І таямн цу яе душы?

Грэшная Грэшная Я нікол не адмаўляла, калі Міхась Стральцоў прасіў пазычыць грошы Звычайна нейкіх 5—10 рублёў Ведама для чаго. (Гэта былі грошы па цэнах 70-х— пачатку 80-х гадоў.) Кажуць, разумныя і цвярозыя людзі не пазычалі яму Мабыць яны рабілі лепш за мяне Я ж не пачувала сябе выратавальніцай І ніколі не ведала дзе яно — выратаванне для яго. І адкуль туга? Адкуль пакуты? «Надзея марная .»

Фаталісткай я, здаецца не была Але ролю суддзі не прымервала для сябе. «Дзе яны? дзе твае мудрацы?» «Кожная мудрасць — ад Госпада і з ім трывае адвеку» Я не адчувала сябе валадаркай, ахоўніцай тае мудрасці

Лісты ж. Тут я — чым далей тым болей — разумела яны яму патрэбныя Хаця часам і зацягвала трохі адказваючы «хуткая дапамога» была ў нас сталым госцем ці госцяй Мы ведалі ўсе кардыялагічныя і так званыя тромбаэмбаліцыйныя (ТЭБ) брыгады Цяжка хварэла маці — і гэтая машына (здзек лёсу — бел-чырвона-белая) часцяком прыязджала да нас і ўночы ды разы са тры на ноч Маё здароўе на той момант таксама не адпавядала так бы мовіць, агульнапрынятым стандартам Вось і пісаў Міхась 31 1 82 г

«Дарагая Ала Іванаўна!

Даўнавата нешта не чуваць ад цябе нічога а я табе цэлых два канверты з вершыкамі паслаў і не ведаю ці атрымала Папраўдзе, не так вершыкі мяне турбуюць як тваё маўчанне. У

мяне такое ўражанне, што я занадта назаляю табе, а табе даць зразумець мне гэта няёмка — вось і рыпіць, каўдобіцца воз перапіскі нашай

Адным словам, адгукніся Тады і напішу, калі будзе цікава (табе), падрабязней»

Той год быў цяжкі У студзені памёр мой свёкар, лагодны дабразычлівы чалавек. Да скону веку гаварыў, як і яго землякі з вёскі Лявонцавічы з-пад Мінска — на роднай беларускай мове Не падлабуньваўся пад «сталічнага» жыхара

Быццё вышнуроўвалася ў вузенечкую шчыліну· аптэкі шпіталі крамы могілкі Хварэла маці Увесь час «паслізвалася» я сама На працы — нікому не было цікавасці да маіх згрызот Графік, якасць. «Давесці зрабіць, выцягнуць. .»

Зразумела, прычыны свайго маўчання я магла згадваць толькі пункцірам Затое блазнавала, як магла, апісваючы, як дасылала яму пасылку Надыходзіў яго дзень нараджэння — 14 лютага І я нешта купіла, нешта спякла — і рушыла на Галоўпаштамт·

«Варыянт «дзядзькі ў Вільні» Прыходзіць такая порсткая цётачка У кажуху Адстояла ў адной чарзе, у другой, у трэцяй — а тут кажуць. выкідай паўтары кіло Аказваецца — 5 кг брутта, хай яно гарыць. Стыхійная ньютанава сіла Тымчасам набліжаецца перапынак на абед, а тут робіцца відавочна, што кажух — не самая спрыяльная адзежына для загортвання пакункаў Адчуванне — ці то ты на патэльні, ці то ў самы поўдзень дзе-небудзь з візітам у якога племені мумба-юмба на самым экватары Дык вось — кацяцца тыя аўчыны з плечукоў і іх падымаюць з падлогі то нейкія спагадлівыя салдацікі. то «презрительные» дамы то ўсмешлівыя дзяўчаткі

Але ж... Нядбайліц і недарэкаў Бог беражэ І пасылае ім у самы кульмінацыйны момант кожнага трагіфарсу фею-чараўніцу Фея мая была памерам з кафлянку ў нашым наваградскім РДК [раённы дом культуры], бурчала, як дзесяць свякрух перад велікоднымі прыборамі але ж хуценька выкінула скрыню, змайстравала нейкую торбу. адпрэчыла мой пірог ("Даражэнькая наедак на паўгадзіны"), з павагай паставілася да сала і кіўбасаў гмыкнула на сыр і цукеркі, але выкідваць не стала — няхай сабе, какава пакінула, а каву адпрэчыла»

Яшчэ нешта ўсмешлівае спрабавала я з сябе выціснуць, хаця адпраўленне пасылкі — малюначак з натуры, і ўсё выглядала сапраўды вельмі пацешна мабыць, з боку

Адказ Міхася датаваны днём яго нараджэння 14 02.82 г

«Mesdames,— ці правільна напісаў я на гэтай тваёй мудрагелістай мове пра якую ведаю толькі, што слова bistro яна запазычыла ад платаўскіх п'янтосаў-казакоў, што не міналі ніводнай парыжскай забягалаўкі а таму і прыспешвалі розных там мусью энергічным: быстро, быстро!

Адным словам, коман ву портэ ву[8]?»

Між іншым захаваўся чарнавік пачатку майго адказу.

«Светлы княжа, Міхась!

Вымушана расчараваць цябе. Excisez-moi[9] (гэта тое ж, што excuse me)[10] Калі і чытаю каго лацінкай, дык гэта тых, хто карыстаецца мовай лорда, якога хто лічыў паэтам, хто — дэндзі з Чэлсі, а хто проста п'янтосам і спакуснікам бедных дачок Евы І яшчэ — дзівакоў з крэсаў якія ўсё пэўнаць свет што nie zginęły [11] А тую грывуазна-куртуазную мову люблю. у маім «малым джэнтльменскім наборы» (не ведаю, як тут зручна выловіцца пра «лэдзі») з яе затрымалася найбольш У знанай ніжнегародскай (гародзенскай? навагрудскай?) інтэрпрэтацыі Ну, а ў астатніх мовах знакамітая людаедка Элачка дала б мне фору Дольчэ віта і о-ля-ля! (Адчуваеш, які дыяпазон?). Муэртэ і но пасаран Варум і данке шон Ну, а сакраментальнае Гамлетава to be or not to be[12] для мяне зараз існуе ў адным амаль што варыянце. Выклікаць «хуткую» ці не?

Вось дапісваю праз два дні Тут паміж іншым у нас адбывалася мерапрыемства мясцовага маштабу Усе, паважаныя і шаноўныя, заклікалі да прынцыповасці і смеласці. Цытавалі толькі што адкрытых імі даўно вядомых (нешта накшталт таго мальераўскага героя які высветліў, што ўсё жыццё гаварыў прозай). Палымнелі пафасам нечуванай прагай справядлівасці, але ж прозвішчаў тых, каго так анафемавалі і нішчылі так ніхто і не пачуў Затое быў пазней выпадак — не прынялі ў СП хлопца, што некалі паспрабаваў паказытаць сёння слыннага і знанага і прызнанага а галоўнае — таго, хто сёння ўладу мае Ну але Кінем іх на волю ўладнага лёсу Хай раскашуюцца мітуслівымі прывідамі свету звычаёвага А вось я лепш некалькі афарызмаў Уайльда табе перакіну·

«Люди воспитанные противоречат другим Люди умные противоречат себе

Полюбите себя, и у вас начнется роман который будет длиться всю жизнь.

Вопросы никогда не бывают нескромными. Нескромными бывают ответы».

Некалі, у студэнцтве, мне страшэнна падабаліся гэтыя ігрыскі розуму гэтыя кульбіты думкі Зараз я паспакайнела да іх, але цікавасць не згубіла Мабыць ты абыякава ставішся да гэтай не вельмі глыбокай натуры, занадта нарцыстычнай каб быць натуральнай

А як табе Сальватор Роза? Жыў мастак у XVII стагоддзі прынамсі 10 год быў у Фларэнцыі, каля Медзічы І ўвогуле большасць з таго, што ён рабіў, не выходзіла за межы прынятага на тую пару Маю на ўвазе стыль пісьма Але ёсць у яго карціна «Смерць Эмпедокла ў безданi» То кратэр вулкана, у які кінуўся знакаміты праўдалюбца і ўвогуле няпэўнасць, мройлівасць малюнка — нібыта недзе напярэдадні з'яўлення імпрэсіяністаў І — аўтапартрэт Чалавек відавочна не эпохі Сенчэнта эпохі барока — такі скепсіс такая хранічная стомленасць душэўная Хаця Адраджэнне саступала месца arte nuova[13] барока Здаецца, менавіта тады Кавалер Марыно прамаўляў, што калі паэт не здатны нікога здзівіць, дык можа ўзяць скрабло і выпраўляцца ў стайню. Arte nuova XX стагоддзя здаецца тое самае вызначала

Занесла мяне ў далячыні То пакуль не даімчалася да якога Сент-Эўрэмона буду заканчваць. А ўвогуле люблю такія «вандроўкі» — шкада што пасля студэнцтва толькі зрэдзьчасу даводзілася выпраўляцца ў іх»

Міхась азываўся

«Я жывы, здаровы, сілкуюся і ласуюся тваімі дарункамі і з жахам перажываю тваe пакуты на бласлаўлёных нашых поштах, дзеля нейкага дня нараджэння! А як было б пачувацца мне, каб які востравокі і быстраногі жыгун ірвануў падручку з тваім паўкажушком? Га? Я і за пяць бы гадоў, седзячы тут, за яго не расплаціўся б! Во жах!

Але я рады усцешана-расслаблены і адчуваю сябе бадай што замужнім чалавекам — што гэта я?— жанатым. А ты пра тое і не падумала? Вось табе!

Наведалі мяне тут два чалавекі аднакурснік мой Іван Шуцік (рэд.[актар] «Железн.[одорожника] Белор.[уссии]») і Анат.[оль] Аўруцін Апошні перад тым у выдавецтве быў і прывёз мне аж тры цыдулы — ад Барадуліна Паўлава і Эд. Валасевіча І вось, развітаўшыся з імі успамінаю цябе і ваш калідор, які хоць не стаў для мяне ні калідорам славы ні ўлады, затое стаўся сцяжынай да аднаго-двух чалавекаў, і няхай бы не зарастала яна, гэтая сцяжына!

Рыгор піша пра кніжку — там ім патрэбны нейкія даты пад вершам а дзе я іх вазьму? Калі ўжо так абавяз[кова] трэба, выдумляйце з галавы — па мне ўсё роўна дысерт[ацый] ніхто не будзе абараняць і нікога мо ў зман не ўвядзём. Ды і наогул гэта несур'ёзна, як кажа Dt., га? Гэта Максім стаўляе даты пад кожным вершам — чатыры вершы на дзень, га? Па-мойму, мнагавата, га? Я пішу на дзень чатыры старонкі. га?

Праз пяць хвілін у мяне адбой Хачу кінуць пісьмо ў скрыню, каб заўтра ранічкай пайшло»

Міхась Стральцоў не вылічваў сваю бессмяротнасць, не распіхваў натоўп на шляху на Парнас — узнёсся туды лёгка і вольна (можа, у гэтым таксама адна з прычын яго трагедыі?), не вельмі дбаў пра дакладнасць, акуратнасць — калі не тычылася непасрэдна твора Пра гэта даводзіць можна адстаронена і з пэўнай доляй літаратурнай сур ёзнасці Ёсць тут у лісце іншы аспект — досыць далікатны пра які весці размову цяжка «адчуваю сябе бадай што. жанатым» На тую пару другая яго жонка Алена Дзмітраўна афіцыйна скасавала з ім шлюб. Пра яго асабістае жыццё (як і пра маё) мы з ім ніколі не вялі размоў Ні ў апошнія гады яго жыцця, ні ў даўнія гады на пачатку 70-х, калі ён яшчэ не пабраў другі шлюб але быў разведзены з першаю жонкай Якія гэта былі адносіны паміж ім і Аленай Дзмітраўнай якія прычыны ладу і бязладдзя — таямніца, пра якую ведалі толькі яны Адно — што было відавочна -- Міхась Стральцоў пакутлівa зноў і зноў вяртаўся да ўзаемаадносін творцы і жанчыны, мужчыны і жанчыны Была ў тым пэўна не толькі пісьменніцкая прага спасцігнуць адну з самых вялікіх таямніц Была і горыч уласнага вопыту І — магу здагадвацца, горыч была не толькі ў яго а і ў тых хто быў злучаны з ім лёсам

..Каб спраўдзіць свой талент трэба ахвяраваць шмат чым І не толькі самому творцу А і тым, хто побач Полюсы настрояў без дай прычыны скруха ці радасць. Нялёгка мець нават аддаленыя стасункі з чалавекам таленавітым А дзяліць штодзённы лад жыцця.. Даравацькрыўды Даравацьнедахопы, заганы звады Таксама патрэбны талент Мала каму дадзены

Да таго ж, кожны заўсёды меў ці мае нейкі вобраз што вызначае ўяўленне аб Прыгажосці, аб Каханні Ці не таму так часта гэты Вобраз у жыцці бывае шматаблічны персаніфікаваны ў мностве канкрэтных асоб? Ці адпавядае гэта чалавечым прынятым канонам хрысціянскім запаветам нарэшце? Не ведаю. Ведаю толькі што гэта заўсёды складана Для Паэта Для тых жанчын, што — кожная!— вырашыла быццам менавіта яна!— адпавядае яго-ным ідэальным уяўленням, Вобразу, створанаму ім

Лісты дзе я была **канкрэтным**, персаніфікаваным адрасатам таксама былі зваротам больш да вобраза, які быў створаны Стральцовым У нейкім сэнсе прапанаваная імпрэза ігрыска Хаця часам як актор «натурнага» складу ён уваходзіў у ролю і патрабаваў «полной гибели всерьез» **На пісьме, на пісьме.** Даючы волю фантазіям-пачуццям Разгортваючы сюжэт ліставання Сюжэт у які ўваходзілі — чакана і нечакана — зломы лёсу накладваючы свой адбітак на эпісталярны сюжэт

«ВАДА АСЕННЯЕ КРЫНІЦЫ...»

«Адчуў я за радкамі твайго пісьма, як турбатліва і нясоладка зараз табе самой, і сорамна мне крыху стала за сваю дакуку і пісьмовы імпэт Ты, калі ласка, даруй

Будзем спадзявацца, што ўсё неяк уладзіцца, улагодзіцца і пацішэе. клопаты, вядома, застануцца, але, можа, дадуць перадых і сабе, і нам. Хоць трохі палёгкі

У нас тут бадай што вясна, і надоечы, колькі дзён таму выдарылася нейкая асаблівая прасветлінка ў прыродзе і так зранку ўзялася нясмела-соладка, з прыхапкам журбы, торгацца сэрца, такая надзея нейкая, па-маладому дурная, патрэпала крыла, што я аж спалохаўся і тут жа сцяўся ўнутрана: баюся я такіх хвілін! Баюся сурочыць тыя харошыя хвіліны, якія, можа, яшчэ наканаваны недзе пасля А страпянуўся, паляцеў душою насустрач шчымліваму падману — пішы прапала! Не далей, як праз дзень-два, тыцнецца да цябе жытуха з такою абразай-прозай, што закаешся «возлетать»! Далібог Са мной заўсёды так, праверана гэта — і тут я забабонны

Таму і душу «прекрасные порывы» Пераймаць мяне ў гэтым не трэба, вядома, гэта мая ўласная містыка, але ж ці не занадта мы тонкаскурымі сталі — вось пра тое я думаю іншы раз. S T у такіх выпадках раіць пакутаваць, ледзь не свядома,—браткі-славяне на ўсё і дзеля ўсяго прыдумаюць [нечытэльна] —куды там якому-небудзь біццю па левай і па правай шчацэ! Мы уже и ногу попирающую лобызать считаем превеликой милостью, и корни и акриды кажутся нам пищею райской, а зловоние подземелий —дуновением райских крыл! Абрыдлі мне гэтыя прапаведнікі пакут, як і розныя T і Г Да сокрушится царствие их! Але калі — о боже!..

Добра. Хопіць. Пішы мне, што надарыцца і калі выпадзе час — я палагоднею на тую пару і табе што-небудзь лірычнае напішу

Што ў вас там за пленум? Абмалюй

Прывітанне вашаму крытычнаму цэху — небось воскуряете самодельными зажигалками фимиамы, а як наконт прыкурыць?

Ну добра, добра

Бывай здарова і пішы

5.03.82

P S Яшчэ раз віншую са святам

М.»

У мяне, аднак, свята не адбылося. Кожны з нас спазнаў пакаранне пана Бога Ён — за свае згрызоты, я — за свае. Мае можна было б пазначыць так, як гэта акрэсліў геній Лермантава. «Законы мудрыя природы он равнодушно пренебрег» І нейкім днём я апынулася на мяжы быцця і небыцця перадусім згадаўшы вядомае, з Высоцкага: «И что там ангелы поют такими злыми голосами» І калі яшчэ адным днём я расшчапіла вочы, дык зразумела «Жывая» Сонца было такое яркае, як ніколі ў жыцці Блакіт неба — па-святочнаму ясны Пакой — поўны нарцызаў і тульпанаў Ляжалі яблыкі — не па-сакавіцку ружовыя, празрыстыя нібыта з садоў Эдэма Былі запіскі І ліст ад Міхася

«Пішу табе на выдавецтва ў надзеі, што пісьмо неяк перададуць Сказаць, што ты мяне засмуціла, мала. мне пачало здавацца немаведама што, і вялікая крыўда ўзнялася на пана бога, маўляў, калі ён бэсціць і карае мяне, можа і не надта вернага свайго халопа, дык навошта яшчэ і людзей, якіх я шчыра люблю і за якіх малюся? А любая па-мойму са шчырых малітваў павінна даходзіць да яго, калі ў ягонай нябеснай канцылярыі вядзецца правільна іх улік і талкова складаюцца дайджэсты А мо не чытае а мо не перадаюць?

Я і тут скажу табе, што рабіць. Ты з ангеламі, з душкамі іх нечапанымі, гаворку вядзі Калі ангельчык сумны трохі, пёрка з крыльца выскубі і пёркам яму так лагодненька за вушкам павадзі — за жывоцік адразу і схопіцца. А ты яго казычы казычы Запросіць пардону — ты яму просьбу сваю І тут ён табе паабяцае, як Барадулін, усяго а ты ўжо яму, як Асіпенка не, ты абажджы, цяперіцька я цябе як у зеркалі, панімаеш, бачу — што ў цябе ў думках праваліруе праваабладае, га? Не падзяляеш?

З імі трэба толькі так.

Смешкі смешкамі, а я як найхутчэй чакаю весткі ад цябе — і харошай Вясна ж ідзе! Мне чалавеку, што зарокся, можа, і радасці і то на душы шчымліва-хараша бывае як вясновы ветрык шыбане ў наздру, як у вушах палошча, як пераверне някепскіх успамінаў адну-другую скібу — душа тарганецца весела а чарвячка сумненняў тут жа склюе падскочыўшы паслужліва і ў добры час, непаседа-грак. Мацуйся і кінь дурное як нехта казаў зрабі ласку мне і людзям, якім ты патрэбна,— ачуньвай хутчэй і мне пішы

Я табе кветачку пасылаю Пазаўчора праклюнулася ў мяне на акне Будуць яшчэ і яшчэ Сіняя кветачка харошая А на сонейка сама часцей глядз

У наступны раз я табе вершык напішу калі хочаш Даўно ўжо не пісаў, а табе напішу.

Здаравейшай будзь, пішы

Міхась.

14 03.82»

Я адпісала яшчэ з бальніцы

«Пішу, мабыць існую. Праўда, пакуль са мноствам забарон Гэта — нельга гэта — непажадана гэта — пакінь надзею назаўсёды Але — існую. Па волі Провидения і пана Бога Мабыць, твае словы дайшлі ў тую высокую інстанцыю. Хіба можна твае слова пакінуць без увагі?

Наладзілі невял кі дэсант з анёлаў-ахоўнікоў і анёлаў-выратавальнікаў Праўда з-за лянотнай сваёй натуры ці з-за сціпласці ні пра што іх не прасіла, не люблю я неяк прасіць. Але яны зразумелі акалічнасці і далікатненька рабілі сваю справу А я, нейкага дня паглядзеўшы на акно, сама зразумела што за ім вясна ў нябеснай канцылярыі ліміты ў маштабах сезона на блакіт і золата выдадзены падвышаныя І вясновае птаства атрымала шырокія паўнамоцтвы карыстаецца імі як той выпускнік музвучылішча Практыкуюцца з самай раніцы, якіх толькі экзерсісаў не навыдумляюць — ніякія ноты не вытрываюць. Нават уявіла сабе той вясновы лес, які я даўжнік твой пав нна вярнуць гэтай парою [Трэці ліст Стральцова, з вершам «Не сумую сягоння навошта? .»] Лес талы, пахучы, празрысты з першымі пралескамі Не магу, праўда кінуць у канверт пралеску лес пакуль што толькі ўяўляць магу Але — на яве ці ў сне — падарунак той Боскі вяртаю з прыемнасцю

Ой, нешта я ледзь не таю ў сентыментальным захапленні вясновым хараством

Ты пытаўся ў папярэднім лісце што за пленум? Я на ім зразумела, не была І нават «ЛіМа» справаздачнага не бачыла Пленум быў па публіцыстыцы Быў Чарнічэнка — выступаў Нехта з нашых дробненька пырскаў памыямі Усё гэта са слоў — спарадычна суб ектыўна, фрагментарна»

Тры месяцы я пісала Міхасю Стральцову акуратна — у свой бюлетэнны час. І з імпэтам чалавека якому было даравана наноў жыццё Дарэчы, пазней у апошнія месяцы Міхася я пры кожнай сустрэчы ў бальніцах, згадвала свае эмпірычныя дарункі Ён слухаў уважліва. А я нешта мармытала пра тое, што магутная валадарніца сусветная ахмістрыня Натура карае нас, але дае нам пасля хваробы радасць свайго спазнання вяртае вясну, водар паветра шчасце існавання

«І лёс вяртае нам сяброў ..» І ўлюбёныя мелодыі і кнігі Я слухала і слухала Шапэна Давёўшы гэта Міхасю.

«Дзень добры, Міхась!

Калі пачынаць з той міжнароднай папулярнай тэмы аднолькава прыдатнай каля вясковага калодзежа і ў выкшталцонай гасцінная дык сёння ў нас такі стракаты-паласаты дзень — паўгадзіны снегавей, як у лютым паўгадзіны — натуральнае красавіцкае сонца а самая пара б яму ачомацца і папрацаваць. вялікдзень неўзабаве, а vielkanoc дык і праз колькі гадз н Вось табе і вселенская гармония

Я лайдакую і немаведама чаму гартаю старыя менш старыя ангельскія раманы Таўшчэзныя Закалыхваюць мяне ўтульныя інтэр'еры і экстэр еры Old England[14] Можа даймчуся ў сваім апрашчэнн і да дэтэктываў А, можа выратуюць тыя абраннікі у якіх і печаль была светла Сёння нешта пачалі іх радкі тоўпіцца ў галаве з раніцы І ўзнікла банальная ідэя банальна параскашавацца ну скажам, Шапэнам Дзякуй Богу магу яе спраўдзіць

Опять Шопен не ищет выгод,
Но окрыляясь на лету
Один прокладывает выход
Из вероятья в правоту

А гэта ўжо зусім далёка ад таго абранніка сонечнага Феба Але блізка шляхціцу з Жалязовай Волі

Вось зноў з явілася сонца — прыемна-цёплае нават праз аконную шыбу І так захацелася тыцнуцца носам у паветра. Вясновае дзе нешта няўлоўнае і няўмольнае Хоць ты гаўкні на неспазнаны струмень немаведама чаго

Якраз атрымала ад цябе ліст то і прабываю ў кампаніі з табой панам Кузьміцкім А яшчэ Пітэрам Усцінавым Гюнтэрам дэ Бройнам і Андрэ Мальро Прагладаю «Иностранную литературу» —сёе-тое з мінулага года — «Крамнэгел» шкада V S «зачытала» першую частку самую цікавую, і сёлетняе Шкада, што Андрэ Мальро — усё ўрыўкі (былі ў «Вопросах литературы» ў 1979 годзе ты мабыць, чытаў). І вось зараз. «Бренный человек и литература» Як ты пераклаў бы? Хаця — як яно па-французску? Між іншым, там ёсць такое: «. у Інды з-за процьмы багоў нельга было ставіць помнікі зямным валадарам» Можа, у тым была свая праўда? І яшчэ згадаю адно: «Мір-Свецкае ўяўленне дасягне вышыні рэлігійнага ўяўлення толькі тады калі літаратура будзе роўнай выяўленчаму мастацтву. Пераемнікамі Мікеланджэла і Тыцыяна будуць не мастакі, але Шэкспір, Монтэвердзі Карнэль» Увогуле там шмат цікавых думак, адно

не люблю нашу дурную заангажаванасць зацыкленасць на адмаўленні і маргіналіях. Невялічкі кавалачак тэксту, але ж каментар — удвая большы за яго. Як у нас любяць каментары, тлумачэнні! Каб, не дай Божа!—не падумалі не так, як трэба не зразумелі ў накшым ракурсе. Ну і калі каментар робіць Самарый Велікоўскі, то гэта каментар: ён неяк умее абыходзіцца без спрашчэнняў, а калі Зоніна, як тут, дык чытаць і сумна, і ўвогуле нецікава.

А чытаючы цябе, прыгадваю чамусьці ліставанне Канецкага — з кім бы ты думаў?— са Шклоўскім Ці наадварот — дзівіць ліставанне Шклоўскага з Канецкім, хаця супраць Канецкага я нічога не маю: нават часам гэты марскі воўк з ягонай жорсткай іроніяй мне падабаецца. Там ёсць і такое «Мы плывем своей дорогой, через прибрежную полынью вдоль берега и все же вперед» «Рукописи умнее авторов. Может быть, рукопись Шекспира даже не захотела бы разговаривать с автором» Але гэта я паціху сунуся да галоўнага «Читать вас обязательно надо с пером в руке и бумагой очень много появляется в голове разного .. бег Вашей мысли — порывистый и зигзагообразный, как у солдат под огнем,— принося мне наслаждение и возбудив подпрыгивание моих мозгов, уносит возникшие гениальные мысли за видимый горизонт или в струи «зефира» Калі я чытаю цябе — у кожнай іпастасі — думаю прыблізна тое ж. Не магу згадаць, што ў мяне ўзнікаюць геніяльныя думкі але што недзе за небасхілам разыходзяцца ў небыт і тыя, што ёсць,ператвараюцца ў нешта цьмянае і невыразнае — факт І какецтва, якое мне не зашкодзіла б мець, як неабходную жаночую зброю, таксама сплывае некуды ў эфіры, стратасферы А я, дурніца, і не лаўлю яго —плыве і хай сабе плыве. Але на той плыннай хвалі, можа, нешта і застаецца ад нічым не растлумачаных захадаў Чапкоўскіх, Зорычаў, Чугуеўскіх (маю да іх самае блізка генетычна і радаводна пазначанае дачыненне). Выхоўваць мяне нікому з іх нават на самай постэмбрыянальнай стадыі не давялося Але стракацца — стракаліся А яны мецілі ў сваю пару свае жыццёвыя сцежкі так. што шляхі кіраваліся больш у Сібір. А сёння адзін чын, важны, як некалі тыя афіцыйныя чыны што выпраўлялі іх за Урал, супіць бровы маўляў непатрыятычна як гэта чалавек мог мець дурасць нарадзіцца так далёка ад межаў родных, на Камчатцы

Ну, ды хай сабе той чын хмарыцца і выціскае з сябе шэдэўры А мы згадаем яшчэ літоўскія хутары, якіх непадалёк ад Гародні яшчэ ладна засталося З нашага боку хутароў мала А ў Летуве ёсць Акраса краю Мара ўсіх антыўрбаністаў І нават рэальны прытулак для прыхільнікаў НТР І вольных людзей Але хто з нас вольны? Ці мы самі выбіраем свае крыжы і ланцугі? Ці яны нас?

Бывай.

А.С.»

І прыйшоў той самы ліст Міхася Лявонцьевіча, дзе ён згадваў пра «загадку назскіх натур», дзе былі развагі на тую тэму, што, мабыць, заўсёды хвалявала яго. «Недзе чытаў як білася (псіхалагічна) з Джоз. Конрадам жонка, не могучы ніяк зразумець усе абертоны яго ўчынкаў і душэўных рэакцый і вось, думаю, раззлаваўшыся, неадноечы крычала нешта накшталт· «Праклятьі пшэк!» Нешта падобнае, мусіць было з Апалінэрам і той якой прысвяціў ён сваю «Sorry»[15] Гэтыя Кажанеўскія, Кастравіцкія [сапраўдныя прозвішчы Дж. Конрада і Апалінэра] — не цацы, адным словам. Майго дзеда Міхала Кузьміцкага па маці таксама памятаю, за натуру не хваліла бабка Хрысця але дзед быў, на маё сённяшняе разуменне, не абы-які чалавек — дай бог мне б ад яго трохі [. .]

Але нешта даражэнькая, я не ў тыя аглоблі падахвоціўся запрэгчыся і стаць. Ды яшчэ ўздыхнуў і закусіў цуглі Даруй Але амаль разгаварыўся толькі не вершыкам Вершыкі ведаеш, апошнім часам нешта не пішуцца, душэўна аслабнуў, саслабеў, а на прозу — часу няма Рэцэнзіі на мне нейкія вісяць, ніяк падступіцца не магу А трэ было б, дзеля хрумсткіх папер: калі вырвуся калі-небудзь адсюль, уцяку куды-небудзь на хутар, да літоўцаў. Колю Старшынава адшукаю, ці каго яшчэ — няхай раяць як схавацца (Старшынаў некалі жыў на нейкім хутары ў Літве, ажаніўшыся ці прыжаніўшыся там,— і некалі мяне падбіваў прыехаць. Даўно, гэта, праўда, было Я і Старшынава таго пасля таго, можа адзін раз і бачыў Наогул адасобіўся я ад усяго. Але ж і «шапачны» стрыкулізм твайго любімага St. цяпер не даспадобы,— не па мне Хоць St. і хітры — не давяраецца «сябрам» і душэўна не прыляпляецца да іх — мае рацыю, га? Толькі гэта таксама не выхад).

Ну, мусіць, пара закругляцца — пакаціўся я, як таварняк з сартыровачнай горкі

А ты мне пішы, як і што хочаш Калі-нікалі лірыкі якой падпусці па галоўцы пагладзь. Я ўжо супакоіўся трохі не кідаюся ўжо пальчык не адкушу

P S А на літоўскія хутары з ездзіць трэба будзе калі Вось толькі дабрацца да Гародні — таксама даўно там не быў, але Ласасянку ўспамінаю калі-нікалі Ад Гародні да тых хутароў блізка, завітваў некалі»

На канверце дата — 19.IV.82 г — у лісце не прастаўлена. Увогуле Стральцоў акуратна датаваў свае лісты Можа гэтая думка — «адасобіўся я ад усяго», можа яшчэ нешта адвяло

ўвагу, магчыма, вось тыя літоўскія хутары — марыў ён пра хату пра свойскае жытло так бы мовіць, «на пленэры» Пра хутар, пра хату дзе на ўскрайку вёскі — адасобленую негаманкую. Не пра дачу — менавіта хату Нават у апошнія ўжо месяцы жыцця калі з явіліся нейкія грошы і пасля аперацыі ў Бараўлянах пачынала цепліцца надзея, ён выпраўляў сваю сярэднюю дачку Вераніку пагледзець якіх пляц з будынінай

Пра гэта многа будзе весціся гаворкі ў нашых лістах напаўжартаўлівай з узаемным пакепліваннем Мне таксама мроілася хата дзе-небудзь у лесе, на самоце І таксама мроя гэтая застанецца мрояй І ўвесь маёмасны набытак — кааператыўная кватэра і некалькі «дачаў» лапікі зямлі на магілках маці, бацькі маёй хроснай пан Магды І яшчэ і яшчэ Для мяне самой гэты лапік у пазажыццёвым існаванні — ужо мара Дай Божа каб не крэматорый

А вось яшчэ ліст-сведчанне. чаму не з'явілася там у Мазыры проза Стральцова Болдзінская восень не выпадала. Прытулак яго высылкі не быў маёнткам не быў «приютом спокойствия, трудов и вдохновенья» Ці было іншае выйсце з той пасткі лёсу у якую ён трапіў, я не ведаю Але — так ці інакш Стральцоў бытаваў у Мазыры у атачэнні не самым мякка кажучы спрыяльным для візітаў высокай Музы

«На адзіноце з сабой і табой мне выпадае заставацца толькі ўвечары пасля 8 гадзін (да 10) — увесь мой вольны час, бо другога, на жаль, не маю. Іншым разам не без зайздрасці ўспамінаю свае першыя месяцы ў санчасці хоць і людна і цесна было і настрой амаль хаўтурны, але, перамагаючы сябе пісалася ўсё ж, бо меў нейкі час а можа галоўнае — злосць. А ты заўважыла што ў кепскім настроі бывае, працуецца добра, варта толькі перасіліць сябе. Скруха — страшэнны цяжар, але «так тяжкий млат» і г.д.

А раніца .. Харошы час, каб услухоўвацца ў прадчуванні і паціху ненатужна давярацца ім і па іх настройвацца Бываюць, сапраўды такія хвіліны сцярожкай амаль упэўненасці ў непазбежнасці нейкага бадай што дзіва, неспадзяванкі узнагароды — нешта падобнае да таго, што прымушае Грын адчуць і перажыць Асоль перад з яўленнем Грэя Грын — няроўны пісьменнік (я кажу пра нявытрыманасць стылю), але гэтыя мечты обморочные до яви па-харошаму здзіўляюць празарлівасцю натхнення, на шчасце, дзейснага ў слове А гэта цяжка Асабліва там, дзе маеш справу з адчуваннямі Гэта ёсць у гамсунаўскіх «Вікторыі» і «Пане» — вельмі музыкальных рэчах. Падобная аркестроўка прозы не навіна, праўда пасля Тургенева, скажам, ягонай «Поездки в Полесье» Перачытай як-небудзь — цуд! Умеў стары! Цяперашнія ўжо, мусіць, так не ўмеюць, хоць у Бітава ў «Армянскім дзённіку» ёсць нешта падобнае па тонкасці і водару· памятаеш там «армянскі дворык»? Хораша

Я пішу тут без усялякай літаратуразнаўчай навукі эклектычнай з густаўшчынкай проста я кажу пра ўмельства падпусціць у рэалізм «смугі», не забіваючы контур кантраст і лейтматыў Вядома, бацькам усяго гэтага трэба лічыць Тургенева, лінія якога даўно ўжо ідзе поруч з лініяй Буніна, жарсткаватай і няўмольнай як лінія скрыпічнага грыфа Але мусіць, хопіць літаратуры Ці не? Пакінем мо на другі раз Ці пераключымся на літаратурны быт

Мне тут нешта піша А. пра маю кніжку якая лічыцца за Барадуліным Дазнаўся думаю. ад D Прапаноўвае перадрукаваць. Прыслаў мне «Ядл.[оўцавы] куст» «Цень ад вясла» — гэта ўжо зажым Каб паставіць гады напісання Я хацеў усё гэта, як ты ведаеш даверыць табе але можа, перадай частку клопатаў· і табе будзе лягчэй і А. думаю здаволіцца бо, здагадваюся нечага хоча ад мяне, нейкай літаратурнай помачы — «хітрая Мяндоза»!

Я не хацеў цябе турбаваць гэтым ведаючы што табе зараз не да таго, але калі ачуняла трохі, вазьміся кіраваць А. (во каб Барадуліным!) — можа кніжку і агораем і паставім таго ж F. перад фактам [. .]

Наконт машыністак (платы) не бянтэжцеся грошы я тут на машыністку зараблю а вершамі зараблю таксама. Адразу ж машыністцы (вам) прышлю. Вы толькі рабіце

Фу! Пераскочыў гэнае гіблае месца — ну яго! Пісьмо сапсаваў! Ты ўжо даруй

. Ну, добрай раніцы! Заканчваю пісьмо пры сонейку, пры чырыканні вераб ёў Нехта крычыць з вуліцы, што радыё абяцала Мінску несусветнае надвор е — аж да 16° цяпла! Во дзе шоргат на «Брадвей»! [Так у гады нашага юнацтва называлі Скарынавы праспект ці дакладней — тыя метры ад Галоўпаштамта да скверу тэатра Янкі Купалы] Во дзе віраванне і спакусы! Але нічога — маўчу У нас недзе свая «першпектыва» — уся ў лінейках-палках і надта сур'ёзных шчытах з не менш сур ёзнымі заклікамі і папярэджаннямі сентэнцыямі Тут Бальзак (!), напрыклад, са шчыта вяшчае так: «Товарищ, помни что один нерадивый заставляет о себе говорить больше, чем семеро примерных» Як табе гэта падабаецца гэты таварыш Бальзак? Я прывык. Я ведаю цяпер, напр[ыклад], што думаў Сервантэс (Дон-Кіхот?) наконт ветлівасці, Аміэль наконт марнатраўства, Даламбер (?) наконт выпіўкі Во! Шмат чаго ведаю: калі-небудзь падзялюся пры нагодзе. Такім багаццем не падзяліцца грэх.

Усё, усё. Бывай здаровенькая, выстаўляйся на сонейка. Успамінай калі-нікалі мяне
Міхась
27—28.IV.82»

О, не,— гэта не Міхайлаўскае, не Эрменанвіль, не Наан не Спаскае-Лутавінава Мазырская фартэцыя А, магчыма, каб лёс даў жыццё Стральцову мы атрымалі б нешта накшталт «Нататкаў з падполля» («Записок из подполья»). Не тое каб «Архипелаг ГУЛАГ» ці «В кругу первом» Але ў мазырскіх самотнікаў была свая трагедыя Свой побыт Свае самаўсведамленні Пра якія можна толькі здагадвацца па лістах Міхася Стральцова «Успамінай калі-нікалі пра мяне» Яму трэба было ведаць — яго памятаюць. Яму была край патрэбная ягоная кніжка вершаў Пацверджанне таго, што ён не выкрэслены з літаратуры з жыцця Ён у кожным лісце піша пра грошы машыністкам — каб, крый Божа, не падумалі, што ён жабрак, што ён спадзяецца на нечую міласць. І нават такое, што магло б мне добра палесціць. «Зноў кажу· ты ўладальніца ўсіх маіх опусаў і воль»,— адношу больш да яго крыўды на тых, на каго ён спадзяваўся «. што яму да тых, у каго не куецца, а плешчацца?» — з горычу згадваў Стральцоў пра аднаго з літаратараў дапамога якога недзе крышачку затрымлівалася

Тымчасам з'явіўся ліст, у якім Міхась відавочна скіроўваў эпісталярны сюжэт у ірэальнае рэчышча з відавочным іранічна-здзеклівым запрашэннем падтрымаць фабульную нітку Закруціць яе ў які карунак ці ў больш шчыльную матэрыю А самае можа галоўнае тут — Стральцоў і Дастаеўскі

А перад ім быў мой ліст — адказ на той, з цытатамі «маралістаў»

«Бач, Міхась, які я ненадзейны элемент Не толькі не выканала павышаных абавязацельстваў, але і з нормай не справілася. Пішу адказ са спазненнем, не крыўдуй. У мяне таксама бывае, што няма хвіліны ні ўдзень, ні ўночы Прыязджае «хуткая» да мамы ў дзве гадзіны ночы, у пяць ад'язджае, а ў восем раніцы выклікаю зноў Сама яшчэ добра не акрыяла, пакуль на бюлетэні А тут вясна, і розныя хатнія гаспадарчыя мітрэнгі Тэмп усюды патрэбны тэмп а яго пакуль што няма Хаця ты маеш рацыю, у кепскім настроі з'яўляюцца нейкія думкі ў галаве, хай бы нейкі фанограф (?) занатоўваў Але ж няма такога, дык пакуль схопіць рука пяро, дык усё з галавы вон рука лена рухаецца, і не ў тым кірунку

А раніца.. Харошы час. Ведаеш, люблю зусім сялянскую, на золаку раніцу Гадзіны ў чатыры-пяць. Няўцямнае ружавенне дня — такі ж прыдатны антураж для мройлівых прадчуванняў і адчуванняў І для жорсткай канкрэтыкі засвaення І для тых галасоў што гавораць. «Храни мечты, безумный, не знают умники таких прекрасных снов» Пераклад гумілёўскі трохі саладжавы Але, чытаючы твой ліст я адчуваю, чаму ўсё ж такі заўсёды паважала вялікага да знямогі Льва Мікалаевіча Ён нават у сваіх пошуках і сваіх метаниях солидно-рассудительный, определенный, ён усё пра ўсё ве́дае нават калі мае сумніва Ніякіх згадак і загадак. Усё пэўна, моцна і як, скажам, у «Хаджы-Мураце», так выпісана, што знямець можна ад клічнікаў свайго ўласнага захаплення Але не цягне, мабыць, «празарлівасцю натхнення» тых, каго прыгадваеш ты, няма той «смугі» ў чыстым рэалізме. Дарэчы не так даўно перачытвала Буніна І чытала б яшчэ. І суб'ектыўна лавіла б улоўнае і няўлоўнае за няўмольнай лініяй «скрыпічнага грыфа» Хіба не?

Хаця апошнім часам заўважыла — на набыццё штодзённай раўнавагі патрэбны жорсткі чэрствы да прагматызму рэалізм з немалой дозай скепсіса парадзіравання — па брэхтаўскім метадзе, калі адчуваеш сябе недатыкальна збоку і ўсё ж удзельнічаеш у падзеях. Ну што-небудзь накшталт ужо згаданага «Крамнэгела» Пітэра Усцінава ці Стэйнбэкава «Блукаючага аўтобуса». Каб не вяртацца да старожкага юнацкага піэтэту перад лаканізмам таты Хэма трохі страхоўкі на ўсякі выпадак не перашкодзіць У пару таго піэтэту лепш было страхавацца антыснабізмам якога Мантэня

Ну, панесла мяне сноўдацца з калаўротнага побыту ў вір літаратурны Без руля и без ветрил

Пра літаратурны быт Калі шчыра — тандэмы не вельмі люблю. І А. не ведаю суцэльна А калі ён хоча літаратурных працэнтаў — не вельмі давяраю Даведаюся праз тыдзень у Валодзі Паўлава [Паўлаў — паэт празаік, на тую пару загадчык рэдакцыі паэзіі] Рыгора Барадуліна, што да чаго Не тое, каб я анархіст-індывідуаліст але з эмпірычных рацэй ведаю, калі бярэцца некалькі людзей, ці не робіць ніхто ці ўсе робяць адно і тое Калі ты хочаш каб удзельнічаў А. дамоўлюся з ім праз Паўлава і «далажу» табе

Наконт новых вершаў. Гэта мая віна Я аддала Рыгору (Барадуліну) тое што ў «Полымя» і на радыё. Пісала табе пра гэта. Па правілах вершы, што не друкаваліся ў зборніках, не даюць здаецца. Але Барадулін гаварыў што для цябе зробяць выключэнне. А паколькі Юпіцеру дазволена ўсё, чаму б табе не пабыць Юпіцерам?

А ты як-небудзь, уладкаваўшыся з прыстойнай літоўкай на хутары не адмовіш у якім закуце ці мансардзе (папросту — гарышчы) адной кабеціне што не ўмее н воднай сялянскай справы — ані жаць, ані касіць, ані каровы даіць. Аднак паважае пленэр. І ўмее не рабіць клопату

А за літаратурныя практыкаванні мясцовых педагогаў з дапамогай класікаў — дзякуй Во распацешыў Ну, не раскашуйся адзін Адшкадуй і надалей блізкім

Якія табе кланяюцца Хочаш, магу зрабіць старасвецкі рэверанс? А не, дык проста развітаюся да наступнага ліста»

«ВОСЬ І ВЯСНА. КАТОРАЯ? ЯКАЯ?..»

«Каб ты ведала, які маршык ірванулі нейкія музыкі на подмасцях маёй душы калі ўхапіў я аж два твае пісьмы, ты можа, сумелася б і наперад засцераглася пасылаць мне лекі такога мацунку! Але ўсё абышлося, я застаўся жывы і выявілася, што ўвесь мой «состав частей» адрэагаваў на тваю дозу нармальна і як мае быць. Цяпер, наадварот, памяншэнне дозы можа быць згубным. мусіць, я ласы да такіх лекаў, як кот да валер'янкі

Жарты жартамі, а я пачаў быў непакоіцца ўжо і нават грызці сам сябе за гіпатэтычныя правіны Думалася, непаразуменне якое выйшла і ты пакрыўдзілася чаго,— рознае думалася І што А. да ўсёй гэтай справы [выданне кнігі] прыліп, і што St. здаецца не любіць яго, і што — чорт ведае што! Але ты азвалася — і стала лепей у мяне на душы І ў думках нават пачаў заносіцца высока, на твае вышкі-гарышчы ў літоўскім фальварку, дзе ты будзеш бавіць час ці не на адзіноце з раманамі Ганны Радкліф. А што ж, дарэчы пакідаеш ты мне? Ідылічнае шчасце з Пульхерыяй Іванаўнай, даруй прыгожай пейзанкай валавокай, як Гера? так? А чаму ты надумалася, што мне варта задаволіцца адной гэтай пейзанкай? Шырокі чалавек, казаў стары Дастаеўскі, і дадаваў, што ўкараціць яго было б не лішне. Нехта моліцца а нехта грашыць? Не, так, паводле Дастаеўскага не бывае. Ягоны чалавек і другую душу, молячыюся, побач, захоча прымусіць саграшыць — і не інакш як з сабой і захоча «ачышчацца» разам з ёй Праўда, перад «пейзанкай», як Раскольнікаў перад Соняй, можа і на каленях калі-нікалі пастаяць, але паляцець душой і іншымі помысламі да «мадоны» і будзе дамагацца каб яна Клеапатрай стала Шырокі чалавек. Матыўчык Клеапатры Даст.[аеўскі] у Ал.[яксандра] Сярг.[еевіча] добра ўчуў, а пасля «па-карамазаўску» яго развіў — такі ўжо чалавек! Урэшт папсаваны татарскім польскім, славянскім і бог ведае якім яшчэ субстратам! А так — да пары, да часу раманы Радкліф чытай Пакуль мяне няма, дазваляю. Папалася, га?

Цяпер пра справы

Зборнічкі я D адаслаў, як і варыянты назваў да кніжкі Туга думалася няўдалыя яны назвы, па-мойму але можа адштурхнецеся ад іх і нешта прыдумаеце самі [Пра гэта было вышэй — рэдактар кнігі Барадулін выбраў загаловак «Яшчэ і заўтра» пад гэтай назвай і выйшла кніга.] З датамі складана. Няўжо ад іх адмовіцца нельга? Калі нельга стаўляйце любыя у межах храналогіі двух кніжак, пакінуўшы два гады паперад першай Якая розніца!

D памагай, я сам у лісце здаецца прасіў яго пра гэта. [ ]

А D — апартуніст і цягамоцька І майстар напускаць на сябе адміністрацыйны ці які яшчэ сур'ёз. Пішу гэта зусім не злосна бо ведаю гэтую кампанію і не здзіўляюся і было б дзіўна ёй інакшай быць. Сярод аплэвухаў нейкіх, дал бог жывем Усе яны вартыя І , хоць і прытвараюцца, што лепшыя Можа В там толькі сур'ёзны чалавек. не сапсаваўся яшчэ

Новыя вершы ім вядома пакажы я хацеў бы, каб узялі што-небудзь адтуль. Не хочацца мне перадрукоўваць запар старое, а каб **захаваць** аб'ём, давядзецца А ў ранейшым шмат такога, ад чаго я пазбавіўся б Тое-сёе я зняў (у кніжках): паглядзіш у D

Наогул жа кніжку больш-менш прыстойную хочацца мець, а выд.[авецтва] са сваімі фінансавымі ці яшчэ якімі меркаваннямі ў гэтым чамусьці не зацікаўлена [.] Тут ужо можа, не літаратура, а нейкая кітайская рысавая плантацыя А С і D стаяць пад гэтай плантацыяй і ў калатушкі б'юць — адпужваюць вераб'ёў Ну іх!

Кінуць бы ўсё гэта, ды вось бяда — позна нічога другога не ўмею, а вучыцца другой навуцы калі? [.]

.таму спадзяванне на фальварак [ ] шукай яго на карце, заходзь калі-нікалі на аўтобусную станцыю пытай у цётак і бабулек.

А пакуль будзем плакацца як у гэтым вершыку,— ці не пра нас?

Хоць ад пары калі мяне
З табою вёрсты разлучылі
Тваім паглядам не дый не
За мною тыя дні сачылі —
Не не прысніў табе такой
Я долі — сведка бог ці сам я!
Што ж, дні нядружнай талакой

Ішлі і для мяне таксама,
Ды мне не рупіла, бадай
І незнарок не падалося,
Што ўсё што мог я не аддаў
Твайму няспраўджанаму лёсу
Я думаў проста· мы — сябры,
І што адна ты права маеш
На ўсе інакшыя дары,
І што мяне ты ўспамінаеш
З пачуццем лёгкім, як уздых,
Зімой па восені ці леце,
І што пачуццяў маладых
Нам не трымаць ужо на ўмеце,
Што разнасцежана акно
Табе адно, а мне — другое
І што табе з твайго відно
Хіба суцешнае адно —
І не відно нішто благое
Я памыляўся! Не спяшаў
У лістапад і ў месяц квецень.
Так размінаецца душа
З другой душой — і плача вецер.
Як цяжка вымавіць «Люблю!»
Даруй мне ўвечары ці ўранні
Цябе аб гэтым пакаранні,
Нібы аб ласцы, я малю»

«Так разлучаецца душа з другой душой — і плача вецер» — гэта не так пра нас, як пра няспраўджанасць чалавечага жыцця, якое пачынаецца з крутога наіву як згадалі б сённяшнія маладзёны, спадзяванняў, мараў А потым захлынаецца, затоптваецца шэрай будзённым, цягамотным «дзень пры дні» «Твайго няспраўджанага лёсу» — назіранне жорсткае і справядлівае. Хаця — ці толькі да мяне яно стасуецца? Не так многа людзей, што маглі б, падводзячы папярэднія вынікі, пахваліцца спраўджаным лёсам. Гэта не суцяшэнне, «холодные наблюдения» і «горестные заметы» І ўвогуле — Міхась мусіць пазначыць у адным лісце: «адрасат праясняецца пазней» Так што я адразу досыць адстаронена і «літаратурна» ставілася да вершаў у лістах Міхася Безумоўна, атрымай я такі ліст гадоў у васемнаццаць, я ўсё ці амаль усё (скептыцызм заўсёды быў знішчальна-выратавальнай якасцю маёй натуры) узяла б напавер, але той узрост даўно адляцеў, як і шмат што ў жыцці

Ці вабіла мяне пачуваць сябе гераіняй эпісталярнага раману? Былі не тыя абставіны І ў Міхася Стральцова. І ў мяне. Хаця, мушу яшчэ згадаць, умовы гульні я прымала Прыхільніца парадоксаў Уайльда і Шоу, вельмі любіла п'есу Дж. Кілці «Мілы ілгун» паводле ліставання Бернарда Шоу і актрысы Патрык Кэмпбэл і спектакль па гэтай п'есе (бачыла ў ім дзве бліскучыя выканаўчыя пары Анатоля Ктората і Ангеліну Сцяпанаву Расціслава Плята і Любоў Арлову). Напрыканцы 60—70-х гадоў увогуле былі вельмі папулярныя розныя дзействы паводле ліставання А.Чэхава і Л Мізінавай, І Тургенева і М Савінай і г.д. Усё гэта было ў мяне, безумоўна, «на слыху» Але на тую пару не думалася, што так недарэчна хутка лісты Міхася Стральцова ператворацца ў спадчыну Я не збіралася адшчыкваць лісце ад яго лаўровага вянка на бутаньерку ці, крый божа, на літварыва І цяпер не маю такой мэты

Згадаю яшчэ раз — умоўны, менавіта ўмоўны, не тэатральны, характар перапіскі мы разумелі абодва І ў гэтым быў свой імпэт Для кожнага з нас адрасат быў перш за ўсё — вобразам Для мяне — багатым усім напісаным Міхасём Стральцовым Для яго — пазначаны ягонай паэтычнай фантазіяй

Мая галава была заўсёды тлумна поўная цытатамі Я ведала — ён угадзее любы перафраз А тым больш вядомых радкоў Сваю кніжку «Гарачы след таленту», дзе адным з «герояў» быў Стральцоў, падпісвала яму· «Мы шли дорогой не одною, но нас обманули те же сны» Я не збіралася параўноўваць сябе з гр. Растапчынай. А ў тым надпісе мела на ўвазе няспраўджанасць калі не лёсу, дык мараў Дарэчы, таксама, па-мойму, адна з прычын таго, што я стала адрасаткай ягоных лістоў, — адтуль, з Мазыра· яму прасцей было кантактаваць з чалавекам «няспраўджанага лёсу» Прынамсі — тымчасам. Я не мэнчыла яго сваім «праспэрыты»[16] І — гэта ён добра ведаў· мела пашану да зробленага ім Не бурчэла — патрэбны раман, неабходна шматлогія

У нас, калі не датычыла беларускай літаратуры, пра гэта згадвалася вельмі часта супа-

далі густы І было яшчэ агульнае — пра тое ніколі не распавядалася але, мабыць, ён угадваў ува мне схільнасць да сузіральніцтва. Ну а я не магла не ведаць гэтага, чытаючы Стральцова Яго «руссаізм», яго адчуванне неабходнасці прыроднай аўры, яго «святадзейства ў гонар прыроднага кругазвароту» Ёсць у Міхася Стральцова ў «Паўночным дзённіку» такое памятнае: «. .мы па-рознаму разумеем сябе ў прыродзе і жыцці чалавек індывідуальны, прырода безасабовая і, да таго ж, абыякавая да нас, у жыцці мы перш за ўсё адчуваем сябе як асобу усё ідзе ад нас і ўсё вяртаецца да нас. мы як бы пасылаем сігналы і самі ж прымаем адказы на іх. Калі ж нешта псуецца ў гэтай добра наладжанай сувязі, яна перастае быць зваротнай Бяжы тады, чалавек, бяжы, хутчэй ідзі да прыроды яна безупынна шле табе свае сігналы, як сонца праменні .»

Ці была ў яго магчымасць там пабыць «на прыродзе»? У лесе? Наўрад. Таму, можа з асаблівым імпэтам апісвае ён уяўныя падарожжы

«Сыбота. Вецер усчаўся, мо на дождж, а ўдзень было цёпла сонечна і мне думалася што за тваім домам, ці за тваімі дамамі, на ўзлобіне ўзгорка, ужо дагараюць [у лісце так], што на працу ты ходзіш паўз возера, памятнае з нейкіх часоў і мне, бо недзе там жыў некал што вось чамусьці ніколі не давялося нам з табой пабыць на прыродзе хаця б у Каралішчавічах, і што як ехаць у Ракаў з нашага гарадскога раёна [мы жылі ў адным раёне — за Кальварыяй], а ехаць можна любым самазвалам (у кабіне, вядома, бо з дваццатага кіламетра возяць у горад гравійку і пясок), можна тое-сёе ўбачыць па дарозе і спыніцца дзе пажадае душа (той дарогай я ездзіў іншым часам па грыбы і нават на дачу да некага з лысагорцаў), што калі не зварочваючы, дапяць да Ракава (гэта ўжо трэба аўтобусам), а там перасесці ў аўтобус мясцовы,— можна вельмі нават проста трапіць на лясную рэчку Лань, а там ужо будуецца (мо пабудаваўся?) наш новы Дом творчасці — толькі справа не ў гэтым і не ў гэтым Доме а ў тым што там добрыя мясціны (ручаюся, бо неаднойчы там блажаўся і хадзіў), і што ты каб захацела і каб захацеў перад тым пан бог (а ён мог бы зрабіць так, што на пачатку восені мой цень слізгануўся б па мінскіх тратуарах) — дык справа ў тым, што я мо шукаў бы сам сябра ў падарожжа за горад — мо па грыбы, мо так, дзеля душэўнай акрасы і цішыні — і мо ты паказала б мне такога чалавека, а каб аблегчыць табе задачу, я наперад скажу, што пажадана каб гэта была жанчына, нечым вельмі падобная на адну тваю знаёмую якая табе калі-нікалі падабаецца, а найбольш, здаецца, не, хоць ты ўсё роўна нягледзячы на гэта, неразлучная з ёй дык вось, гэтая жанчына бадай што спатрэбілася б у падарожжы мне — ты ёй скажы як-небудзь, пры нагодзе, пра гэта, га?

І пра тое, што яна скажа і як яна адкажа, мне адп шы

А восень я паспрабую заказаць добрую.

Вось што я ўспомніў· у ранейшым пісьме не на ўсе твае дзелавыя пытанні адказаў — так загаварыўся, як цецярук.

Ну, вядома, В абыдзецца без А., гэта зразумела Так я і А. калі не памыляюся пісаў А з В вы, думаю, паладзіце.

Яшчэ забыўся папытаць у цябе пра лёс рукапісаў В Івашчанкі Паспрыяйце яму як быццам бы мне, калі я хоць трохі ў вашай рэд.[акцыі] чаго варты Гэта харошы і сур ёзны чалавек, крытык харошы, ведаеш сама Ён, па-мойму, трохі баіцца рэдактарская самаўладства але гэта, па-мойму, не амбіцыі, а натуральны стан і рэакцыя сумленнага і пісьменнага крытыка Так што не надта гладзьце супраць шчацінкі Дальбог! Ну зрабіце! Мяне вы ўсё роўна не выдаеце, выдавайце хоць тых, каго прыемна будзе чытаць.

Ага, вось. пакуль той фальварак, дык у мяне, можа свая хата будзе. Гэта, каб у «прымы» не ісці А да сябе ўзяць каго хочаш магу І не буду гаварыць, што, маўляў вось гэта мая хата [.]»

Івашчанка — гэта маскоўскі крытык, які на тую пару надаваў вялікую ўвагу беларускім літаратарам, пісаў і пра Стральцова, у прыватнасці, прадмову да зборніка прозы ў перакладзе на рускую мову «Журавлиное небо» (бібліятэка часопіса «Дружба народов»). На тую пару планаваўся ягоны зборнік «Круги надежды и добра» А кніга крытыкі М хася Стральцова «Пячатка майстра» выйшла ў 1986 годзе І — што ўтойваць — цягнула я з Міхася Лявонцьевіча гэты рукапіс, і просячы, і молячы і пагражаючы Пакуль не прынёс стос газетных і часопісных выцінкаў — і складваць, і аддаваць машыністкам на перадрук, і вычытваць. гэты гонар ён надаў мне рэдактару Была, была ў «абранніка сонечнага Феба» гэтая звычка ён не любіў чорнай працы, чарнавых рыштункаў Было ў яго літаратурнае сібарыцтва А хутчэй — яму і сапраўды быў патрэбны сакратар, памочнік, чалавек, які рабіў бы тэхнічную працу Мабыць, такі чалавек быў яму патрэбны як і свой калі не маёнтак і не фальварак, дык ціхманы, добраўпарадкаваны куток. Хата ў цішы Разуменне. Паразуменне І — свабода ад занятказ, так бы мовіць, «не эзатэрычных»

І гэтае, зусім звычайнае для другіх, і лёгка спраўджанае для іншых жаданне. мець хату было таксама, на жаль, толькі ідэяй фікс. А ён трызніў тым прытулкам Гасцяваўшы, пасля

звароту з Мозыра на чужых дачах Дарэчы калі мы ездзілі ў 1987 годзе ў вёску Сычын хата яго дзяцінства была пустая Там ніхто не жыў Але мусіць не ў яго натуры было б месціцца так, каб заўсёды быць на вачах, пад пільнай увагай вяскоўцаў (Зараз дарэчы Сычын — «зона», тут ніхто не жыве.) Аднак ці не гэтую ў Сычыне хату ён меў на ўвазе ў лісце? Пазней у пісьмах Міхась згадваў· і ў печы б паліў і дровы б цягаў і ваду нас ў І глядзеў бы на вясёлы ці роздумны агонь у камінку Пазіраючы на «узор прыгожы пекных зор» На самоце? Так. Але мне здаецца, самоту (уединение) ён любіў ажно адзінота не была яго марай Бачыў ён сябе хутчэй — з Ёю Хто — Яна? Межы асабістых адносін і ўяўнага прывіднага ён не пазначае Падзеі жыцця і падзеі ўяўлення — яны набліжаюцца ў яго і перакрыжоўваюцца Ці — верагодна?— ён намысліваў можа новы твор? Лісты ж — як чытацкі водгук Даходзіць!

«Дзень добры, даражэнькая!

А ведаеш, мне спадабалася як ты паказала кіпцюркі, ці прыняла гэткую фехтавальную пазіцыю перад m-me Vt. і (о, женщины!) характарыстыкі пранікпівыя і вычарпальныя такія ад літаратурнай удавы спачатку як бы дух адлятаў а потым і спружыны ўсе жаласна бомкнуўшы, вонкі Ну то няхай! Як я зразумеў m-me ў Саюзе на кафедру ці амбон узнімалася а цыганаваты падшыванец за якой парцьерай хаваўся? І Гамлета на гэтага Палонія не знайшлося?

Мне дык трохі прабач і смешна Не ведаю чаму а У акрамя смеху можа дурнога чамусьці нічога ніколі не выклікаў у мяне Нешта што пнецца раздзьмуцца да памераў вала І дапяў-такі да параўнання з гэтым боскім стварэннем у працавітасці — нейкай нуднай і асуджанай, і знябытай вол вось так, мусіць, і нудна працуе і нудна жлукціць ваду

Ваду ты пі, ваду ты пі —
Да скону века
Ды толькі ў ёй ты не тап
Сучалавека

Там у іх, па-мойму хіба з L. парагатаць ці пагаварыць можна За адно гэта не шкода і намякнуць яму іншым разам але «хітра» як бы прымаючы правілы пэўнай гульні вядомай табе і яму, што ад «баля́рына» Льва ён розніцца хіба адсутнасцю мужыцкай барады («Ну мужыцкае, браце у нас ёсць — і да барады ягонай ёсць!»), а таксама ж надта таленавітых сыноў («Мая Танька і Шамякінскую заткне!»). L. пагладзіць жывот свіркне акулярамі ў адзін бок у другі а потым задзярэ галаў і па-блазенску хапне ротам паветра — і так будзе на цябе глядзець во мы ім! [.]

Во ім! Весялей між іншым і сама глядзі на свет Мне дык гэтага пэўна жадаеш інакш не скіроўвала б нечы і позірк і імпэт на Дульцынеі і Флор розных. Хто яго ведае «Мне бы лучше вон ту .» — ці заўсёды гэта апраўдвае сябе, га? У прастаце так званай ёсць нешта ад чаго можна звар'яцець. Вельмі проста што там магчыма разгадка я згодзен але ж чалавека зноў жа так нехта зглумаздаваў што ён сам сабе пры гэтым не паверыць і ўсё адно будзе шукаць нечага яшчэ на згубу сабе Чалавек, між іншым прастаты баіцца хоць і жадае яе Я табе гэта спасылкай на строга навуковае вызначэнне жыцця дакажу Яно вызначаецца (жыццё) таўталагічна жыццё ёсць жыццё І не болей Які-небудзь сэнс ці тым болей ідэал мэта — крый божа! Гэта, мусіць, праўда але паспрабуй пераканай у гэтым «гуманітарнага» чалавека! Так і я ў Дульцынею, і ў Флору тваю не веру я ў яе веру толькі ў той момант можа калі чалавек «истекает звездными хлопьями» як сказаў нехта Прырода тут пастку добрую паставіла гэта праўда Але ж гэта толькі імгненне, а мы каб не звар яцець ад усведамлення жахлівай «хрупкости» гэтага імгнення прыдумалі мастацтва культуру і г.д. і г.д. Каханне само сабой — вось табе? І не вырвешся адсюль. І таму не палохай мяне ні «разумнасцю» ні Дульцынеямі не суцяшай І адкуль ты ведаеш між іншым што табе трэба спакой — і прытым такі а не гэтакі? Кінь, кінь, даражэнькая!

Але ж мы і ў філасофію з табой залезлі! На сёння даволі можа Я табе пялёстак «ириса» калі не памыляюся, прышлю. («Флоренция ты ирис нежный» — у Блока). Можа дойдзе?

Пра справы напішу ў другім лісце згода?

А ты б мне здымак свой прыслала, ці што? Не смейся Я хваліцца ім не буду Тут гэта і не банальна можа — не хваліцца, а здымак. Гэта тут толькі мусіць, можна зразумець. Я табе пасля вярну калі захочаш. А свой я так ці інакш прышлю для кніжкі ты на мяне цяперашняга паглядзіш і вырашыш ці трэба яго даваць (перамелаваць). Хаця там можа і другога малююць. хе?

П шы паветраныя ванны ці душы (як іх там завуць?) прымай Патрохі і паступова І вады не бойся Каб не баяцца У чытай

3 VI.82

Міхась»

Дульцынеі і Флоры — усё пра тое ж, мае згаданыя вышэй напаўжартам напаўсур ёзам згадкі, як ён кіне ўрэшце сваё вымушанае паселішча і атабарыцца на хутары на ўлонні прыроды, з якой Чароўнай Дамай і будзе ствараць шэдэўры А я тымчасам калі-небудзь завітаю да іх, і яны адшкадуюць мне на пару дзён гарышча ці прынадную мансарду і я буду пацяху піць слодыч вясковага паветру і суцэльнага жыццёвага спакою: nihil habeo, nihil curo[17] Тымчасам я прайшла працэдуру прыёму ў саюз і «живописала» яму нейкія фрагменты таго «дзейства». Здымкі мы не дасылалі — яны таксама засталіся ў той, не пазначанай канкрэтным рэаліямі ўмоўнай прасторы нашага ліставання Як у тэатры — калі нехта падносіць шклянку да вуснаў гэта зусім не азначае, што ён нешта п е.

Стральцова для кнігі маляваў мастак М Вецік па старым здымку Я на тую пару не фатаграфавалася гадоў сем, а то і дзесяць. Былі выпадковыя аматарскія адбіткі больш з нейкімі людзьмі І ўвогуле я вельмі рэдка прэзентавала здымкі Ці то ад сціпласці, ці то ад засцярогі Хто яго ведае — як той здымак будзе глядзецца заўтра? Калі адыдзе вось гэтая неабходнасць — перамаўлення графічна выяўленымі словамі?

А пакуль перамаўленне было ўжо звычным нібыта гаворкай — з некім, а і з самім сабой Я пазначала была такая звычка гаварыць у яго ўвогуле Так пісаліся лісты· нібыта мне нібыта, як ён сам пісаў і пра што ўжо згадвалася — дыярыюш ствараўся Anno Domini[18] 1982

«Дзень добры, Ала!

Аж самому няёмка, што так надакучаю табе пісьмамі — і гэта я катораму яшчэ нядаўна старонку Дзюма (во дзе кара!) было б адолець лягчэй, чым адказаць каму-небудзь на ліст або напісаць па сваёй ахвоце. Таму будзеш думаць, што ўплываеш ты на мяне дабратворна, калі змагла збудзіць ва мне гэтую, я думаў, атавістычную страсць, або хэнць. Я можа, глядзі, і раскалыхаюся душэўна, а ты, значыцца, як гаварыў незабыўны Броўка, а ты пішы, а ты пішы

І па тэатрах, вядома, хадзі, не надта турбуючыся што паселіш у маёй душы чорную зайздрасць. Тэатрал я невялікі, мне ўсё роўна, ходзяць больш у тэатр ці кіно — або наадварот І хто там каго пераможа, якая дзесятая ці адзінаццатая муза — мне справа сапраўды дзесятая Сучасны тэатр не ведаю, не бачыў, вядома, нічога з рэжысёрскіх феноменаў Гратоўскага [?], панявежцаў якіх-небудзь нават не бачыў, не ведаю, што там вырабляў у сваім тэатры Любімаў, а вось з ягоным вучнем Раеўскім (так ён сябе называе) рабіў Купалу, бо тут сапраўды было нешта (у Купалы) ад «паэтычнага» тэатра. І спрэчкі розныя пра дыктат рэжысуры і акцёрскае самавызначэнне неяк абыходзяць мяне: я не за надакучнае выдыганне і выкаблучванне аднаго правінцыйнага Рэйнхарда перад другім, я і не за «салопны» нейкі рэжысёрскі стыль, асабліва ў трактоўцы класікі як і не за аголены мадэрны, а проста ўбогі, т.зв. сучасны Я быў бы проста, можа, за тэатр, але што гэта такое? Жорсткія псіхалагічныя канструкцыі Раеўскага пры абструганым ці неабструганым дэкоры якога-небудзь Герлавана? Палавінчатасць Луцэнкі? Луцэнка трохі як бы на маіх вачах рабіў «Раскіданае гняздо» — там было тое-сёе, але нейкай лініі, нават рэжысёрскай, ён не дабіўся, што амаль заўсёды робіць Раеўскі хоць і рацыяналістычна вельмі — так, што глядач бачыць часам адваротнае таму, што ён хацеў

А так, я не ведаю дзе той сучасны тэатр і дзе той стыль. У макаёнкаўскай «Верачцы» хіба? Даруйце. На санвузле, прабач і якая-небудзь Пегі сучасная глядзіцца не надта каб, а тут яшчэ Пульхерыя нейкая Іванаўна, чамусьці завецца аж Арынай Радзівонаўнай Авохці нам!

Гэта, вядома, не значыць, што я не хацеў бы, скажам, пайсці з табой у тэатр — хоць на «Запарожца за Дунаем» — калі ласка! І людзі няхай ходзяць у тэатр і ў кіно і на танцпляцоўкі, ці на «карчы», як іх называюць у парках»

Тэатр і кіно засталіся «незасвоенымі» творцам Стральцовым

«Ведаеш, Міхась, як я трапіла ў тэатр упершыню? Калі была ў 5-м класе маці выйграла на аблігацыі нейкія грошы І на гэтыя нечаканыя пенёндзы павезла ў Менск мяне і дзяўчыну што дапамагала нам па гаспадарцы ці хутчэй па хатніх справах. Маці з ранку да вечара была на працы заўсёды — у камандзіроўках. Адвакат

У сталіцы мы спыніліся ў шыкоўным на мой погляд «люксе» ў гасцёўні «Беларусь» [цяпер — «Свіслач»]. Сіні аксаміт шаўковыя крэмавыя сторы, раяль.. У оперным глядзелі «Князь-возера» Уражання адкрыцця не было, але памятаю — спадабалася атмасфера тэатра Строга і вольна, як у храме [ ]

Недзе з трэцяга курса і пазней, у 60—70-я гады была аматаркай тэатра «захвыцонай» аматаркай Тэатр Мілцініса ў Паневежысе не бачыла, але да «Ванемуйне» ў Тарту дапяла «Давалі» (76-ты) «Танга» тысячу разоў забароненага тады Славаміра Мрожэка У Маскве падчас сваіх курсаў падвышэння кваліфікацыі ў 74-м годзе хадзіла нават па два разы на дзень на ранішнія і вечаровыя спектаклі «Вачыма клоўна» (паводле Бёля) з Бортнікавым у тэатры Массавета бачыла Бог ведае колькі разоў і ў Маскве і падчас іх гастроляў

А гастролі! Гастрол ! Акімаўскага Ленінградскага — «Дон Жуан» «Здань» «Дванаццатая ноч» А тэатр Маякоўскага ў часы Ахлопкава! А «Мілы ілгун» мхатаўскі са Сцяпанавай і Кторавым! [ ]

У 1972 годзе сядзела ў бібліятэцы ў Ленінградзе ледзь не месяц. Бачыла ўвесь рэпертуар

Таганкі Твой улюбёны Раеўскі мне падаецца звычайным плагіятарам. У «Лесвіцы славы» ён, што шкаляр, «здзёр» усе прыёмы, усе мізансцэны свайго настаўніка Любімава з яго «Тарцюфа» [...]

Цяпер я радзей хаджу ў тэатр. Ці гады матчынай хваробы даліся ў знакі, ці што. Аднак — люблю. Кніжкі да гэтай пары купляю. «Тэатральныя» Люблю і так званы рэжысёрскі тэатр. Усе фокусы а ля Пітэр Брук, Меерхольд ці Брэхт І акторскі — таксама Люблю добрых актораў На сцэне.

Бывай.

А.С.».

І Стральцоў на пачатку лета, 7.06, адпісваў

«Пісьмо маё ў адказ на тваё ранейшае, якое так узнепакоіла цябе, ты, мусіць, атрымала, і значыць, ведаеш, што першая прычына непакоіцца адпала. Другая — а ці не сказаць і мне нешта падобнае да твайго? І я табе, мажа, нечага нагаварыў, хоць, не ў прыклад табе, раскайвацца ўсё ж не буду — не! Хочаш сячы галаву, хочаш злітуйся. Апошняе, вядома, было б найлепей. [...]

Пішы І не бойся быць разбэрсанай трохі Каму ж гэта не дазваляецца, як не жанчыне? [. .]»

Ну, вось што я ўжо ўмела — таленавіта, геніяльна — быць разбэрсанай Можа, таму, што заўсёды была занадта зацугляная працай — за сябе і за іншых. І ўся самадысцыпліна ішла на гэта. Бо той самы ўлюбёнец Міхася Стральцова гаварыў· «Плоды — вдохновенного досуга, вдохновенного труда». «Досуга» — у мяне яго ніколі не было. Служба. Служба Служба Абавязкі Абавязкі Абавязкі

Міхась тое разумеў·

«Справы, справы, справы

Мне тут, па-свойму, дальбог, лепей І тут ёсць розныя справы і можа нават замнога іх, але ўсе яны ў адным зададзеным рэчышчы І, значыцца, той, хто прадвызначыў і планаваў іх (не я, вядома), думаў, можа, і аб нейкай карысці ад усяго гэтага, а калі яе няма або не можа быць, дык няхай гэта будзе на ягоным і сумленні, і сумненні Не на маім жа! Во дзе «апартунізм» а ты яго бярэш на сябе!

Так, справы Найпершая мо і найлепшая справа — грызціся за свае права быць самім сабой, а гэта немагчыма, на жаль, інакш як праз эгаістычнае сцвярджэнне сябе, і гэта зноў жа, не здзіўляйся, найбольш магчыма якраз у мастацтве — гуманным паводле мэт і вынікаў, і эгаістычным паводле спосабу здзяйснення. Гогалі і Чэхавы разумелі гэта, плоцячы за такое разуменне дарагую цану Чэхаў, праўда, востра адчуваў гэтую цану ва ўсім іншым, «кукарэкнуў» у другім — узяў ды жаніўся Ма Па [Марыя Паўлаўна — сястра Чэхава], здаецца не магла яму даравацъ. Як адданы і па-жаночы разумны чалавек, яна ведала, што дабром тут не скончыцца — і не скончылася, вядома.

З усяго гэтага вынікае, што нам варта калі-нікалі задумвацца, як казаў Прокша, «ці варта было жаніцца»

Як табе падабаюцца мае развагі?

Гэта яшчэ толькі развагі пра «справы», а справы, чакай, будуць. Ну, па парадку В я, здаецца, пісаў **пра некалькі** вершаў, якія даслаў у «ЛіМ» — там, здаецца абяцалі даць. Мусіць, пра гэта ён і ўспомніў Пачакайце «ЛіМа» З іх ты, ведаеш, здаецца, адзін той, які я апошнім часам даслаў табе. Іншае — я ўспомніў вершы старыя (яны валяюцца дома недзе) і так-сяк іх узнавіў — не ўсе. Імі я не задаволены, але проста хацелася абазвацца неяк, а тваю падборку (заўваж, тваю) я не хацеў разбураць. паглядзім што зробіць з ёю Вялюгін

Чакайце «ЛіМа»

Рэцэнзіі мае ніяк не робяцца Адбіў усялякую ахвоту К. а можа раззлуюся і напішу Цьфу! Перасілю сябе. У «ЛіМе» таксама абяцаў нешта пра R бо прасілі Таксама цяжка будзе пісаць. І прасілі яшчэ ў мяне ўспаміны, сюды даслалі — Броўчыха і сястра Еўд.[акіі] Лось. Напісаць можна было б, але час.. Усе мае (амаль усе — бо не паверыш) кволыя літздольнасці і скупыя вольныя хвіліны забіраеш ты — і я рады гэтаму, нягледзячы на тое што Адэсай ты шкрабанула-такі (не назнарок?) мне па сэрцы Але я цярплю, хоць адразу ўспомнілася і як ты хацела мяне сплавіць «пейзанцы»

І гэта я так гавару пра справы!

Ну добра, будзем пра справы

Вялюгіну паспрабую напісаць — толькі куды у рэдакцыю? Хатняга адрасу я не помню Прышлі

В пра мяне напамінай. [. .]

Івашчанка твой ліст атрымаў — задаволены Калі дазволіш папрыспешваю яго Наогул яму памажы

Вось, слухай. хачу я калі выберуся адсюль, уцячы ў Масковію. Бачу што фальварка ў нас не агораецца, застаецца нам адной перапіскай жыць і паважацца на адлегласці Жаніцца там не буду але, як Крупенька [Яўген Крупенька — паэт], у прымы мо дзе прыстану Як ты думаеш, ці возьмуць?

Во што такое старасць!

Што табе напісаць яшчэ? Адчуваю, што я нешта сёння «перастарэкаўся», як кажа Брыль. А пісаць стаў як У — ці адчуваеш? Я ўсё ж, як ні кажы, «в затворах», а ён У ля афіцыянтак у Саюзе крэкча і аблізваецца як памаўзлівы кот, з Bs праблемы адзюльтэра сучаснага па дзве гадзіны ў дзень на праходках ранішніх і вячэрніх вырашае дык хіба яму «перастарэкацца» можна — скажы? Гэта мне ўжо хутчэй даравальна, хоць, праўда, недаравальна, як У пісаць

Лепш ужо зусім не пісаць, што я і раблю — не без поспеху

Спытай у акына Шаха [Шахавец Уладзімір Міхайлавіч — празаік, на тую пару загадчык рэдакцыі перавыданняў у выдавецтве «Мастацкая літаратура»], з чаго (ці з каго?) яны мяне збіраюцца маляваць (для кніжкі, кал тое будзе). А то я сапраўды ім здымак адсюль прышлю: валасы нам 2 см дазваляюць кляйма на ілбе няма ноздры не вырваныя а гольф я ў каго-небудзь, хто на волю будзе ісці на 5 хв.[ілін], каб сфатаграф[авацца], пазычу.

А ты здагадайся да чаго я ўсё гэта вяду і на што «намякоўваю»

Бывай. Міхась. 12 VI.82»

Рэцэнзіі Міхась Лявонцьевіч так і не напісаў Не перасільваў сябе, не высільваўся Ахоўваў усё ж перш-наперш «права быць самім сабой» А Чэхаўскае «кукарэканне» згадвалася нездарма вядома Былі мабыць, асабістыя падставы меркаванні тыя мецъ Але хто ж з вялікіх так ці інакш не «кукарэкнуў»? І ці быў выключэннем Міхась Стральцоў? Але зноў жа згадаю яшчэ раз — жонка ці каханка талента — гэта таксама талент Некалі не чуць. не бачыць, не ўмець слова вымавіць Некалі — чуць тое, што не было прамоўлена, бачыць тое, чаго не было, усміхацца калі вусны сцятыя крыўдай і няўладзіцай У Міхася Стральцова таксама была свая чалавечая гісторыя, свае, так бы мовіць «вытворныя множнасці» свая непаўторнасць выпадкаў і фактаў І зямны шлях ужо перакінуўся на другую палавіну — для Стральцова да крыўднага малую палавіну Хаця ён разумеў гэта і не меў ахвоты разумець Ён быў паэтам Ён марыў пра Вялікае Каханне і не страціў надзеі на яго

Вось і вясна Каторая? Якая?

Каторая — у лёсу запытай.

Якая — што за марамі блукае?

Лепш не пытай а лепш душой адтай

Міхась Стральцоў верыў і не верыў, мабыць у гэтыя вёсны Кожным выпадкам любіў і адчуваў існасць існавання Верыў у вялікую сілу Быцця

Ускраіна абвалаклася дымам

Гарацъ, гарацъ бадылле і лісцё.

Пад гэтым небам сінім і любімым,

Не верыцца чамусьці ў небыццё.

Але гэта было пазней — а тут пакуль быў камуфляваны іроніяй адчай. «кляйма на ілбе няма», «ноздры не вырваныя» Таму і мае лісты на тую пару важылі нашмат больш іх рэальнай каштоўнасці Ён прайшоў праз страшэннае прыніжэнне і здаецца захаваў відавочную ці пакрыёмую крыўду за яго. Але — ці вярнуўся б ён да ўнармаванага жыцця каб не Мазыр? Не ведаю. І не кідаю камень абвінавачвання тым, хто спрыяў ягонай «ссылцы»

Так ці інакш — Стральцоў лічыў дні ў сваёй высылцы

«ПАКЛІЧУ МАРУ...»

«Добры вечар,—кажу гэты раз і гляджу ў акно, за якім і сапраўды вечарэе, але на Захадзе ні барваў, ні бліскавак, хоць па-навальнічнаму пахмурна і ветравана [так у тэксце]. Зеляніна нейкага вайскова-адчужанага, без тонаў, колеру, бо замгліла неба а ці надоўга не ведаю

Учора атрымаў тваё пісьмо, адпісаў нават заклеіў, і вось яно і ляжыць на стале як не маё ўжо, без маёй улады на яго, якраз такое, якім прачытаеш яго, якім яно табе падасца А якім не ведаю Рэчы, мусіць таксама ведаюць адчужэнне як і праніклівасць, можа сваю Я, напрыклад, рэдка бываю ў згодзе з імі і яны мусіць адчуваюць гэта бо ніколі не затрымліваюцца ў мяне, як бы баяцца нейкай неўладкаванасці самога гаспадара — мо найперш, душэўнай

Дык вось, пісьмо табе ляжыць неадпраўленае і будзе ляжаць аж да панядзелка прыдзе разам з гэтым, а мо і не — на тое ёсць свае паштовыя дзівосы

Значыцца, так. Надвор'е, мяркую, і ў вас сапсавалася і ты мусіць, так і не здзейсніла мой наказ павандраваць па крэсах нашага раёна з «французской книжкою в руках» a la belle Таццяна, памаркоціцца ля возера ў часы калі там мала ўжо вульгарных купальшчыц і купальш-

чыкаў, але яшчэ і не затаіўся ў прыбрэжных хмызах сумна-задумлівы Пан каб высочваць нетутэйшых наяд,— не пагражае табе хіба сустрэча з маім імгненна-прывідным ценем над той вадой ён нагадае табе, можа лермантаўскія радкі якія згадваў я некалі над тым з дазволу сказаць, возерам Вось такія радкі

Окончен труд дневных забот
Я часто о тебе мечтаю.
Бродя вблизи пустынных вод,
Вечерним выстрелам внимаю.
И между тем как чередой
Глушит волнами их седыми,
Я плачу я томим тоской,
Я умереть желаю с ними

Кажется, так[19] А ўспаміналіся мне там можа «иные берега иные волны» А цяпер я хачу бачыць цябе менавіта на нейкіх здратаваных берагах нейкага м нскага возера — і крый божа, не ў Палангах і не ў Адэсах шумных! Крый божа!

Ці не эгаізм гэта? І па праву якому га?

Як бы там ні было, пасылаю табе трохі «божых слёзак» А наогул жа няхай анёлы з табой гуляюць, а ты, калі хочаш узносся з імі на неба — не надоўга праўда, бо ў мяне забаляць вочы глядзець на анёльскае гэта відовішча

Бывай. Пішы. Жыць асабліва не спяшайся А маркоціцца — тым болей

Міхась.

12 06.82.»

Ён умеў быць высакародна-шчодрым — Міхась Стральцоў Мог высокай думкай сваёй узнесці на «небясі», надаць шчымліва-чыстую кампанію, кінуць крылцы-пасачкі — не шкада. Хай, маўляў, пацешыцца я толькі-толькі знялася з трохмесяцовай бюлетэневай котвіцы ён гэта ведаў І неяк знаходзіў — там!— і добрыя словы і «божыя слёзкі» Крыху сентыментальна? Магчыма Але — ведаючы ягоны эгацэнтрызм не як норму паводзін а як засяроджанасць творцы і імкненне да абароны таго самага «права быць самім сабой» тым большым духоўным дарункам мелася лічыць ягоны мякка-іранічны клопат А па-чалавечы — разумела што яму лацвей ведаць што яшчэ нехта не гойсае па якіх прывабных і далёкіх мясцінах, а сціпла трымаецца блізкіх ваколіц. Яму і тыя ваколіцы былі краем абетаваным Ці не таму ён так падрабязна ў згаданым ужо пісьме ў Каралішчавічы апісвае маршруты падарожжаў што яму здаюцца такімі зваблівымі і ці не таму сочыць сцежкі па якіх ён нязмушана і звыкла столькі пахадзіў, а цяпер тыя пуцявіны далёкія нібыта якія шляхі на Марсы Ці не таму як цярплівы настаўнік, перапытваў· «Я табе наказваў хадзіць там і там — ці ходзіш?» (Ліст ад 17.VI.82). Я бывала ў тых мясцінах, дарэчы было халаднавата то там амаль нікога не было — любата Пра што і згадвала Міхасю а тымчасам вельмі ж асцерагала ад Масковіі Перш-наперш — не ўяўляла яго сабе там Што яму рабіць у тамтэйшых мясцінах? Беларускаму пісьменніку? Усё ж — свая зямля то яна свая Ці трэба яе самахоць кідаць? Ды і неяк больш сутыкалася ў жыцці з агрэсіўна-актыўнымі сталічнымі дамамі І ўвогуле маёй местачковай схільнай да splended isolation[20] натуры маскоўская мітусня была чужой а комільфо тыя, што неслі на сабе «особый отпечаток» сустракаліся мне толькі зрэдзьчасу Пра тое неяк і распавяла я Міхасю

«Добрай раніцы Міхась!

Не паспявае маё лянотнае і неспрактыкаванае пяро за тваёй імклівай думкай Вось не адказала на адзін ліст — а ты адшкадаваў мне яшчэ аднаго Кручуся ў нейкім непатрэбным чыноўным і хатнім клопаце. Раблю зараз мемуары Паўла Малчанава ў так званай апрацоўцы Галавача Ці звар'яцею, ці скіруюся да ўзроўню «літпраўшчыка» Але хопіць пра гэта Хаця — дзіўлюся, як гэты чалавек, Галавач, гэтулькі год рабіў рэдактарам

Сёння папнуся ў тыя мясціны якія ты старанна раіў Халаднавата мабыць, будзе незавозна Во і добра

Якраз учора пабачыла Рыгора [Барадуліна], і падаспеў твой ліст з яго вершыкам, на жаль пасля сустрэчы То Рыгор даводзіў — з чаго гаворка! Ён! Ды не здасі — каго!—Міхася Стральцова. Пра што гаварыць, людзі добрыя! Аж ты ўсё гэта і сам добра ведаеш.

Мне таксама падабаецца назва «Яшчэ і заўтра» Дарэчы і наконт хутара ў мяне пісалася не дзеля апрашчэнства твайго а дзеля гэтага — яшчэ і заўтра Хто табе будзе там патрэбны — не ведаю Мяркую толькі што некаторыя вароны ў жыцце і трансцэндэнтныя капітулянкі — не той варыянт А да Барадуліна тым рэфлексанткам нават і па дыпламатычнай парафіі далёка. «Маладзік прарэзаўся танклявы быццам малады Міхась Стральцоў» А дарэчы ты памятаеш, як мы з табой сустрэліся ў выдавецтве акадэмічным?»

І я распавяла пра тое, што прамоўлена на пачатку майго допісу У лісце ж далей было

«Мяне, між іншым Вера Сямёнаўна [Палтаран — на тую пару загадчык рэдакцыі крытыкі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура»] распытвала ці ёсць у цябе час. Па яе агентурных звестках, ты працуеш у бібліятэцы Але ж я распарадку твайго дня не ведаю Сам не пішаш, то мне распытваць няёмка. Сказала толькі ёй што вольных хвілін у цябе амаль што няма»

«Дзень добры Ала!

О у мяне не такі ўжо і благі быў дзень! Як бы там не было тое-сёе ўтаргаваў усё ж у цябе. Цяпер хаджу надзімаюся як паўлін, ну а ты — ці адчуваеш сябе павай? Магчыма можа але не з той нагоды як хацелася б мне Бо пакруціў я тваё пісьмо і так і гэтак і бачу што велькі ты дыпламат Абвяла мяне вакол пальца папярэдне не паманіўшы нават! Хітранькая ты! Усе захады мае абышла ды яшчэ мне як Анегін нейкі ў спадніцы марал вунь які за мае прамаскавецк я сімпатыі (быццам бы) прачытала А наастачу яшчэ напалохала тамтэйшым востранькім каблучком, які непазбежна патопчацца па мне Да апрашчэння завеш але не з сабой (sic!), **акулярчыкі** мне спрытненька ўціраеш а сама смяешся Кіпцюркі-шпілечкі маўляў нехта іншы пакажа няхай Не давядзецца мне мусіць, аб яву ў тую рыжскую газету якую ты згадвала неяк, пісаць. А што? Закажы на будучае выразкі ў м нскім бюро даведак — пацеха будзе!

Але чакай Я нейкі іншы ход прыдумаю супроць цябе Мы яшчэ паваюем Напалохалася? Тады будзем пра іншае» (21 VI 82).

«І праўда дачакаешся калі будзеш пісаць мне сіберныя лісты што нападзе на мяне нemaта як тады, мусіць у далёкім тым выпадку пра які згадваеш ты І лістоў ад мяне другіх не будзе — табе вядома усё роўна а мне крыўда душэўнае крушэнне

А што ты пішаш? І нос, маўляў задзіраў і над падлогай ледзь не лунаў ці лётаў, і маланкі як Юп цер, выкрасаў а таго і не ведаеш што кал нешта падобнае і было дык няйначай ад пярэпалаху і перапуду А ты думала, што я S які павінны прымушаць ваша племя трапятаць. Выдумала такое! Я можа, што і другое помню таксама выдавецкае Як пранізала мяне аднойчы ад вашай ягамосці нетутэйшымі флюідамі нейкім дальбог — і было ўжо гэта ў тым блаславёным выдавецтве што ля гасцін цы «Мінск» [нейкі час выдавецтва «Мастацкая літаратура» месцілася каля гасцініцы «М нск»] — на першым паверсе ля касы блізка ці што. дзе S (зноў S !) панаваў над усімі, як Александрыйскі нейкі стоўп А тут і ты мільганулася і мо позірк мой цябе пераняў Далей ужо я табе нічога не скажу хоць і помню

Вось табе адпаведзь за «недаткнёнтасць»

А наогул жа ніякі мой варыянт не прымаеш ты і мне не надта спадзеючыся на паштовую прозу адказваць табе хіба вершыкам і ты ўбачыш тады на якую дарогу ты мяне падбіваеш і якую папірачку мне падаеш Чытай і ад згрызотаў пакутуй А то во яшчэ і вершык вазьму ды і ўсенародна прысвячу табе. І так адпомшчу Напалохаў? (Не без дазволу не буду)

Кіну, рыну — пакіну
Гэты дом на гары
Горкі дым успаміну
Хай развеюць вятры

Хіба гэтак няможна?
Дзе пасцелецца цень
Ад капы прыдарожнай
Там і будзе пасцель.

На Ясельду ці Піну
Ці на Пціч, Вілію,—
Або на лугавіну
Я слязу прал ю,—

Каб зрабіл ся парай
Над ракой, над ракой
Каб здружылася з хмараў
Талакой талакой,—

І каб кані крычалі,
Прадчуваючы гром
Каб на вольным прычале
Здрыгануўся паром

Вось так мы перайшлі і да вершыкаў Не зразумеў толькі я чаму гэта D выкінуў **адзіны** верш (У рыхтаваным зборн ку.) Я выкрасліў давол , найбольш слабое, і ўсё ў п сьме здаецца

да Паўлава, пазначыў па (не **на**) старонках — у дзвюх кніжках. Там, у пісьме, аж дзве шарэнгі старонак. Спытай у Валодзі [Паўлава], хоць ён і **тумарэсік** вялікі (ведаеш такое слова?). [. .]

Барадуліну напісаў, адказу пакуль няма (у адказ на ягоны ліст). Пачакаю Ты хоць пішы А то лянуешся Адсюль цябе пісьмамі цяжка разварушыць (не дзеля справы адной!), а там наогул ад мяне схаваешся. Але, калі вярнуся, шпацырамі рознымі буду табе ўсё ж надакучаць, а то і зважу ў Ракаў да польскіх кабет і бабулек — там трохі яшчэ ёсць. Ты ў карты з імі пагуляеш, а я цябе за жонку буду выдаваць і казаць, што ні ў карты не гуляю, ні гарэлкі не п ю, бо цябе баюся Згода?

Пра жыццё-быццё свае, «дыярыуш», так сказаць свой я табе так ці інакш выкладаю — адно і тое ж, распарадак усяму галава, таму і мне не цікава, і табе зачапіцца не будзе за што. А што Вера Сямёнаўна? Скажы ёй, што тут сумна, як сярод У -скай прозы,— няхай не палічыць гэта замахам на яе зямляцкія пачуцці У мяне вось А. ў земляках ходзіць — і то нічога. Ну і што? Хітрунчыкі М таксама Яшчэ нехта ёсць. А ўсе яны не вартыя аднаго п янтоса Гаўрусёва

На Вялюгіна я прасіў Рыгора навесці Можа, і сам напішу калі адказу ад Рыгора не будзе. Паглядзім [.]

Але ну іх, справы! Нешта сумна і самому стала, і нецікава пісаць.

«Нового мира» я тут не бачу, як і шмат якіх часопісаў Хіба трапляецца «Юность» і «Нёман», з нашых — «Вожык» і «Р.[аботніца] і сял.[янка]» [. .]

У бібліятэцы тое-сёе трапляецца са старога — перачытваю Выпадкам трапіла кніжонка дачкі Л.Андрэева — Веры Андр.[эевай] — «На Черной речке» Пра дзяц.[інства] на фінскай дачы. Цікава наогул Тым больш, што я «Детство» Вадзіма Андр.[эева], сына, некалі чытаў А чытаць, калі праўду казаць, няма калі. Дурная, марная, абразлівая трата часу Хоць я ў гэтым сэнсе і наогул не вялікі ашчаднік (колькі часу таго патраціў), але, як ворагу рэгламентацый, выць, іншым часам, дальбог, хочацца — почему не минула чаша сия? А S.J мне нават, нахабнік, неяк пісаў што цярпець трэба і пра нейкую прану думаць. Адказаў (о, адказаў!) — не адказвае і не адкажа Гумару няма ў некаторых людзей — вось табе і казань уся Прыдуркамі лагернымі прыкідваюцца — мо так лепш?

Але я злавацца пачынаю. А ўсё таму, што пра распарадак В.[ера] Сям.[ёнаўна] папытала Але ж яе памяншальныя суфіксы да любога парадку прыдадуцца — ці не так? Не буду

Давай лепш напішы, што ты бачыла ў маіх (цяпер быццам нашых) мясцінах, калі не жартавала, пішучы як бы пра нейкае «падарожжа» Ці ты на Лысую гару трапіла? Не трэба Мо лепш паедзем у Ракаў

Я ведаю яшчэ адно добрае месца За аэрапортам, пры выездзе са Слуцкай на Брэсцкую шашу і далей па Брэсцкай там гадавальнік вялікі і рэшткі старой садовай планіроўкі і проста лес ёсць, і жывёліны рознай у лесе многа маецца, і не ведаю, яшчэ што але мне там падабалася А ў Курасоўшчыне можна ўкінуцца ў цягнік і ехаць ў Ваўковічы — і там я таксама трохі ведаю, і там таксама ёсць лясніцтва (начаваў там некалі з Карамазавым і гарэлку піў), і матэль, але гэта ўжо зусім не тое, як і піянерскія лагеры якіх там хапае Там хіба восенню добра Гэта я ведаю: я ў тых ваколіцах бульбу некалі студэнтам капаў і як ні дзіўна, адна знаёмая хата дагэтуль засталася (гэта ўжо не ў лясніцтве).

Колькі табе ўсяго нагаварыў — а карысці?

Але нічога!

Вось. ты нешта абяцала мне ну нешта такое **сентыментальнае**. але паводле маёй вымогі? Маўчу

Паспрабуй цяпер не напісаць мне доўгі ліст! А я вазьму во яшчэ і падражнюся con amore[21]

P S Смяешся?

30 VI.82

Міхась».

Нешта сентыментальнае — здымак. Я так і не высылала яго Прысвячэнні? Іх таксама не было. Як ён сам пазначаў «адрасат нават для самога сябе праясняецца апасля» Я прыняла гэта як адзіна магчымы і верагодны варыянт· перавага ўзросту, які галантныя «поляцы» называюць «узростам элеганцкасці» (нам абодвум на тую пару крыху пераскочыла за сорак). Пазней праўда, я не адмовіла сабе ў магчымасці пачаць артыкул «Калі браць пробы на глыбіні .» так «Чалавек напісаў нізку вершаў Жанчыне. Пазней, публікуючы, ён не рабіў прысвячэнняў І як мастак, маў рацыю. Каму б ні прысвячаліся тыя вершы яны сталі фактам мастацкім У нейкай меры адчужаныя нават ад свайго творцы і ад той што была нібыта непасрэднай прычынай напісання вершаў».

Змяніліся абставіны З явіліся рэальныя «пейзанкі» З рэальнымі абрысамі У рэальным атачэнні Жыццё знаходзіла рэальнае рэчышча

Дарэчы, кнігі свае «Мой свеце ясны», куды ўвайшлі вершы з лістоў, і нават «Пячатку майстра», дзе я была рэдактарам, ён мне не падараваў Ажно, калі, прыйшоўшы ў «Нёман», я прэзантавала іншым, але не яму, сваю толькі што надрукаваную кніжку «Слова сапраўднага лад», ён пакрыўдзіўся, прынёс з кнігарні асобнік і прымусіў зрабіць надпіс. А на маё запытанне адказаў: «Што я буду падпісваць? Ты — гэта я» Я ведаю, што так гаварыў сваёй жонцы Ю.Алеша, А.Сахараў — Е.Боннэр, і тут можна было спакусіцца салодкім самападманам. Але — даверлівасць не была маёй дабрачыннасцю. Безумоўна, тут была нейкая іншая прычына. Якая — не ведаю. З даверу я ў яго не выйшла. Ён аддаваў мне некаторыя чарнавікі сваіх прац. прынамсі, верша, прысвечанага Барадуліну («Стаяў і я на гэтай кручы .»), пераклады пушкінскіх вершаў («Элегія»· «Гады былыя шалам весялосці .» —«Безумных лет угасшее веселье .», «Заклён»· «О, калі праўда, што ўначы .» — «Заклинание» «О, если правда, что в ночи. », «Горад пышны, непрыветны .» — «Город пышный, город бедный » і інш). Міхась настойваў, каб я рабіла сцэнарый дакументальнага фільма пра яго, каб удзельнічала 22 красавіка 1987 года ў вечарыне ў яго гонар, каб прыйшла ў апошні дзень перад аперацыяй

Загадка «назскіх натур»

І ўсё гэта было пазней. А пакуль было ліставанне.

«Дзень добры, Ала!

Нічога, нічога, пакуль прабачаю, а там паглядзім [Зноў за хатнімі і службовымі мітрэнгамі я спазнілася пісаць ліст]. А папраўдзе, дык можа і раўную трохі цябе да нейчых чужых (для мяне, вядома) бядотаў і турботаў, не адчуваючы пры гэтым ні пакаяннасці ці хоць збольшага сораму Чалавек, такім чынам, эгаіст, і я ў тым ліку Эгаіст — гэта б яшчэ нішто, а то і зайздроснік, і ўласнік. Ён нават і нечай увагай да нечага болю распараджацца хоча, а не выйдзе — і таму, чужому болю, зайздросціць будзе Некаму ўвага, а чаму не мне? Пра сябе ён успомніць, абавязкова ўспомніць! І паралелі, і вышукі адпаведныя знойдуцца і вось пачне ён думаць неяк так. Маўляў, некалі на перакладных, у паштовых карэтах, у рыдванах розных падарожнічалі — і не толькі дзеля ўласнай ахвоты — не! Сон марнавалі, вантробы растрасалі ці шлункі, салдафонаў розных дарожную ўладу цярпелі А тут самалёты паязды, шасейкі, гладкія, як велікоднае яйка, скрозь паслужлівыя заляцаншчыкі на ўласным транспарце (толькі міргні!) — нічога! Ніхто ні да каго не спяшаецца, ніхто нікога адведаць не хоча. І на чорта тады той тэхнічны прагрэс? А камандзіроўкі і камандзіровачныя тады, урэшце, навошта? Падумай і скажы

А тут яшчэ Дэрптам нейкім душу мне скаламуціла, бо як прачытаў я, што ты недзе там з «гетынгенам» нейкім стаяла блізка свяшчэнных камянёў нейкіх, аж пацямнела мне ўваччу дальбог — думаю, скуль там побач увішны студэнт з ФРГ з'явіўся? Даражэнькая, пардон, растлумач! А можа, гэта эстонцы імёны нейкія несусветныя пабралі? Зноў жа — стаяць ты побач стой, а ў сённяшнія рэляцыі вунь праз якую даўніну не трапляй Богам кажу, раўнаваць стану І дойдзе да таго, што розных там пеўнікаў на вежах талінскіх і рыжскіх да бліскавак у вачах неўзлюблю, нават верш Забалоцкага, дзе пра пеўнікаў сказана, што «таинственный разум созвездий непременно присутствует в них» з памяці сатру — цяпер ты разумееш, якая страшэнная штука рэўнасць?

А падарожнічаць, вядома, будзеш толькі са мной, **а эти всякие разные самостоятельные мысли вы при себе оставьте, потому что мы очинно даже это не уважаем, это все экивоки и вертижи**. Потому что мы сами деликатесы культурные знаем и даже знаем иностранный стишок.

Вчера цібе чакала,
Варум ты не пришов?
Я не такая фрава,
Каб ждаць па семь часов

А ежели вы интересантов каких насупротив нам имеете и делаете им приятный монплезир, так мы и тем недовольны и ревуар вам тоже сделать умеем. Потому что то. как вы нас обманывали орёр, орёр, орёр[22]!

Каково я тебе мораль прочитал?

Будзеш ведаць, з кім справу маеш

Але нічога мы з табой Лешчанку [маецца на ўвазе спявак Леў Лешчанка] не любім абое, можа, на гэтай аснове паразумеемся не станем у нашым падарожжы адно аднаму патлы выдзіраць Як ты думаеш?

Падарожнічаць будзем, я рашыў ужо, у Піцер: там хоць немцы і англічане абруселыя і многа рознай «мари, чуди и чухны», і фін дзікі напіваецца ля помніка Пятру Вялікаму — а славянскаму сэрцу гэта прыемна Ты ўсё гэта абдумай.

А пакуль табе вершык.

Как фармазона,
Без лишних слов,
Втолкнули в зону—
И будь здоров!

Изведав палку
И поводок,
Я хавал пайку
И срок волок.

Теперь смекай-ка
Я стал здоров
И славлю пайку
И прапоро́в!

Пішы асабліва не лянуйся
Міхась.
15 07.82»

Ліст — што практыкаванн ў розных жанрах. Аналітычныя саманазіранні — нібыта і не самога аўтара, а таго самага «лірычнага героя» «Чалавек, такім чынам эгаіст, і я ў тым л ку Эгаіст — гэта б яшчэ нішто а то і зайздроснік, і ўласнік. Ён нават і нечай увагай да нечага болю распараджацца хоча, а не выйдзе — і таму чужому болю зайздросціць будзе» Тут і нешта, не падобнае на звычнага Стральцова версіі стылю, мазаічны дывертысмент знакі адносін, якія ён пазначае, сведама бярэ з ірэальнай рэальнасці і рэальнай ірэальнасці Логіка «фравы» і «логіка» зоны — вось табе. Каб верыла ягоным разважанням не давала веры Тут я адчуваю, што калі знойдзецца выдавец і — раптам!— знойдзецца чытач, дык вось тут чытач абурана адсуне тое чытво — гэтай нахабніцы пісалі шчырыя лісты, а яна мала што друкуе, дык яшчэ і пхнецца аналізаваць. Гвалт! Расслойванне інтэлектуальнай аўры Але — мушу думаць, што і сам Стральцоў, не задумваючыся, падсвядома ўсё ж адчуваў літаратурны кштал нашага ліставання

Ну, а вандроўка ў Мазыр была адкладзена да грэцкіх календ. І ў «Піцербурх» мы таксама не трапілі, і па Ракаўскай шашы да польскіх бабулек не завіталі Разумеў прывіднасць вандровак больш як хто сам Стральцоў — «бо разнасцежана акно: табе адно, а мне другое»

Сябры Стральцова рабілі ўсё, каб ён мог вярнуцца ў Мінск.

Заканчвалася рэальна-прывіднае эпісталярнае суіснаванне. Як згадваў Стральцоў, «так хочацца пабачыць цябе — і схавацца куды-небудзь Не здзіўляйся З радасці («той грустной радости») ці смутку што ты так нядаўна належала мне па праву «затворничества» хіба і што вось надышоў час развітацца з пэўнымі прывілеямі — з прывіднымі прывілеямі на жаль. Што ты на гэта скажаш? Ах, Піцербурх! Няўжоаднаму падавацца на вуліцу Бродскага і ў Рускі музей?»

«Прывілеі» нашы і сапраўды касаваліся Але з нашым бюракратычным ладам Міхась Стральцоў затрымаўся ў Мазыры ажно да зімы — апошні яго ліст пазначаны 2.XII 82 г А пакуль быў яшчэ ліпень. І 1982-гі год лічыў месяцы па грэгарыянскім календары І я атрымлівала лісты

«Дзень добры Ала!

Итак, свершилось, матушка!— атрымаў, нарэшце, ад цябе пісьмо Пачаў чытаць а там недаўменне, чаму не пішу І тут я пачухаў патыліцу Бо пішу і адказваю — у той жа дзень, як атрымліваю пісьмо,— і не таму, што я такі акуратненькі-дакладненьк а таму што не церпіцца з табой хоць так, ліставейна паразмаўляць, выклікаць цябе на ўласныя вочы і як бы адчуць тваю прысутнасць ледзь не дых у дых. Во як — не смейся! [. .]

Як бы там ні было, я ўзрадаваўся твайму пісьму бо пачаў думаць ужо немаведама што А цяпер вось шкадую, што не чытаў «бергманска-антаніёніеўскае блюзнерства» і не ўведаю, што гэта такое Я калі не памыляюся, пісаў табе пра «Піцербурх», што наконт гэтага думаеш не вем Хоць, кажу наперад, «сунічных палян» там няма [маецца на ўвазе фільм І Бергмана], ёсць марошка,— ці не яе прасіў паміраючы Пушкін?

Добрая душа ты спяшаешся прарочыць мне блізкую дарогу У лепшым выпадку гэта будзе — цьфу, цьфу, цьфу!— у верасн І то — каб жа! [ ]

Пісаць я нічога не пішу — з каранцінам скончылася мая пісаніна як ты ведаеш хаця б па вершыках, даўно Няма часу Думаць няма калі Рэцэнзі на мне вісяць — яшчэ не зрабіў Паспрабую мо хіба для «ЛіМа» А мо ўсяму віною К.— адвярнуў ён мяне ад «творчасці» дальбог Бо мусіў яго збольшага, праз сілу прачытаць Такім дурным неістотным паказалася ўсё гэта — наша пісаніна наогул

Але вось ляжыць тут у мяне томік лермантаўскага «Героя .»— даўно ўжо не перачытваў яго — гады чатыры ці пяць Баюся Можа, тады перачытаю, калі сам што-небудзь пачну ў прозе рабіць. Цуд канструкцыі і жывапісных проста-такі «ракурсаў» і «рэфлексаў» пры стварэнні перспектывы, аб'ёмаў планаў І так лёгка самому Талстому руку падаў Нехта там вывodзіў некага з гогалеўскага «Шыняля» а Талстой дык дальбог з лермантаўскага «Валерыка» скокнуў Маштаб Памятаеш ягоную «Спрэчку»? У Казбека с Шат-горою был великий спор» Проста-такі панарама з касмічнага карабля! І тут жа якая-небудзь «Молитва» (іх, здаецца, дзве), тая, дзе «с души, как бремя скатится сомненье далеко и верится, и плачется и так легко легко» У гэтым жа радзе: «Ночевала тучка золотая. .», «Горные вершины. .» —

якое ўменне адрынуць ад бур і скрух душэўных, па-дзіцячы бязгрэшна паплакаць перад прыгажосцю боскай і зямной. Вялікія «перапады» амплітуды рухаў душэўных — ці не гэта адно выдае імгненную гатоўнасць душ «к соображению понятий» душэўную рэактыўнасць, назаві гэта вышэйшай ступенню таленту, моцартыянствам, ці як?— усё роўна.

Што табе сказаць яшчэ, чаго не пішуць нашы лянотныя літаратуразнаўцы? Прачытай у Лерм.[антава] «Штосс» — пачатак нечага, рамана, можа Мне заўсёды здаецца што так пачаць мог бы Дастаеўскі Няхай ранні часоў «Хозяйки», «Галядкина» и т п

Не ведаю навошта гэта пішу Паводле выпадковых асацыяцый? Але ц выпадковыя яны — не асацыяцыі (нашы), а факты што за імі? «Нет на земле ничтожного мгновенья» — у панараме духоўнага развіцця (і літаратурнага) заканамернасцей, безумоўна, шмат — і тут не трэба быць Сашам Яскевічам каб зразумець гэта (ці можа убачыць) Гэтак жа я напрыклад, бяруся даказаць, што такі «эпік», як напр.[аклад] У належыць да дрэнна зразумелай коласаўскай трад[ыцыі], хоць сам ён чамусьці думае што выйшаў з Чорнага пераплюнаў Мележа, які таксама, дарэчы, памыляўся ведучы сваю «радасл.[оўную] ад Чорнага (хочучы так — суб ектыўна бо Чорны некалі яго падтрымаў). Чорнаўскай трад.[ыцыі] ў нас, на жаль, не пашанцавала як і купалаўскай калі разумець традыцы не ў ларчанка-навуменкаўскім сэнсе У нас можа калі і быў хто дык Купала і Чорны, Багдановіч і Гарэцкі На жаль, не так і многа

Пра сённяшніх не будзем казаць — рана Але я думаю што мы не дажывем да такой ганьбы, каб прызнаць у бліжэйшы час «класічнымі» зубрамі (?) з аднаго боку У а з другога — Z. А мо да гэтага дойдзе? Не трэба каб нехта новы прыйшоў у літаратуру· каб яго блізкім прыходам пачало ўжо дыхаць наваколле — ці чуваць там нейкае «смущение» і «возмущение» ў прыродзе? Хоць ты паслінь палец вазьмі ды і вытні на вецер

Канчаю, даражэнькая! Бо, можа кажу не тое бо можа вяла і нецікава думаецца Ды яно і праўда — добра прарочыць і бубніць збоку Лепш можа справай нейкай канкрэтнай займацца, хаця Вунь D корпаецца ў нейкім пазаддзі і думае што яму помнік за гэта паставіць калі не на Паркавай, дык у N павінны Прыйдзе час, помнік ставіць не збяруцца — пачне крычаць, што ягоны талент вялікі выдавецкія мітрэнгі згубілі што аўтары зеллем знарок малайца спаілі, што асабістых крытыкаў праз пасаду не займеў а тое ў галаву не прыйдзе, што найперш трэба навучыцца хаця б пісьменна адчуваць і думаць не кажучы ўжо аб тым каб граматна пісаць,— бо і гэта не зашкодзіла б. А паказваць сябе мэтрам і вялікім дзеячам перад E ці Nt. з якімі гарэлку п'еш, па-мойму несур ёзна ці сядз , ці дамоў ідзі

Во ўспомніў, загаварыўшы пра выдавецтва што там Івашчанка? Мне нешта перастаў пісаць. Ці здаў ён рукапіс? Прабач Скажаш усе лаюць выдаўцоў і ўсе ад іх нечага хочуць Але ж я без прэтэнзій па-хатняму так сказаць. [.]

Во яшчэ ўспомніў Я прасіў цябе ў нейкім лісце, мусіць у тым які не атрымала, дазнацца што гэта за пастаноўка «Наш Куп.[ала]» ў купалаўцаў Я падумаў быў, што можа Раеўскі адрадзіў нашу даўнюю задуму (напісаную) пра Купалу тое што часткова прайшло некалі на тэлебачанні як фільм Цяпер, прагледзеўшы недзе ў газеце бачу што не тое Гэта мантаж з купалаўскіх спектакляў, перасыпаны «говорениями» ад сябе (і пра сябе) акцёраў пад выглядам як гэта заўсёды бывае, што пра некага іншага Няхай

І гэта я так закругляюся! Прабач, што напэцкаў, пісаў апошнія старонкі на рабоце выдаючы кнігі, лаючыся з-за газет —хочацца каб пісьмо пайшло заўтра ж. Напішы, ці скора дойдзе, наогул Нешта дзіўнае выйшла з нашай перапіскай

Бывай Да лепшых часоў
28.07.82
Міхась»

«Дзень добры, Ала!

А папраўдзе добры вечар! Не бяруся сказаць, што робіш ты ў гэты час, хоць і спрабую ўявіць цябе па-хатняму, «у халаце і пантофлях», і за кухоннымі турботамі нават,— дальбог, не ўдаецца мне гэта! Мо чытаеш седзячы як школьніца за сталом (не возлежишь на канапе?), мо гаворыш з кім па тэлефоне мо палiваеш на балконе кветкі мо пазычаеш суседцы тэлепраграму робячы гэта тым больш ахвотна што сама можа як і я той тэлевізар не глядзіш мо вырашаеш што лепей вып ць нанач — каву гарбату ці люмінал?— а мо абмежавацца паводле ёгаўскай рэкамендацыі шклянкай халоднай вады? Думаеш так і раптам спахопліваешся што ўсё гэта лухта ў параўнанні з пакутамі W ад ягоных «удоў» як называе т—х пасій St. —скажы які занятак прыдумаць яшчэ табе?

Я дык вось пішу і думаю, што перапіска наша збілася з пісьменнага (граматнага) рытма і пачала нагадваць тутэйшую радыёфікацыю Вось, напрыклад, аб'яўляюць вячэрнюю паверку, і я на сваім бібліятэчным дынаміку чую гэта як рэха тое ж самае з рэпрадуктара што ля сталовай,— але я натуральна веру таму, што бліжэй дынаміку над сваім вухам Гэтак жа і

цяперашняе тваё пісьмо, яго рэальнасць, а твой адказ на яшчэ адзін мой ліст шкуматае ветрам недзе ля «сталовай» — дзе твой адказ? «Адрэдагуй» ты неяк гэтую «тэхніку»!

Я табе ўсё расхвальваю St.— Pg [Sankt-Pitersburg], а ты маўчыш! Дачакаешся восені ці зімы, а які Пецярбург зімой? Яго зімнім нават ніхто з літаратараў-пецярбуржцаў не пісаў калі не лічыць някрасаўскае «Пра надвор е» Як гэта? «Государь мой, куда вы бежите?— В канцелярию, что за вопрос? Я не знаю вас.— Трите же, трите поскорей бога ради, ваш нос! Побелел!— Ну а мой? Лучезарен — То-то принял я меры!— Чего-с?— Пейте водку в мороз. Сбережете свой нос на щеках же появятся розы!» Не яшчэ ёсць як н дз ўна у Дастаеўскага — дзе дакладна не памятаю але памятаю, што там зімовае неба над горадам перапаласаванае марозным дымам ад кам ноў здаецца настолькі фантастычным што прыходзіць думка што і сам горад уздымецца з гэтымі дымамі і сплыве куды-небудзь

Не, ну яго, зімовы той Пецярбург! Даражэнькая ну іх, Эрмітажы Пецяргофы — мы ў Царскае Сяло паехалі б! І кожны дзень ездзілі б ці нават сталі б пастоем у якой мясцовай чухонкі калі яны яшчэ не перавяліся там,— падумай даражэнькая! І юны **нкшП** то гарачлівы то нечакана маўклівы, з вечна абгрызанымі пазногцямі нячысты ў начных сваіх помыслах, пра што не пасаромеўся сказаць пятнаццацігадовым у сваім «Пробуждении» — пачаў бы **занимать наше воображение**. Калі ты любіш рамантычныя пачуцці дык стала б мне расказваць пра патаемную любоў **сего вьюноша** да жонкі Карамзіна які жыў летам тут у студэнцкія пушк.[інскія] гады, а я як цынік, нагадаў бы табе як Наталля Мікалаеўна бегала адсюль у казармы да Дантэса, полк яго стаяў непадалёк. Цікава га? Праўда было гэта ўжо не ў ліцэйскія гады вядома а калі шаноўны А С ці то дзівячыся ці то жахаючыся усё больш пачаў адчуваць сябе ў эфіопскай скуры прадзеда Абрама Пятр.[овіча], калі пачаў пераконваць сябе што маўр Атэла «не ревнив» і г.д.

Не ведаю, як яшчэ пераконваць цябе і як адбіць у цябе ахвоту да розных Курляндый і Эстляндый

Нейкія даручэнні круціліся ў мяне ў галаве, але вось разгаварыўшыся забыў Вось. У Макарэвіча на радыё мае вершы — што ён думае з імі рабіць? Чамусьці не адказвае мне. А вершы ідуць, здаецца, у «Полымі» — нехта чуў абвестку па радыё (у жніўні?). Радыё запозніцца — і тады ўсё ў кош Пазвані Макарэвічу Ой даражэнькая не! прабач Усё пераблытаў Цяпер скажы што я заклапочаны сваімі літарат.[урнымі] справамі?! Усё наадварот Макарэвічу трэба званіць не наконт «Полымя» а наконт «ЛіМа» Там жа **новыя вершы**. З «ЛіМам» трэба ўзгадняць, бо «ЛіМ» гэны маўчыць. Калі паспееш зрабіць зрабі А можа ужо тымчасам і «ЛіМ» выйшаў Наогул жа пра гэта ўсё адпішы

[. .]»

Датаваны ліст 8.08.82 года

«УЖО ДАСПЕЎ ТВОЙ ЛІСТАПАД...»

Да Эстляндый, Курляндый і Дэрптаў ахвоты ў мяне нават Міхась Стральцоў не адбіў Да гэтай пары Балтыя мне — вялікая прынада Сама па сабе. Ніякіх прыемных асабістых падзей там не здаралася Годны, «вселенский» спакой восеньскай Юрмалы А «Санкт-Піцербурх»

И страны по которым нам
Хотелось бы пройти
Исчезли — их теперь уже
На карте не найти
А ці трэба шукаць?

Што ж мяне здзівіла — чаму Міхась не згадаў Блокава. «Она пришла с мороза раскрасневшаяся .» Праўда ён не любіў хрэстаматыйна блізкіх узораў Тонка разумеў умоўнасць і «літаратурнасць» нашага ліставання

«Слухай калі вярнуся ці змагу я прэтэндаваць на колькі твайго часу і ўвагі тваёй? Я разумею што табе цяпер не да мяне, але я і зразумляю нават малую ўвагу адпаведна, надаўшы ёй цаны Я не такі ўжо капрызлівы і не такі эгаіст Толькі мне цяпер так хочацца каб нехта, як малога, пагладзіў па галоўцы каб першай парой я не баяўся за той ці іншы душэўны рух, каб адвучыўся трохі ад душэўнай зацятасці якая на жаль, бывае непазбежнай у пэўных абставінах і ўмовах. Адным словам калі многа нельга, чалавек, хоць і нехаця задавальняецца і роллю спажыўца нейчай «філантропіі», а хіба я выключэнне? Проста мне не шанцуе так, як і іншым а ім «несть числа» ўсюды і заўсёды Такая апартуністычная ці плюралістычная «філасофія»

Івашчанку не толькі паўшчувай пры выпадку за мяне але «и власть употреби»— хіба так

можна не адказваць на пісьмы, схавацца сярод хахлоў і тым цешыць сваю «лукаво-сентиментальную» душу? А сапраўды цікава гэта атрымліваецца [нечытэльна] у хахлоў: сантыменты і рознае іншае несентыментальнае. Ты не заўважала? Панаглядай

Як мы сустрэнемся? Не буду загадваць, бо сурочыць баюся Тэлефоны ўсё ж прышлі

Барадул.[іну] прывітанне перадай — хай бы напісаў мне што духаўздымнае, лайдак! У зняволенні добра было сядзець хіба якому Беранжэ віно, дамы, візіты, Жюдит (?), агнём наэлектрызаваная грамадская думка, а што казаць нам, грэшным, калі нават да Ал.[яксандра] Сярг.[еевіча] не на край свету а на Пскоўшчыну завіталі хіба два чалавекі, якімі ён душэўна даражыў — Пушчын да «п'яніца» і «рохля» Дэльвіг А «лукавый» зноў лукавый, царадворца Жукоўскі адпісваўся пахваламі «Борись, силач! .» і г.д. Дык той жа ўжо на той час новым Дзяржавіным мог сябе адчуваць, а тут .»

Безумоўна то быў папрок. Мне, Барадуліну, іншым Наконт ншых — не буду меркаваць. Сама я і сёння ўпэўнена што пацвельванні наконт майго прыезду былі таксама больш умоўнымі — «літаратурным» ходам Не ведаю, ці было б лепш, каб я раптам рушыла ў той Мазыр. Пад які настрой Стральцова трапіла б.

Ці не была б тая сустрэча чарговай «невстречей» Вобраз — ён вышэйшы за чалавека..

Тымчасам я «пребывала» ў Каралішчавічах.

І атрымала ад Міхася вось гэты ліст «Пошты ўчора, як заўсёды ў суботу, не было, а сёння прыйшло ад цябе аж два пісьмы. Чытаю і перачытваю іх у бібліятэцы — пад нуднае чваканне і пялёхканне дажджу за акном а перад вачмі — твае Каралішчавічы на якія міжволі пераношу і тутэйшую непагадзь: не вельмі ўтульна, мабыць, там і табе.

Уяўляю «нубійскую конніцу», якую дождж загнаў пад дах, да тэлевізара і транзістараў — во дзе калоцяцца сцены! Памятаю гэта па тых жа Каралішчавічах у канікулярны час, калі мае ўласныя дзеткі, увогуле слухмяныя, ..ыраблялі там бог ведае што, каб не адстаць, вядома, ад іншых. Цяпер у тых дзетак свае дзеткі, а бацька адлучаны ад бацькоўскіх ды дзедаўскіх клопатаў І, сучасны чалавек, можа, і не надта перажывае з-за гэтага. Пазбавілі нейкай там выхаваўчай ролі? Дык выхавацеляў у нас і так даволі. Куды ні кінь вокам, усюды Песталоцы то з пернікам, то з дубінай і, дальбог чалавеку сама пара хавацца ад іх, што ён і робіць, пачынаючы са школы — спачатку ў славутай «падваротні», а, пасталеўшы і за тымі варотамі, што надзейна акантаваны казённым арнаментам. І там ужо яго справа думаць ці не думаць пра добрыя намеры выхавацаў і пра тое, «что под жизнью беспутной и путной разумели людские умы»

Даражэнькая, нешта робіцца з «ячэйкамі» нашымі У дзяцей няма бацькоў бацькі ходзяць нейкімі навейшымі караламі Лірамі І выходзіць, што сапраўды ворагі чалавеку «сямейнікі» ягоныя што наогул жыве ён не ў сям'і дзе ў падпечку дома тоіцца старэнькі, трапятлівы, з дзіцячым мудрым сэрцам дамавік і кватаруе на «съезжей»— з клапамі, з «околоточным», з прыбіральшчыцай Дунькай, якая зранку крычыць не дакрычыцца, каб пусцілі яе ў нейкую Еўропу — ці не затым, каб адукаваць тамтэйшых наконт нейкага раўнапраўя? Бо розныя Аўроры Дзюдэван даволі слаба дзейнічалі па гэтай частцы і сказаць ім дзякуй можна хіба за моду на мужчынскія штаны — гэтую ваяўнічую мімікрыю чаму не ацаніць? Даражэнькая, даруй, не фемінафобства гэта, а проста нешта накшталт раздражнення з выпадку таго, якія часам пачварныя формы набывае «жаночае пытанне» узведзенае неразумнымі людзьмі ў неразумны ранг — так, што, урэшце, найбольш церпіць ад гэтага і сама жанчына, і «ячэйка» нейкая і псіхалагічны тонус грамадства.

Кажу гэта не як «пацярпеўшы» проста такі-сякі ўласны вопыт прымусіў паглядзець на каторыя праблемы, як ні дзіўна, не па-суб'ектывісцку суб'ектыўная (псіхалогія) мне ўсё ж павінна быць бліжэй, паводле майго занятку Памятаеш у «Фаусце»? «Мне нечего сказать о солнце и звездах — я вижу на земле страданье человека»? Я пісаў табе, здаецца, ужо неяк пра гэта.

У мяне тут было не тое каб даволі часу (яго забіраў распарадак і розная звязаная з ім нікчэмнасць і лухта), даволі ўсё ж, каб паразважаць над тым над гэтым Той час што фільтраваўся з гэтай нікчэмнасці і лухты проста шкада было аддаваць дробязям свайго «я» тут можа было і падсвядомае жаданне нейкай кампенсацыі вымушанага марнатраўства — падсвядомы разлік.

Ведаеш я зразумеў што адзінота не так і згубная ў маім узросце. Цяпер я ведаю гэта тым больш, што яна звыклай была для мяне і раней бо твой пакорлівы слуга пазбаўлены так званых талентаў «общительности» і трошкі «загартаваны» ў гэтым сэнсе Мой «экзістэнцыялізм» памагаў мне.

Нешта загаварыўся я і «воспарил» Не буду

Давай пра што іншае.

У Пальміры розныя я без цябе не паеду Вось што мушу табе сказаць. Сёлета ўсё роўна позна Гэта вучыцца толькі ніколі не позна, як, дарэчы мондра разважалі тыя «соревнователи просвещения» якія дбаюць пра твой надзённы і духоўны правіянт Вучыся і адпавядай

пасадзе. Хлеб апраўдваць трэба і вялікім пачынаннем спрыяць трэба таксама

Пра Скрыгана скажу, што гэта ў яго «пункцік» — з імёнамі мудраваць. Сам ён то Янка то Ян (а жонка, здаецца, заве Янчыкам), то ён Ів.[ана] Сіпак.[ова] падаб'е Янкам звацца то Цвірку закапыліць нос на манер Гадзіцкага нейкага то мяне Міхалем хрысціў а на благі выпадак — Міхалам — слухай толькі яго! А ты завіся ўжо лепей Алінай калі хочаш а я табе нагадаю пушкінскі вершык.

Алина, сжальтесь надо мною!
Не смею требовать любви.
Быть может, за грехи мои,
Мой ангел, я любви не стою,
Но і т.д.

Макарэвічу не звані Навошта яму вершы друкаваныя? Я пасылаў яму «лімаўскія» думаючы што паспее да публікацыі пракруціць, дадаўшы, можа, што з таго што замарнавалі мінулы раз (З «палымянскіх» — памятаеш?) Ён змоўчаў З гэтым народам ні ў лазні парыцца ні ў мінскім метро (дарэчы, што яно?) на «чарнілы» прасіць. Цьфу!— прабач!

Бывай. Пішы хутчэй А часу — часу яшчэ хапае. Я ў верасні яшчэ буду тут мусіць, сядзець
Міхась.
22 08.82»

Наконт Скрыгана — гэта я распавяла Міхасю Стральцову, што раіў Ян Аляксеевіч мне вярнуцца да свайго нармальнага, дадзенага бацькамі імя — Альбіна І нядрэнна было б матчына ці бабчына прозвішча згадаць. Чапкоўская ці Зорыч.

.А давялося марнавацца Міхасю Лявонцьевічу там яшчэ ажно да снежня І быў яшчэ час падумаць і пра марнасць нашых высілкаў грамадскіх наконт розных там «эмансіпэ» Намёк тут быў таксама Пісаў ён адной з самых цяжкіх ахвяр таго раўнапраўя Маю на ўвазе звіх псіхалагічны. Паталагічны Хранічны

Экзістэнцыялізм — ён быў філасофіяй нашага пакалення Пра тое ўжо згадвалася Тут дарэчы, і тлумачэнне шматлікіх драм нашых аднагодкаў Драм відавочных і драм што не відаць староннiму погляду Выявіць сябе ў нейкім сацыяльным, грамадзянскім сэнсе не ўваходзячы ў канфлікт з уласнымі прынцыпамі, з уласным сумленнем і — галоўнае!— уласнымі схільнасцямі, было немагчыма Дарэчы, маю вялікае сумніва — ці магчыма гэта ўвогуле калі-небудзь. І ў тым самым быцці —для сябе, што ствараецца з быцця-ў-сабе у тым свеце феноменаў, што быў адзіна рэальным для нас, у свеце рэчаў і падзей — тая «ячэйка» пра якую вядзе гаворку Міхась Стральцоў, была зусім немалаважнай. Была яна, хаця і хісткім не апірышчам, вядома, але прыстанкам для душы І мала каму па-сапраўднаму шчасціць на тую «ячэйку», нават калі перайначваюць мяняюць, спрабуюць варыянты Ці трымаюць яе як «дот», «дзот», бомбасховішча, выскокваючы на «разведку боем» ці дзеля рызыкі «пайграць з агнём»

Надзея ўскладвалася на самадастатковасць душы На роднасць душ На шчаслівы выпадак. А на таго «старэнькага, трапятлівага, з дзіцячым мудрым сэрцам дамавіка» мала каму шанцавала. Не шанцавала здаецца і Міхасю Стральцову Ці сам ён быў у тым вінаваты? Ці хто іншы? Не ведаю Але нездарма ён так пакутліва і многа думаў пра тое. Ці мел той вялікі талент жанчыны, што былі побач з ім згадаю яшчэ раз? Быць жонкай каханкай таленту ахоўніцай хатняга вогніска.. Не проста гаспадыняй што ўмее смажыць, варыць прыбіраць, даглядаць дзяцей, а — ахоўніцай дому і берагіней таленту? Ці мелі яны талент разумення самаахвяравання, такту? Нездарма, мабыць, адзін талент толькі зрэдзьчасу сыходзіцца з другім талентам Хто ж не ведае гісторыю адносін Аўроры Дзюдэван і вялікага музыкі з Жалязовай Волі, Барыса Пастарнака і яго першай жонкі мастачкі Яўгеніі Лур е-Пастарнак... І.. І Хіба што Луі Арагон і Эльза Трыале?

А асабісты лёс Максіма Багдановіча?

Сам Стральцоў у «Загадцы Багдановіча» ў раздзеле «Мадонны» так вядзе думку пра згрызоты душы Максімавай. «Багдановічу не асабліва шанцавала ў каханні Сказаўшы так мы маем права задумацца — чаму? Тое, што Багдановіч быў варты кахання і сам быў несумненна здольны на моцнае пачуццё — даказваць гэта сёння не трэба і колькі палкіх сённяшніх паклонніц ягонага таленту з радасцю захацелі б узнагародзіць яго за колішнюю несправядлівасць лёсу? Толькі Багдановічу сёння гэта не трэба, ды і не ўпэўнены мы што, каб з явіўся Багдановіч сёння, усё не паўтарылася б спачатку»

Міхась Стральцоў не быў абыдзены ўвагай жанчын І апошнія гады, пасля звароту з Мазыра на свой літаратурны круг, ён зазнаў вялікі жаночы інтарэс да сваёй асобы Бескарыслівай, карыслівай імгненнай сталай Капланкі кахання закаханыя толькі ў яго Стральцова вечныя курсісткі якія павінны былі мець абавязкова суб ект захаплення — актора паэта, скептычнага мысленніка Рыбы-лоцманы якіх вабіла слава М хася Стральцова хай

не вельмі гучная, прымглёная але бясспрэчная надзейна «забяспечаная» ў часе. Жанчыны для якіх каханне магло быць сэнсам жыцця урэшце — кабеты якіх зваблівала і яго сапраўднае літаратурнае «я» і няпэўнасць сямейнага статусу· ён не ўзнаўляў афіцыйна шлюб з Аленай Дзмітраўнай і не рабіў з гэтага таямніцы А ён меў прагу Вялікага Кахання Было і тое, пра што яго вялікі і любімы ім папярэднік пісаў· «Быть может, и на мой закат печальный блеснет любовь улыбкою прощальной?» (Нездарма мабыць, перакладаў «Элегію»). Дык была і гэтая, развітальная, усцешная «улыбка» Але ці была тая адзіная? І ці ўвогуле, згадаю зноў і зноў ці можа яна быць — адпаведная суцэльна вобразу, мары? І хіба кожны з нас меўшы нейкі жыццёвы і начытаны вопыт, не пацвердзіць гэта? І — хто ведае ці можа — паэт!— быць аднаечы і назаўсёды закаханы Ці мелі б мы лірыку Аляксандра Сяргеевіча калі б ён сустрэў сваю Ганчарову гадоў у -наццаць, ажаніўся, і былі б яны верныя адно аднаму дзень пры дні? Не ведаю Або калі б наш Багдановіч не меў пакут сэрца ці прачыталі б мы

О, як прыгожы-дзіўны ты!
Двайной красы аблік ядыны!
Ажыў у ім твой вечны цэль,
Мадонн тварыцель, Рафаэль!

Меў рацыю Пастарнак. «Вобраз. чалавека.. большы за чалавека» Хаця «прататып» пачуцця, мары — ён існуе, у часе і прасторы і мае больш ці менш дасканалы і адухоўлены выгляд. Але — ці ў падзейнай рэчаіснасці рэальная Любоў Мендзялеева была тоесная Чароўнай Даме, якую ведае свет? «Величавая Вечная Жена» — яна таксама была ўвасабленнем платонаўскіх і піфагарэйскіх міфаў Эзатэрычная зададзенасць цыкла вершаў пра Чароўную Даму, уяўленне пра «Уладарніцу Сусвету» як ахоўніцу таямніц быцця і трагедыя рэальных узаемаадносін — Блока і Мендзялеевай — ці не яскравы ўзор таму? Блок і Багдановіч — блізкія Міхасю Стральцову паэты І мара пра Жанчыну Жыцця як і ў іх, заўсёды была з ім Менавіта — так. Мара пра Чароўную Даму Ці быў нехта, хто рэальна адпавядаў гэтаму вобразу ці мог бы адпавядаць — не ведаю Тэарэтычна здаецца — наўрад. Ці бывае эквівалент мары? Хто адпавядае кожнай рысачкай — яму, Вобразу? Тут трагедыя паэтаў і тым шчаслівы іх лёс, што Мара выяўляецца ў Вобразе Вобразе, што з'явіўся дзякуючы нейкай рэальнай жанчыне, пэўнага росту пэўных параметраў, з рэальным колерам вачэй, у канкрэтных строях. Жанчыне, вабліва далёкай ці спакусліва блізкай

Адсюль — і Дон-Жуаны ўсіх часоў Тут і Блокава, жорсткае: «Да есть печальная услада В том, что любовь пройдет, как снег», «Нет, с постоянством геометра Я числю каждый раз без слов Мосты часовню резкость ветра, Безлюдность низких островов» І гэтыя іранічныя радкі М Кузьміна (таго самага акмеіста і кларыста): «И снова я влюблен впервые, Навеки снова я влюблен» — ці няма тут нейкай усмешлівай ісціны? Адсюль — вершы музыка, танец, адсюль — той стан і настрой, што ўзвышаюць над будзённым днём над звычаёвасцю.

Настрой гэты быў добра вядомы Міхасю Стральцову

Я не памятаю, што я пісала ў сваім лісце (чарнавіка не было), але атрымала з Мазыра ліст у якім, па сваёй звычцы, Міхась Стральцоў зноў шчыра падманваў сябе Зноў — песціў сваю Мару Ствараў вобраз Яе. Так склаліся абставіны што зноў мела да таго дачыненне я І — талент ягоны У які ён верыў і не верыў І — творчасць. Пра якую ён згадваў, думаў спапяляючы сябе сумнівам, аддаючы сваё пяро эпісталярнаму імгненню перагараючы думкай у словах інтэрлюдый

«Дарагая Ала!

Дзякуй за харошае, духаўздымнае пісьмо Чытаць яго было і прыемна і ведаеш трошкі балюча О, не трэба чалавеку заглядваць далёка ўперад! Не трэба, можа каб яму і гаварылі што ён нечага варты нешта зможа, каб захацеў і г.д. Ты, вядома не гаворыш так, бо ты разумніца, але вось пасля твайго ліста я падумаў чамусьці, што ў мяне, мусіць мала самалюбства (аўтарскага, у дадзеным выпадку) і што я да гэтай пары (а пара мусіць) так і не вырашыў для сябе пэўна, добра гэта ці блага У тое што нешта патрэбна тваё, маё ці іншых нейкіх другім іншым, тым больш у такой меры якую ты па дабраце сваёй кладзеш верыць мне скептычнаму, калі хочаш рамантыку асабліва не выпадае Мне даволі было б і ўсведамлення (узрост пра які ты пішаш!), што я скажам, нейкім чынам патрэбны аднаму чалавеку· ці не давол гэтага для таго, каб аддаць яму, як найлепшае ў табе ашчаджаную з гадамі пяшчоту веру без прыняжэння яе падазрэннем ці разлікам удзячнасць за непрымушанае парыванне — усё тое простае і пазначанае вечнай навізной што ўціхамірвае нас у сталасці і ўстрымлівае ад хапатлівай пагоні за «асалодамі» («насалодамі», як піша Караткевіч), дае неганарлівае адчуванне ўласнай асабістасці — без боязі патануць ці панішчыцца ў агульным Вырасце цырбулька дзядоўніку ці ліст конскага шчаўя пасля нас — якая розніца? Верыць у сустрэчу «в лице ином» немагчыма хаця б таму, што нам не дадзена «там» памяці пра былое

сваё існаванне, не дадзена ўспаміну «там» — якая ўжо «сустрэча»! Вось чаму ў чалавека на гэтым свеце, акрамя жыцця, ёсць яшчэ адна толькі ўзнагарода — **успамін**, тое, што жывіць мастацтва — акрасу гэтага жыцця «Природа знать не знает о былом» — гэта здаецца, Цютчаў Чалавек — ведае. Даражыць імгненнем, а не ганяцца за ім, зрабіць імгненне асацыятыўна-аб'ёмным (вось дзе патрэбны ўспамін) — гэта чалавечы космас (і мікра- і макра-), а ўсё астатняе — пустата, «холодные миры», ачоскі туманнасцяў і няхай Калмагораў гаворыць пра магчымасць «думающей плесени» — суцяшэння мне ці каму яшчэ ад гэтага мала Адным словам, няхай жыве ўспамін!

Вось табе трохі «філазофіі», а з якой нагоды — сам не ведаю Мо з той, што проста ты патрэбна мне — думай пра гэта як хочаш

А на чалавекаў я, наогул, не крыўдую. Даўно паблажлівы — можа залішне нават. Многім гэта здаецца абыякавасцю, хоць гэта і не заўсёды так. Мяжа тут усё ж ёсць

Здаравенькая будзь. Не сумуй Ніякі ты не цынік. Чалавек, у якога ёсць свой свет, не адзінокі ўсё ж.

Міхась 26.08.82»

Няхай жыве ўспамін! Ці мае там, у сваім «вялікім ніколі» Міхась памяць або адчуванне, або інтуіцыю? Ці ведае ён пра мае гадзіны дні, месяцы — сам-насам з ягонымі лістамі? Маімі лістамі? І што мне трэба было рабіць тады? Наскрозь ненатуральная, залітаратураная асоба? Можа, трэба было кінуць усё і ўсіх і бегчы? Спяшацца Куды? Навошта? Ратаваць? Дапамагаць? Падмацоўваць духаўздымным настроем? Прысмакамі-рыштункамі? І з'явіўся б нечуваны творчы імпэт? Шыбаваць у «Піцербурх»? І тады з'явіліся б неспазнаныя шэдэўры? Не, я вельмі скептычна ставілася заўсёды да сябе ва ўсіх іпастасях. Нават у гады блакітных мараў і ружовых спадзяванняў (Таму, дарэчы і не задумвалася, калі падпісвала першыя спробы пяра — ат, як ні назавіся хоць гаршчком аднак пазней зразумела нават сціплыя допісы павінны быць падпісаны адпаведным імем Між іншым — Стральцову была не патрэбная гэтая аздоба ён быў Стральцовым) Дык не месіяй, ні місіянеркай, ні музай, ні ахоўніцай, ні выратавальніцай я сябе не адчувала І ставілася з пэўнай іроніяй да прэтэнзій іншых І нават да шчырых парыванняў — на ролю выратавальн ц і ахоўніц.

Ды і той год само існаванне было для мяне дарункам лёсу Усё адчувалася наноў Сонца? Шчадроты Бога. Дождж? Дар нябёсаў Кубачак кавы? Рытуал Быццё было самадастатковым. Мне было вернута жыццё. І рытм жыцця здаровага чалавека Мне здаецца, такое адчуванне павінна было быць у Стральцова пасля вяртання Воля! Ніякага рэжыму Чалавечыя неўнармаваныя паводле законаў казармы, умовы жыцця

Да таго ж. у Міхася былі складаныя, адгалінаваныя сямейныя стасункі У мяне — сям я. Дарагія мне людзі Ці думаў пра гэта ён? Не ведаю Але — Міхась Стральцоў быў Паэтам «Слагаются победы Из опыта потерь»· яму была вядомая гэтая ісціна таямніца якой адчынена толькі абраннікам светлай Багіні Красы Ён не баяўся страціць. Наноў А я маючы надзейную ахову маіх гадоў, што згадаю яшчэ, траха перайшла за грэцкае акмэ, і сякую-такую літаратурную і жыццёвую загартоўку, разумела нашы эпісталярныя дачыненні як неабходную яму гульню, як практыкаванне душы Як неабходнасць нейкага сэнсорнага спажывання Урэшце, зноў жа, зноў — як тое, што Міхась піша ўсё гэта Вобразу, што стварыў сабе там, у замкнёнай прасторы на самоце Я ж мела тое, што ў мяне ніхто не мог адабраць, не мог увайсці туды за мной, мог толькі здагадвацца пра гэта, адчуваць. Так, свой свет у мяне быў І я бараніла яго. І ведала — там я сама сабе — не каралева не,— але істота цалкам незалежная Ні ад абставін, ні ад людзей, ні ад чыіх учынкаў Ні ад Удачы ні ад Поспеху Ні ад няўдач І скрухі Міхась адчуваў гэта І мне, можа, вышэйшая жыццёвая ўзнагарода — гэтыя ягоныя словы «Чалавек, у якога ёсць свой свет .» Нясціпла? Не ведаю. Гэты свет я не змагла мабыць, выславіць, увасобіць у вобразы хаця — грэшная — ад спакуслівага граху прозы я не пазбавілася, друкавацца — не спрабавала (адзіны выпадак, калі я вульгарную падробку пад традыцыйную прозу насіла аднаму скептычнаму рэдактару, не залічваю, падробленне — заўсёды помсціць, нельга спрабаваць пець не ў дадзенай табе прыродай актаве).

А ў тым, маім, свеце былі і Блок, і Эмілі Дзікінсан і Шэкспір, і Уайльд, і Булгакаў і Брыль, і Стральцоў Той Стральцоў, што належаў мне як і тысячам іншых чытачоў з якім я заўсёды магла весці гаворку, незалежна ад яго настрою, ад абставін, ад яго стаўлення да мяне Гэтага — у мяне ніхто не мог адняць, ніхто не мог мяне пазбавіць. Нават ён Стральцоў Як ніхто не мог бы адняць сонца, аблокі, дрэвы, пошум ветру, дажджы, снег птушыны шчэбет Шапена Баха.. І дачыненні да высокай існасці Боскай.

І той «свеце ясны», што быў светам Міхася Стральцова, і ў якім раскашавалі ўсе мы ягоныя чытачы Ці трэба было ў тым свеце прыдбаць куточак і мне? Мабыць, не. Ці трапіў у той свет ідэал ягоны, Стральцоўскі? Не ведаю.

Воля ўжо блізілася і выдавала пакуль што сваю ману Міхась нерваваўся У мяне тымчасам прыходзілі па тры-чатыры «хуткія» за ноч Да маці Зноў я не заўсёды магла адразу адказаць на ліст Ноч без сну праца, аптэка пошукі лекаў пошукі падарункаў для ўрачоў і фармацэўтаў (наша знакамітая бясплатная медыцына!).

«Прабач мне маё назалянне, але тое што ты маўчыш пачынае непакоіць мяне Думаецца рознае. Найперш вядома пра хатнія твае турботы Дзяліцца імі зразумела не абавязкова з кожным але для мяне, павер важна ведаць, як ты і што. Мне заўсёды хацелася заслужыць хоць колькі твайго даверу, ды вось бачу што не заслужыў Мне вельмі крыўдна і шкада сябе А мо пісьмо маё не атрымала? Думаецца яшчэ ці не **ўшчамілася** сюды (прабач грубае слова) якая плётка? Хоць і не бачу прычын са свайго боку для гэтага дапускаю што непаразуменне якое-небудзь магло выйсці Ад гэтага ніхто не бержоны на жаль Толькі вось непаразуменні калі яны ўзнікаюць нейк трэба «здымаць» — пры ўзаемным даверы А мне хочацца думаць, што я магу разлічваць на твой давер.

Можа, я ўсё тут перабольшваю можа проста выдумляю сам сабе — толькі ўяві і мой стан Каб я хоць мог табе пазваніць!

У мяне тут усё пакуль няпэўна Бібліятэку можа пачну перадаваць днямі Колькі гэта працягнецца, не ведаю. Потым — павінны быць яшчэ аж дзве камісіі — медыцынская і судовая Калі — таксама дакладна не ведаю Вакол мяне адны пытальнікі Гэта — тут А ў Мінску іх колькі? Я не надта бядую, але нервы наструнены

Слухай, падрыхтуй мне нешта накшталт спіса таго што мне, вярнуўшыся трэба будзе прачытаць у першую чаргу Што мяне цікавіць ты ведаеш пачні хаця б з часопісаў Збяры што можна да адной кучы. А я табе падару за гэта «Голубой чертополох романтизма» аднаго аўстрыяка Айзенхарда [правільна —Айзенрайха] — нешта і ад Музіля і ад Шніцлера, і ад Ст Цвейга нават, і ад Кафкі дзе-нідзе — адным словам «венская школа» — не «пражская» Гэта — апрача розных іншых дробязяў (не кніжных) якія хачу табе падарыць.

Не буду размахвацца на пісаніну Можа заўтра будзе ад цябе пісьмо А на гэта ты ўсё адно адказвай

А мне ўсё ж трохі сумна Бывай

Міхась.

6 09.82»

.У 1984 годзе, калі ўсе развітваліся з маёй маці зайшоў і Міхась Народу была процьма — з Навагрудка з Гародні мінскія блізкія і далёкія знаёмыя, амаль усё выдавецтва «Мастацкая літаратура» (я тады працавала там — і яшчэ раз спазнала ў горкія хвіліны якія спагадлівыя і добрыя людзі побач са мной), са службы майго мужа Кветкі кветкі кветкі І маці — строгая у чорным загадзя падрыхтаваным строі Я гляджу толькі на яе — тры дні як то павінна быць у хрысціян мы развітваемся з ёю. І раптам адчуваю: кветкі паклаў Міхась Стральцоў Падымаю вочы — яго ўжо няма «Стральцоў?» — пытаюся ў мужа «Так»

А неўзабаве адышоў з гэтага свету бацька Міхася

Былі, былі нейкія паралелі і перакрыжаванні

«Даражэнькая!

Вечар добры, а калі хочаш, то дзень ці раніца! Гэта ўжо як табе патрапіць. А я ўвечары пішу, у той дзень, як атрымаў тваё пісьмо. Дзень няўдалы для пошты заўтра субота а потым нядзеля З Эолам не адашлеш табе пісьмо· галубоў што жывуць у паддашку тутэйшай лазні і добрай жардзінай каб была не выганіш у вялікі белы свет· аблянелі [нечытэльна], як нашыя прапары,— бо харчоў здаецца, хапае Не люблю я чамусьці гэтую птушку Хоць яна і сімвал нечага,— пошлая і, мусіць, недалёкая, як газетная кіяскёрка Чаму кіяскёрка?— бог яго ведае, нешта прыйшло ў галаву раптоўна — і напісаў Пісьмо ўсё ж, можа патрапіць да цябе раней нашага кардоннага тэрміну — таму яго зваротнаму адрасу ўвагі не надавай — так трэба А літару мне, калі хочаш можаш не пісаць. Наша паштарка цяпер у адпачынку і пошту я сам забіраю: сваё пісьмо знайду і сам сабе ўручу Вяртаецца яна (паштарка) у канцы верасня, а я месяц тут, пэўна, праседжу,— нешта ўжо і спадзявацца на дарогу перастаў І ты неяк неімпэтна, прабач, пішаш, і надзей у мяне на нешта добрае няма і зіма скора і турботаў як у Чыгрынава, наперадзе, і радасці не блішчыць,— жыццё ўяўляецца нейкім прымыльнікам ці то дзяжурным міліцэйскім пакоем. Бррыда!

Хоць бы ўжо табе неяк здатней ды весялей пачувалася і то мне было б цяплей!

Горка мне чытаць было пра Сцяпана Захаравіча [Сцяпан Захаравіч Гаўрусёў — паэт], шкада магутную сілу але падумаўшы быць У —мі ды Z.—мі — не такі ўжо і вялікі «прыварак» бядотнаму чалавецтву Сцяпан Захаравіч хоць гусарыць умеў і то добра а куды яно пайшло ўсё і навошта і на што пойдзе — нам не дано предугадать, сапраўды Але, цвяроза разважыўшы, Т -чаў вершыкі ягоныя пераживуць, як і вершыкі іхнія таксама Истинно истинно

говорю тебе. Малое суцяшэнне, канечне,— але што ж рабіць? Ты вось не абяцаеш мне ні ласкі ні спагады а я табе пішу і мне добра, пішучы і я забываю што многа ёсць сіл і клопатаў якія ірвуць чалавека на часткі і нават часу сабраць сябе зноў няма не тое што спадзявацца, быццам некаму патрэбны твае шарыкі ды вінцікі

Я ў апошнім пісьме, якое ты, калі адпісвала мне, мусіць, яшчэ не чытала, збаяўся якой-небудзь брыды — не за сябе, за цябе, а цяпер бачу, што трывога дарэмная — і дзякуй богу!

«Чтиво» ты маё будучае ўсё ж сплануй — я пісаў сур'ёзна

Не зразумеў, чаго паляцела ты ў Наваградак,— нейкая своевольная комета в кругу расчисленных светил Узяла б лепш камандзіроўку ды на нашу браму зірнула бачыш рэўнасць ува мне загаварыла Слаб человек. Я табе сур ёзна кажу: хочаш апекавацца (нават хоць трохі), шукай мне добрую жонку, бо сам я бачаць богі не знайду У Персію мяне ніхто не пусціць, на сцэнарныя курсы ў Маскву я не траплю, бо не маю ніякай драматургічнай жылкі ні хэнці мець яе, у вёсцы жыццё яшчэ жарстчэй, сіберней чым у горадзе (я гэта ведаю), а гаспадарыць я не ўмею. Да таго ж вось і разваж, што мне рабіць? Думай, даражэнькая бо я перабраў у думках шмат чаго: нават на топшчыка ў Каралішчавічах меціў ды з аднаго боку малады незагартаваны п'яніца V мару падкасціў [нечытэльна], з другога — Сцяп.[ан] Зах.[аравіч] той жа, дай бог яму здароўя раней за мяне там сабе маёнтак агораў

Абавяжу лепш цябе пакуль пісаць мне праз дзень п сьмы і ў кожным даводзіць, што я цаца, што я харошы, што мяне, як буду ісці ў суд на раздзел жылплошчы хоць здалёк паражагнеш, што ў мой халасцяцкі пакой ката з парогу ўкінеш што кветкі на балконе, калі той будзе, прымусіш пасадзіць увесну калі да вясны (о!) дажыву і калі паспею памяняць да той пары кватэру О! Наогул я не жартую, я праўду пісаў што клопатаў у мяне будзе, як у Іцкі знаёмых.

Надакучыў я, адчуваю сваімі фразамі і перыфразамі табе, ды яшчэ во не ўцяміў што на гэткай паперы варта было з аднаго боку пісаць [папера амаль бібулковая толькі цыгарэты рабіць],— і будзе табе мэнка і раздражненне, чытаючы Прабачай

Пішы, даражэнькая а я чакаць буду і дні лічыць. І спадзявацца што можа, мы з табою сёлета па зялёнкі і радоўкі ў лес з'ездзім Як ты глядзіш на гэта?

Кветкі ў мяне пад акном каторыя адцвіл каторыя яшчэ чапурацца кветкі, наогул познія І два каштаны мае падраслі і лазіна у якой я абразаў адз н ствол вунь як у гору за лета пайшла — узрадавалася расці. Ластаўкі тут за акном сядзелі летам на правадах, міла шчабяталі — адляцелі цяпер Прылятае на кветкі чародка чыжоў — прыгожыя і рахманыя птушкі Жулька, што ў гарачыню ў сваёй пячоры пад кветкамі спала, цяпер ляжыць удзень на ўгрэве збоч асфальтавай дарожкі — ласкавае такое і разумнае стварэнне Я думаю яна асабіста ведае кожнага ў зоне і ведае кожнаму цану

І гэта я так закругляюся! Загаварыў цябе а ты зноў зробіш выгляд, што не заўважыла **тое, што** было перад **тым** (во стыль) — пардону прашу!

Бывай Пішы

Міхась.

10 09.82»

Сцяпан Захаравіч. Ён пайшоў з гэтага свету не нашмат перажыўшы Міхася Любіў зайсці ў рэдакцыю — спачатку «Мастацкай літаратуры» потым «Нёмана»· «Ну што, высакавольтная?» (Гэта нейкі мой допіс падаўся яму такім «энергаёмістым».) Гаўрусёў усё і ўсіх чытаў любіў добрае слова кінуць. Пра Міхася Стральцова гаварыў ціха, важка неаспрэчна. «Геній»

У тую пару, калі пісаў Міхась Лявонцьевіч Гаўрусёў узяў шлюб з пакаёўкай Дома творчасці (не ведаю, ці афіцыйны) і жыў у маленькім дамочку на тэрыторыі Дома У яго пагоршыўся зрок, нешта здаецца, пакульгваў але — заўсёды ў чысцюткай белай кашул высокі паглядны ён згадваў· «Якія вогн шчы мы тут паліл з Пысіным! Верталёты прылятал — праверыць» І гаварыў расказваў пра свайго сябра з Магілёва Паэт пра Паэта

Гаўрусёў недзе за дзень да сваёй смерці зайшоў да нас у рэдакцыю «Нёмана» выклікаў мяне з планёркі падараваў сваю апошнюю кнігу Паэт

Былі на тэрыторыі Каралішчавіцкага Дома творчасці і тыя «Джэры і Джульбарсы» пра якіх пісаў Міхась. Тым летам — «афіцыйны» сабака Валет і «неафіцыйная» Пальма Пальма таксама ведала, здаецца, усім цану. Вельмі любіла нашчадкаў Пімена Емяльянавіча Панчанкі. Пасля іх ад'езду доўга жыла ў нас на верандзе Але гэта ўжо іншы аповед. Іншая драма.

«У РАССТАННІ ЁСЦЬ ВЯЛІКІ СЭНС...»

«Добры дзень, дарагая!

Гэта як уздых,— трохі стомлены трохі безнадзейны — трохі з надзеяй на палёгку «Даражэнькая» і «дарагая» — адчуваеш розніцу? Адчуўшы адчуеш і мой настрой. Ну іх к богу, нашыя праблемы і нашыя клопаты, наша свядомае ці міжвольнае хітраванне з самімі сабой! Бо як падумаю што чалавеку ў гэтым жыцці па сутнасці, так мала трэба і што гэтае «малое» за такімі вялікімі пячаткамі (Дастаеўскі неяк прагаварыўся, што гэтае «малое», «простае», можа, настолькі сапраўды простае і малое, што чалавеку ў яго немагчыма паверыць), бо калі падумаеш так, сапраўды робіцца не па сабе і ад усялякіх нашых слоў, і ад нашых звažанняў на чужыя ці свае акалічнасці, і ад апраўдання гэтых нашых звažанняў — і тады нейкі лісток засохший безуханный гаворыць нашаму розуму і пачуццю больш чым усе нашыя акалічнасці. Ты добра зрабіла што прыслала мне гэты лісток, запытаўшы тым часам ці не пакрыўдаваў і г.д. Пакрыўдаваў-такі, мусіць, **даражэнькая** (вось тут яно на месцы) — і гэта ты, можа, адчуеш з майго трохі бурклівага пісьма, не гэтага Адчуй і будзь са мной трохі шчырэйшай Крый мяне божа папракаць цябе ў няшчырасці наогул! Мне проста здаецца, што ты ў нечым шчадзіш мяне ці аберагаеш а ў чым, зразумець не магу — і ў гэтым недагаворанасць нейкая Мо мне і здаецца. Вось пабачу цябе на ўласныя вочы пачую твой голас — і зразумею, можа, у чым тут справа і сакрэт

Не памятаю ці пісаў табе (а больш, здаецца каму?), што мая малодшая дарослая дачка пачала мне пісаць апошнім часам і нават прыслала свае вершы Што яна піша я ведаў і раней, а тут пабачыў на ўласныя вочы Здаецца нешта ёсць (кажу гэта аб'ектыўна). Але больш мяне суцяшае яе сур'ёз, неблагая філалагічная адукацыя, наогул, па-мойму даволі мізэрная ў наш час у дзяўчатак (і не толькі) яе ўзросту Я напісаў «адукацыя» а трэба было — пісьменнасць. адчуванне стылю, што мне асабліва да спадобы Я гэта ўсё да таго, што хацеў бы, каб ты неяк пазнаёмілася з ёй і ўзялася кіраваць хоць збольшага юнай душой· я гэта не ўмею ды і баюся адчужэння пэўнага — у жанчын узаемапаразуменне можа, прасцей Я прасіў Вераніку пазваніць табе (даруй што без твайго дазволу бо, дарэчы, прасіў давядацца, чаму вашэці маўчыць), прасіў а званіла яна ці не, не ведаю, бо ты нічога не пішаш а яна не адпісала пакуль.

Прыгарні калі пазвоніць, да сябе дзіцё: мне, дальбог, хочацца, каб нехта меў на яе харошы жаночы ўплыў — інтэлектуальны і псіхалагічны

Што ты думаеш пра ўсё гэта, напішы але ведай што мне хочацца настойваць на сваім хаценні

Вершы «дитё» піша чамусьці па-руску а варта было б скіраваць на што іншае, тым больш што і вучыцца ў універсітэце на бел.[арускім] аддзяленні Вядома, я скажу пра ўсё гэта ёй і сам толькі не ў лісце, можа, і не адразу Не адразу бо хачу пабачыўшы пасля году адсутнасці ўцяміць, што і як. А ты зачапі яе як-небудзь цяпер — зразумей толькі мяне правільна. я, можа, бянтэжуся трохі сваёй ролі, і таму прашу ў цябе дапамогі, але не толькі таму Галоўнае ў маёй упэўненасці што твой уплыў можа быць найбольш дзейсным Ты можа, пасмяешся з маіх гэтых старанняў але ж мне ў глыбіні душы ўсё ж нешта лесціць, што ў малой прысутнічае-такі філалагічная жылка і што яна можа аслабнуць без пэўнай увагі, бо вучыцца малая на вячэрнім (а мо цяпер і завочным?) аддзял.[енні], а дзе там літаратурнае асяроддзе і г.д.?

Пра маю ўяўную чытацкую дасведчанасць ты здаецца трохі перамяніла думку бо сапраўды — якое тут у мяне было чытанне? Канечне, я не чытаў тут як не чытаю наогул, розную выпадковасць, лухту Тое-сёе цікавае для сябе я і тут прачытаў але вось навінкі?! А навінкі ўсе ў цябе ды яшчэ вунь якія! Якраз усё тое, што трэба мне Я чытаў з таго, што ты згадваеш, толькі Гесэ — і «Воўка» і «Гульню ў бісер»

Фільмы вядома, не бачыў «Амаркорд» асабліва хацеў бы паглядзець. Феліні чамусьці мой любімы рэжысёр «Хрысціянскі» пачатак у ім цаню, адсутнасць бяздумнай жорсткасці і чалавечнасць і адухоўленасць сімволікі Наіў можа, пры гэтым Наогул наіў у мастацтве люблю — гэта нешта накшталт супермастацтва ці што.

Але — даволі Бібліятэку я перадаю, але — марудна Ты пакуль мне пішы Зразумела? Калі прыйдзе час «закругляцца» — вестку падам

Не журыся, а я буду думаць пра сустрэчу

Міхась.

27 IX.82»

З Веранікай мы сустрэліся пазней. А той парой яна акуратна патэлефанавала мне, сціпла-інтэл гентным голасам спытала пра здароўе. Але бацьку — як згадвала пазней яна сама — паспавядала добра І ён тлумачыў нашы стасункі мы сябры «маю права на такую раскошу» Вераніка паказвала мне гэты ліст бацькі ў першы дзень нараджэння Міхася пасля яго смерці 14 лютага 1988 года Пасля наведвання могілак мы з Веранікай паехалі да мяне і доўга гаварылі Пра яе пра яе бацьку

А пазнаёміліся мы ў тых жа Каралішчавічах. Быў семінар маладых. У 1984 годзе. У снежні У Веранікі з явілася некалькі цікавых рэцэнзій у друку На семінары іх высока ацаніў такі

сур'ёзны літаратуразнаўца як Алесь Яскевіч. Прыемна было сказаць сваё слова і мне. І не таму што пра гэта прасіў некалі бацька Таму што сапраўды падаваў надзею тонкі крытык — крытык паэзіі Вершаў сваіх на семінары яна не паказвала Вельмі прыгожая — класічная, арыстакратычная прыгажосць — Вераніка трымалася з годнасцю трошкі адстаронена Я таксама не стала парушаць «дэмаркацыйнай лініі».

Сапраўднае наша знаёмства адбылося калі я прыйшла рабіць у «Нёман» І ў тое цяжкое лета 1987 года у бараўлянскія апошнія тры месяцы Міхася Стральцова, мы часта сустракаліся тэлефанавалі адна адной — і ўранку і ўвечары «Дамы-патранэсы» з мяне, праўда, не атрымалася З розных прычын Ды мабыць, апекаванне — не мая роля Я заўсёды не хацела быць назолай Не любіла і не ўмела настойваць на нейкіх сваіх высновах. Заказвала Веранiцы некалькі рэцэнзій, як прыйшла ў «Нёман» На кнігу Веры Вярбы яна зрабіла прафесійны, з настроем матэрыял Нешта не напісала Часта заходзіла да бацькі — мы працавалі разам з ім са снежня 1986 года да таго, як ён лёг у канцы мая 1987-га ў шпіталь. Тады і пазначыліся нейкія прыязныя нашы адносіны з ёю. Пры жыцці Міхася — і калі яго ўжо не было побач з намі Натура тонкая, выбуховая — Вераніка то з'явіцца нечакана ў наваротную ноч, як снягурка, з вялізным пакункам апельсінаў то дашле на дзень нараджэння мілую, натхнёную тэлеграму.

А тым часам у 1982 годзе было яшчэ некалькі лістоў, у якіх Міхась, упадабаўшы ролю рамантычнага скептыка дакараў маю сумотную шэрасць, папракаў у квакерстве, фарысействе і розных іншых смяротных грахах. Можа, не варта было б цытаваць адзін з яго апошніх лістоў але ў ім так відаць той самы «талант общения» які ён сам у сабе адмаўляе. Талент так бы мовіць, маналагічнага дыялогу Тое чаго няма ў яго творах, і тое, што, можа не заўсёды было заўважнае ў жыцці — ён быў негаваркі больш моўчкі назіраў, пасміхаўся, даваў раптам нечаканую характарыстыку

«Даражэнькая! Ала!

Сіберны твой скразнячок прасвістаў маю істоту навылёт Во і цяпер нешта казыча пад лапаткамі але я абтрося ад дрыжыкаў і мушу ўсё ж сказаць, што нешта не падабаешся ты мне сёння, даражэнькая! Дарэчы, вось я заўважыў што і «даражэнькім» ты мяне хрысціш як не ў гуморы Буду плаціць табе тым жа і я, даражэнькая

А цяпер скажы, на якое ліха мне Ar (добра, хоць не У.), навошта S S — нават ён, душу і розум якога я сапраўды цаню,— навошта мне яны, калі мне трэба нешта што абарочвалася б табой, крупінкай тваёй увагі ды нейкай няхай прыхамацінкай, бо няўжо ты не зразумела што я стаў тут капрызлівы — не на чытанне,— не, не на яго, а на чалавечае слова і жэст і мне сапраўды крыўдна, калі ты адмерваеш нейкую «дыстанцыю» якая табе магла прымроіцца толькі тады, калі ты пра сябе ці пра мяне падумала блага — а можа, і пра абодвух. І не падабаецца мне, што ты рядишься в этакую просвирню или сваху от Александра Серг.[еевича], а мне от него оставляешь каких-то А.П [Анну Пятроўну Керн], Е К. [Елізавету Ксавер'еўну Воранцову],— почему бы еще и не Собаньскую! Последнюю А.С любил может, правда, в известном смысле Ну что, получила? «Секс-бомбочки» под меня подкладываешь? А? А сама захінулася У -каўскай хусткай-канаплянкай і перастарэкаеш! А сама ўсміхаешся сабе хітранька і думаеш ухопіць тую бомбу ці не?

Халера яго ведае, за якую «бомбачку» я, прыехаўшы, ухаплюся і які «бікфордавы шнур» падпалю! Вось панаглядаеш але наперад скажу што ва ўсім толькі ты будзеш вінаватая бо жорсткім сэрцам ды яшчэ і супрацьжонкавых ірвоў вакол сябе накапала, «ежей» як нашы пад Масквой, панастаўляла процьму — сіберам дыхаеш аж чарнее і курчыцца ўвачавідкі любы бедны лісток надзеі! Хіба можна так?

Ты як-небудзь у вольную хвіліну ўсё гэта вазьмі вось і разваж. Значыцца так ты не крыўдуеш на мяне за «адповедзь», як я на цябе за «сівер» — згода? А «чтиво» якое-небудзь часопіснае і нечасопіснае падбяры, спагані са сваіх знаёмых даўгі Я што прачытаю што хоць вокам пракіну, «веласіпедна», як пісаў некалі Гершэнзон, кажучы пра чытанне «пехам» і пра тое, што завецца «галопом», а ў яго, бы,— «веласіпеднае»! У яго ёсць увогуле «пешак» чытання на прыкладзе «Онегина» — многа дробязей але цікава праўда

Не сварыся, даражэнькая, калі ласка са мной, **умягчайся душой**, думай часам не толькі пра каралішчавіцкіх сабак [я яму апісвала гісторыю разумніцы Пальмы], але і пра тое, што і чалавекі іншым часам бываюць удзячныя і верныя нават — хаця б у дружбе.

Выдавецкія навіны мяне чамусьці мала кранул , хоць я і рады за [прызначэнне] В Ён хлопец, здаецца, сур'ёзны і не амбітны і не хварэе, здаецца, на D -скія комплексы абойдзенага ды пакрыўджанага — а это уже последнее дело для литератора и первая проба для чиновника от литературы D , к сожалению, чиновник, и его беда в том, что боится признаться себе в этом. С такой половинчатостью карьеру делать трудно, а D надо делать карьеру пока не поздно — последние часы окончательного решения прошли! Прошляпит боюсь. И обозлится еще больше.

А так можно стать понеприятнее и Е Вот видишь, как я бываю зол И не такой уж я паинька

Но.. полюбите нас черненькими, а беленькими мы сами себя полюбить можем Каково?

Пиши. Ты не спрашиваешь, что мои дела и правильно делаешь, потому что ничего определенного еще не знаю Пиши, пиши.

Міхась»

Тут прамільгнула тое, што я ведала адчувала і што потым сцвердзіў Міхась — ён быў верны ў сяброўстве і ўдзячны «Дыстанцыя» ж, пра якую і згадвае Стральцоў паводле майго ліста, дыстанцыя паміж Талентам Стральцовым і аматаркай Красы якую часам даймае сверб пісьма,— дыстанцыя гэтая «огромного размера» Тое ж, што ў наступным лісце сам Стральцоў называе сябе «аматарам ад пісьменства прыгожага» — то тут боль. і ад крыўды — наноў пачынаць жыццё? І боль ад няспраўджанага ад нязробленага І тая скруха што магла прайсць каго хочаш, калі ён даведаўся — а хутчэй за ўсё такі даведаўся — пра словы адной з літаратурна-кіруючых асоб. «Сядзіць там, у ЛПП, і хай сабе сядзіць» Сябры Стральцова вялі перамовы наконт датэрміновага вызвалення пісьменніка

Увогуле магу сабе ўявіць адчай ягоны — там, у Мазыры «втолкнули в зону — и будь здоров» Што ж тады ўсё зробленае ім? Усё напісанае? Ён аўтар «Загадкі Багдановіча» «Смалення вепрука», чалавек, што стварыў «Адзін лапаць, адзін чунь»,— ва ўладзе «прапоров» Яшчэ раз мушу падкрэсліць — я не бяру на сябе смеласць вінаваціць тых, хто спрыяў яго знаходжанню «ў зоне» не ведаю, ці было нейкае іншае выйсце ці не, але магу ўявіць увесь жах яго цвярозага ўяўлення калі ён апынуўся — без суда і следства, без крымінальных прычын за агароджай «зачыненай установы» Ён, тонкі філосаф, паэт, чалавек трапяткой натуры .. «Ён быў падобны да спітага Бога»,— пісаў пра Поля Верлена Жуль Рэнар. На каго падобны быў Міхась Стральцоў? На Бога за кратамі? Бога грэшнага і бязвіннага? Вінаватага і невінаватага?

Тымчасам грэшны Бог лічыў дні. Да звароту

«Можа здарыцца так, што пісьмо гэта сам даганю ў Мінску Але — п шу «с той горькой радостью» і т.д. Бацюхны-светы! Больш за год прайшло, адмалацілася адгрукалася — і года па-праўдзе, не так шкада, як таго, што час упушчаны не для пісаніны нават (бог з ёй!), а для вырашэння спраў жыццёвых і неадкладных. Вось выйду а сам у цянётах большых і шчыльнейшых, чым быў раней. Вось што раз'юшвае! О багі!

Пазваню табе з дарогі, калі надарыцца. Пакуль жа — і сумна і няпэўна ў мяне на душы і адчуванне, што воля як быццам і не радуе што быццам нечага і шкада — няволі? Кветкі мае тут завялі ўсе (незнарок, як у Рубцова выйшла· «Алые цветы мои в садике завяли все») — наогул, сіратлівасць і пустэча У каго яшчэ. «Мокнет осыпается весь мой бедны сад, листья пожелтевшие по ветру летят»? Але гэта так, дзеля мінору, можа прафілактычнага — журба Будзем лічыць, што журба — пачуцце здаровае

Каб у цябе хоць усё добра было! Матухна малю некага і малюся! Мысленна не на вежах гедымінавых нават, не на ірвах наваградскіх, а на кручы маёй падсожаўскай — на паляпшэнне лёсаў чалавечых, а не на злом галавы! Быць таму! І — аман!

А так — клопату таго, што Z.-ны будуць хадзіць у майстрах нароўні з якімі італійскімі ці фряжскими У нас усе майстры — і Kr і Y , і Ld і K. і M Ну іх! Я радуюся што ў мяне хоць зайздрасці чорнай няма Я — аматар ад пісьменства прыгожага І даволі

Бывай мо да сустрэчы.

Міхась.

11.10 82»

Зайздрасці ў яго сапраўды не было. Але грэблівасць нават нейкая да ваяўнічага графаманства натуральна прысутнічала заўсёды Увогуле ён як Рэмі дэ Гурмон, лічыў· «Няхай сабе жывуць, мяжу мы адзначылі, ёсць два тыпы пісьменнікаў· тыя хто ўмее пісаць і тыя хто не ўмее пісаць — таксама як ёсць спевакі безгалосыя і з голасам» Так, ён згадзіўся б з дэ Гурмонам «. узнікла літаратура без стылю, падобная на вялікі шлях, дзе няма ні травы ні ценю, ні прахалодных крыніц» А сапраўды — колькі ў нас тых бальшакоў — голых, шэрых, нудотных. Гладкіх, як блінец, ці ў выбоінах. Але жывога прыгожага на што кінулася б вока мала Аднак — кніга за кнігай, публікацыя за публікацыяй

Былі кастрычнік-лістапад 1982 года Заканчваліся афіцыйныя мітрэнгі наконт вызвалення Лісты былі кароткія, пахаплівыя, што тэлеграмы

«Дзень добры, Ала!

Я дарэмна абнадзейваў цябе, думаючы што траплю ў Мінск 12-га Гэтага не здарылася бо не сабраўся высокі суд. Не хачу зноў лунаць во облацех, але спадзяюся на 19—20 Калі так, адказаць мне ўсё роўна не паспееш Таму развітваюся да сустрэчы

Пішу таму, што не хачу, каб ты нервавалася дарэмна можа не праз мяне наогул а праз маю нягжэчнасць, нядбайнасць, аб прыстойнасці — хаця б у тым што датычыць перапіскі

На сконе свайго тутэйшага жыцця я чамусьці стаў спакойны як трансфарматарная будка

Ох, не к дабру гэта, мусіць — Паглядзім

Пакуль бывай Як сустрэнемся?

Міхась.

14.Х.82»

«Дарагая Ала!

Увёў увёў я сябе і цябе ў зман дачасна і міжволі! Заела мой лёс як патрон у казённіку — ні стрэліць ні назад падаць Адно добра — бібліятэку я перадаў ўздыхнуў з найвялікшай палёгкай Камісіі прайшоў Чакаю суда А суддзі то хварэюць ці з чужымі бабамі паводле Чэхава недзе ў фінскай лазні начуюць. Можа і не так. Кажуць, усё ж хварэюць А я хварэю на нудоту на халодную злосць на боязь асенне-зімовай слаты і прымаразкаў — і душа асенняя падшэрхлая і ачарсцвелая Пахукай мо на яе га?

Можа, у аўторак, 26-га можа не.

Як і абяцаў пазваню ці з дарогі ці адразу прыехаўшы

Так хочацца цябе пабачыць

Бывай З табою мае малітвы

Міхась.

22.Х.82

P S Два дні як пацяплела Цёпла і пахмурна Падгнілай лістотай хораша пахне Раніцай зямля пацее — апошняя задуха перад зімой Сініцы ганяюцца па дрэвах адна за адной і неяк па-сарочы чачэкаюць.

М С.»

«Дарагая Ала!

Я можа і сапраўды **дабіваю** недзе апошнія свае дн тут (не падумай, што крыўляю якога-небудзь Хаіма ці Шмёлку). Як хочаш наогул дабіваю дабываю, але каб сапраўды так.

Пісьмы твае я атрымаў усё ж, неўзабаве пасля пісьма Вераніцы А вось ці атрымала ты мае? Я там табе агаворваў ролю нейкай бадай што патранэсы настаўн цы моладзі і г.д. але вось ты пішаш што размова ваша тэлефонная была паспешлівай няўцямнай ці што. Усё ж Вераніка мне напісала што голас у А.І **прыемны і малады** — ты гэта адзнач Гаворыць усё ж. заўважай жанчына Нешта ды значыць.

Напісала мне яшчэ ледзь не трактат наконт пасрэдніцтва няўмяшання і г.д. Як табе гэта падабаецца? Мне бадай што спадабалася Гэта добра калі малыя прынсіпы свае заяўляюць

Калі ўсё ж табе пазвоніць яшчэ (а я хацеў бы), прынаравіся не на хапок пагаварыць. яна летам была ў тваёй любімай (чаму?) Рызе — паахайце адна перад адной з выпадку тамтэйшых дзівосаў розных. Вы жанчыны, гэта ўмееце.

Навін у мяне ніякіх. Бібліятэку лічы перабрал — на тым справа і стаіць. Трэба акты спісанне і г.д., а мае рэвізоры каторы дзень не паказваюцца Сягоння сыбота заўтра нядзеля а што ў панядзелак, невядома

Думаў я трапіць да вас пасля 7-га (Кастр), ды мусіць не Каб хоць у сярэдзіне месяца І то б нічога

Як сустрэнемся? Ты мне столькі яшчэ больш чым Ніка (Вераніка) «маралаў» начытала (за ўвесь час), можа не «маралаў» а блакаду нейкую павяла пэўна — можа, столькі напамахвала перада мной і амаль незаўважна як харошая дрэсіроўшчыца смирительным стыком што старыя рэфлексы мае затармазіліся, новыя — не выпрацаваліся — і я стаю перад фактам разбурэння асобы як яна ёсць. Вось што ты нарабіла!

Узваж узваж усё гэта даражэнькая, і перамяні гняўлівасць і жорсткасць на літасць

Ну, але, тым часам чакаю тваіх лістоў пакуль, п шы — не лянуйся

Скажу табе што-небудзь харошае ў другім л сце, калі твой праўда. не будзе надта сіберным

Бывай пакуль.

Міхась

2 12 82»

Гэта быў апошні л ст Міхась Стральцоў вярнуўся ў Мінск.

Я знайшла запіс у сваім дзённіку ў студзені 1982 года: званіў Міхась. А гаворку памятаю. Гаворка была звычайнай. Пра нейкія навінкі ў часопісах. Пра выданні Пераверзева (літаратуразнаўцы), якія толькі што з явіліся. Яшчэ пра нейкія літаратурныя і калялітаратурныя навіны

ПРЫ ЎРАЧЫСТЫМ СВЯТЛЕ ДНЯ

Сустрэліся мы канечне ж, выпадкова Я сунулася хутчэй дахаты з Дома кнігі пасля чарговай ночы з «хуткімі дапамогамі», без сну зусім «не в лице» І пабачыла спачатку нейкі недарэчны, руды калматы каўнер са штучнага футра на шэрым паліто, а потым за каўняром згледзела знаёмую ўсмешку· Міхась. І ён быў заняты нейкімі сваімі думкамі, сваім клопатам Неяк гмыкнуў іранічна «Ну, вось — сустрэліся». Таксама мабыць, згадаў «урачыстае святло дня» і «сталёвы пярсцёнак»

Пазней прынёс Айзенрайха і маленечкую драўляную жанчыну — з палец, у стылі ўлюбёнага ім прымітывізму

Пачалі рыхтаваць ягоную кнігу крытыкі «Пячатка майстра» Я збірала Міхасю для чытання нейкія часопісы, ён прыносіў мне ў выдавецтва толькі што набытыя ў кнігарні кнігі

Стасункі нашыя набылі ранейшы, звычны прыязна-дыстанцыйны кшталт З інтэрлюдыямі-гаворкамі па тэлефоне, выпадковымі сустрэчамі Часам, праўда па тэлефоне ён згадваў напаўжартам, як той вялікі, з Польшчы «Збяжым у Тамашуў» Былі можа як у Тувіма, свой Тама́шуў, і яшчэ якія падарожжы Але гэта былі ўжо іншыя гісторыі Больш рэальныя З канкрэтнымі дзейнымі асобамі Не са мной І тут — толькі канстатацыя факту Не роспач Не журба. Не шкадаванне. Не «уничижение» — нават тое што «паче гордости» Інакш не магло быць У жыцці кожнага з нас кантрапункты пазначаліся паасобку Лініі існавання ішлі паралельна Паводле Эўкліда Толькі часам выяўляючы логіку казанскага матэматыка — і перакрыжоўваючыся. Каб зноў сысці ў далёкія паралелі І эпісталярныя нашы стасункі скончыліся выхавана-гжэчным шматкроп'ем. Ніякіх меладраматычных клічнікаў і пытальнікаў Ніякіх кропак над «і»

Тымчасам здавалася — маршрут жыцця, дыстанцыя нашага зямнога існавання яшчэ досыць далёкія ад той, канечнай падзеі

А пакуль — кожны са сваёй самазасяроджанасцю Раўнавага быцця Раўнавага суіснавання Ідылія духоўнай блізкасці На адлегласці

Ажно «провидение» да ідыл й і ілюзій не так часта ставіцца паблажліва Драмы лёсу не было. Але фінал нашых адносін усё ж стаўся трагедыяй 23 жніўня 1987 года Міхакс Стральцоў пайшоў з жыцця І трагедыя — не таму што надышоў канец зямнога існавання гэта натуральна Трагедыя — таму што не зжыў пазначанага біблейскага веку, калі чалавек адыходзіць «насычаны днямі» (Хаця ў нас ад нязбытнага сацаптымізму і пра васьмідзесяцігадовых пішуць. заўчасна памёр.)

Перад тым — мы рабілі разам у часопісе «Нёман» Перад тым — ён святкаваў свой пяцідзесяцігадовы юбілей Перад тым — была ўсё ж вандроўка

У Слаўгарад. У Сычын Рабілі тэлефільм пра Міхася Стральцова Ці — больш правільна перадачу пра Міхася Стральцова, дзе быў дваццаціхвілінны фільм На тэлебачанні вырашылі выехаць на радзіму Стральцова І былі тры цудоўныя дні — 20, 21, 22 студзеня 1987 года Напярэдадні стаялі страшныя маразы — да 30 градусаў А як нам ад язджаць — пацяплела недзе -10 не больш Усё сляпуча-белае, блакітнае. Тэлебачанне едзе на сваім «рафіку» мы Міхась Стральцоў з дачкой — светлай лагоднай Алесяй, Рыгор Барадулін, Алесь Пісьмянкоў і я — аўтобусам І гаворка, здаецца, ідзе звычаёвая, і п'ём звычайную каву з тэрмасу што прынесла Алена Дзмітраўна (разам з іншымі ванзэлкамі, прызначанымі сваякам Міхася), і ямо звычайныя піражкі з яблыкамі (майго вырабу), і нічога асаблівага не адбываецца але прысутнічаюць у аўтобусе нейкія флюіды паразумення і разумення што не выяўляюцца ў словах і ўчынках, але адчуваюцца інакш (сёмым, дзесятым чуццём?). Настрой гэты — недзе ў паветры, у кіламетрах, метрах дарогі, у сыпучым ясным снезе, у праменьчыках сонца Мы ж едзем да тых дрэў, да тых стромаў, дзе гуляюць блакітныя вятры даўняй Стральцоўскай мары Маладога яго наіву І юных парыванняў душы І за вокнамі аўтобуса —стоеныя таямнічыя лясы, абрусы заснежаных палёў, утульныя вёсачкі, гасцінныя гарады Ідылія заснежанай прасторы, ідылія нязгаданага і згаданага, ідылія падарожжа — турботы і штодзённы клопат засталіся недзе на тых кіламетрах, што адлічылі колы нашага «Ікаруса» а мы ў рэальных, але і прымроеных нашым уяўленнем прасторы і часе у вэлюме добразычлівасці і нават крыху сентыментальных ілюзій «радаснага саду», аддзеленага ад астатняга свету не толькі дахам аўтобуса, але і агульнасцю вось гэтых, нядоўгіх, крухкіх, ламлівых сувязяў, суадносін — падарожжа.

І былі сустрэчы з аднавяскоўцамі Міхася Стральцова. З яго маці што так спакойна нібыта яна ўсё жыццё давала інтэрв ю тэлебачанню, гаварыла. «Я заўсёды лічыла, што ён некім будзе. Літаратарам нейкім» з жанчынай, у якую ў юнацтве быў закаханы Міхась З тымі дрэвамі хатамі — з той зямлёй, што памяталі Міхася Стральцова, якому яшчэ толькі наканавана было стаць творцам. Майстрам Там, у Сычыне і Слаўгарадзе ішло сваё недатычнае да нас і незалежнае ад нас жыццё. Быў звычайны клопат дня Але ў дычыненні да героя нашага падарожжа ўсё набывала асаблівы сэнс: жанчына, што плукала бялізну ў палонцы цікаўныя вясковыя дзеці (іх было няшмат), вольныя не прывязаныя але не бадзялыя хатнія сабакі Пажоўклыя здымкі ў хаце, дзе гадаваўся Міхась, каляндар прыроды што вёў ягоны бацька. Нават зусім пашорхлыя амаль не-

арганічныя ўжо, вязкі нейкіх зёлкаў пад столлю хаты, нават старыя табурэты і яшчэ нейкія седалы ў хаце і ў сенцах. І тая круча ў Слаўгарадзе, над якой Міхась чытаў свой верш, і старыя гасцінцы Магілёўшчыны Там цяпер — і надоўга — нячутная і нябачная бяда. Але я не хачу распавядаць пра яе тут — тады пра гэта яшчэ мала хто ведаў (Чарнобыльскія сакрэты захоўваліся пільна — прайшло паўгода), мы таксама занятыя былі іншым.

Нават і вячэры — у Сычыне, у Слаўгарадзе, у Доўску (на шляху ў Мінск) — былі не тое каб рытуальна-ўрачыстыя, але ў іх адчувалася магія прысутнасці талентаў — Міхася Стральцова і Рыгора Барадуліна, незаўважны гіпноз падпарадкаванасці ўсіх астатніх іх асобам. Усё другаснае набывала нечаканую галоўнасць існага і важнага, усё ўзбуйнялася, набывала нейкія адценні, нюансы, ствaралася асобая атмасфера Хаця не было сур'ёзных гаворак, спрэчак — нейкія аскепкі, бліскаўкі, іскры. Але бліскаўкі — вясёлкі, іскры — месячнага святла, аскепкі — вялікай казкі жыцця

Гэта было і пазней — калі ў Менску запісвалі свае слова Васіль Вітка, Віктар Карамазаў, Карлас Шэрман І потым працягвалі студыйную гаворку ў кавярні І маўклівая мудрасць Васіля Віткі, нейкая філасофская лагоднасць і ціхамірнасць Карамазава, якая раптам выбухала нечаканай весялосцю Усё гэта жывілася прысутнасцю Міхася Стральцова. Героя, юбіляра. Ён з нейкай добрай радасцю глядзеў на свайго сябра, які ўзяў ды і прайшоўся кругам упрысядку ў кафэ. «Віця»,— неяк заўсёды злагадна згадваў Карамазава Міхась.

Так, былі перад'юбілейныя дні Перадача з фільмам выйшла да юбілею. І я гарэла ад сораму Усе выдатна гаварылі, усе былі на экране роўныя самі сабе ў жыцці Але той перадачы і таго фільма, які я сабе ўяўляла, не атрымалася Не толькі таму, здаецца, што я не мела вопыту ў кіно і на тэлебачанні. Рабіла я сцэнарый (па просьбе Міхася — гэта была, як згадвалася, яго ідэя, калі ён даведаўся, што збіраюцца рабіць фільм пра яго) паэтычна-лірычны Прыехаўшы ў Слаўгарад і пазнаёміўшыся з рэжысёрам, я зразумела, што мы маем на ўвазе розныя рэчы Добра перамовіліся, я ўсю ноч не спала і вырашыла вяртацца ў Менск. Дзеля чаго я тут? Няўломак, няўдаліца. Міхась Стральцоў і Рыгор Барадулін неяк усё гэта «стушевали», але я па сутнасці толькі прысутнічала пры тым дзействе Рэжысёр Уладзімір Таміла рабіў усё, што ён лічыў патрэбным. Рэдактар Саня Шлег ажно квітнеў ад радасці — фільм пра сябра Аператар лавіў настрой героя і прыроды Рыгор высакародна ўзяў на сябе ролю вядучага. І абодва яны — Міхась Стральцоў і Рыгор Барадулін — разумеючы мой афронт, зрабілі рабочую няўдачу ўдалай жыццёвай імпрэзай

Міхась пазней усё суцяшаў мяне: «Не перажывай. Мы паедзем да цябе ў Наваградак, зробім фільм пра Янку Брыля» Янка Брыль — не толькі любіў удзячнага вучня Ён быў «дарагі яму літаральна кожным радком» І ў гэтым абзацы з «Пячаткі майстра» — стаўленне да пісьменніка і чалавека выяўляецца, можа, найбольш выразна. «Брыль наогул пісьменнік, надзелены вялікай здольнасцю пастаяннай апрабацыі вышэйшых маральных каштоўнасцей і ўдакладнення іх для сябе і для сваіх герояў Гэтая якасць, пры яшчэ надзвычайнай духоўнасці брылёўскага мастацкага свету выгадна вылучае яго сярод сучасных нашых празаікаў — гэтым ён прыналежны да непарушных традыцый вялікай літаратуры»

Вось гэтае — «апрабацыя вышэйшых маральных каштоўнасцей і ўдакладнення іх для сябе і для сваіх герояў», мастацкі свет Брыля — было для Міхася Стральцова неабходным патрэбным, меціла яго ўласную філасофію існавання надавала ёй, мне так здаецца, важкасць і пэўнасць. Часам ён, мабыць, і не пагаджаўся ў душы з Іванам Антонавічам, але ўласныя, яго, Стральцова, разгубленасць і разумовыя пошукі яго «няшчасная свядомасць», паводле Гегеля, яго «пункцірны» — сацыяльны і асабісты — побыт знаходзілі тут і сталую грунтоўнасць усведамлення, і ахоўную свядомасць, і нібыта блізілі яго да нейкіх першасных, анталагічных асаблівасцяў нашага быцця ў свеце. І блізкасць мастацкага метаду недзе набліжала, а недзе адштурхоўвала Міхася Стральцова ад Брыля (у «Смаленні вепрука» хаця б). Але Брыль быў заўсёды неабходны Стральцову І ў апошнія дні Міхася — калі яму на нейкі час стала лепш — яны паўтары гадзіны вялі размову апошнюю. 6-га жніўня 1987 года

Янка Брыль вёў рэй і ўлётку, у ліпені 1986 года, калі быў вечар Міхася Стральцова. І пазней, на вечарыне ў дзень юбілею ў доме Міхася Лявонцьевіча і Алены Дзмітраўны за хатнім багатым сталом Знешне нішто, дарэчы, не нагадвала пра «падводныя плыні» ў іх сямейным жыцці Было гасцінна утульна, смачна Было весела і цёпла Праўда дарослых дачок ад першага шлюбу — Вікторыі і Веранікі — не было.

У 1987 годзе Міхась Стральцоў — гэтаму спрыяў Рыгор Барадулін — наладжваў некалькі вечароў Недзе ў сакавіку — у Доме літаратара, пазней — у Гародні, недзе яшчэ. Тады многім здавалася мнагавата Нават і мне. Хаця ў Доме літаратара, напрыканцы красавіка я таксама брала чынны ўдзел Здаецца, крыху больш удалы, як у тэлевізійнай перадачы

Міхась Стральцоў ціха-здаволена згаджаўся на ўсе вечары Ці таму, што ўсё гэта было пацвярджэннем ягонага вяртання ў літаратуру і літаратурны свет. Ці таму што прадчуваў — мінаюць апошнія месяцы жыцця Так ці інакш — добра, што былі вечары, што ён зноў адчуў сябе прызнаным, слынным літаратарам

Добра, што ён пачаў працаваць у «Нёмане», у аддзеле мастацтва і крытыкі гэта таксама спрыяла вяртанню яго грамадскага рэнамэ. Міхась Стральцоў быў узрадаваны і ўражаны, калі яго запрасілі ў часопіс. пазваніў! прасіў! сам галоўны рэдактар! Дарэчы зазначыць, што галоўны рэдактар Анатоль Кудравец (сябар Міхася Стральцова) не збаяўся папярэджанняў адміністрацыйных асоб: за складам рэдакцыі тады пільна сачыла не адна ўстанова

Добра, што Рыгор Барадулін — паэт! а значыць, запраграмаваны на пэўны эгацэнтрызм чалавек — не толькі спрыяў заказам на пераклады, выданню кніг, але і акуратна ўранку і ўвечары тэлефанаваў Стральцову і нават купляў таму месячны білет на гарадскі транспарт.

Добра. Таму што, вярнуўшыся з Мазыра, Міхась Стральцоў быў замкнёна-разгублены, пачуваў сябе адстаронена і адчужана ад звычнага літаратурнага атачэння Пра тое згадваў у гаворцы са мной Вячаслаў Івашчанка — гэта пра яго клапаціўся ў лістах Міхась (мы з Івашчанкам якраз ладзілі кнігу).

Служба дапамагла Стральцову наноў адчуць грунт пад нагамі. Ды і сталы заробак быў не лішні

Ці не пярэчу я сабе? То сцвярджала — яму патрэбны маёнтак, рэнта І раптам На той момант, пасля ўсіх пярэкрутаў лёсу служба была ратункам.

Хаця пазней Міхась збіраўся наноў вярнуцца выключна да творчай працы Вёў пра тое гаворку ў Другім шпіталі Яшчэ да Бараўлянскіх прысудаў

Прадчуванне канца — ці было яно ў яго? Мне здаецца, калі і было, дык падсвядомае, інтуітыўнае. Не выслоўленае Не выяўленае канкрэтна У красавіку і траўні 1987 года ён пару разоў прыходзіў на працу страшэнна бледны Тлумачыў — нешта з сэрцам Гэта, мабыць, ірадыяцыйны боль (у яго быў рак стрававода). Потым нечакана лёг у бальніцу Спачатку ў Другі гарадскі шпіталь. Потым — у Бараўляны, у анкалагічную клініку

Наведвала яго і тут і там. У Бараўляны да яго многія ездзілі Нейкім разам мы сышліся выпадкова. Карлас Шэрман, Анатоль Сідарэвіч і я Карлас зрабіў слайды і пазней аддаў іх Сідарэвічу у часопіс «Крыніца» (адзін з іх друкавалі). Там, дзе мы ўдваіх з Міхасём Стральцовым,— падараваў мне. Слайд гэты раптоўна знік пасля таго, як я паказвала яго наварочным вечарам разам з маімі італьянскімі слайдамі Перавярнула дагары нагамі ўвесь дом — няма, хоць плач Няма

Перад аперацыяй увечары прыходзіла да Міхася ён пагладзіў прынесеныя кветкі, паглядзеў на чарэшню .. Быў супакоены, лагодны Спадзяваўся на дактароў Папрасіў, каб Алена Дзмітраўна — яна была пры ім — праводзіла мяне. Мы абедзве супакойвалі яго.

Вестка пра смерць Міхася Стральцова заспела мяне на Іслачы — той Іслачы, пра якую ён пісаў з Мазыра У Дом творчасці (толькі адчынены) Стральцоў так і не паспеў трапіць. Я ж апынулася там з прычыны рамонту кватэры здавалася, Міхась быў здаровы, узяла адпачынак. А потым так і шпацыравала кожнага дня ў Менск і назад — трэба было весці працу аддзела. За абодвух.

Пасля таго, як усе мы, яго сябры, праводзілі Міхася Стральцова ў апошні яго шлях, лёсу было заўгодна кінуць мяне паводле лепшых традыцый «усадебной культуры» (ужо згадвала — Міхась любіў яе) — за мяжу У Італію. Можа, дзеля таго, каб там, дзе на кожным камяні — адзнака тысячагоддзяў — згадаць аб ratio vivendi[23] Зірнуць на свет sub specie aeterni[24] А можа, каб проста парадавацца жыццю. І за яго таксама. За Стральцова. «Небо Италии, небо Торквата, Прах поэтический древнего Рима. .» Баратынскі ..

Каго працытаваў бы тут Стральцоў? Што «загадаў» бы паглядзець?

Працытаваў Загадаў Непапраўны прошлы час. Мінулы .

Быў. Было. . Былі Надзеі Гаворкі Спрэчкі «Круг земных забот .»

«І ЎСПОМНІЦЬ ДУША СВЯТЛО...»

Быў Ёсць. Будзе. Паэт, філосаф, празаік, эсэіст, крытык Міхась Стральцоў Класічныя ўзоры майстэрства Творчасць, дзе няма слотнай няўклюдзіцы слоў, цягамотных, раскілзаных сюжэтаў. Творчасць, у якой мы знойдзем лірычна-філасофскі водгук на жыццё, такое перажыванне светапарадку, што мае на ўвазе і надзейнасць класічных арсеналаў, векавых канонаў — і пазалагічна-мантажнае выяўленне ўражанняў падзей і ўменне знайсці новыя пошукава-некананічныя ўстаноўкі

Я зноў перачытваю невялічкае эсэ, шэсць слупкоў тэксту, непрэстыжны «падпольчык» літгазетаўскай (маскоўскай) паласы «Я не пастрашуся прамовіць, што мяне цікавіць пытанне годнасці мастацтва самога па сабе»

Перачытваю «Дзень у шэсцьдзесят сутак», «Загадку Багдановіча» «Смаленне вепрука» Глыбіня думкі, дыстынктоўнасць стылю Тое дадзенае абраннікам сузіранне што «ахоплівае субстанцыю рэчы ва ўсёй яе цэласнасці» разуменне «філасофіі ўсясветнай выпадковасці быцця .»

Гегель... Роб-Грые...

Зараз бы ўзяць трубку, набраць нумар тэлефону Пачуць голас. Згадаць існаванне той, далёкай і блізкай, паралельнай лініі

Яе няма

І яна ёсць.

Ёсць. Нездарма я так недарэчна ўрупілася ў гэты эпісталярна-прывідны ўспамін Адчуваючы гармонію натуры Міхася Стральцова. Таямніцу яго асобы Магію яго слова Вышыню і вытанчанасць інтэлекту

«І ўспамінае душа святло. .»

І сыплецца, спадае бэзавы попел успамінаў

Іслач.
Жнівень 1990 г
Верасень 1992 г

---

1 Ultima ratio (*лац.*)— смерць — апошні довад усяго.

2 У лістах М. Стральцова згадваюцца шматлікія канкрэтныя асобы. Там, дзе гаворка не мае адмоўнага сэнсу, пакінуты прозвішчы і імёны. У адваротных выпадках назвіскі «зашыфраваныя» адвольнымі крыптанімамі, паводле анульнапрынятых узораў, лацінкай: накшталт — містэр X., пан N., горад N., нейкія X, Y Z і г.д.

Лісты складваліся ў пэўным настроі, часам хвілінным. Адносіны да людзей у М. Стральцова, як у большасці з нас, грэшных, не мелі сталай дамінанты. Да таго ж пададзеныя ў пэўным кантэксце выказванні надаюць публіцыстычны, вокамгненны акцэнт пісанаму і могуць быць скарыстаныя ў літаратурных, калялітаратурных, пазалітаратурных гульнях, да якіх я ніколі не спрычынялася. А тым больш не бачу тут падстаў уводзіць у гэтае спагуднае, ганебнае кола бездакорную літаратурную постаць Міхася Стральцова.

3 Падаю той варыянт, які быў у лісце.

4 У Рубцова:

На кладбище затоплены могилы,
Видны еще оградные столбы,
Ворочаются, словно крокодилы,
Меж зарослей затопленных гробы...
(Н. Рубцов. Подорожники. М., 1976. С. 43).

5 У Рубцова:

Прекрасно небо голубое!
Прекрасен поезд голубой!
—Какое место Вам?— любое.
Любое место, край любой.
(Н. Рубцов. Подорожники. С. 138).

6 Guilich (*нем.*)— обман, хитрость, коварство.

7 Unmóglich (*нем.*)— немагчыма.

8 Comment vous portez vous (*франц.*)— як жывяце?

9 Excusez-moi (*франц.*)— даруйце.

10 Excuse me (*англ.*)— даруйце.

11 Nie zginiely (*польск.*)— не загінулі. (Пачатак польскай патрыятычнай песні — «Ieszcze Polska nie zginiela.).

12 To be or not to be (*англ.*)— быць альбо не быць.

13 Arte nuova (*іт.*)— новае мастацтва.

14 Old England (*англ.*)— старасвецкая Англія.

15 Sorry (*англ.*)— прабач.

16 Prosperity (*англ.*)— працвітанне, росквіт

17 Nihil habeo, nihil curo (*лац.*)— нічога не маю, ні пра што не маю клопату (нічога не баюся).

18 Anno Domini (*лац.*)— у лета Божае.

19 У цытаце М. Лермантава недакладнасць. Першы радок чытаецца так: «Окончив труд дневных забот». (М.Лермонтов. «Ты помнишь ли, как мы с тобою...» Собр. соч. М., 1948. Т 1 С. 86.)

20 Splended isolation (*англ.*)— бліскучая адзінота.

21 Con amore (*італ.*)— з любоўю.

22 Horreur (*франц.*)— ужас.

23 Ratio vivendi (*лац.*)— сэнс жыцця.

24 Sub specie aeterni (*лац.*)— з пункту погляду вечнасці.

Уладзімір АРЛОЎ

МЫ

Фаўна сноў

БРЫТАНСКІ МУЗЕЙ

У антычным аддзеле
мы гутарым з імператарам Веспасіянам
(9—79 гады нашай эры),
з тым самым, што абклаў падаткамі
грамадскія прыбіральні,
каб сказаць сыну, што
грошы не пахнуць.
Д'ябал з імі, з прыбіральнямі,
кажу я,
але навошта было асуджаць на выгнанне стоікаў?
(А мая каханая

згаджаецца ў гэтую хвіліну на спатканне).
Затое я пабудаваў Калізей,
апраўдваецца Веспасіян.
Але пры чым тут стоікі? —
не разумею я.
(А мая каханая
смела ўваходзіць
у чужыя дзверы.)
Веспасіян незадаволена чмыхае
мармуровым носам,
страчаным у нейкім
з дваццаці прамінулых стагоддзяў.
Наш сусед Септымій Север
зласліва касавурыцца:
балбатня замінае яму
абдумваць паход на парфянаў.
(А мая каханая
паказвае сваю грыўку
чужому люстэрку.)
Хтосьці адбіў імператару Септымію
абедзве рукі,
аднак, напэўна, усё-такі не за тое, што
ён пачаў узводзіць тэрмы Каракалы.
Попел яшчэ не засыпаў
фрэсак Пампеі,
і смуглявы патрыцый
займаецца любоўю з нявольніцай,
не зважаючы ні на нас,
ні на Ікараву авантуру,
ні на карабель Уліса.
(А мая каханая
падстаўляе вусны для пацалунка і
дазваляе рабіць усё астатняе.)

У Лондане цвітуць вішні.
У Менску падае дождж.
Уліс праплывае паўз выспу сірэнаў.
Мая каханая кажа не мне:
гэта — маё надвор‘е.

ЗГАДКА ПРА МОРА

Калі зрастуцца
нашы нервовыя валаконцы,
калі мае лейкацыты
пабягуць па тваіх хрызалітавых жылках,
калі салёныя рукі
ператворацца ў плаўнікі
і
мы слізганём у аквамарынавыя глыбіні,
з галубца ўвойдзе
паважная чайка і,
нахіліўшы набок галаву,
строга прамовіць:

запомніце гэты дзень,
сёння — свята найкарацейшага ценю.

РАНІЦА 29 САКАВІКА 1994 г.

Гарбата з малаком
пасля ўчарашняга піва,
якое, кажуць, ганараваў
яго зямляк Роберт Бёрнс,
(ягоныя вершы, прызнайся, падабаюцца табе меней
за яго ўлюбёны напой)
здаецца слабаватаю.
«The Guardian» паведамляе:
учора ў Парыжы памёр Эжэн Іянэска,
кароль абсурду,
які
разам з малалетняй ахвяраю
сексуальнага маньяка
рахмана глядзіць на цябе з газетнае паласы,
зняты на асноведзі сцяны
з партрэтам насарога ў натуральны памер.
З кухоннага падваконня
бліскае бурштынавым вокам
садовая вавёрка,
што сцягнула са стала востры кавалачак
белага шакаладу з арэхамі.
Такія вавёркі ўжо не ўмеюць
скакаць з дрэва на дрэва —
перабягаюць ад ствала да ствала
па прысоленай градам селязінавай траве,
падобныя да пацяжэлых цыркавых гімнастак
у адстаўцы,
якіх калісьці любілі капітаны і маёры
паветраных сілаў Яе Вялікасці.

Ты раптам успамінаеш,
колькі табе споўнілася летась.

АДНОЙЧЫ ДАЎНО

Гэта здарыцца
ў кляштары айцоў-дамініканаў
у часы Стогадовай вайны,
а магчыма, вайны за гішпанскую спадчыну,
а магчыма, крыху раней ці пазней.
Аднойчы пасля вячэрні
ў кляштарную браму
пастукае падарожнік на стамлёным кані,
а назаўтра малады прыёр
з бляскам у запалых вачах,
які выдае ў ім сухотніка,
седзячы на сонечнай тэрасе
з відам на Альпы або Пірэнеі
за сталом з клепсідрай і астралябіяй,

як на аўтапартрэце Скарыны,
перагорне апошнюю старонку маёй кнігі,
адолее пакутлівы прыступ кашлю,
адкінецца ў мулкім крэсле,
паглядзіць на гадзіннік на ўсходняй вежы,
скажа падарожніку:
ён не павінен напісаць гэтае кнігі
і
пераверне гарачай рукою клепсідру.

Я буду ехаць у тралейбусе
з відам на Серабранку,
чытаючы ўчарашнюю газету.
Падарожнік гнацьме каня
па горных дарогах.

ТОЕ ЛЕТА

Тое лета
з першым пацалункам у духмяную макаўку,
з уважлівым позіркам смерці,
з адзінокаю срэбнай кудзеркаю,
з ласанькай, што любіла цалавацца,
з зацвілаю азярынай,
якая памятае тваё цела з тых часоў,
калі вада ў ёй была празрыстая,
як твае сны...

Тое лета
будзе доўжыцца даўжэй за нас.

ПАРОМ ПРАЗ ЛА-МАНШ

Я так і думаў:
тут амаль ніхто
(калі не лічыць мяне)
не гаворыць па-беларуску,
але,
каб ты была са мною,
гэты дробны недахоп
імгненна ператварыўся б
у велізарную перавагу, бо
ў гушчыні палубнай публікі
мы маглі б гаварыць пра нашы пачуцці,
не саромеючыся самага патаемнага,
(ты ведаеш, якія вострыя адчуванні
могуць падараваць проста словы)
за выключэннем таго,
што нельга казаць нават шэптам у ложку —
пагатоў, мы з табою схільныя да прымхаў і
часта стукаем тры разы па дрэву.

Наш карабель
(па-тутэйшаму — ferry, альбо boat-ship)

гайдае ўсё мацней, і
ўжо ёсць першыя ахвяры марской хваробы.
Я раблю выгляд,
што не снедаў у Бельгіі
і не жлукціў піва ў карабельным бары
цалкам прадбачліва,
а не з банальнай прычыны
адсутнасці фунтаў і франкаў.
Праўда, манет хапіла б на званок табе
(уяві, што на палубе ёсць тэлефоны, якім усё роўна:
Токіо або Лепель),
толькі я забыў пра розніцу ў часе.
(Цікава, хто пражыў гэтыя дзве гадзіны
замест мяне?)

Порт Ramsgate
выдае з мора на шыкоўныя дэкарацыі
да фільма «Каханка французскага лейтэнанта»
паводле рамана жыхара гэтае выспы Дж.Фаўлза.
Я не казаў табе, што
білет у Ramsgate
(разам са сваім тэлефонам)
дала мне ў Менску
дзяўчына з зялёнымі, як сённяшні Ла-Манш, вачыма,
якую я ахвотна
запрасіў бы павячэраць разам —
каб на свеце не было цябе.

За прыбярэжнымі кулісамі
рыхтуецца да выхаду мытнік
з шэкспіраўскім імем Рычард,
які прыме мяне
(відаць, дзякуючы рудой барадзе)
за хлапца з Ірландскай Рэспубліканскай Арміі.
Але ўсё скончыцца памысна,
калі не лічыць спазнення на вакзал «Victoria»,
дзе ўчора ірландцы
мімаходзь апусцілі ў сметніцы
чарговую партыю бомбаў,
замаскаваных пад порцыі пламбіру,
каб два чалавекі
ўжо ніколі не змаглі трапіць у Еўропу,
а яшчэ адзін
здолеў бы наведаць яе
ў камфартабельнай калясцы для бязногіх.

Усё скончыцца памысна:

я хутка прывыкну да левабаковага руху
(урэшце, гэта пустая фармальнасць,
бо ўсе мы, згадзіся,
рухаемся ў адным кірунку,
хоць часам нам з табою ўдаецца
рухацца насустрач адно аднаму
і нават сустракацца);
у тэрарыстаў будуць велікодныя вакацыі;
я пакажу, як прайсці на Holden Road

пажылай мурынцы з Вест-Індыі, і за гэта
мяне нязлосна цапне за нагу
пародзісты брытанскі сабака
невядомае мне пароды;
голуб з Trafalgar Square
на знак асаблівага даверу
пакіне белы кружок
на маім зялёным швэдры;
(у Менску
адзін абазнаны габрэй скажа, што
апрача зялёнага швэдра ў мяне зялёная аўра;
я не прамінуў бы падзяліцца гэтымі звесткамі
з зеленавокай Ленай —
каб на свеце не было цябе)

і калі я зноў падымуся на boat-ship,
Англія здасца мне
ўтульным зялёным хутарам,
дзе можна было б затрымацца яшчэ на тыдзень,
каб там больш гаварылі па-беларуску,
прынамсі — ты.

DEJA VU*

Новае расчараванне
з'явіцца ў знаёмым абліччы:
цёплага надвячорка з цішынёю,
што звіла гняздо ў тэлефоне;
цнатлівай ночы з «Beatles»,
якія ў сне сыграюць развітальнае «Let It Be»;
бязмежна-пустэльнага ложка
з нядзеляю на даляглядзе;
пачатага рукапісу,
які ні да кога не прыраўнуе;
белагрудай коткі,
якая ўладкуецца на стале,
зусім сур'ёзна лічачы,
што дапамагае пісаць;
кароткага дожджыка,
які дзесьці пакратае лапкамі
жоўтую парасонку;
званка старой прыяцелькі,
чыё каханне шмат гадоў таму
размінулася з тваім каханнем;
вечаровага сябра,
які здзівіцца, калі ты
папросіш цыгарэту...

ТВАЕ ІМЁНЫ

Я забываю словы.
Словы забываюць мяне.

* Тое, што ўжо бачыў (франц.)

Мы сустракаемся на белым аркушы,
не пазнаючы адзін аднаго,
спяшаючыся разысціся
быццам прахожыя ў прыцемнай выгбе
дзе-небудзь у Рызе каля сабора св.Якуба
або на менскім праспекце
насупраць крамы «Гарбата».
Толькі твае імёны
яшчэ памятаюць мяне.
Я яшчэ пазнаю іх
у крыклівых натоўпах чужых найменняў,
выводжу іх на паперы
(чамусьці ў ніжнім левым кутку,
чамусьці зялёным атрамантам),
пішу іх сцішана й асцярожна,
захінаю рукой ад ветру з расчыненага вакна —
каб не паляцелі ў невараць
чародкаю зялёных стракозаў.
Баюся заблукаць без іх
на гэтай гулкай белай роўнядзі,
дзе так часта надараюцца з'явы
пад назваю fata Morgana.
Баюся заблукаць незваротна.

Цябе завуць Трава.
Цябе завуць Неба.
Цябе завуць Вогнішча.

Цябе завуць Дарога.

ФАЎНА СНОЎ

Чародка бялявых анёлаў
з нафарбаванымі вуснамі
над горадам з сярэднявечнае гравюры,
які ўтульна паколвае аблокі
цацачнымі спічакамі;
лагодны сабака Рэкс,
які меланхалічна дажоўвае
майго зайца Колю,
што жыў у мяне ў тыя часы,
калі я сам быў яшчэ неўміручы;
знаёмы рыжы пітэкантрап
з-пад вокладкі мамінага падручніка гісторыі,
які ў дзяцінстве прымарожваў мяне
пазіркам да падлогі,
а цяпер асвоіў шахматы
(я толькі апасаюся,
каб ты падчас партыі не зайшла ў пакой:
майму партнёру бракуе добрых манераў);
ружовая вужака
са смарагдавай каронаю на галаве
ў басейне, куды дае нырца
ў гарнітуры і пад гальштукам
нецвярозы тутэйшы паэт Анатоль,
падобны з твару да Гіёма Апалінэра;

падобны да самога сябе
цвярозы празаік Адам,
з якім мы ў 1863 годзе
асуджаем у налібоцкай леснічоўцы на смерць
зарослага рудым шчаціннем маскоўскага лазутчыка,
што, апелюючы да міжнароднае практыкі,
патрабуе задавальнення апошняе просьбы —
з'есці бляшанку кілек у тамаце,
якую я хачу з'есці сам, і ў выніку
леснічоўку атачае рымская цэнтурыя,
што ваюе з інсургентамі на баку Аляксандра II;
ты на сонечным плыткаводдзі
са схіленым над табою маім тварам,
адбітым у пералівістай плыні, —
ласкавыя ўгаворы не баяцца зялёных шчупакоў,
што ленавата казычуць
твае цалаваныя ступачкі,
пакуль мы любім адно аднаго ў цёплай вадзе,
узгадваючы формулу Геракліта,
якую я ўдасканальваю тваім імем;
драўляныя статуі святых апосталаў Пятра і Паўла,
якія гавораць на дзесяці мовах
(у тым ліку і па-кітайску)
у багатай віле з кандыцыянерамі
і тэрасаю над самым морам,
з якой можна назіраць, як
чапляючыся за выступы скалаў
і
раз-пораз абрываючыся ў ваду,
узахапы караскаюцца ўгору
дзесяткі два айчынных паэтаў;
ты ў чырвоным арктычным пухавіку,
пад якім па чарзе адтайваюць
паміж тваіх дваццацігадовых грудак
пакрытыя шэранню лебедзі,
знойдзеныя намі сярод ільдзін і сумётаў
горнай цясніны
(ты сцвярджаеш, што гэта балівійскія Анды);
канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега,
што заклапочана зашпільвае на гаплікі сіні жупан,
выходзячы з XVI стагоддзя праз маю прыбіральню;
ты за рэстаранным столікам
з ільснянаскурым афрыканцам,
ахутаная ментолавай смугою цыгарэтаў «Salem»;
Венера Ільская
з маёй падлеткавай галюцынацыі
ў пустой кватэры а палове пятай раніцы
з пагрозлівым надпісам «Cave amantem»*
на масянжовым цокалі;
жоўтатвары Акутагава,
падобны да в'етнамскага студэнта
з інтэрната нашае маладосці
з рукапісам «Жыцця ідыёта» пад пахаю і
чапурысты, як травеньскі грак, Карл Густаў Юнг

* Сцеражыся той, што цябе пакахае (лац.)

з трактатам «Wandlungen und Symbole des Libido»*
з кухлямі ў меру разбаўленага піва
каля жоўтае бочкі
на вуліцы Стралецкай у Полацку,
дзе мы паспелі з імі шчасліва размінуцца;
мы з табою на пляцы Гішпаніі ў Рыме —
ты ў серабрыстай сукенцы-трыко з «маланкаю»
ад палевай ямінкі на шыі
да схаванага пад срэбрам
пушыстага трохкутнічка;
ты ў мяне на каленях
на каменнай лавачцы пад ніцай вярбою
каля выпаленага сонцам калумбарыя;
прахожыя,
народжаныя да і пасля Хрыстовага нараджэння;
жанчына з тэракотавай амфарай на плячы,
якую мы аклікнулі, каб
выпіць па шклянцы ламбруска
перад тым, як твая «маланка»
апячэ мне пальцы абяцаннем новых тайніц,
нязведаных за тысячы нашых блізкасцяў
на беразе стагоддзя,
чые астатнія гады
адплываюць у невараць
крохкімі крыгамі,
па якіх
мы
з табою
спрабуем,
трымаючыся за рукі,
перабрацца на той бок.
(Першы дотык змяшае вымярэнні й эпохі,
дзе мы існуем
ва ўсіх ранейшых і будучых увасабленнях;
слодыч абуджэння пацвердзіць:
мы з той самай матэрыі, што і нашыя сны).

Калі сёння ты не прыснішся мне,
я сам папоўню фаўну тваіх сноў
сваёй сарамяжлівай сумотаю
з пахам канваліяў,
сваёй негаваркой пяшчотнасцю
з пахам язміну,
сваімі бессаромнымі вуснамі
з гаркавым пахам рамонкаў.
Я згодны нават на тое, каб
мы з табою прысніліся некаму трэцяму —
хай паўторыцца
той бязгрэшны сон,
дзе мы сядзім на даху нью-ёркскага хмарачоса
і,
боўтаючы над безданню босымі нагамі,
успамінаем:
калі ты снілася мне,
калі сном быў я сам.

* Метамарфозы і сімвалы лібіда (ням.)

ДАРОГА Ў ПОЛАЦК

Дарога ў Полацк
пасля спаткання з табою
падобная на дарогу з Эдэму
ў яго ліпеньскія ваколіцы.
Разгорнутая на каленях кніга:
«Дзень быў блакітны,
як адварот птушынага крыла...»
Хіба гэта не пра нас?
Мімалётны сон,
шчаслівы, як кацяня на срэбным бервяне
пад дзедавай арабінай.
Твае чарэшневыя вусны
яшчэ блукаюць па бульварах і завулках
горада, які завецца маім целам.
Чырвоны акварыум «Ікаруса»
ўвачавідкі поўніцца бурбаткамі кісларод у.
Суседка ў кароткай спадніцы
з тваімі цыбатымі нагамі,
з тваімі асіметрычнымі ямачкамі
на падбародку,
калі ты смяешся
з майго шапялявага блазнавання.
Азёры сярод спадзістых пагоркаў сведчаць:
аўтобус не збіўся з курсу.
Знаёмы скульптар сцвярджае, што тут
(прашу трымацца паважна)
зноў завяліся ундзіны,
вядомыя з гістарычных крыніц мінулага стагоддзя
(пра гэта ўжо напісала сталічная газета).
Не выключана, што ў іх
ногі маёй суседкі
з каленямі, як яблыкі-папяроўкі,
якія я хачу накрыць
сваёй расхваляванай далонню,
каб адчуць сорам перад табою,
каб востра адчуць тваю ўладу,
што здаецца мне сёння
найвышэйшаю формай свабоды.
Табе лепей не ведаць:
без цябе я рызыкаваў бы застацца
толькі магчымасцю самога сябе,
не ўведаўшы,
як цалуюцца ундзіны
ў чырвоным «Ікарусе»
па дарозе з Эдэму ў Полацк,
па дарозе ад нас да цябе,
па дарозе з прадоння бясконцасці
ў бездань нябыту,
сагрэтую чарэшневымі вуснамі,
якія асцярожна робяць
салёны глыток.

Эрнэст ХЭМІНГУЭЙ | ЯНЫ

ІНДЗЕЙСКІ ПАСЁЛАК

Навела

На возеры ля берага была прычалена чужая лодка. Побач стаялі і чакалі два індзейцы

Нік з бацькам перайшлі на карму індзейцы адштурхнулі лодку і адзін з іх сеў на вёслы Дзядзька Джордж сеў на карму другой лодкі Малады індзеец сапхнуў яе ў ваду і таксама сеў на вёслы

Абедзьве лодкі адплылі ў цемнаце Нік чуў рыпенне уключынаў другой лодкі далёка ўперадзе у тумане. Індзейцы грэблі кароткімі рэзкімі рыўкам Нік прытуліўся да бацькі той абняў яго за плечы На вадзе было холадна Старэйшы індзеец веславаў з усяе сілы але другая лодка ўвесь час ішла ўперадзе ў тумане.

—Куды мы плывём, тата? — спытаўся Нік.

—На той бок, у індзейскі пасёлак. Там адна ндзіянка цяжка хворая

—А. — сказаў Нік.

Калі яны даплылі, другая лодка была ўжо на беразе Дзядзька Джордж курыў у цемры цыгару Малады індзеец выцягнуў іх лодку на пясок. Дзядзька Джордж даў абодвум індзейцам па цыгары

Ад берага яны пайшлі лугам па траве, мокрай ад расы, папераздзе ішоў і нёс ліхтар малады індзеец. Потым увайшлі ў лес і выбраліся па сцяжыне на дарогу Яна вяла ў далячынь да пагоркаў На дарозе было нашмат святлей дрэвы абапал яе былі высечаныя Малады індзеец спыніўся і патушыў ліхтар, і яны пайшлі далей па дарозе

За паваротkaю на іх выскачыў і загаўкаў сабака Уперадзе свяціліся агні халуп дзе жылі індзейцы Выскачыла яшчэ некалькі сабак. Індзейцы прагналі іх назад, да халупаў. У вакне бліжэйшай халупы свяціўся агонь. Ля дзвярэй стаяла і трымала лямпу старая

Усярэдзіне на драўляных нарах ляжала маладая індзіянка Яна раджала ўжо два дн Каля яе сабраліся ўсе старыя жанчыны пасёлка Мужчыны згуртаваліся і курылі ў цемры на дарозе, дзе не было чуваць крыкаў жанчыны Якраз тады калі абодва індзейцы і Нік услед за бацькам і дзядзькам Джорджам увайшлі ў халупу яна зноў пачала крычаць Жанчына ляжала на ніжніх нарах, пад коўдраю гарою ўздымаўся яе жывот Галава была павернутая набок. На верхніх нарах ляжаў яе чалавек. Тры дні назад ён параніў нагу сякераю Ён курыў люльку У халупе моцна смярдзела

Бацька Ніка загадаў паставіць на агонь ваду і пакуль яна награвалася гаварыў з Нікам

—У гэтай жанчыны, Нік,— сказаў ён,— павінна нарадзіцца дзіця

—Я ведаю,— адказаў Нік.

—Нічога ты не ведаеш,— сказаў бацька.— Слухай Тое што ты бачыш цяпер называецца родавыя спохваткі Дзіця хоча нарадзіцца і яна хоча каб яно нарадзілася Усе яе мышцы напружваюцца дзеля таго, каб дапамагчы яму нарадзіцца Вось што адбываецца калі яна крычыць.

—Разумею,— сказаў Нік.

Тут жанчына зноў закрычала.

—Ох, тата, хіба ты не можаш даць ёй чаго каб яна не крычала? — спытаўся Н к.

—Не, не магу Са мной няма нічога такога — адказаў бацька — Але яе крыкі не маюць значэння. Я не чую яе крыкаў бо яны не маюць значэння

Чалавек на верхніх нарах павярнуўся тварам да сцяны

Жанчына на кухні знакам паказала доктару што вада ўскіпела Нікаў бацька прайшоў на кухню і адліў палову вады з вялікага катла ў тазік. У кацёл ён паклаў інструменты якія прынёс з сабою загорнутымі ў насоўку

—Трэба, каб інструменты пракіпяціліся — сказаў ён і, апусціўшы рукі ў тазік, пачаў церці іх мылам, прынесеным з сабою з лагера Нік глядзеў як бацька трэ мылам то адну, то другую руку. Робячы гэта вельмі руплів, бацька адначасна гаварыў з Нікам

—Бачыш, Нік, дзіцяці трэба ісці галавою ўперад, але так бывае не заўсёды І калі гэта не так, дык усім тады багата клопату Можа, трэба будзе рабіць аперацыю. Зараз пабачым

Калі бацька пераканаўся што вымыў рукі як след, ён вярнуўся ў пакой і прыступіў да справы

—Адгарні коўдру Джордж,— сказаў ён — я не хачу да яе дакранацца.

Пазней калі пачалася аперацыя, дзядзька Джордж і трое індзейцаў трымалі жанчыну Яна ўкусіла дзядзьку Джорджа за руку, і ён сказаў· «Ах, сучка!» — і малады індзеец, які вёз яго цераз возера, засмяяўся Нік трымаў тазік. Усё гэта забрала немалы час.

Нікаў бацька падхапіў дзіця, шлёпнуў яго, каб той лепш дыхаў, і перадаў старой

—Бачыш, гэта хлопчык, Нік,— сказаў ён — Ну, як табе падабаецца быць маім асістэнтам?

—Нічога,— сказаў Нік. Ён глядзеў убок, каб не бачыць, што робіць бацька

—Так. Ну цяпер усё — сказаў бацька і кінуў нешта ў тазік.

Нік не глядзеў туды

—Ну,— сказаў бацька,— зараз трэба накласці швы Можаш глядзець, Нік, ці не, як хочаш Я буду зашываць разрэз.

Нік не стаў глядзець. У яго даўно прапала ўсякая цікаўнасць.

Бацька кончыў і выпрастаўся Дзядзька Джордж і індзейцы таксама падняліся Нік аднёс тазік на кухню

Дзядзька Джордж паглядзеў на сваю руку Малады індзеец усміхнуўся

—Зараз я прамыю перакіссю, Джордж,— сказаў доктар.

Ён нахіліўся над індзіянкаю. Цяпер яна ляжала зусім спакойна, з закрытымі вачыма Яна была вельмі бледная Яна не ўсведамляла, ні што з яе дзіцём, ні што робіцца вакол яе.

—Я прыеду заўтра — сказаў доктар, разгінаючыся —Сядзелка з Сэнт-Ігнэса, мусіць, будзе тут апоўдні і прывязе ўсё, што трэба.

Ён быў узбуджаны і гаваркі, як футбаліст пасля ўдалае гульні

—Вось выпадак, Джордж, пра які варта напісаць у медыцынскі часопіс,— сказаў ён — Кесарава сячэнне з дапамогаю нажа і швы з дзевяціфутавай вяленай жылы

Дзядзька Джордж стаяў, прытуліўшыся да сцяны, і разглядваў руку

—Ну, вядома ты ў нас вялікі хірург,— сказаў ён

—Трэба зірнуць на шчаслівага бацьку Яны бадай, найбольшыя пакутнікі ў гэтых маленькіх сямейных справах,—сказаў Нікаў бацька.— Хаця, мушу сказаць, чалавек перажыў усё надзіва спакойна

Ён адкінуў коўдру з галавы індзейца Рука яго трапіла ў нешта мокрае. Ён стаў на край ніжніх нараў, трымаючы ў руцэ лямпу і зазірнуў наверх. Індзеец ляжаў тварам да сцяны Горла ў яго было перарэзана ад вуха да вуха. Кроў лужаю сабралася ў тым месцы, дзе дошкі прагнуліся пад цяжарам яго цела Галава ляжала на левай руцэ Адкрытая брытва, лязом уверх,— на коўдры

—Выведзі Ніка, Джордж,— сказаў доктар.

Аднак ён позна спахапіўся. Нік, стоячы ля дзвярэй кухні, добра бачыў верхнія нары і жэст бацькі, калі той, з лямпаю ў руцэ, павярнуў галаву індзейца

Ужо днела, калі яны ішлі назад па дарозе да возера

—Ніколі не дарую сабе, што ўзяў цябе з сабою, Нік,—сказаў бацька Уся яго нядаўняя ўзбуджанасць прайшла — Трэба ж было такому здарыцца!

—Што, жанчынам заўсёды так цяжка кал ў іх нараджаюцца дзеці? — спытаўся Нік.

—Не, гэта быў вельмі вынятны выпадак.

—Чаму ён забіў сябе, тата?

—Не ведаю, Нік. Не мог перажыць, напэўна

—А часта мужчыны забіваюць сябе, тата?

—Не надта Нік.

—А жанчыны?

—Яшчэ радзей

—Ніколі?

—Ну, бывае часам

—Тата!

—Што?

—А куды пайшоў дзядзька Джордж?

—Ён зараз прыйдзе

—Цяжка паміраць, тата?

—Не. Думаю, гэта зусім няцяжка, Нік. Усё залежыць ад абставін

Яны сядзелі ў лодцы Нік — на карме, бацька — на вёслах. Над пагоркамі ўздымалася сонца Плёснуў акунь і па вадзе пайшлі кругі Нік апусціў руку ў ваду У рэзкім холадзе ранку вада здавалася цёплая

Гэтым раннім часам на возеры у лодцы, каля бацькі што сядзеў на вёслах, Нік быў зусім упэўнены што ніколі не памрэ.

Пераклаў з англійскай Алесь АСТАШОНАК.

Філіп ФРЭНО | ЯНЫ

МЕЛАНХАЛІЧНЫ ІНДЗЕЕЦ

Навела

Наколькі я памятаю, была сярэдзіна жніўня, мы сядзелі на зялёным пагорку каля ручая, дзікі вінаград яшчэ не паспеў, але мы ўжо прадчувалі задавальненне, якое будзем мець неўзабаве ад ягоных дзіўнага смаку ягадаў з гронак, што віселі цяпер у нас над галовамі ў густым ценю прыгажуна-бука, раптам у наш бок з лямантам памкнуліся нейкія маладыя людзі, і мой мудры сябар Сахэм[1] Тома-Чыкі, тагачасны мой спадарожнік, узяў мяне за руку і настойліва прапанаваў выправіцца разам з ім у яганы вігвам, што знаходзіўся за некалькі міляў адсюль, у далечыні ад усялякае цывілізацыі

Ягоная просьба, такая незвычайная і такая несвоечасовая ў тую жудасную спякоту, а галоўнае, з-за чаго выказаная — з-за крыку колькіх п яніц, здзівіла мяне. Аднак я згадзіўся, і мы рушылі на захад, не абмяняўшыся больш аніводным словам, праўда, у першым сустрэтым доме зноў распалілі люлькі

Ледзь толькі мы ступілі ў лес, як я пачаў пераконвацца што ўсё тут нам бачнае захавалася ў дадзеным Прыродаю выглядзе. Дрэвы статнасцю і высокасцю сваёй быццам сведчылі аб тым, што ўласнай дасканаласцю яны анізвання не абавязаныя Умельству Ручаі пятлялі, як хацелі, не спростаныя нудна рыдлёўкаю селяніна Зямля тут ніколі не зведвала плуга, а паветра ў гэтым Царстве Прыроды поўнілася цудадзейным водарам, які ўцягвалі ў сябе лёгкія яшчэ тых старажытных людзей, што жылі ў пракаветныя вякі свету

Насустрач нам, гаўкаючы, выбег руды сабака, і я зразумеў, што нарэшце мы дабраліся да вігвама Жытло, сама болей восем футаў у вышыню было збудавана з абы-як абчасанага дрэва уверсе — дзірка-дымаход. Мала не аблепленыя высачэзнымі дрэвамі, вігвам стаяў на беразе празрыстага ручая На глыбокім месцы маладая індзіянка вудзіла рыбу і спрытна выхоплівала адна за адною стронгу ды іншых насельнікаў ручая Старая непадалёк трыбушыла рыбу і вешала яе вяліцца на зіму.

Мы ўвайшлі з індзейцам у вігвам і селі па-простаму на драўлякі, накрытыя лісінымі шкурамі Другога абсталюнку ў жытле не мелася Падлога пад нагамі была тою, якую спрадвеку мы топчам нароўні з звярыма Я парадаваўся з таго, што быў выпушчаны ў гэты свет у такі час, калі яшчэ можна заспець першабытных людзей і ўбачыць прыкметы іхняга побыту Колькі наступных стагоддзяў сатруць усё гэта дарэшты. Я вырашыў, калі выйдзе, крыху падражніць індзейца.

—Не магу зразумець, Сахэм Тома-Чыкі,— сказаў я,—навошта вам, чалавеку з вашай адукацыяй, хаваць сябе ў такім дзікім кутку. Вы ж прайшлі сама мала сто семнаццаць ліг[2] да дзвярэй Дартмуцкага каледжа[3] — дзеля таго, каб дапасці навукі моваў, мастацтваў ды містэрыяў, — а цяпер адмаўляецеся ад усяго набытага, такіх паводзінаў я няздатны зразумець Хіба ж прасторны дом таўстуна-святара не быў бы лепшы ад гэтага будана сярод змрочнага лесу, ля гэтага дзікага ручая? Хіба ежа і напоі белых законнікаў не былі б лепшыя ад гэтае прэснае рыбы, гэтых засохлых карэньчыкаў і ручаёвай вады? Хіба доктарскі каўпак, элегантны ранішні халат і строгі цёмны касцюм пашыты еўрапейскім краўцом, не засцілі б у вашых вачох гэтай убогай коўдры, што вечна спаўзае з плячэй і якую нельга надзець без шпілек, ад якіх клопату больш, ніж карысці?

—Даруй мне — адказаў індзеец,— калі ўсе памянёныя табою даброты ды перавагі ўявіліся мне нікчэмнымі ў параўнанні з маім боскім адзіночаннем Толькі нашае ўласнае стаўленне да жыцця дае нам шчасце. Вялікі Чалавек, вышэйзорны насельнік, абыдзецца з намі па мудрай сваёй волі На мне ляжыць абавязак шчасна пражыць тыя гады, якія ён мне даў, бо тады я ягоны слуга і вернік. Пазбаўлены гэтае радасці, я быў бы адно ў роспачы. Не закранай гэтага, белы чалавек, іншыя будуць складаць законы і не мець сну дзеля марных радасцяў; Тома-Чыкі ва ўсім бачыць таемны сэнс, і калі ён задаволены сваім вігвамам — мэта ягонага існавання дасягнута А якая ж цана той адукацыі, што не мае сваёй першай галоўнейшай мэтаю асабістую і грамадскую сумленнасць? Не асвечанае справядлівасцю ды міласэрнасцю, веданне таго і таго мала чаго каштуе Хадзем на руіны старажытнага індзейскага горада — там паблізу адпачываюць мае продкі

Ледзь кончыўшы, ён схапіў сваю кульбу і выскачыў з вігвама апантаны нібыта яго падганялі думкі аб супляменніках —нябожчыках, жывых і нашчадках. Я кінуўся следам за ім

—Які сэнс сумаваць? — сказаў ён — Праз тры вякі на зямлі не застанецца аніводнага майго брата і брата майго брата Нашая раса ўся знікне. Нядаўна я вяртаўся дамоў з таго боку ручая Калі я дабраўся да яго, у ім паднялася ўжо з-за дажджоў вада, і, толькі рызыкуючы жыццём я змог пераправіцца цераз ручай. Усхадзіўся вецер, сек лівень. Я запоўз у гарэшнік і заснуў І тут перада мною адразу паўсталі душы маіх продкаў Іх ахінала роспач Яны

ўтаропіліся ў мяне і крычалі адзін за адным: *«Брат! Прыйшоў час і табе збірацца да нас: твой народ вынішчаны, землі адабраныя, лепшыя ваяры перабітыя, нават вігвам, у якім ты жывеш, і той закладзены за тры барылкі сідру! Будзь мужчынам і, калі Прырода спазняецца да цябе з сваёю ласкай, знайдзі сілу сам увайсці ў яе нябачную спачывальню».*

Тым часам мы прыйшлі да руінаў старажытнага індзейскага горада Месца было надзвычай рамантычнае, у тым сэнсе, што такі куток заўсёды хіліць да роспачы Тае ж хвіліны сонца схавалася за вялікаю цёмнаю хмарай, і гэта адно дадала пахмурнаму відовішчу чароўнасці Яшчэ захаваліся прыкметы ранейшых вуліц і плошчаў; яшчэ ацалела колькі дрэваў — гэтыя ўлюбёнцы часу перажылі ўсіх былых насельнікаў места. Як і некалі, струменіў ручай і білі крыніцы, з якіх наталялі прагу пакаленні і пакаленні людзей, якія даўно перайшлі ў той свет, адкуль не вяртаюцца. Увесь гэты час твар індзейца быў роспачны, а калі мы падышлі да месца, дзе знайшлі сабе спачын ягоныя продкі, Тома-Чыкі не змог стрымаць слёз.

—Гэты лапік зямлі,— сказаў ён, падабраўшыся — раней належаў мёртвым, але цяпер ужо не! Увесь гэты горад з наваколлем, не пашкадаваўшы нават касцей нашых прапродкаў, купіў чужаніца. Нас абрабавалі, і гэтым рабаўнікам быў чалавек, які ведаў старажытнагрэцкую і старажытнагабрайскую мовы. Пяць барылак віскі вырашылі ўсё. Ён выбраў час, калі мы былі п'яныя і ўвесь свет здаваўся нам драбнічкаю, што ж тады казаць пра гэты куточак зямлі, які, аднак, карміў нас мясам ды рыбаю. Вось тут,— уздыхнуў ён,— жыў Таўтонга, адзін з самых слынных нашых ваяроў Быў час, калі ён мог пахваліцца ста дваццаццю сямю перамогамі, а самога яго загубіў бяззбройны ангелец. Вунь там, цераз дарогу, жыла прыгажуня-Пілаўаў; трыццаці тром жаніхам з свайго племені адмовіла яна, а гандляр ірландзец завабіў яе за тры ярды срэбранай стужкі і новую коўдру А там стаяў дом Скатавабы, майго дзеда ён загінуў з-за барылкі рому, якую проста згубіў па дарозе нейкі гандляр з Захаду Няхай паболеюць ягоныя радасці за ягонымі заходнімі гарамі! Успаміны агортваюць мяне роспаччу Вернемся ў вігвам!

Калі мы дабраліся да яго прытулку, індзеец адразу сеў і самотна ўтупіўся ў нейкую аднаму яму вядомую далячынь ці блізкасць. Старая індзіянка спыталася ў яго, чаму ён такі сумны

—Пазбавіцца смутку ты сам здатны,— сказала яна.

Тома-Чыкі ўскочыў на ногі, нібыта нешта згадаўшы, і ўсклікнуў·

—Жыццё — гэта сон, і цудоўны сон, калі ставіцца да яго як да сну, а не інакш Прынясі мне жбан добрага сідру; ён будзе мне сябрам, калі ўсе астатнія падмануць мяне і здрадзяць мне, найкаштоўнейшы Боскі дар — толькі белыя людзі валодаюць тайнаю яго гатавання!

Ён пачціва прапанаваў і мне пакаштаваць прынесенага напою, але сідр з аднаго ўжо паху быў такі кіслы, што я пакляўся ўсімі індзейскімі багамі не браць яго ў рот Тады індзеец паказаў на ручай, дзе маладзіца вудзіла рыбу, і, пасвятлеўшы з твару, сказаў·

—Ідзі, цвярозы чалавек, табе да смаку будзе і вада, а я з задавальненнем паспытаю гэтага яблычнага соку

Дзве гадзіны мінулі ў маўчанні Нарэшце індзеец выпіў прынесеныя два галоны[4] сідру, згадаў раптам, што колькі дзён назад ён прадаў за нішто зямлю сваю і вігвам, і адразу раз'юшыўся, распалены выпітым.

—Досыць,— сказаў ён,— з мяне хапіла, у мяне няма больш ані дому, ані зямлі, я хачу сказаць слова аб мудрасці самазабойцы

Усё пагоня за ветрам! — пачаў ён — Гэтыя кветкі, ручаі ды ціхія прыцемкі — нішто мне. Я не зраблю вялікага граху, калі скажу, што мне гідка іх бачыць. Шэсцьдзесят разоў рабіла сонца гадавы круг з таго дня, як я ўпершыню быў уражаны пекнасцю ягоных зіхоткіх promняў Пражыву я яшчэ шэсцьдзесят і што, хіба я ўбачу хоць што новае, не бачанае раней? Калі ўсё надакучвае і страчвае свежасць, самы раз спяшаць збірацца ў апошнюю дарогу Сёння ж ноччу падпалю свой вігвам і знікну разам з дымам Няма,— прадоўжыў ён, дапіваючы рэшткі сідру,— няма нічога новага усё надакучвае і страчвае смак.

У гэты момант на парозе з'явіўся вандроўны гандляр з таварамі Ён прыйшоў, як высветлілася, здалёк і цяпер прапаноўваў абмяняць барылку французскага брэндзі на бабровыя шкуркі, што сушыліся на слупку ля вігвама

—Французскі брэндзі? — усклікнуў Тома-Чыкі — Гэта штосьці новае.

—Вядома,— адказаў гандляр,— ва ўсякім разе ў нашых дзікіх краёх.

—Прысягаю небам, я яго пакаштую,— сказаў індзеец.

—А ці ж не супярэчыць гэта вашаму перакананню,— заўважыў я,— што няма нічога новага пад сонцам? *Толькі для вечнаіснага няма невядомага і новага, з простымі смяротнымі ўсё зусім інакш. На карысць і на радасць ім у акіяне жыцця Умельства і Прырода ў вечным сваім суплёце ствараюць новыя формы і сутнасці.*

—Сам Бог насяляе сваёю часцінкай гэты дзіўны напой,—усклікнуў індзеец, паспытаўшы брэндзі другім разам — Забірай, незнаёмец, усе мае шкуры і футры, а калі развіднее, выпраўляйся дамоў па новы запас гэтага нектара Жыццё рабілася мне невыносным і я пачынаў ужо думаць, як хутчэй пайсці з яго. Цяпер я спазнаў мудрасць і застаюся з перакананнем. *толькі* РАЗНАСТАЙНАСЦЬ *робіць жыццё жаданым.*

1788

Пераклаў з англійскай Алесь АСТАШОНАК.

---

[1] Сахэм — правадыр (мова індзейскага племені крык).
[2] Ліга — адзінка даўжыні ў Вялікабрытаніі і ЗША — 4,828 км.
[3] Дартмуцкі каледж — адзін з старэйшых каледжаў ЗША, знаходзіцца ў штаце Нью-Гэмпшыр, на паўночным усходзе краіны.
[4] Галон — адзінка аб'ёму і ёмістасці ў Вялікабрытаніі і ЗША — 3,785 л.

ТВАРАСЛОВЫ

Дбожыць — не спаць, калі хочацца спаць, не паддавацца сну, калі сон змагае і апаноўвае, гэтым сваім дбаннем як бы тварыць набажэнства, здабываць божую падтрымку асягаць новыя можнасці жыцця; *бодрствовать.*

Дбожанне — *бодрствование.*

Дбожны, дбожлівы — *бодрый, бодрствующий.*

Дбожыцца — знаходзіцца ў стане, калі **дбожанне** становіцца ўласцівасцю натуры і адбываецца само па сабе.

Калі б ведаў гаспадар дома, у якую варту прыйдзе злодзей, то дбожыў бы і не даў бы падкапаць дома свайго (Мацв., 24:43).

Дбожце маліцеся, каб не ўпасці ў спакусу: дух дбожны, самсць жа нямоглая (Мацв., 26:41).

Дык жа не будзем спаць, як іншыя, але будзем дбожыць і цвярозіцца (1 Сал., 5:6).

Звіждаваць — бачыць далёка наперад праз далечыню часу, выклікаць вобраз таго, што мае адбыцца; *провидеть.*

Звіждоўны — *провидческий.*

Звіждаванне — *провидение.*

Звіждар, звіждун — *провидец.*

Хто гэта, што азмрочвае Звіждаванне словамі без кнозы? (Іоў, 38:2).

Бо гэта народ бунтоўны, дзеці хлуслівыя, якія не хочуць слухаць закона Госпадняга, якія звіждарам кажуць. «перастаньце звіждаваць», прарокам «не прарочце нам праўды...» (Іс., 30:9—10).

І Пісанне, звіждуючы, што Бог вераю апраўдае паганцаў, прадузвясціла Аўраму (Гал., 3:8).

Навузга звязвае ў вузлы слоў тое, што праяўляецца ў падазроных здагадках і што плявузгаецца па завуголлі; *навет.*

Навузгнічаць — *наветничать.*

Навузгнік — *наветник.*

Навузглы — *«наветный».*

І сказаў Давыд: што мне вам, сыны Саруевы, што вы робіцеся цяпер навузгнікамі? (2 Цар., 19:22).

Не прыхіляй вуха да крывадушных падшэптаў і не ўпускай у сэрца свае варожых навузгаў (Апокр.).

На каго навузгнічаюць, той апраўдаецца сваёй адданасцю праўдзе, але хто навузгнічае, прычыняецца да віны (Апокр.).

Кноза — змест, суадпаведны наканаванаму парадку рэчаў, які якраз і распазнаецца ў ёй і дзякуючы ёй; змысловая цнота; *смысл.*

Кнозны — *имеющий смысл.*

Кнозіць — *смыслить.*

Скнозлівы — *смышленый.*

Скнозлівасць — *смышленость.*

Хай дасць табе Госпад кнозу розум (1 Пар., 22:12).

Адымае мову ў красамоўцаў, старцаў пазбаўляе кнозы (Іоў, 12:20).

Простым даць скнозлівасць, юнаку — веды разважлівасць (Пр., 1:4).

Узбуджаю вашу чыстую кнозу, каб вы разумелі словы, раней моўленыя святымі пракамі (2 Пётр., 3:1—2).

Спрытыкацца — сутыкацца ўпрытык з перашкодай, якая, можа, і не варта тваёй увагі, але якая чакае, каб гэта быў менавіта ты, спатыкацца аб яе, падпадаць пад яе прыкры дыктат; *претыкаться.*

Спрытыкнуцца — *преткнуться.*

Спрытыкненне — *преткновение.*

Спрытыкі — *претыкания, козни.*

На руках панясуць цябе, не спрытыкнешся аб камень нагою тваёю (Пс., 90:12).

Калі будуць наступаць на мяне ліхадзеі, супротнікі ворагі мае, каб зжэрці цела маё, то яны самі спрытыкнуцца ўпадуць (Пс., 26:12).

Бо спрытыкнуліся аб камень спрытыкнення (Рым., 9:32).

Адзеньцеся ў паўнату зброі Божай, каб вам можна было стаць супраць спрытыкаў д'ябальскіх (Еф., 6:11).

Бытнаваць — знаходзячыся ў пэўным часа-прасторавым кантынууме, быць тоесным быццю, і такім чынам дазваляць яму рабіцца пастасным, асабовым; *пребывать.*

Бытнаванне — *пребывание.*

Бытны — *пребывающий.*

Бытнавацьме — *пребудет*

Тады, якое месца абярэ Госпад, Бог ваш, каб бытнаваць імені Яго там, туды прыносьце ўсё, што я наказваю вам (Другазак., 12:11).

Хто не бытнавацьме ўва мне, адрынецца прэч, як галіна, і ссохне (Іаан, 15:6).

Бог ёсць любоў, і той, хто бытнуе ў любові, бытнуе ў Бозе, Бог у ім (1 Іаан, 4:16).

Хітлівы — той, хто хістаецца ў сваіх паводзінах, але так, што гэтае хістанне ўнутрана абгрунтавана мэтанакіравана; хітры; *лукавый.*

Хітляваць — *лукавить.*

Хітляванне, хітліўства — *лукавство.*

Хітлівец — *лукавец.*

Слова вуснаў яго — няпраўда хітляванне (Пс., 35:4).

Госпадзе! Збаў душу маю ад вуснаў хлуслівых, ад языка хітлівага (Пс., 119:2).

Словы хітлявяць, але ведаеце вы, аднак, большую праўду (Апокр.).

Пойтаць — насычаць моцай, сілкаваць энергіяй, паіць жыццём; *питать.*

Пойтанне — *питание.*

Пойтанец — *питомец.*

Пойтальнік, пайтавальнік — *питатель.*

Пайтаваць *подпитывать.*

Пойтань — *питомник.*

Я буду пойтаць і вас, і дзяцей вашых (Быц., 50:21).

А ў сёмы пакідай яе (зямлю) ў спакої, каб пойталіся нябогі з твайго народа, а рэшткамі пасля іх пойталіся звяры палявыя (Зых., 23:11).

Ён будзе табе ўцехаю пайтавальнікам у старасці тваёй (Руф, 4:15).

Гэта будзе здароўем для цела твайго пойтаннем для касцей тваіх (Пр., 3:8).

Воды жывілі яго (дрэва), бездань уздымала яго, рэкі яе акалялі пойтань (Езяк., 31.4).

Усякі, пойтаны малаком, недасведчаны ў слове праўды, бо ён яшчэ немаўля (Яўр., 5:13).

Вельмаваць узвялічваць над усімі, аддаючы таму, хто вяльмуецца, у слугаванне сваю душу; *превозносить.*

Вельмаванне — *превозношение.*

Вяльмоўны — *превознесенный.*

Вельмічаць — *превозноситься.*

Спыніцеся і спазнайце, што Я Бог буду ўвельмаваны ў народах, увельмаваны на зямлі (Пс., 45:11).

Убачылі яе дзяўчаты, — увельмавалі яе, царыцы і наложніцы, — увасхвалілі яе (Песня Песн., 6:9).

Маладзён будзе нахабна вельмічаць над старым і мужык над вяльможам (Іс., 3:5).

Слаўлю, вяльмую ўзвялічваю Цара Нябеснага (Дан., 4:34).

І ўсялякае вельмаванне, што паўстае супраць спазнання Божага (2 Кар., 10:5).

Вомшанне ўбірае ў сябе рэчаіснасць, судакранаючыся з ёю; змяшчае яе ў сабе, распазнаючы навобмацак, што яна азначае; яно ў руху, яно на шляху, рэчаіснасць для яго заўсёды і перашкода, павадыр; *осязание.*

Вомшаць — *осязать.*

Вомшавы, вомшаны — *осязаемый.*

Вомсны *осязательный.*

Вомшаем, як сляпыя, і, як без вачэй, ходзім вобмацкам (Іс., 59:10).

Вы падступіліся не да гары, вомшанай ахопленай полымем (Яўр., 12:8).

Пра тое, што было адпачатку, што мы чулі, што бачылі сваімі вачамі, што разглядалі, што вомшалі рукі нашы (1 Іаан, 1·1).

Вотханне ўдыхае дух рэчаіснасці і распазнае яе па тым, як яна пахне, чым патыхае; *обоняние.*

Вотхаць — *обонять.*

Вотхны, вотхавы — *обоняемый.*

Вотхасны — *обонятельный.*

будзеце там слугаваць багам, зробленым рукамі чалавечымі з дрэва каменя, якія не бачаць не чуюць, і не ядуць і не вотхаюць (Другазак., 4:28).

Калі ўсё цела вока, то дзе слых? Калі ўсё слых, то дзе вотханне? (1 Кар., 12:17).

Цяперац той, на каго цяпер скіраваны позіркі, каму падпарадкоўваюцца, каго слухаюць, *властитель.*

Цяпернічаць — *властвовать.*

Чутка прыйдзе ў адзін год, і потым у другі год, і на зямлі будзе змушчаванне, цяперац паўстане на цяперца (Іяр., 51.46).

Бывае час, калі чалавек цяпернічае над чалавекам на шкоду яму (Екл., 8:9).

Ісус жа, паклікаўшы іх, сказаў: вы ведаеце, што князі народаў уладараць над імі цяпернічаюць вяльможы (Мацв., 20:25).

Глеймаваць — «клеймаваць» гліну камень, выяўляючы з іхніх глыбіняў адчутыя вобразы; *ваять.*

Глеймаванне — *ваяние.*

Глеймавальнік — *ваятель.*

Глейм, гляймак — *изваяние.*

Гляймоўны — *ваятельный.*

Гляймоўня — *ваятельная мастерская.*

Не рабіце сабе стодаў глеймаў, слупоў не стаўце ў сябе, і камянёў з выявамі не кладзіце ў зямлі вашай (Ляв., 26:1).

Каб вы не ўпалі ў распусту і не зрабілі сабе глеймакоў, выяў якога-небудзь стода ў выглядзе мужчыны альбо жанчыны (Другазак., 4:16).

Хай будуць сыны нашы як расада, няўрымслівыя ў маладосці сваёй; дочкі нашы — як адмыслова зглейманыя слупы ў харомах (Пс., 143:12).

Дворма — вонкавы бок рэчаў, змест якіх выявіўся займеў форму; *наружа.*

Двормны, двормавы — *наружный.*

Дворміць, двармаваць — *обнаруживать.*

Надворма — *наружу*

Двормнасць, двормавасць — *наружность.*

Няма нічога патайнага, што не зрабілася б яўным; нічога не бывае ўтоенага, што не выйшла б надворма (Марк, 4:22).

Не судзіце па двормавасці, а судзіце судом справядлівым (Іаан, 7:24).

Таму не судзіце ніяк раней часу, пакуль не прыйдзе Госпад, Які асветліць схаванае ў змроку і ўдворміць сардэчныя намеры (1 Кар., 4 5)

Але яны не шмат што паспеюць, бо іхняя неразумнасць удворміцца перад усімі (2 Цім., 3:9).

Знічыць — звесці на ніштo, давесці да нічога; калі з'яву, то — *«упразднить»*, калі чалавека, то — *«уничижить».*

Знічэнне, знічаванне — *упразднение, уничижение.*

Знічаны — *упраздненный, уничиженный.*

Знічаваны — *уничижаемый.*

Знічлівы — *уничижительный.*

Досыць насычана душа наша ганьбаваннем ад фанабэрлівых знічаваннем ад ганарлівых (Пс., 122:4).

Многа разоў Ён выбаўляў іх; яны ж раздражнялі Яго ўпартасцю сваёй, былі знічаваны за беззаконне сваё (Пс., 105:43).

З гэтага царства паўстануць дзесяць цароў, і пасля іх паўстане іншы, адметны ад ранейшых, знічуе трох цароў (Дан., 7:24).

І незнакамітае свету знічаванае нічога не вартаснае абраў Бог, каб знічыць вартаснае (1 Кар., 1:28).

А потым канец, калі Ён аддасць царства Богу Айцу, калі знічыць усякае начальства ўсякую ўладу, сілу (1 Кар., 15:24).

Нячымец, нечымлівец — той, хто сваімі ўчынкамі ганьбуе чалавечы чын; *нечестивец.*

Нячымнічаць — *нечествовать.*

Нячыміць — *бесчестить.*

Нечымлівы — *нечестивый.*

Нячымнасць, нечымлівасць — *нечестие.*

Знячымнічаць — *бесчинствовать.*

Знячыміць — *обесчестить.*

Знячымства — *бесчинство.*

Я яб'явіў яму, што Я пакараю дом яго на вякі за тую віну, што ён ведаў, як сыны яго нячымнічаюць, і не ўтаймоўваў іх (1 Цар., 3:13).

І я, куды пайду я з маім знячымствам? (2 Цар., 13:13).

Ці можна сказаць цару: «ты — нечымлівец», і князям: «вы беззаконнікі»? (Іоў, 34:18).

Праведнік ненавідзіць хлуслівае слова, а нечымлівы ганьбуе нячыміць сябе (Пр., 13:5).

Праўда захоўвае беззаганнага ў дарозе, а нечымлівасць губіць грэшніка (Пр., 13:6).

І немаўляты іхнія будуць пабіты перад вачамі іхнімі; дамы іхнія будуць разрабаваны жонкі іхнія знячымнічаны (Іс., 13:16).

(Любоў) не знячымнічае, не шукае свайго, не раздражняецца, не думае злога (1 Кар., 13:5).

Здарсць афарбоўвае чалавечыя паводзіны ў колер здарэння і, як здарэнне, прыцягвае да сябе ўсеагульную ўвагу; *дерзость.*

Здарснасць, здарсненне, здарснаванне — *дерзновение.*

Здарсны, здарслівы *дерзкий, дерзостный, дерзновенный.*

Здарсаць — *дерзать.*

Здарсайце!— *дерзайте!*

Калі ж хто з тубыльцаў альбо з прыхадняў зробіць што здарсліваю рукою, то ён зневажае Госпада (Ліч., 15:30).

Калі прарок скажа імем Госпада, але слова тое не збудзецца не спраўдзіцца, то не Госпад гаварыў гэтае слова, але гаварыў гэтае прарок па здарсці сваёй (Другазак., 18:22).

У наступную ноч Госпад, з'явіўшыся яму, сказаў: здарсай, Павел; бо як ты сведчыў пра Мяне ў Ерусаліме, гэтак належыць сведчыць і ў Рыме (Дзеі, 23:11).

Воржы — варожыя чалавеку сутнасці, якія вядуць з ім нябачнае змаганне; *бесы.*

Воржыць — *бесить.*

Воржаўскі, воржны — *бесовский.*

Воржышча *бесовище.*

Варжаваты — *бесноватый.*

Варжавацца — *бесноваться.*

Воржанне, варжаванне — *беснование.*

Мінуў поўдзень, а яны ўсё яшчэ варжаваліся да самай пары вечаровага ахвяравання (3 Цар., 18:29).

Сказаў: Госпадзе! памілуй сына майго; ён у маладзік варжуецца і цяжка пакутуе (Мацв., 17·15).

Тыя, што бачылі, расказалі ім пра тое, як гэта адбылося з варжаватым, аб свіннях (Марк, 5:16).

Выходзілі гэтаксама і воржы з многіх з крыкам гаварылі: Ты Хрыстос, Сын Божы (Лука, 4:41).

А тыя, што бачылі, расказалі ім, як ацаліўся варжаваны (Лука, 8:36).

Дух жа выразліва кажа, што ў апошнія часы адступяцца некаторыя ад веры, уваждаючы духам звабным вучэнням воржным (1 Цім., 4:1).

Здзейсце — дзеянне, якое вымагае самаахвярных высілкаў дзякуючы якому здзяйсняецца вышэйшая мэта існавання; *подвиг*

Здзейснік — *подвижник, герой.*

Здзейсны, здзейсніцкі — *подвижнический, героический.*

Здзейсавацца *подвизаться.*

Здзейсаванец — *подвизающийся.*

На здзейсце душы Сваёй Ён будзе глядзець з задавальненнем (Іс., 53:11).

Спяшайцеся і сыходзьцеся, усе народы наўкольныя, збярыцеся; туды, Госпадзе, вядзі тваіх здзейснікаў (Іаіль, 3:11).

Усе здзейснікі ўстрымліваюцца ад усяго: тыя для атрымання вянка тленнага, а мы — нятленнага (1 Кар., 9:25).

Для чаго я руплюся і здзяйсуюся моцай Ягонай, што дзейнічае ўва мне магутліва (Калас., 1:29).

Вы яшчэ не да крыві змагаліся, здзяйсуючыся супраць грэху (Яўр., 12:4).

Мысах — «наўмысная», самасная развага, не ўзгодненая з голасам сэрца; *рассудок.*

Мысахны — *рассудочный.*

Мысханне — працэс выяўлення мысахных высноў; *«рассудочествование».*

Мысхаць — *«рассудочествовать».*

Мысны, змысны — *рассудительный.*

Мысніць, мыснаваць — *рассуждать.*

Змысніць — *рассудить.*

Мыснаванне, змыснаванне — *рассуждение.*

Змыснасць — *рассудительность.*

Бо яны народ, што страціў мысах, няма ў іх кнозы (Другазак., 32:28).

Выслухайце, мудрыя, мову маю, і прыхіліце да мяне вуха, змысныя! (Іоў, 34:2).

Усталюем паміж сабой мыснаванне, і распазнаем, што добра (Іоў, 34:4).

Тады змыснасць будзе сцерагчы цябе, розум будзе захоўваць цябе (Пр., 2:11).

«Я, прамудрасць, сяльбую з розумам, шукаю змыснае веды» (Пр., 8:12).

І сэрца лёгкадумных будзе ўмець мыснаваць; і коснаязыкія будуць гаварыць ясна (Іс., 32:4).

Бо мне здаецца, нязмысна пасылаць вязня не паказаць абвінавачванняў на яго (Дзеі, 25:27).

Сельбаваць, сельбавацца — жыць, пасяліўшыся ў пэўнай мясціне стаўшы прыкметай гэтай мясціны; *обитать.*

Сельбаванне — *обитание.*

Сельбаваны — *обитаемый.*

Сяльбоўнік, сельбіт — *обитатель.*

Сяльбоўня, сяліба — *обитель.*

Сельбішча — *обиталище.*

Сыны Ізраілевы елі манну сорак гадоў, пакуль не прыйшлі ў зямлю сельбаваную (Зых., 16:35).

Цябе адлучаць ад людзей, сельбаванне тваё будзе з палявымі звярамі (Дан., 4:22).

Папраўдзе, блізка да тых, што баяцца Яго, выратаванне Яго, каб сельбавала слава ў зямлі нашай! (Пс., 84:10)

Тады народ мой будзе жыць у сялібе міру, і ў селішчах бяспечных, ў жытлішчах лабожных (Іс., 32:18).

сказаў мне Госпад: з поўначы адчыніцца бедства на ўсіх сяльбоўнікаў гэтай зямлі (Іяр., 1:4).

Тнеча — марныя спробы, дарэмныя намаганні нешта здзейсніць, нечага дамагчыся, з імі штурхаецца чалавек па крузе жыцця і сам тнецца імі; *тщета.*

Тнечны, тнечлівы — *тщетный.*

Тнечнасць — *тщетность.*

Тнечыцца — марна старацца, *«тщиться».*

Надзея тнечлівая: ці не ўпадзеш ад аднаго позірку яго? (Іоў, 41:1).

Нашто бунтуюць народы, плямёны задумваюць тнечнае? (Пс., 2:1).

Але што для мяне было перавагаю, тое дзеля Хрыста я палічыў тнечай (Філ., 3:7).

Датуль будзе тнечыцца чалавек,

пакуль не расплюшчацца вочы розуму і ён не ўбачыць, дзе — скарб (Апокр.).

Змождзі — мукі, якія змагаюць чалавека і якія, аднак, ён можа прынясць і перажыць, *страсти*.

Змаждоўны — *страстный*.

Змаждавацца — апанавацца **змождзямі**.

Змаждаваны, змаждзелы — апанаваны **змождзямі**.

Змождзень — *страстотерпец*.

Змаждаванне — стан перажывання **змождзяў**; *«страствование»*.

Таму аддаў іх Бог ганебным змождзям (Рым., 1:26).

Бо калі мы жылі па самсці, тады змождзі грахоўныя, выяўляемыя законам, дзейнічалі ў ласцімцах нашых, каб прыносіць плод смерці (Рым., 7:5).

Ці чалавек змаждуецца, ці сяльбуе ў спакої   няхай спадзяецца на Бога (Апокр.).

Змаждаванне — духоўная барацьба, той, хто выходзіць з яе пераможцам, мае за ўзнагароду жыццё (Апокр.).

Звомны — той, чыё меркаванне і чыё прызванне не супадаюць са звыклымі, хто, не маючы свайго дому, шукае яго ў свеце; *странный*.

Звомнік — *странник*.

Звомнасць — *странность*.

Звомніцтва, звомнічанне — *странничанье, паломничество*.

Звомнічаць — быць **звомным**, знаходзіцца ў **звомніцтве**.

Звома — *странствие*, мэта якога — далучэнне да святыні.

Бо маёмасць іхняя была такая вялікая, што яны не маглі жыць разам, і зямля звомніцтва іхняга не ўмяшчала іх (Быц., 36:7).

Я ўсталяваў запавет Мой з імі, каб даць ім зямлю Ханаанскую, зямлю звомніцтва іхняга, у якой яны звомнічалі (Зых., 6:4).

прыйшоў да багатага чалавека звомнік, той пажадаў узяць са сваіх авечак альбо валоў, каб згатаваць абед для звомніка (2 Цар., 12:4).

Звомнік я на зямлі; не хавай ад мяне запаведзяў Тваіх (Пс., 118:19).

Не ўбачыш больш народа лютага, народа з глухой, няўцямнай гаворкай, з моваю звомнай, незразумелай (Іс., 33:19).

Многія з вучняў Яго, чуючы тое, казалі: якія дзіўныя словы! хто можа гэта слухаць? (Іаан, 6:60).

Ласцімец — частка, якая мае ўласцівасць прыналежаць да цэласнасці, быць суадпаведнай ёй; *член*.

Ласцімства — *членство*.

Ласцімны   *членский*.

Ласцімшчына   тое, што прыналежыць **ласцімцу**; яго ўласнасць, вотчына.

Ласціміць, ласцімнічаць — праяўляцца і дзейнічаць у якасці **ласцімца**.

Ласцімы — праявы паводзіны **ласцімца**.

Змуцілася ад гора вока маё, і ўсе ласцімцы мае, як цень (Іоў, 17:7).

Калі ж правае вока тваё спакушае цябе, вырві яго і кінь ад сябе; бо лепш для цябе, каб загінуў адзін з ласцімцаў тваіх, а не ўсё цела было ўрынута ў апраметную (Мацв., 5:29).

Хіба не ведаеце, што целы вашы ёсць ласцімцы Хрыстовы? Хіба адыму ласцімцы ў Хрыста, каб зрабіць іх ласцімцамі распусніцы? (1 Кар., 6:15).

Аб іхніх намерах гавораць іхнія словы, сведчаць ласцімы іхнія аб тым, хто яны (Апокр.).

Змуштаванне — уздзейнічанне на чалавека, каб змусіць яго жыць так, як ён не хоча жыць, думаць так, як ён не хоча думаць, запрыгоньванне яго жыццёвай волі; *насилие*.

Змуштоўна — *насильственно*.

Змуштоўнік — *насильственник*.

Змуштаваць — *насильствовать*.

Змушта — акт **змуштавання**.

І ўбачыў яе Сіхем, сын Гамора Гівейца, князя зямлі той, ўзяў яе, спаў з ёю, прычыніў ёй змушту (Быц., 34:2).

Разладзь, Госпадзе, і падзялі мовы іхнія; бо я бачу змуштаванне звады ў горадзе (Пс., 54:10).

Не спаборнічай са змуштоўнікам не абірай ніводнага са шляхоў яго (Пр., 3:31).

Але твае вочы тваё сэрца звернуты толькі да тваёй карысці да праліцця нявіннай крыві, да таго, каб рабіць уціск змуштаванне (Іяр., 22:17).

Яны не ўмеюць абыходзіцца справядліва, кажа Госпад: змуштаваннем рабаўніцтвам збіраюць скарбы ў харомы свае (Ам., 3:10).

Знеча — акцыя, якая, каб пакараць чалавека за яго ўчынкі, нявечыць яго цела; *казнь*.

Знечыць — *казнить*.

Знечыцца — *казниться*.

Знечнік — падлеглы **знечы**; *казнимый*.

Знечаны — той, над кім здзейснілася **знеча**.

Знеч — той, хто застаўся жыць, але — знявечаны **знечай**.

І сказаў Госпад Майсею: яшчэ адну знечу Я навяду на фараона і на Егіпцян (Зых., 11:1).

І яна зрабілася ганьбай сярод жанчын, калі здзейснілі над ёю знечу (Езяк., 23:10).

А Ірад, пашукаўшы яго і не знайшоўшы, судзіў вартаўнікоў і загадаў іх знечыць (Дзеі, 12:19).

За гэта ў адзін дзень прыйдуць на яе знечы, смерць і плач і голад, і будзе спалена агнём (Утаяв., 18:8).

Утаяванне — адкрыццё схаванага, выяўленне патайнага, якое, аднак, не «рассакрэчваецца», а, застаючыся тоесным таямніцы, становіцца тоесным штодзённай рэчаіснасці, становіцца прысутным; *откровение*.

Таяўнасць — *откровенность*.

Таяванне — *откровенничанье*; сама з'ява **утаявання**.

Таяўны — *откровенный*.

Таяўнічаць — *откровенничать*.

Таяваць — рабіць тайнае яўным; *открывать*.

Утаявацца — зрабіцца з тайнага яўным; *открыться*.

Таява — змест **утаявання**, тое, што праз яго адкрываецца.

Утаяваны — адкрыты праз **утаяванне**.

пакладзі ў каўчэг утаяванне, якое Я дам табе (Зых., 25:16).

Праўда таяванняў Тваіх вечна: настаў мяне на розум, буду жыць (Пс., 118:144).

Абрэжце сябе для Госпада, здыміце крайнюю самсць з сэрца вашага, мужы Іуды і жыхары Ерусаліма, каб гнеў мой не ўтаяваўся, як агонь (Іяр., 4:4).

Дык не бойцеся іх: бо няма нічога схаванага, што не ўтаявалася б, патайнага, што не было б уведана (Мацв., 10:26).

Калі ж яны слухалі гэта, распавёў прыпавесць. бо ён быў блізка ад Ерусаліма, яны думалі, што хутка павінна ўтаявацца Царства Божае (Лука, 19:11).

Але, з-за ўпартасці тваёй нераскаяннага сэрца, ты сам сабе збіраеш гнеў на дзень гневу ўтаявання праведнага суда ад Бога (Рым., 2:5).

Гай ПІКАРДА

НАШ



Гай Пікарда на Скарынінаўскіх урачыстасцях у Полацку. 1990 г.

ЯН З ЛІТВЫ

(Першы беларускі друкар у Лёндане)

Пра Гая ПІКАРДУ (Г. ПІХУРУ)

Аляксандар РЫПІНСКІ ў Лёндане

(1849 - 1859)

ЯН З ЛІТВЫ

(Першы беларускі друкар у Лёндане)

Францішку Скарыне належыцца без сумніву гонар быць першым беларускім друкаром І зусім слушна, бо слаўны доктар з Полацку ня толькі надрукаваў у 1517 г у Празе чэскай першую кнігу пабеларуску (Псалтыр), але таксама залажыў першую друкарню на беларускай зямлі ў Вільні ў 1525 г Ягоныя кнігі ня былі, аднак, першымі друкаванымі кнігамі ведамымі на Беларусі Ужо ад 1492 г існавала ў Кракаве друкарня пад кіраўніцтвам майстра Сьвятаполка Фіёла З гэтай друкарні вышла некалькі славянскіх літургічных кнігаў якія былі ведамымі на Беларусі перад паяўленьнем твораў Скарыны[1]

Цераз імглу гісторыі да нас дайшло імя яшчэ аднаго чалавека, які можа мець права да тытулу першага беларускага друкара, хоць уся ягоная ведамая друкарская дзейнасьць прайшла заграніцаю. Ангельскія гісторыкі і бібліёграфы кажуць, што ў канцы XV-га стаг жыў у Лёндане нейкі друкар, які называўся Jon Lettou г зн Ян з Літвы або Ян Ліцьвін Ягонае паходжаньне было прадметам дагадак. Усе згаджаюцца, што ён быў чужынцам і некаторыя старэйшыя гісторыкі ўважалі яго за немца[2] Аднак большасьць аўтарытэтаў згаджаецца што Ян быў «літоўскага» (г зн беларускага) паходжаньня[3] Назовы Lettou або Lettow у сярэднявяковай ангельскай мове ўжываліся дзеля азначэньня Вялікага Княства Літоўскага[4] У тым часе было таксама звычайным зьявішчам сярод чужынцаў дадаваць да свайго імяні назоў гораду ці краіны, адкуль яны паходзілі Так, напрыклад, другі лёнданскі друкар, які праз некі час быў супольнікам Яна з Літвы, называўся William Machlinia (Вільям Мэхлінскі) і паходзіў з флямандзкага гораду Мэхелен Іншы друкар, з якім Ян мог мець лучнасьць у Італіі, называўся Matheus Moravus (Мацей Мараўскі) і паходзіў з Аломуца ў Маравіі[5] У кнігах, якія вышлі з друкарні Яна з Літвы, слова lettou пісалася з малой літары Гэта магло-б сьведчыць што гэтае слова ўжывалася не як прозьвішча, але дзеля азначэньня паходжаньня друкара[6]

Нам няведама, дзе і калі нарадзіўся Ян з Літвы ані калі ён пакінуў Вялікае Княства Літоўскае. Некаторыя гісторыкі думаюць, што ён быў вучнем Мацея Мараўскага бо літары ягоных выданьняў маюць пэўнае падабенства да літараў гэтага апошняга[7] Мацей Мараўскі паявіўся ў Генуі ў 1474 г., але ўжо ў наступным годзе пераехаў у Нэапаль, дзе ён дзейнічаў аж да 1492 г.[8] Калі Мацей быў сапраўды настаўнікам Яна, дык магчыма, што ягоны вучань — які меў добрую асьвету і ведаў лацінскую і францускую мовы,— быў студэнтам на Праскім унівэрсытэце ў літоўскай калегіі заложанай каралевай Ядвігай, жонкай Ягайлы. Адтуль ён мог паехаць разам з Мацеям у Італію, або далучыцца да яго там пазьней. Навучыўшыся ад яго пачаткаў друкарства, ён мог выехаць у Англію, дзе былі лепшыя магчымасьці працы для маладога і параўнаўча недасьведчанага друкара Гэтая тэорыя ёсьць вельмі праўдападобная але мае сваю слабую старану ў тым што раньні шрыфт Яна з Літвы ёсьць вельмі падобны — каб не сказаць аднолькавы — да шрыфту пэўнага John Bulle, які займаўся друкарствам у Рыме у 1475-79 г[9] Ня гледзячы на сваё прозьвішча гэты друкар паходзіў ня з Англіі а з Брэману ў паўночнай Нямеччыне. Магчыма, што Ян, прыехаўшы ў Італію, працаваў некі час у друкарні Буля ў Рыме Другая магчымасьць ёсьць тая што Ян спаткаўся і працаваў з Булям яшчэ ў Нямеччыне. Брэман быў адным з гарадоў Ганзы і меў гандлёвыя зносіны з Данцыгам, Кэнігсбэргам і з гарадамі гоцкага ўзьбярэжжа Ганза мела таксама свае прадстаўніцтва у Лёндане, якое было звычайным месцам затрымкі для падарожнікаў з усходняй Прыбалтыкі Гэта ў пэўным сэнсе робіць нам зразумелым чаму некаторыя гісторыкі ўважалі Яна за немца.

Першы раз мы спатыкаем Яна з Літвы ў Лёндане ў 1480 г дзе яму належыцца гонар быць першым друкаром які пасяліўся ў лёнданскім City Ангельскі першадрукар Какстон які адчыніў друкарню тры гады раней, жыў у Уэстмінстэры Ёсьць даныя думаць што Какстон сам заахвочваў Яна і іншых замежных друкароў пасяліцца ў Лёндане Няведама ці Ян адчыніў адразу свае прадпрыемства, ці праз некаторы час працаваў у якой існуючай ужо друкарні Скромная якасьць ягоных першых выданьняў і факт што мы ня ведаем аб ніякіх кнігах, выданых ім перад прыездам у Лёндан прымушаюць думаць, што ў Лёндане Ян стаўляў свае першыя крокі ў друкарскім мастацтве

У першым часе сваёй дзейнасьці ў Лёндане Ян надрукаваў некалькі выданьняў Індульгенцыі Папы Сыкста IV-га супроць Туркаў, выданых Дж. Кэндалям Крыху пазьней ён надрукаваў на кошт Вільяма Вількока выданьне Тамаша Пэнкета кнігі Антонія Андрэя «Questiones super XII l bros metaphysicae» У 1481 г зноў на кошт тога самага Вількока ён надрукаваў кнігу Тамаша Валензіса «Камэнтар да Псальмаў»

Паводле Тэмпэрлі гатыцкі шрыфт, ужываны ў гэтых выданьнях, быў «грубы і паломаны»[10] Іншыя аўтары кажуць, што іхны шрыфт быў акуратны[11] хоць ён безумоўна не заслугоўваў на церазьмерныя пахвалы якімі абсыпалі яго некаторыя аўтары[12]

Дакладнае месцазнаходжаньне друкарні Яна з Літвы ў гэтым першым пярыядзе ягонай дзейнасьці нажаль, ня ёсьць ведамым.

У 1481 г Ян увайшоў у суполку з другім замежным друкаром, Вільямам Мэхлінскім Тэмпэрлі думае што Ян найперш быў працаўніком у друкарн Вільяма а пасьля маладшым супольнікам[13] Гэта было-б звычайным зьявішчам у выпадку маладога і недасьведчанага друкара Факты аднак змушаюць думаць, што наадварот ня Ян, але Вільям быў маладшым супольнікам Перадусім мы ня ведаем ніводнай кнігі, надрукаванай Вільямам Мэхлінскім перад тым, як ён уступіў у суполку з Янам з Літвы Па-другое, калі-б было так, як думае Тэмпэрлі, дык выдаецца няверагодным, каб быўшы працадаўца дазволіў, каб імя ягонага маладшага супольніка было надрукаванае першым на кнігах, выданых супольна

Ян з Літвы і Вільям Мэхлінскі купілі лепшы шрыфт[14] і адчынілі сваю друкарню ў City, «недалёка ад царквы ўсіх сьвятых» (All Hallows). Цэркваў з такім назовам было ў Лёндане аж восем Паколькі, аднак, нашыя друкары спэцыялізаваліся ў выдаваньні праўных кнігаў[15] дык іхняя друкарня павінна была быць недалёка ад Inns of Court, г зн дзяльніцы гораду дзе жылі і працавалі праўнікі Таму яна найбольш праўдападобна знаходзілася недалёка г зв Вялікай Царквы Усіх Сьвятых (All Hallows the Great) каля Тамізы Характэрна што гэтую царкву наведвалі купцы Ганзы чыё прадстаўніцтва ў Лёндане — г зн Steel yard або Stahlhof — знаходзілася побач

Пра Гая ПІКАРДУ (Г. ПІХУРУ)

Калі пагадзіцца з тым, што ў лёсе не бывае выпадковасцяў, дык юны лейтэнант кавалерыі Франсуа Абрагам Разье, што служыў у маршала Даву, зусім не выпадкова начаваў аднойчы ўвосень 1812 года каля вогнішча, раскладзенага недзе на беларускіх абшарах Смаленшчыны. Трэба прызнаць невыпадковым і тое, што ўначы прыцісную мароз і месье Разье адмарозіў сабе вуха, з якім давялося неадкладна развітацца, але не назусім, бо ашчадны лейтэнант высушыў яго і ўсё жыццё вазіў з сабою ў табакерцы, каб праз сто з лішнім гадоў гэтая фамільная рэліквія трапілася на вока ягонаму праўнуку Гаю, народжанаму ў 1931-м у некалі варожым Напалеону Лондане.

Ад сябра міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, выхаванца юрыдычных факультэтаў Сарбоны і Оксфарда, брытанскага падданага Гая Пікарды вы можаце пачуць, што якраз з сухога вуха і пачалася ягоная цікавасць да краіны, па дарогах якой некалі гарцаваў на кані ягоны зухаваты продак. Асабіста я выслухаў гэтую гісторыю, сустрэўшыся з містэрам Пікардам у Полацку на святкаванні 500-годдзя Францішка Скарыны. Другая наша сустрэча адбылася ў бібліятэцы імя першадрукара на Holden Road у сталіцы Злучанага Каралеўства, дзе гэты чалавек, шчодра надзелены не толькі красамоўствам, але і талентам даследчыка, жыве пры Беларускай каталіцкай місіі, прысвячаючы свой час навуковым штудыям і сяброўскім гутаркам з удзячнымі слухачамі.

Сваім найбольш значным даробкам у беларусістыцы Гай Пікарда ўважае выдадзеныя ў Лондане зборнікі «Беларускі духоўны спеўнік» і «Беларускі царкоўны спеўнік». Ягоныя публікацыі па праблемах беларускай гісторыі і культуры няраз з'яўляліся ў часопісах «Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва» (Нью-Ёрк), «The journal of Byelorussian Studies» (Лондан), «Божым Шляхам» (Парыж—Лондан), адкуль і ўзятыя прапанаваныя чытачам «Крыніцы» тэксты (падпісаныя псеўданімам Г.Піхура), якіх, вядома, не было б, каб напалеонаўскі лейтэнант Франсуа Разье ўладкаваўся бліжэй да вогнішча.

Уладзімір АРЛОЎ

Найбольшым асягненьнем супольнікаў было надрукаваньне клясычнага твору ангельскай праўнай літаратуры — Tenores Novelli аўтарам якой быў Sir Thomas Littleton Літлетон (прыб 1407-1481) быў сябрам Inner Temple (адно з чатырох таварыстваў лёнданскіх праўнікаў). Ён быў судзьдзёю і адным з найбольшых аўтарытэтаў у галіне ангельскага земскага права Паколькі ягоная кніга была першым падручнікам у гэтай галіне, дык выхад яе ў сьвет быў важным выдарэньнем ня толькі ў гісторыі друкарства, але таксама ў гісторыі права. Хоць кніга ня мае загаловачнай бачыны адна прыпушчаецца, што яна была выданая ў другой палове 1481 г Тэмпэрлі думае, што Літлетон сам назіраў над яе выданьнем коратка перад сваёй сьмерцю[16] Шрыфт у гэтай кнізе быў лепшым чым у ранейшых выданьнях Яна з Літвы, аднак ён яшчэ быў далёка не дасканалы Літары былі «грубыя гатыцкія», «барбарскія і паламаныя», а тэкст быў перапоўнены скаротамі[17]

Ян з Літвы і Вільям Мэхлінскі надрукавалі яшчэ некалькі кнігаў у большасьці праўных, супольна, але ўжо ў 1483 г на загаловачных бачынах красуецца толькі імя Вільяма, а ягоная друкарня знайходзіцца цяпер у Гольборн каля мосту Фліт Такім чынам дзейнасьць Яна з Літвы ў Лёндане трывала крыху больш, чым тры гады Што сталася з ім пасьля — няведама. Паводле, аднак, адной тэорыі, вельмі прывабнай, хоць без дастатковых даных, Ян стаўшыся майстрам друкарства, выехаў з Англіі ў Кракаў[18] Там ён памагаў Фіёлу залажыць друкарню і надрукаваць паславянску «Трыядзь» і «Актойх» Ёсьць пэўныя меркаваньні, якія можна прывесьці ў абарону гэтай тэорыі Вялікі князь Казімер, які панаваў у Кракаве як польскі кароль, быў вялікім прыхільнікам і патронам «літоўскага» мастацтва. Ян з Літвы павінен быў быць досыць маладым, калі ён прыехаў у Лёндан, калі мы будзем уважаць досыць нізкую якасьць ягоных першых твораў, як вынік браку дасьведчаньня Пазьней ён робіць значны поступ наперад. Моўныя цяжкасьці, аднак, напэўна перашкаджалі яму ў разьвіцьці ягонай дзейнасьці асабліва, калі попыт на кнігі ў жывой ангельскай мове рос з дня надзень з вялікай шкодаю для лацінскіх выданьняў Удасканаліўшы сваё майстэрства што магло быць больш натуральным для яго, як вярнуцца да свайго князя каб пад ягонай дабразычлівай апекаю падзяляць разам з Фіёлам практычную манаполію на друк славянскіх кнігаў?

Як-бы там ня было, але для беларусаў, якія сяньня жывуць у Англіі ёсьць прыемна думаць, што пяцьсот год таму іхні зямляк хадзіў па вуліцах Лёндану і нават пакінуў значны сьлед свайго побыту ў гэтым горадзе.

«Божым шляхам». Лондан, 1965. Травень–чэрвень

---

[1] Мітр. Іларыён, «Перводрукованиі Львівскиі Апостол». Наук. Збірнік Укр. Вільн. Акад. Наук у С.С.А., Нью Ёрк, 1953, бач. 19–20.

[2] C. Timperly, «A Dictionary of Printers and Printing», London, 1839, b. 173–174.

[3] «British Museum Catalogue of Printed Books in the XVth Century», Part IV, London, 1916, p. XIV· F Harrison. «A Book about books», London, 1943, p. 116.

[4] Cf. Geo Chaucer, «The Canterbury Tales» — The Prologue, lines 43–46 & 52–54.

«A Knight ther was, and that a worthy man,
That fro the tyme that he first began
To riden out, he loved chivalrie,
Trouthe and honour, fredom and courteisie...
Full ofte tyme he hadde the bord bigonne
Above alle naciouns in Pruce;
In Lettow had he reised and in Ruce,
No Cristen man so ofte of his degree».

[5] Cf. «British Museum Catalogue of Books printed in the XVth centure», Part VI, London, 1930, pp. XLII–XLIII.

[6] Cf. «Tenores Novelli» of Sir Thomas Littleton, London, 1481

[7] Cf. «The Dictionary of National Biography». Ed. 1909, Vol. XI, p. 1012.

[8] Cf. «Brit. Mus. Cat.», Pt. VI, loc. cit.

[9] Cf. «Brit. Mus. Cat.», Pt. IV, p. XIV

[10] Cf. Timperly, Op. cit., p. 167

[11] Cf. R. Peddie, «Printing: a short history of the art», London, 1927, p. 178.

[12] Cf. R. Ostrowski, «Fragments from the History of Byelorussia», London, 1961, p. 83–84.

[13] Timperly, loc. cit.

[14] «Dict. Nat. Biography», loc. cit.

[15] Ян з Літвы і Вільям Мэхлінскі надрукавалі разам пяць праўных кнігаў Пасьля адыходу Яна, Вільям выдаў другое выданьне кнігі Літлетона (гл. тэкст).

[16] Timperly, op. cit., p. 174.

[17] Timperly, op. cit., p. 167

[18] R. Ostrowski, op. cit., p. 84.

Аляксандар РЫПІНСКІ ў Лёндане

(1849 - 1859)

Ня можна сказаць, каб Аляксандар Рыпінскі быў вялікім паэтам Для многіх ён ня быў нават добрым беларусам. Як бы там ня было, аднак займае пэўнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры 19-га стаг. і ўжо дзеля гэтага заслужыў на нашую ўвагу

Аляксандар Радван-Рыпінскі нарадзіўся ў Беласелцы на Віцебшчыне[1] Паходзіў з старой беларускай шляхоцкай сям'і[2] Асьвету атрымаў у Віцебску ў школе дзе панаваў моцны польскі дух. Яшчэ будучы вучнем, у 1827 ён пачаў пісаць вершы папольску

Ягонае дасканалае веданьне беларускай мовы і зацікаўленьне жыцьцём і культурай беларускага сялянства паказваюць на тое, што аставаўся ў цеснай сувязі з сваім народам

Падзеі 1830 г захапілі Рыпінскага маладым чалавекам. Ён шчыра аддаўся «польскай» справе змаганьня супроць Масквы і служыў у паўстанчай арміі ў чыне паручніка. Пасьля разгрому паўстаньня Рыпінскі ўцёк заграніцу і пасяліўся на нейкі час у Парыжы, які тады быў сапраўднай другой бацькаўшчынай усіх славянаў Мала ведама аб ягоным жыцьці ў гэтым горадзе, хіба толькі тое, што ў 1839 г. прачытаў там рад лекцыяў у польскім выгнанчым літаратурным гуртку аб Беларусі, ейнай культуры, а ў асаблівасьці аб ейнай паэзіі і музыцы Гэтыя лекцыі былі выданыя папольску ў 1840 г пад загалоўкам «Бялорусь»[3]

У 1848 г у Францыі выбухла паўстаньне, якое прывяло да стварэньня Другой Рэспублікі і да зьмены ўрадавай палітыкі ў адносінах да выгнанцаў Многія з гэтых апошніх павінны былі шукаць новага месца жыхарства. Вялікая Брытанія дала гасьціну для 500 польскіх уцекачоў адразу пасьля паўстаньня 1830 г , дык цяпер вочы эмігрантаў з Парыжа зьвярнуліся ў бок гэтай краіны Сярод іх быў і Аляксандар Рыпінскі Дакладныя абставіны ягонага прыезду ў Англію няведамыя, але ўжо ў 1849 г мы бачым яго ў Тотэнгам, які быў тады маленькім гарадком на паўночнай ускраіне Лёндану, а цяпер зьяўляецца прадмесьцем гэтага гораду Прыемнае палажэньне і блізкасьць да сталіцы былі, магчыма прычынаю таго, што ў палове 19-га стаг у Тотэнгам было вельмі шмат школаў Дзеля гэтага там было вялікае запатрабаваньне на настаўнікаў, асабліва дзеля навучаньня замежных моваў Гэтую патрэбу маглі задаволіць эміграны, многія з якіх мелі добрую асьвету і ўладалі некалькімі мовамі Дык ня дзіва, што ў гэтым часе мы знайходзім у Тотэнгам калёнію польскіх настаўнікаў, між якімі былі і беларусы Сярод настаўнікаў быў таксама сьвятар С.Бжэзінскі ў «установе Mr Hill у Bruce Castle, Tottenham»[4] Польскія і беларускія эміграны атрымалі дазвол карыстацца з капліцы пры Бэльгійскай амбасадзе ў Лёндане, якая тады знайходзілася на London Road пры St. Georges Fields на паўднёвым беразе Тамізы Айцец Бжэзінскі, які быў капэлянам польскай калёніі ў Лёндане, адправіў там першую Службу Божую на Сёмуху 1843 г[5] Няма сумліву што Рыпінскі там часта бываў у часе свайго жыцьця ў Лёндане.

Пасяліўшыся ў Тотэнгам, Рыпінскі знайшоў там працу у Eagle House School недалёка ад West Green. Гэтая школа была заложаная ў 1841 г і мела вельмі шмат чужынцаў сярод сваіх вучняў Вось што кажа аб ей гісторык Тотэнгаму, Фрэдэрык Фіск. «Большасьць вучняў у інтарнаце былі сынамі чужынцаў з добрых сем'яў, многія з іх прыходзілі, ня ведаючы ніводнага слова паангельску»[6] Закладчык і кіраўнік школы Andrew Price наняў Рыпінскага як выкладчыка францускай мовы — якую гэты апошні ведаў вельмі добра, дзякуючы свайму жыцьцю ў Парыжы,— і рысаваньня[7]

У 1851 г Рыпінскі жыў у маленькім доміку на 3 Chances Row разам з сваім прыяцелем Станіславам Руткоўскім, таксама выгнанцам. Ён тады рэкамэндаваўся, як «паручнік польскай арміі, цяпер мастак-маляр, настаўнік францускай і нямецкай моваў і рысаваньня»[8]

Жывучы ў Тотэнгам, Рыпінскі пазнаёміўся з Юліюшам Пшыемскім выгнанцам, як і ён, і настаўнікам ў Гров Гауз Скул Пшыемскі быў таксама крыху паэтам, і Рыпінскі прыводзіць некаторыя ягоныя вершы ў прадмове да аднэй з сваіх паэмаў папольску

У 1855 г знайходзім зацемку аб падатках, якія Рыпінскі павінен быў плаціць за дом і гарод на 5 Grove Place што знайходзіўся толькі пару крокаў ад школы Відаць, гэты дом быў ягонай собскасьцю. Гадавая рэнтавая вартасьць будынку была 20 фунтаў, што было нармаль-

най вартасьцю добрага дому на прадмесьці Лёндану ў тым часе[9] У сваім доме Рыпінскі заложыў невялікую друкарню, дзе выдаваў ня толькі свае творы, але таксама надрукаваў прынамсі адзін нумар гадавой справаздачы з дзейнасьці Лёнданскага Таварыства Прыяцеляў Польшчы (1857 г.).

Літаратурная спадчына Рыпінскага ня ёсьць вялікай. Мы ўжо коратка ўспомнілі аб ягоных Парыскіх лекцыях. У Лёндане вышлі ў 1853 г тры выданьні ягонай беларускай жартаўлівай паэмы «Нячысьцік» Паводле прызнаньняў самога аўтара ён улажыў гэты твор на Рычмандзкім узгорку рамантычнай мясцовасьці каля Лёндану У трэцяе выданьне Рыпінскі ўвёў сыстэму націскаў дзеля аблягчэньня правільнай вымовы пабеларуску У паэме гаворыцца аб бедным селяніне Мікіце, які ў Вялікі Пост забіў сьвіньню і нарабіў каўбасаў Ён паслаў жонку па гарэлку, а сам таксама адлучыўся некуды на хвілінку У часе іхняй адсутнасьці прыйшоў чорт і ўкраў сьвіньню і каўбасы Жонка прыйшоўшы і ўбачыўшы што сталася, нападае на мужыка і жадае яму сьмерці Яе жаданьне зараз-жа спаўняецца М кіта падае мёртвым а агонь нішчыць усю хату Мараль паэмы (калі наагул тут ёсьць якая мараль): ніколі ня есьці каўбасаў у Вялікі Пост

Мастацкая вартасьць паэмы, якую аўтар называе «беларускай бальлядай», ня ёсьць вялікая Ейны зьмест ёсьць няцікавы і верш слабы Трэба, аднак, зазначыць, што мова твору добрая і досыць чыстая, а зьмест поўны сымпатыі да сялянства ў духу патэрналізму які быў тады характэрным для некаторых колаў беларускай шляхты Паводля Карскага «Нячысьцік» — гэта спроба, ня вельмі ўдачная аддаць дух народных забабонаў[10]

Хоць Рыпінскі пісаў таксама і папольску, але гэтыя ягоныя творы ня маюць вялікай цікавасьці Галоўнай ягонай заслугай было тое, што стараўся культываваць беларускую мову на чужыне, а таксама зьбіраў і распаўсюджваў весткі аб розных відах беларускай народнай творчасьці Ды і самі палякі ўважалі Рыпінскага за беларускага паэту[11]

Літаратура ня была адзінай галінай мастацкай дзейнасьці, якой займаўся Рыпінскі Ён быў таксама энтузіястам фатаграфіі (якая была тады толькі ў сваіх пачатках) і нядрэнным мастаком-маляром Абодвы гэтыя зацікаўленьні ня былі бескарыснымі У 1867 г, магчыма дзеля падмацаваньня сваёй ня вельмі вялікай настаўніцкай платы, ён рэклямуе сябе як прафэсіянальны фатограф[12]. Няведама нічога, што-б магло даць нам паняцьце аб дзейнасьці Рыпінскага ў гэтай галіне, хаця вельмі магчыма, што некаторыя ілюстрацыі да збору ягоных паэзіяў былі зробленыя ў ягонай студыі Мы больш знаем аб мастацкіх здольнасьцях Рыпінскага ў галіне рысаваньня бо да гэтага часу захаваліся гравюры з двух ягоных рысункаў, якія прадстаўляюць выгляд «акадэміі» Eagle House, дзе ён быў настаўнікам

Пасьля 1858 г мы не знайходзім больш вестак аб Рыпінскім у Лёндане Праўдападобна ён вярнуўся ў гэтым часе на бацькаўшчыну, дзе памёр ў 1860 г. Школа Eagle House дзе ён быў настаўнікам, ужо даўно разбурана, і на ейным месцы высіцца цяпер будынак Тотэнгамскага тэхнічнага каледжу Дом Рыпінскага 5 Grove Place стаіць яшчэ, і яго можна бачыць з боку вуліцы High Street. У Тотэнгамскім музэю у Bruce Castle, у парку якога Рыпінскі напэўна часта гуляў, мы знаходзім яшчэ некалькі ўспамінаў аб ім дзьве вышэйўспомненыя гравюры з ягоных абразоў, а таксама пасьведчаньне, упрыгожанае партрэтам каралевы Вікторыі, выданае Рыпінскім аднаму з вучняў

Рыпінскі быў вельмі строга асуджаны гісторыкамі беларускай л таратуры за палянафільства, «рэакцыйнасьць» і «недэмакратычнасьць» Некаторыя нават сьцьвярджалі што ён чыста выпадкова называўся беларускім паэтам[13] Асабліва яму закідаецца, што ён называў беларускую мову дыялектам а Беларусь — правінцыяй Польшчы. Было-б аднак няправільным закідаць Рыпінскаму палянафільства на гэтай аснове. З ягоных твораў, асабліва ў польскай мове, відаць, што Рыпінскі ўжываў назову «Польшча» не ў этнічным сэнсе але ў сэнсе «рэчпаспалітай» У вельмі падобны спосаб сяньня Вялікая Брытанія зьяўляецца «рэчпаспалітай» ангельскага, шкоцкага і валійскага народаў Адносна-ж слова «дыялект» дык у прошлым ён вельмі часта ўжываўся як сынонім слова «мова» (напр. славянскі дыялект). Сам Рыпінскі ў адным месцы гаворыць аб «рускім і польскім простых дыялектах» Ён, аднак, без сумніву лічыў літоўцаў, украінцаў і беларусаў за асобныя народы, злучаныя з палякамі ў аднэй рэчпаспалітай супольным змаганьнем супроць маскоўскага акупанта

Калі ідзе аб ягоную «рэакцыйнасьць» дык варта памятаць словы паэты ў прадмове да ангельскага выданьня аднаго ягонага твору·

«Перакананьне, якое паступова распаўсюдзілася і апошнім часам запусьціла карані сярод цывілізаваных народаў, што толькі нацыянальныя багацьці ёсьць годныя працы і часу сучаснага пісьменьніка і што толькі там ён павінен шукаць натхненьня і ідэяў, змусіла мяне напісаць гэты твор. Гэтай думкай я кіраваўся ў маёй цяперашняй і прошлай творчасьці і я чэрпаў мае ідэі з поля нашага простага люду так багата засеянага паэтычнымі і нацыянальнымі кветкамі Так як у палітыцы сяньня народныя масы ўважаюцца адзінай праўдзівай і моцнай асновай урадаў і мерай існаваньня незалежных нацыяў, таксама і ў літаратуры нацыянальнымі могуць сяньня ўважацца толькі тыя творы, якія былі ўзятыя з жыцьця гэтых масаў з глыбіні іхніх сэрцаў Маючы гэта на ўвеце у маёй паэзі не знойдзецца ніводнага месца дзе-б я ня выкарыстаў якой жывой пагаворкі, ці не запазычыў некай думкі з вуснаў нашага пачцівага сялянства, якое жыве на нашай польскай зямлі і гаворыць рознымі дыялектамі Толькі такую паэзію лічу нацыянальнай Усякая іншая паэзія ня дойдзе да сэрца народу»[14]

Ды нават памінаючы ўсё вышэй сказанае, было-б несправядліва судзіць Рыпінскага і іншых сучасных яму «палянафілаў» паводле нормаў нашага часу Нават сяньня ёсьць сярод беларусаў нямала адукаваных адзінак, якія праяўляюць палянафільскія ці масквафільскія нахілы У часе, калі жыў Рыпінскі, беларускае нацыянальнае адраджэньне было толькі ў сваіх пачатках і брутальная палітыка русыфікацыі, якую праводзіў маскоўскі царскі урад на Беларусі, была ў поўным разгоне. Дзеля гэтага мы не павінны дзівіцца з тых прадстаўнікоў беларускай шляхты, якія ў тым часе глядзелі на Польшчу як на натуральнага саюзьніка ў змаганьні супроць Масквы Ня гледзячы на ўсе свае недахопы Рыпінскі быў далёка больш дадатнай фігурай з беларускага пункту гледжаньня чым, скажам, Сымон Полацкі ці Адам Міцкевіч ён прынамся ня цураўся сваёй роднай мовы На чалавека, які быў толькі прыпадковым беларусам, Рыпінскі выказаў зьдзіўляючае знаёмства і сталае зацікаўленьне культурай і мовай беларускага народу Ён ня меў, здаецца, ніякіх ілюзіяў адносна сваіх паэтычных здольнасьцяў, аднак у апошнім ведамым нам ягоным вершыку адчуваецца іскра нацыянальнай гордасьці

Ты-ж сам, суседзька, хацеў,
Што-б і я табе запеў;
Ну, я табе і пяю,—
Прымі песенку маю.
Можа гэта ня песьнь? каша?
Ды ўсёжтакі свая, наша![15]

Да дадатнай стараны ягонай дзейнасьці трэба безумоўна залічыць тое, што Рыпінскі жывучы ў Парыжы і Лёндане, першы пачаў распаўсюджваць на Захадзе весткі аб Беларусі яе мове і культуры Хоць гэтая праца ў сваім часе не дала вялікіх вынікаў, тым ня менш яна мае сваё значэньне Для беларусаў, якія сяньня жывуць на выгнаньні асоба і дзейнасьць Рыпінскага прадстаўляюць немалую цікавасьць і таму яны павінны аднесьціся да яго з разуменьнем і сымпатыяй на якія ён заслужыў

Г. ПІХУРА

«Божым шляхам». Лондан, 1964. Жнівень–верасень

[1] Krosnowski: «Almanach Historique», Paris 1847, bač. 337

[2] Рыпінскія, або Рпінскія, былі старажытным шляхоцкім родам з Віцебшчыны; адзін з продкаў Аляксандра, Багдан Рыпінскі, быў праваслаўным архіяпіскапам Полацкім, Віцебскім і Мсьціслаўскім у 1570 г

[3] Białoruś — «Kilka słów o poezyi prostego ludu tej naszej Polskiej prowincyi, jego muzyce, śpiewie, tańcach etc., przez Alexandra Rypinskiego, członka Akademii Przemysłu, rolnictwa, rękodziel i handlu Francuskiego», Paris, 1840.

[4] Annual General Report of the Friends of Poland, London, 1842, bač. 23.

[5] Annual General Report..., London, 1843, bač. 25.

[6] Fred Fisk: «A History of Tottenham», II Series, London, 18..., bač. 171

[7] Annual General Report..., London, 1850, bač. 7; AGR 1857, bač. 19 & 22.

[8] Гл. The Census List for Tottenham 1853, што знаходзіцца ў London Record Office.

[9] Гл. Rate Book for Tottenham 1855, што знаходзіцца ў Bruce Castle Museum, Tottenham.

[10] E. Karski: «Geschichte der Weissrussischen Volksdichtung und Literatur», Berlin—Leipzig, 1926, bač. 125—126.

[11] S. Orgelbrand: «Encyklopedia Powszechna», T XIII, Warszawa 1902, bač. 191

[12] ARG 1857 in fine.

[13] С. Майхровіч: «Нарысы Беларускай Літаратуры XIX стагоддзя», Менск, 1957, бач. 67· М. Гарэцкі: «Гісторыя Беларускай Літаратуры», Вільня, 1921, бач. 69.

[14] Гл. заўвагі і выясьненьні аўтара (паангельску) ў: «The Sergeant Philosopher a Legend», translated by H. Daniels, London 1856, бач. 43—44. Арыгінал паэмы (папольску) быў выданы аўтарам ў Лёндане ў 1853 г.

[15] Гэты вершык Рыпінскі напісаў у альбом А. Дарэўскаму-Вярызе у 1860 г Гл. М. Гарэцкі: «Хрэстаматыя Беларускай Літаратуры», Вільня, бач. 102.

КРЫНІЦА № 9

1994

ШТОМЕСЯЧНЫ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ЧАСОПІС

ВЫДАЕЦЦА СА СТУДЗЕНЯ 1988 ГОДА

Заснавальнікі:
СП Беларусі, калектыў рэдакцыі

Выдаецца на беларускай мове

Рукапісы аўтарам па пошце не вяртаюцца

Пішыце:
220807, г. Мінск, ГСП, вул. Кісялёва, 11

Званіце:
366-071, 366-142

Падпісана да друку з арыгінал-макета 26. 10. 94. Фармат 60x84 1/8. Афсетны друк.
Папера газетная. Ум.-друк.арк. 13,02. Ул.фарб.-адб. 14,35. Ул.выд.арк. 14`,52.
Тыраж 4000 экз.
Кошт дагаворны. Зак. 1084.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка у друкарні выдавецтва
«Беларускі Дом друку», 220013, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79.